# Пятрусь
# Броўка



АКАДЭМІЯ НАВУК БССР

ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ
імя ЯНКІ КУПАЛЫ

# Пятрусь Броўка

## ЗБОР ТВОРАЎ У ДЗЕВЯЦІ ТАМАХ

Рэдакцыйная калегія:
Р. І. БАРАДУЛІН, А. У. БРОЎКА, Ю. П. БРОЎКА,
В. В. ЗУЁНАК, В. А. КАВАЛЕНКА,
М. І. МУШЫНСКІ, І. Я. НАВУМЕНКА

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1989

# Пятрусь Броўка

ЗБОР ТВОРАЎ У ДЗЕВЯЦІ ТАМАХ

5

ВЕРШЫ
ПАЭМА
1972—1980
ПЕРАКЛАД

Рэдактар тома
Л. М. ГАРЭЛІК

Падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі
А. Д. АТАЕВАЙ, Т. Р. СТРОЕВАЙ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1989

ББК 84Бел7
Б 88

Б $\frac{4702120202-125}{М 302(03)-89}$ 88—89

ISBN 5-340-00293-4

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989

# I

# ВЕРШЫ

## АДЗІНЫ ШЛЯХ

Мы першымі
На свеце цэлым
Сабраліся, каб разам жыць,
Адна душа, адно ў нас цела,
Адзіны шлях для ўсіх ляжыць.

А ён прывабны і прыгожы,
Няхай нялёгкі іншы раз,
Зярняты дум, зярняты збожжа
Цяпер агульныя у нас.

Ці то між гор, ці стэпаў голых,
Ці то паміж ялін, бяроз,
Калі вясёла — ўсім вясёла,
Калі бяда — балюча скрозь.

Адна нам зорка ясна свеціць,
Яна вядзе і ўдаль заве,
Калі ёсць шчасце на планеце,
Яно для ўсіх — між нас жыве!

## ЛЮБАЯ МЯСЦІНА

Відаць, я ў гэтым не адзіны,
Відаць, што кожнага краіне
На ўсё жыццё адна мясціна.
І ёсць такая і ў мяне.

За тое месца над ракою
Не знаю большае красы,
Яно заўжды, заўжды са мною,
Дзе б я ні быў, ва ўсе часы.

Туды ніякае дарожкі,
Ні нават сцежак лугавых —
Кусты ляшчынніку, бярозкі,
Малы ядлоўчык паміж іх.

Я там вясновай раніцою
Сустрэчы першае чакаў,
Калі ж прыйшла, дык я пра тое,
Пра што хацеў, і не сказаў.

Наогул анямелі словы,
Куды адвага ўся сплыла?..
Ды і яна, бы выпадкова,
Мяне на беразе знайшла.

Стаяла ціш, дзе мы сышліся,
І толькі чуў, узнёслы, я,—
Дрыжэла песня жаўра ў высі,
А больш за ўсё — душа мая.

## КАРЭННІ ПЕСНІ

Вялікі дуб.
Яго напевы
Ідуць з карэньчыкаў малых.
І я, нібы карэннем дрэва,
Збіраю песню з душ людскіх.

Кладу,
Чаканю слова к слову,
У гэтым сэнс глыбокі ёсць.
Таму і рознакаляровай
Бывае песні прыгажосць.

І ёй
Аддаўшы ўсё, што маю,
І свой наказ: — У людзі руш! —
Сачу, а як яе прымаюць
Мільёны воч, мільёны душ?

## СЭРЦАЛЁТ

Да пэўнай станцыі ў палёт
Вядуць звышгукавы экспрэс.
А верш — ракета-сэрцалёт,
Прад ім, як ёсць, сусвет увесь.

Каб быць патрэбным дзень пры дні,
Людскія сэрцы паланіць,
Ён на належнай вышыні
Па змесце й форме мусіць быць.

Каб вёў яго натхнення жар,
Каб узляцеў ажно да зор,
Каб крылы рвалі тоўшчы хмар,
Каб ніклі нізка пікі гор.

Каб мог плысці ён — ноч не ноч,
Каб вызначаўся і красой,
Каб быў прываблівым для воч
І часта вабіў навіной.

Яму ляцець бясконца год,
Нікому не злічыць таго,
Бо верш — ракета-сэрцалёт
І безліч станцый у яго.

## У МУЗЕІ

Сябры, сябры,
Наш круг радзее —
Хто сам сышоў, хто на вайне...
Ах, колькі вас са сцен музея
Глядзіць сягоння на мяне!
І тыя, што паваявалі,
Што білі ворагаў на скон,
І тыя, што зямлю аралі
Яшчэ на трактары «Фардзон».
І тыя, хто з душой выноснай
Паліў ля буданоў касцёр,
Каму бярозы нашы й сосны
Былі ў час грозны за сясцёр.
І тыя змагары за волю,
Каго кідаў за краты лёс,
І тыя, з кім у камсамоле
Спявалі мы: «Наш паравоз...»
З кім у асеці і адрыны
Збіралі восені дары,
З кім на вясковай вечарыне
Скакалі часта да зары.
І тыя, з кім калісьці ў першы
Хадзілі мы вучыцца клас,
І тыя, з кім пісалі вершы,
З газет чакаючы адказ.
Пра вас тут весціны такія —
Што смерць...
Здаецца, закрычу —
Бо для мяне вы ўсе жывыя.
Аддаць вас смерці
Не хачу!

## НЯХАЙ ЖА ВАМ НЕ СНЯЦЦА...

Хапіла і героям,
І ўсім: старым, малым...
Мы зведалі такое —
Не верыцца самім.

Зямля крывёй паліта,
Агню слупы, слупы...
Мы бачылі забітых —
Ляжалі, што снапы.

Мы бачылі — ляцелі
Снарады пчол гусцей
І матак звар'яцелых
Ля нежывых дзяцей.

Палалі хаты-свечы,
А дым, як смоль, густы.
Пасля — стаялі печы,
Разявіўшы раты.

Мы бачылі — кідалі
Сялібы галубы
І быццам буркавалі,
Падобна да кляцьбы.

Вы, дзеці сонца, працы,
Далёка ад вайны —
Няхай жа вам не сняцца
Пра гэта нават сны.

## БАЛАДА ПРА ДУБ САЎГАСА СІТЦА

Шмат за жыццё дзівоснага
Бачыць мне выпадала,
Дрэваў самых магутных
Я наглядаў нямала.
Бачыў у пушчах дрымотных,
Каля азёраў, крыніцаў...
Чаму ж ты параніў сэрца,
Дуб, што з саўгаса Сітца?
Год мо пяцьсот ці болей.
Аж да аблокаў рушыш,
Крокаў аж дваццаць зробіш,
Пакуль ля камля абкружыш.
Голле тваё, што крэмень,
Летам мядзяна-зялёны...
Ды на цябе як гляну,
Быццам ты чым засмучоны?..
І праўда, калі распазнаеш,
Хочацца слёзам ліцца,
Што мне пра дуб расказалі
Людзі з саўгаса Сітца.
Глянь жа ты ўвысь і добра,—
Вяршаліна дуба свіціцца,
Бачыш зялёную крону,
Абскуб яе нехта быццам?
Што ж, па галлі пахадзілі
Сякерамі, нават пілою —
Гэта было ў сорак першым,
Часінаю вельмі цяжкою.
Гэта было ў сорак першым,
У год невыносна-крывавы.
Эсэсаўцам, вырадкам лютым,
Бач, не хапала забавы,
Ну й рагаталі ж, як чэрці,
З выдумкі, быццам заўзятай,
Сагналі музыкаў палонных
У робах сюды паласатых.
Што ім бяда музыкантаў.

Затое эсэсаўцам люба —
Ах, як іграў ім, іграў ім
Аркестр духавы па дубе!..
Былі сярод тых аркестрантаў
Савецкія, сербы, французы,
Бельгійцы, англійцы, ірландцы —
Іграліся вальсы і блюзы,
Ігралі ваўсю аркестранты,
Заказы ім з долу крычалі,
А каты ў мундзірах, спадніцах
Скакалі, скакалі, скакалі...
Да сёмага поту скакалі,
Як толькі трымалі іх ногі,
Здавалася — неба ірвалі
Пра фюрэра «хайлі» і «гохі»...
І раптам яны анямелі
І знік звар'яцелы запал,
Ім вушы прарэзаў няшчадна,
Як гром, як нястрымны абвал,—
«Інтэрнацыянал»!..
Эсэсаўцы гаўкалі: — Стой!..
Але аркестранты не чулі —
Ігралі мацней і мацней...
І з долу пасыпалі кулі!
Ды марш пралетарскі байцоў
Ніякая смерць не заглушыць.
І падалі з голляў тады
Нікім нескароныя душы.
Ім бачыўся час перамог,
І горда яны паміралі,
А трубы і нават адны,
Здавалася, самі ігралі...

---

А мне гэта ўсё расказаў,
Ніколі аб тым не забыцца,
Волат наш, сведка жывы,
Дуб, што ў саўгасе Сітца!

## МОДНІЦА

Дзе я ні быў,
Куды ні ездзіў,
Нідзе не бачыў я такой.
Ах, што за модніцу я ўгледзеў —
Часопіс «Моды» — нуль прад ёй.

Сукенка —
Поўнага адкрою,
Пярсцёнкаў безліч на руках,
З Памір — прычоска вышынёю
І два Эльбрусы на грудзях.

Чырвонай фарбы,
Дайце рады,—
Пажарам шчокі заняло,
На вуснах паўкіло памады,
А завушніцы па кіло.

Насустрач ёй
Дзяўчо імкліва
Бяжыць, бялявых дзве касы...
Няхай сукеначка не дзіва,
А воч не звесці ад красы.

* * *

Паміж сяброў,
Паміж каханкаў,
Якія ў думках кожны міг,—
Няма ні станцый, ні паўстанкаў
Такіх, каб раз'ядналі іх.

Калі імкнешся
Да сустрэчы,
Не скажаш марам ты — маўчы,
Яны лятуць уранні, ўвечар,
У час глыбокае начы.

Іх перакажуць
Любым зоры,
А ці нашэпчуць іх вятры,
Жаданняў не прыпыніць мора,
Пустэльні стэп,
Плячо гары!

# ТРЭБА ВЕДАЦЬ...

## I

Трэба ведаць — сэрца просіць,
Як дзядам, бацькам жылося.
Хаіі старыя на змярканні
Вам раскажуць аб паданнях,
Як сахой даўнеі аралі,
Як смыком зямлю бырлялі,
Як з сявалкі збожжа зерні
Рассявалі чорнай жменяй.
І як поле з каласамі
Сажыналі ўсё сярпамі.
Як, на ток прывёзшы, білі —
Так цапамі малацілі,
А пасля — круцілі ў жорнах,
Каб займець хоць бохан чорны...

## II

Трэба ведаць... Каб не згінуць,
Будавалі як хаціну.
Трэба гнуціся ў тры столкі,
Каб займець бярвенняў колькі,
І пакорчыцца без меры,
Каб узвесці зруб сякерай,
Ну, а стрэшку, як вядома,
Зладзіць з жытняе саломы,
Столь зрабіць з жардзя яліны,
А падлогі — проста з гліны,
А на зімку ледзяную
Печ паставіць,
                    хоць курную,
І на свет адкрыць акенца
Хоць на тры якія шкельцы.

## III

Трэба ведаць... Гэта важна
І якой была ў нас лазня:
Цёмнай, быццам сутарэнне.

Печ лажылася з камення,
А палочак — з дошчак збіты,
З дубу — доўгае карыта.
Камяні ж у печку клалі,
Да чырвоных награвалі,
А ў ваду,
як іх пускалі,—
Як пяруп тоіі, грукаталі,
На палку ж, пу хто як можа,
Біўся венікам з бярозы,
А пасля, найбольш дзябёлы,
Асвяжаўся ў снезе голы.

IV

Трэба ведаць... Што зазналі,
Як на пана працавалі
Парабкі — жанкі, мужчыны,
Дзень пры дні згіналі спіны.
Вольных не было нікога —
Ад старога да малога.
Нас, нявольнікаў-вяскоўцаў,
Пан не гладзіў па галоўцы,
За маленькую патрэбу
Адрабіць было нам трэба —
І за грыб, і за чарніцы,
За бярно з якой сушыцы,
І за лыкі, і за дровы,
І за пашу для каровы.

V

Трэба ведаць... і пра тое,
Апраналі што? Якое?..
Ды са зрэб'я нагавіцы,
І сарочкі, і спадніцы,
Світку — ад дажджу схавацца,
І кажух — гадоў на дваццаць...
Ну, а ў вошта абувацца?
Гэта, як вядома, ў лапці,
Што з вяровак, пенькавыя,
А найбольш у лазавыя,
Ну, а боты абувалі —

На жыццё іх раз спраўлялі.
Шапку з зайца — на марозы,
А на лета — хто што можа...

VI

Трэба ведаць... Як калісьці
Бедны люд імкнуў да выйсця,
Пра ягоныя клапоты
Цемры збавіцца, прыгнёту,
Як на пана паўставалі,
Косы і калы́ ўздымалі,
А спаймаўшы, злосна білі,
Як палац яго палілі...
Помста ж гэтая вякамі
Ледзь гарэла агенькамі...
Да агульнага ж паўстання
Не хапала ўсім яднання,
І рабочай мужнай сталі,
І сцягоў, што ўдалеч звалі...

VII

Трэба ведаць... Пакаленням,
Як узняў народы Ленін,
Як, ім цемру асвятліўшы,
Нашу партыю стварыўшы,
У яднанні мужным, братнім
Іх павёў на бой астатні —
Знішчыць лад жыцця старога...
Як заззяла перамога,
Як з'яднаў сялян, рабочых,
Як раскрыў усім ён вочы:
Дзе мана,
                дзе праўда свеціць,
Як належыць жыць на свеце...
Ды нялёгкія дарогі
Аж да поўнай перамогі.

VIII

Трэба ведаць... Пра народа
Неўмiручыя паходы
Супраць зграі белапанскай

У вайне, у грамадзянскай,
Як Дзянікіна разбілі,
Як Пілсудскага крышылі,
Як змялі Махно, Пятлюру
Нестрыманай вольнай бурай,
Як звялі да скону зграі —
Чорт жа ўсіх пералічае...
Нашым — выпала памерці,
Леглі з Леніным у сэрцы.
Хоць жыцця не шкадавалі,
Ды свабоду адстаялі.

## IX

Трэба ведаць... І заўсёды.
Як узводзілі заводы,
Як у вёсцы бурным часам
Будаваліся калгасы,
Як з варотаў на заводзе
Першы трактар наш выходзіў
На бясконцае бязмежжа
І на полі нішчыў межы.
Нішчыў межы між шнурамі,
Нішчыў межы між людзямі.
Як было нялёгка ў сёлах
Будавацца клубам, школам,
Як пад зоркай пяцікутнай
Уздымаўся край магутны!

## X

Трэба ведаць... Мы павінны
Заўжды помніць аб Айчыннай,
Хіба хто калісьці можа,
Каб запамятаваць слёзы,
Кроў бязвінных немаўлятак
І пакуты нашых матак.
Як сябе не шкадавалі,
Мужна ворагаў каралі
За свой родны край аддана
І байцы і партызаны,
Як знішчалі лютых гадаў

І на фронце і ў засадах —
Непахіснаю рукою,
Усёй савецкаю сям'ёю!

## XI

Трэба ведаць... Чуйна, дбала,
Як з руін усё ўставала,
Як раслі на месцы голым
Гарады і нашы сёлы:
Цэглу на плячах насілі,
Зерне кожнае лічылі,
Сёстры, маткі спіны гнулі,
На сабе плугі цягнулі...
Нам браты дапамагалі,
Сілу зноўку мы прыдбалі,
Працаю яе займелі.
Беларусь расла, мацнела,
Стала дужай і прыгожай,
Ганарыцца ёю можам!

## XII

Трэба ведаць... Ўсенародна
Нам аб партыі, аб роднай,
Што вяла заўжды наперад
З моцнай сілай, моцнай верай,
Вольным і нялёгкім часам
Нас па ленінскіх наказах,
Як, разбіўшы ўсе напасці,
Прывяла народ да шчасця,
Узняла наш сцяг чырвоны
На сусвет увесь сягоння!
Скрозь, дзе люд за волю б'ецца,
Да яго душой хінецца,
Мы ж нясём свой сцяг высока
З нашай любасцю глыбокай!

* * *

Бывае, хтосьці запытае,
Між гор і пальмаў, ну аб тым,
Твой край завошта паважаюць,
Ну, Беларусь адметна чым?

Кажу: — Якія ў нас адзнакі —
Палеткі, луг, азёры, бор...
І гор няма ў нас аніякіх —
Ды людзі ёсць — вышэй ад гор!

## ЗА ВАС МЫ РАДЫ, МАЛАДЫЯ...

За вас мы рады, маладыя,
За ваш узлёт, размах і план,
На жаль жа, ёсць яшчэ такія,
Што ўсіх узводзяць толькі ў зман.

Ані турботаў, ні клапотаў,
Ані жадання шлях знайсці —
Глыбакадумныя на фота,
Пустапарожнія ў жыцці.

# НАСТРОЙ

Даўно,
Юначаю парою —
Не сумаваць даваў зарок,
А ўсё залежыць ад настрою —
Самапачуцце, слых і зрок.

Ідзеш дадому
Зухаваты,
Ці думы горкія гнятуць —
Здавалася, што вокны хаты
Альбо слязяцца ці пяюць.

Калі
Нам не хапала хлеба,
Ды хтосьці памагаў з людзей,
Здавалася, што нават неба
Было цямнейшым ці святлей.

Пачуцці,
гледзячы якія,—
Сугучна птушкі ім пяюць,
І нават кветкі палявыя
У розных колерах цвітуць.

Было —
З усходу да заходу
Ўвесь дзень журботна праміне...
Ды толькі любая заўсёды
Была прыгожай для мяне.

* * *

Палі, лугі, гаі, разлогі,
Бор над Бярозаю-ракой —
Ах, колькі бачыла дарога,
Сягоння крочу па якой.

Іду па ценях продкаў наскіх,
Свой цень за імі ўдаль вяду,
Іду я па легендах, казках,
Па песнях вечнасці іду.

Іду, нібы ўзлятаю ў неба,
Ды азіраюся назад —
Ці ўсё я ўзяў ад іх, што трэба,
А можа, сам чаго не варт?

Ды марай цешуся такою,
Што супакойвае мяне,
Што нехта пойдзе ўслед за мною
І, можа, добра памяне?

## КАЛІ Б НАНОВА ПАЧЫНАЦЬ...

Калі б нанова пачынаць
Ісці ў далёкую дарогу,
Калі б з сабою выбіраць
Спакой душы альбо трывогу,—
Трывогу б я узяў з сабой,
Знайшоў бы новае я з ёй.

Калі б нанова пачынаць
Ісці ў далёкую дарогу
І зноў бяду перамагаць...
Каго б я выбраў на падмогу —
Не падкіх да прыгожых слоў,
Няхай маўклівых, ды сяброў.

Калі б нанова пачынаць
Ісці ў далёкую дарогу
І зноў юнацтвам красаваць,
Каго б пазваў з найлепшых, многіх —
Відаць, ўсё тую ж, што пазнаў,
Як першы раз я пакахаў.

## А МЫ РАСЦЁМ!

Хацелі звесці нас да скону
Ці мала розных там пачвар —
Усе, каго наш сцяг чырвоны
Кідаў то ў холад, а то ў жар.

Мапой, брудотай распіналі,
З усіх падваліпчаў гулі,
Раўлі на свет, што мы канаді...
А мы раслі,
А мы раслі!

Крычалі з кожнай падваротні,
Што гіне кожны наш завод,
А мы ўздымаліся на сотні,
На тысячы вышэй штогод.

Крычалі стуль, з чужацкай далі,
Што ледзьве мы без іх жылі,
Труну заўчасна рыхтавалі...
А мы раслі,
А мы раслі!

Крычалі злыдні — гіне глеба,
Што мы не зладзілі з сялом,
Прыйшоў калгас, не будзе хлеба
І што мы з голаду памром.

Не здасць мужык сваёй палоскі,
Не аб'яднаць усёй зямлі,
Крычалі — нас загубіць вёска...
А мы раслі,
А мы раслі!

Крычалі ў час вайны агністы,
Жадаючы сваё сустрэць,
Што пераможуць нас фашысты,
Што будзе нам усім канец.

Мы ж рук пакорліва не склалі,
Хоць шмат крыві і пралілі,
А ворагаў перамагалі,
Да новых перамог
Ішлі!

А час ішоў. Тады іначай
Свайго хацелася здабыць,
Калі не здолелі гарачай,
Вайной халодпаю скарыць.

Але нікому не скарыўся
Наш родны, светлы, любы дом,
Мы выраслі і ўшыр і ўвысі,
І мы расцём,
І мы расцём!

## РОЗДУМ

Жыццё і лашчыла і секла,
Кідала ўвысь і на глыжы —
Я сам сабе і раї і пекла
Рабіў пазменна для душы.

Не тая радасць, што спрасонку,
А тая, здолеў што прыдбаць,
Не тая боль, што бачна звонку,
А боль, што людзям не відаць,—

Што і зрабіў, здаецца, мала,
Што і дарэмна дзень пражыў
І што сябе недасканалым
У шмат паробленым лічыў.

Жыццё ж мінае рана-рана,
Нядаўна цвіў, а стаў сівым,
І я зрабіўся ветэранам,
Хоць быць імкнуўся маладым.

Было ў жыцці нямала тлуму,
Жыцця ж наноў не пачынаць —
І шмат няздзейсненых задумаў
З сабою выпадзе забраць.

## ПРАВАДЫ

Вісяць між гор, вісяць між скалаў,
Гудуць між стэпаў і бароў.
Як нагляджу, дык іх нямала,
Па-над зямлёю правадоў.

І ў позні час, і рана-рана,
І ў цішыню, і між віхроў —
Нясуць святло, цяпло старанна,
Людзей яднаюць для размоў.

Вось гэта — поступ веку значны,
Ды прычакаем шмат чаго,
А колькі правадоў нябачных
Ідзе ад сэрца, ад майго.

Каб людзям кроплю хоць малую
Свайго святла, цяпла аддаць...
І вельмі, вельмі я сумую,
Калі адказу не чуваць!

## КАЛІ ТАБЕ БЫВАЕ СУМНА...

Калі табе бывае сумна,
дык ты не падаї у адчай.
Ты паглядзі, які вясёлы
паміж узгоркамі ручай,—
Усё раскрыта, што ён мае,
уся краса ажно да дна,
А ты паслухай, ты паслухай,
а што за срэбра-гамана!

Калі табе бывае сумна,
дык ты не вешай галавы,
Ты паглядзі на сенажаці,
на колер кветак і травы,
А што за кветкі, што за кветкі,
у кожнай свой адменны твар,
А што за пах, калі адчуеш,—
у сэрцы ўзнімецца пажар!

Калі табе бывае сумна,
не выклікай пакутных слёз,
А ты прыгледзься, ты прыгледзься
да стану тоненькіх бяроз —
Плывуць у свет, што ні галіна,
дык па зялёнаму вяслу,
І кожны ліст
нібы спявае жыццю падзяку і хвалу!

## ЛЮДСКОЙ УВАГАЙ МЫ САГРЭТЫ...

Гляджу на шуструю дзяўчыну,
На бляск вачэй, ружовасць шчок,
Што за прылаўкам магазіна,
Як быццам белы матылёк.

Нялёгка ёй, скажу вам шчыра,
Майстэрства гэткае прыдбаць,
Каб і з навалкам масла й сыру
Кавалачак усмешкі даць.

Правесці ўважна час рабочы
І заўжды ветліваю быць,
Каб на прыдзірлівасці змоўчыць,
Яшчэ параіць, што набыць.

Людской увагай мы сагрэты,
Ім словы ўдзячнасці ў адказ.
Усіх уславілі паэты,
Майстроў прылаўка славіць час!

## ДУМА ПРА ВЕРУ ХАРУЖУЮ

Шлях твой нялёгкі
Не ўсыпаны ружамі,
Вера Харужая,
Вера Харужая!

Часта ж юнацтва
Ззяла вясёлкаю,
Ах жа, якой ты
Была камсамолкаю!

Прагнай да ведаў,
Працай упартая,
Любай дачкою
Была ты ў партыі.

Партыя стрэла —
Сэрцам аддануго,
З ёй пажыццёва
Лёсам звязаную.

Партыя сілу
Дзеўчыны змерыла,
Ёй найадказную
Справу даверыла.

Веры ій хацелася,
З горам нязгодпаю,
Біцца ў падполлі
За волю народную.

Колькі ў заводах
На роздум наводзіла,
Колькі прыгнечаных
Вёсак праходзіла —

Скрозь пакідаючы
Снягаў праменьчыкі,

Што распаляліся,
Быццам агеньчыкі.

І найхаробрая,
І асцярожная...
Ды не мінулася
Брама астрожная.

Зведала голад,
Карцэр са сцюжаю —
Вера Харужая,
Вера Харужая.

Ды не скарылася,
Не залякалася
І цераз краты
Мужна змагалася.

Гордай, нязломнай
Была камуністкаю,
Пісьмы на волю
Слала агністыя.

Межаў не зналі
Словы крылатыя —
Крупскай глыбока
Сэрцам прынятыя.

Ведала, слова
Шмат каго здружа з ёй —
Вера Харужая,
Вера Харужая!

Час жа мінае...
Бывае, зынячыцца,
Выпала шчасце
З воляй пабачыцца.

Зноў да Радзімы
Яна прытулілася,
Ах, як дзяўчыніна
Сэрцайка білася.

А як пабачыла,
Ажно здзівілася —

Тое, пра вошта
За кратамі сніласся.

Горад узнесены,
Вёскі зялёныя.
Скрозь пераможныя
Сцягі чырвоныя.

Людзі сардэчныя
І гамапцлівыя,
Твары вясёлыя,
Твары шчаслівыя.

Быццам на кожным
Сонейка свеціцца...
Толькі нядоўга
Выпала цешыцца.

Цешыцца родным,
Тым, пра што марыла,
З захаду злосная
Зграя ударыла.

Зноўку на бойку
З нягодаю рушыла —
Вера Харужая,
Вера Харужая!

І каб Радзіма
Ў няволі не згінула —
І немаўлятка
З болем пакінула.

Трэба быць пільнай
І найсмялейшаю,
Зноўку падполле —
І найцяжэйшае.

Вораг бязлітасны,
Злосцю ашчэраны,
Віцебск, ты помніш
Подзвігі Верыны!

Скуль яна, сіла
Нястомная, бралася,

Віцебск, ты помніш,
Як Вера змагалася?

Вечнай любоўю
Да мужнае туліцца —
Кожная плошча,
Кожная вуліца.

Віцебск, ты помніш
Яе, палымяную,
І хоць загінула —
Закатаванаю —

Ворага нішчыла,
Ворага здужала —
Вера Харужая,
Вера Харужая!

## НАС РЭВАЛЮЦЫЯ ЎЗБУДЗІЛА

Змагаліся мы колькі сілы
За шчасце свету і дабро,
Нас Рэвалюцыя ўзбудзіла
І пасадзіла за пяро.
Нас шмат у час той пачыналі,
Сардэчных слоў чакаў народ,
А з нас, між іншым, жартавалі:
— Міхась Чарот, а з ім пяцьсот.
І я хадзіў у пяцісотцы,
Нямала й перайшоў дарог,
І я — у першай пяцігодцы
Трубіў па цэхах так, як мог.
І я на сходках, на вясковых,
Махрой закураны не раз,
Зарыфмаваным хутка словам
Агітаваў ісці ў калгас.
Хоць невялікія прамоўцы,
Ды вершамі да сэрца йшлі,
Былі мы ўсе маладнякоўцы
І шмат каго з сабой вялі.
Нам не здавалася цяжкою
Перабудова часам тым,
Бо ўсё, што нова, маладое
Было нам родным, дарагім,
Нас білі ў грудзі грозна хвалі,
Жаданне ж іх прайсці расло,
Жыццё мы весці спрабавалі,
А нас усіх жыццё вяло!

## МАТОРНЫ ВЕК

Маторны век.
Мы так гаворым —
Пасля шнурка, сахі пасля,
Пасля — як з першага матора
Нібы прачнулася зямля.

А сёння —
Стала ўжо звычайным,
Што поле трактар перайшоў,
Што даўгашыйныя камбайны
Плывуць між хваляў каласоў.

Што зерне спелае
Адразу
Злятае з іх, бы ў ручаях,
А, ручаі сабраўшы, МАЗы
Гудуць па жнівеньскіх шляхах.

## АХ, ДРЭВЫ, ДРЭВЫ...

Ах, дрэвы, дрэвы,
Я ў здзіўленні,
Адкрыйце тайну мне адну —
Як разнамоднае адзенне
Пашыта толькі за вясну?..

Сукенак шум —
У лісці чыстым
І ў ззяні кветачак, як зор,
А крой буйны, бо ігальчасты,
А што за формы, што за ўзор?..

Гляджу на вас
І сэрцам рады,
Што шмат цудоўнага пазнаў.
Відаць, мастак гадоў мільярды
На ўборы дзіўныя аддаў.

## НЯЛЁГКАЯ ДАРОГА

Хто сёння ў свеце вершы ўзважыць,
Выходзіць новаму цяжэй.
Паэт! Збірай на воз паклажу,
Кладзі, як можна, найвышэй.

Складай радкамі дбайна, зграбна,
А трэба, дык і ўразнабой...
Ды каб усё было прывабна
І ўсіх здзіўляла навізной.

Паэту трэба везці многа
І раздаваць сваё вакол,
Яму нялёгкая дарога —
А то на ўзгорак, то на дол.

Ласкавых стрэне й неласкавых,
Яму ж да сэрца ўсё бяры,
Не захапляючыся славай,
Сатканай толькі з мішуры.

То стрэне тых, што падпрагуцца,
Пасобяць воз увысь цягнуць,
Але й такіх, што паімкнуцца,
Каб воз паэта абярнуць.

Ды ўсё ж яго пад родным небам
Прытуліць заўжды родны дом,
І ехаць трэба, трэба, трэба,
Хай дождж,
хай золь,
хай град,
хай гром!..

## СЯДЗЯЦЬ САЛДАТЫ ЛЯ КАСТРА...

Нямала год прайшло з вайны,
А дні бягуць, а дні бягуць,
Байцы былыя пры агні
Сядзяць і гутарку вядуць.

А промні восеньскай зары
На тварах іх, немаладых —
Сядзяць, як быццам пры кастры
У франтавы прыпынак іх.

Гудуць аб пройдзеных шляхах,
Як жыў нялёгка наш салдат,
І бульба ў цёплых іх руках,
Не грушы жудасных гранат.

Старэйшы баявым сябрам
Пра год дваццаты ўспамінаў,
Глядзіш, нібы Будзённы сам,
Ён вусы горда распраўляў.

Здавалася, ён узляціць,
Як той арол супроць гайні,
Было не цяжка і ўявіць
Яго на ўзмыленым кані.

Другі аб тым апавядаў,
Як у Айчынную хадзіў,
Як маршал Жукаў адзначаў
Яго і Славу прышпіліў.

Другая Слава, што адзін
Браў языка за рэчкай Прут,
А трэцяя, дык за Берлін,
Калі быў Гітлеру капут.

Успаміналі дым дарог,
Руіны сёл і горач ран...

А як між іх прамоўчаць мог
Сын грозных пушчаў — партызан.

Што ледзь не першаю рукой
У Дзядзькі Косці знаўся ён,
Скідаў не раз часінай той
За эшалонам эшалон.

Што раз крывёю так сышоў,
Быў ля магілы на краю,
Ды з першымі у Мінск прыйшоў —
Сталіцу вызваліў сваю.

Гаворка йшла. Яе цяпло
Іх саграважа, як вясна.
І тое, з імі што было,—
Святая праўда, не мана.

Шумеў ім згодна бор здалёк,
Ручай спагадна гаварыў,
І светлы ад кастра дымок,
Як дань салдацкай славе, плыў...

## ЖАДАННІ

Мы ўсе чагосьці зноў жадаем:
Вось каб узяў, памаладзеў,
Каб сіл з'явілася без краю,
Ну, што б я вытварыць хацеў?

У асалоду, без прынукі,
Было б найлепей гэта так,
Каб мне адно — кіёк у рукі,
На плечы рэчавы рукзак.

Каб стрэцца з месцінамі тымі,
Дзе шмат нязведаных шляхоў,
Раней за ўсё сваёй Радзімы
Куточак кожны б абышоў.

Як аднаму і ў добрай хаце
Малы, малы куточак свой,
Прастор — усё маё багацце,
Маё натхненне, воблік мой.

Хадзіў бы я сабе паволі,
З людзьмі памарыш, папяеш...
Красы пазнаў бы значна болей,
Ды і сяброў, відаць, не менш!

## НЕ ВЕР...

Такі спрадвек закон прыроды —
У поўдні цень найкарацей,
А дзень хінецца да заходу
І цень, што міг,— усё даўжэй.

Няйпачай, волат вырастае,
Не менш вярсты да галавы,
І кожны крок пераступае
Так лёгка рэчкі і равы.

Мінаеш нівы, агароды,
Імпэту не спыніць твайго,
Здаецца, лес не перашкода,
А крок — праскочыш і яго.

Ды не ўпівайся асалодай,
Дарма, што гэтак кажа зрок,
Не вер ты ценю прад заходам,
Твой не такі магутны крок!

## МІНУТА МАЎЧАННЯ

Мінута маўчання.
Жалоба ў краіне.
Маўчу я,
А думак нівошта не спыніць —
Перажытымі
Імчацца шляхамі,
Лятуць між траншэяў,
Лятуць пад баямі,
Лятуць па-над стэпам,
Лятуць над барамі,
Лятуць у паветры,
Лятуць над марамі,
Туды,
Дзе палеглі навечна героі,
Вяртаюцца ж думкі,
Набракшы крывёю...
Краіна ў маўчанні
Ад краю да краю...
Маўчу я.
І ўпотай слязу выціраю.

## ВІДАЦЬ ЖАДАНАГА АБРЫСЫ...

Відаць Жаданага абрысы,
Яго і веліч і абсяг,
І я імкнуся ў гэты высі
Пад пяцігодак буйны ўзмах.

Ад вузкіх піў, ад хмурных хатак,
Ад шэрых саламяных стрэх
І я ішоў хадой упартай
Штогод з паверха на паверх.

Расла вялікая краіна
А ўсё яскравей і шпарчэй.
І я, дзе мог, лажыў цагліну,
Каб уздымалася вышэй.

І я ў сям'і сяброў, сябровак
Спяваў пра ўзлёт, як толькі мог,
І набірала сілу слова
Між новаўзведзеных дарог.

## І ЎДЗЕНЬ І ЎНОЧЫ...

Удзень, і ўночы, й на світанку
Я з ёй, мне воч не адарваць —
Ну, з чым, скажы, з якой каханкай
Магу я кніжку параўнаць?

У час любы я з ёю мару,
Яе сяброўкаю заву —
У вершах, прозе, мемуарах
Я разам з аўтарам жыву.

І я, апрануты па модзе,
Ў крылатцы, як у часе тым,
Кахаю тых, што ўжо стагоддзі
Спавіты моракам начным.

На мастакоў малюся рукі,
На цуд, што тavailable разьбяры,
І з карыфеямі навукі
Згараю разам на кастры.

З героямі цяжкімі днямі,
Здаецца, разам я пабыў...
І засланіў усіх грудзямі,
Хто нас ад гора засланіў.

Я таямніцы спасцігаю,
Плыву за думамі, калі
У высь захмарную ўзлятаю,
Спазнаўшы глыбіню зямлі.

Калі ж няма — яе старанна
Шукаю, быццам сам не свой...
І ўжо ніхто, скажу я пэўна,
Не завалодаў так душой!

# СКЕПТЫК

У век стваральны, век наш мужны
Шукаю для сябе адказ —
Адкуль ён, скептык недалужны,
Адкуль з'явіўся паміж нас?

Глядзіць то злосна, то лісліва,
Спіну сагнуўшы да гарба,
А на спіне такая грыва,
Даўжэй, чым некалі ў папа.

І глянеш, дык здаецца штосьці,
Не вельмі розуму ў яго.
Ці ён нагледзеўся чагосьці,
Ці ён наслухаўся чаго?

Калі адказная між намі,
Бывае, гутарка ідзе,
То ён — нацепае плячамі,
А то рукамі развядзе...

Бывае, сэрца палымнее,
На тварах шчасце і святло,
А скептык крывіцца, хмурнее,
Як быццам зубы праняло.

Даводзіцца сябрыне дружнай
Нямала чуць яго абраз.
Адкуль жа, скептык недалужны,
Адкуль з'явіўся паміж нас?

Выдатнае, без лішніх сведак,
Бывае, зблэсніць усяляк,—
І тое быццам бы не гэтак,
І гэта быццам бы не так.

Адкуль ён, з логава якога
Сягоння вынырнуў такі?

Не, як вядома, не такога
Яго выводзілі бацькі.

Бо ганьба ён для іх і гора,
І крыўда грудзі ім пячэ,
Той сук, усеўся на каторым,
Ён сам бязлітасна сячэ.

А што рабіць, яго спаткаўшы,
З агідай, можа, абысці?..
Лепш скалануць,
За грыву ўзяўшы,
Каб зразумеў ён, з кім ісці!

## ЁН ДЛЯ МЯНЕ АДНОЙ

Усе, як ёсць,
Усе ў калгасе
Не захапляюцца Панасам,
　А ў Зосі песенька другая —
　А я яго...
　А я кахаю.

Сяброўкі
Здзекуюцца проста:
Які малы,
Не выйшаў ростам.
　А ў Зосі песенька другая —
　А я яго...
　А я кахаю.

Жартуюць
З хлопца камбайнёры:
Пастух —
Для маладога сорам!
　А ў Зосі песенька другая —
　А я яго...
　А я кахаю.

Ёй зычыць маці
Быць шчаслівай,
Занадта ж хлопец твой
Маўклівы.
　А ў Зосі песенька другая —
　А я яго...
　А я кахаю.

Не выйшаў ён,
Сяло гаворыць,—
Ні ў спевакі,
Ані ў танцоры.
　А ў Зосі песенька другая —
　Ён для мяне адной
　Спявае!

## ХІРУРГІЯ

*Праф. М. М. Маліноўскаму*

Добрае сэрца,
Вострыя вочы.
Рукі-праходцы,
Сталлю літыя.
Зноўку з усімі
Мару і крочу,
Зноўку я слаўлю
Цябе, хірургія.
Твой твар задуменны
Мусіць схіліцца.
Я прад табой
Распасцёрты, вядома,
Ты нада мною,
Як некалі рыцар,
Перад атакаю
Ў белым шаломе.
Майстра ты зброі
Сваёй легендарнай,
Простай,
Што ў бойку рашуча ўступае,
І ты нагадаў мне сабой
Камандарма.
Хай што —
Плацдарма плошча малая.
Ты вынаходца,
Хай у наш век
Розных машын
Панавыйдзена мноства.
Я чалавек,
Я чалавек,
Значна складаней іх першародствам.
Часам ты хмура
·Хілішся долу.
Нейкай хвілінаю
Здашся суровым...
Рады я —
Ўбачыў пробліск вясёлы —
Значыць, я зноўку
Буду здаровым!

## ЗНАК ЯКАСЦІ

Давайце ж працаваць як след,
Як ленінскія дзеці,
Каб ад цвіка аж да ракет
Было найлепш у свеце!

І я хачу па Ільічу
Быць якасна найлепшым,
І, новы дзень сустрэўшы,
І я хачу, і я хачу
Пісаць такія вершы —

Каб рос іх жар,
Прасцяг і ўзлёт,
Каб кожны працу славіў,
Каб ім народ, каб ім народ
Знак якасці паставіў!

## ЗАЎЖДЫ ВЫ З НАМІ

Падпольшчыкі!
Я сэрцам плачу,
Што вас жывымі не знайду,
Хоць скрозь па Мінску ўсюды бачу,
Калі па вуліцах іду.
Бо вы
Для новых пакаленняў,
Скарыўшы злосную гайню,
Не засталіся ў сутарэннях,
А усе ўзняліся ў вышыню.
Вас бачыць —
Радуецца вока —
На новых месцах зноў і зноў,
Сярод паверхаў і высокіх
Заводаў, фабрык і дамоў.
І хоць
З астатняе дарогі
Ваш след калісьці знік для нас,
На знанай плошчы Перамогі —
Ля самай зоркі бачым вас!
Наш край
Не ганьбяць акупанты.
Вас, мужных, бачыць наш пагляд
Па-над сцягамі дэманстрантаў
У час усенародных свят.
Гады праходзяць
За гадамі,
Штогод мы вышаў у жыцці.
Падпольшчыкі,
Заўжды вы з намі,
А з вамі лёгка нам ісці!

# ЧАТЫРЫ ШТЫКІ НАД МІНСКАМ

Славы курган,
На ім на вякі
Ззяюць здалёку,
Ззяюць і зблізку —
Чатыры штыкі,
Чатыры штыкі,
Чатыры штыкі над Мінскам.
Помніць народ,
Помніць пра тых,
Хто заслужыў
Яго ласку —
Чатыры штыкі —
Чатыры франты,
Быў востры і штык партызанскі.
У год перамог,
Чэз у які
Чорны прыгнёт
Акупанцкі,
Чатыры штыкі —
Чатыры рукі
Мінск абнялі па-брацку.
Славяць наш Мінск
Вершаў радкі,
Песнямі славяць сваімі
Чатыры штыкі,
Чатыры штыкі
І яснае неба над імі!

* * *

Калі руку на развітанне
Дала ты ў нашу маладосць,
Я зразумеў, што і ў каханні
Не толькі шчасце, гора ёсць...

Рука спачатку сагравала,
І ў сэрцы цеплыня расла,
Яна ўздымала і ўскрыляла,
Надзеяй светлаю была.

Пачуў жа — адчуванне стыла,
І ўсхваляваўся нездарма,
А што ты ў гэты час рабіла,
Ты добра ведаеш сама.

Ну што ж, канца няма, вядома,
Відаць, яго й не будзе, не!..
Ты аддала руку другому,
Адны пакуты толькі мне.

## КАЛІ ГУБЛЯЕ ЛЕТА СІЛУ...

Калі губляе лета сілу,
Пачатак восені люблю —
Яшчэ і рунь ледзь-ледзь прабіла,
Нібы іголкамі, зямлю.

Яшчэ зялёны ліст дубовы
І не надумаў медзянець,
А ўжо шпакі вядуць размовы
Кудысьці ўдалеч адляцець.

Бабры свае майструюць норкі,
Мацуюць спрытна берагі,
І звонка цокаюць ваверкі,
Як падлічаюць арахі.

У гэткі час, засумаваўшы,
Нібы спускаешся з гары,
Калі і сам, усё сабраўшы,
На схіле восеньскай пары.

## ПРАЖЫТА МНОЙ УЖО БАГАТА...

Пражыта мпой ужо багата,
Гадоў сабраўся поўны кош,
Куды ні глянеш — даты, даты,
І з кожным годам усё больш.
І мне ўжо дата замільгала...
Я ж у кругу салідных дат,
Хачу быць простым, як салдат,
Якому шмат да генерала.
Хачу ісці ў шарэнзе роўнай
Не абы-як, а каб найлепш,
І ў роднай арміі працоўнай
За рубяжамі браць рубеж,
Каб мы прыгнёт людзей скарылі,
Каб скрозь прыйшоў яму капец,
Каб мне, хоць зрэдку, гаварылі
Так, як салдату: — Маладзец!

## А ТЫ ВЫШЭЙ, ШЫРЭЙ, ГЛЫБЕЙ!..

Першастварэнне свету
дорыць
Вышыні даўняй пекнаты,
А ты вышэй за дзіва-горы —
Яны не думаюць, як ты!

Разбег у хваляў нястрыманы,
Не змераць іхняй шыраты,
А ты шырэй за акіяны —
Яны не думаюць, як ты!

Вада з глыбінь зямлі бруіцца,
Прабіўшы дужыя пласты,
А ты глыбей за ўсе крыніцы —
Яны не думаюць, як ты!..

## У НЕБА ГРУКАЕ ЗІМА...

Ужо мароз. Цяпла няма.
І дрэвы злубянелыя.
У неба грукае зіма...
Ну, пачакай ты, белая!

Табе з мятлюгаю абы
Па шыры мчаць заснежапай,
Яшчэ ж не ўсе прыйшлі грыбы,
Не ўсё і з поля звезена.

І журавіны на імху
Не ўсе яшчэ сабраныя,
Ну, пачакай жа ты крыху,
Прыходзь пазней жаданаю!

Прыходзь жа не суроваю
Ты з поўначы далёкае —
Іскрыстаю, пуховаю,
Прыходзь чырванашчокаю!

І каб не толькі халады,
А каб сняжынкі слаліся,
Ды каб і дзеці і дзяды
На санках з горак мчаліся.

Каб на азёрах ледзяных,
Як соты, лункі біліся,
Пенсіянерам каб на іх
Яршы спарней лавіліся.

Каб маладыя ўсе былі
Прыгожымі, шчаслівымі,
Каб распісалі лес, палі
Скрозь лыжамі імклівымі.

Каб птушку, нават і адну,
Не бачыць замярзаючай,
Каб сустракала ты вясну,
Сама прад ёю таючы!

## СІНОПТЫКАМ

Дзяды па святах надлічалі,
Па зімніх днях маглі гадаць,
Па іх, калісьці нам казалі,
Якіх надвор'я змен чакаць.

Для іх прыкметай бездакорнай
Карова вечарам была,
Якой, чырвонаю ці чорнай,
Што з пашы першаю ішла.

Як сонца села на змярканні,
А як той месяц выглядаў,
А ці была раса пад ранне,
А як той певень праспяваў.

Ды ўсё ж распазнавалі мала
Сваёю варажбой тады,
Калі ж траплялa — супадала,
Бароды гладзілі дзяды.

Сіноптыкі! Вы знаўцы свету,
Навукі ўсе вам сказ вядуць,
Не для таго гаворка гэта,
Каб вас чым-небудзь упікнуць.

У нас і сумнівы не ўзніклі,
Каб вам зусім не давяраць,
І нездарма штодня прывыклі
Мы вашы весціны чакаць.

Не ў тым, як апрануцца, справа,
А ў новы век, у новы час,
Ад краю ў краі — уся дзяржава
Чакае пэўнага ад вас.

Як разгарнуць усе работы,
Як са здабычаї нетраў быць,

А як трымацца самалётам,
А як і сеяць і касіць.

Як на шляхах ісці машынам,
А як трымацца караблям,
А што ж, і ведаць мы павінны,
Як апранацца варта нам.

Мы ганарымся сёння вамі,
Вы наш нагодны вартавы,
Ды, што граха таіць, часамі
Міжволі маніце і вы.

Цяпла чакаеш — дождж лупцуе,
Дажджу — а спёка, як найгорш,
У белым выйдзеш — спаласуе
Цябе такі нястрымны дождж.

А калі ў полі шмат багацця
Не ўдасца нам сабраць як след...
Мы вас адных не вінавацім,
Стыхія ўпартая — Сусвет.

І сярод вас растуць героі,
У вашых ведах — маладосць!
Мы цвёрда верым, прыйдзе тое,
Што будзе пэўна ўсё, як ёсць!

## І ТАК МНЕ РАДАСНА ІСЦІ...

Прыгожае жыццё я маю.
Іду здаўна ў далёкі шлях,
Жыву
І заўжды адчуваю,
Што дзеецца ў маіх грудзях.

То ціш такая,
Лепш не трэба,
То раптам забаліць сто ран,
То ў іх бязвоблачнае неба,
То раптам — выбухне вулкан.

Ды раптам
Зменяцца палеткі,
Зазелянее, як вясной,
І закрасуюць буйна кветкі
З вясёлкаю над галавой.

Гляджу я —
Удалеч крочаць людзі,
І шмат нязнанага ў жыцці,
І вецер — так асвежыць грудзі,
І так мне радасна ісці!

## СМАГА

Смага, смага,
Ты паслухай, ты паслухай —
У жыцці якой бывае,
не ад палу, не ад сонца,—
Смага, смага —
Бачу Брэст, паўзуць да Буга,
Пад шрапнельнай завірухай,
ледзь жывыя абаронцы.
Смага, смага,
Сіл набрацца —
так жадаецца героям,
Не пусціць далей злачынцаў,
каб закрыць сабой дарогі,
Смага, смага,
Біць нянчадна катаў з чорнаю душою,
Што нясуць народу рабства,
смага міру й перамогі.
Смага, смага,
Смага высі, смага ў неба уздымацца,
Ты яе спыніць не можаш,
толькі марамі, ніколі —
Смага, смага —
Хочуць рукі, хочуць плечы
моцнай працы,
Ты яе пазбыцца можаш —
толькі плённа, толькі ўволю.
Смага, смага —
Да кахання,
яно ж прыйдзе, і не ўбачыш,
Толькі гэта невядома,
а ці ўвечар, а ці ўранак,
Смага, смага —
Ні віном, ані вадою
ты такое не пагасіш,
Бо на гэта сілу маюць —
толькі вусны у каханак.

## «БУРЖУЙКА»

Як маладосць сваю прыпомню,
Дык, ідучы насустрач дням,
Быў я ў буржуйку улюбёны...
Я прызнаюся шчыра вам.

Меў ад яе пяшчот нямала,
Ажно да сэрца йшло цяпло.
Ах, як жа моцна саграваля,
Калі сцюдзёна мне было.

Я да яе звяртаўся смела,
Сасной, бярозай частаваў,—
Буржуйка гэтак чырванела,
Што я ледзь з жару не згараў.

Давала мне настрой для працы,
Я ж да яе любоў адчуў,
Яе я ў панскія палацы,
Дзе валрэўком быў, прыцягнуў.

Прыходзілі сябры пагрэцца,
Ніхто з мяне тады не кпіў,
Што я адну буржуйку ў свеце
І па-сапраўднаму любіў.

## ЧЫМ БОЛЬШ ЖЫВУ...

Чым больш жыву, чым больш сталею,
Смялей мае лятункі мар,
І мне здаецца — разумею
Гамонку ветру, зор і хмар.
Мне змалку слухаць давялося
Як быццам голас іх жывы —
Гамонку дрэў, вады, калосся,
Гамонку лісця і травы.
Я слухаў ветру сказ напеўны
І грозны гул аж да зямлі,
Я слухаў гоман хмараў гнеўны,
Як заспрачаюцца калі.
Бы выхваляюцца тым часам,
Хто з іх мацней перакрычыць,
Пакуль пярун не сцішыць басам,
Не спудзіць бляскам бліскавіц.
Гамоніць жыта, быццам мора,
Гудзіць вакол: — Прыйдзі, сажні...
А ты прыслухайся, як зоры
Нібы пяюць у вышыні.
Вады ля млына гоман чую:
«Нялёгка жорны мне круціць».
Гамонку лісця дрэў такую
Аб тым, як ім даўжэй пражыць.
І гэта ўсё мне блізка, родна,
Нібы ад сэрца, ад майго —
І я з усімі імі згодны.
І мне б хацелася таго!

* * *

Гадоў нямала праляцела,
Калі між гор я тут хадзіў...
Эльбрус, Эльбрус,
А ты ўсё белы
І ты магутны, як і быў.

А мне гадоў мінулых замець
Прынесла рана белізну,
І ўсё ж
Мая хавае памяць —
Адну далёкую вясну.

Якой не стрэць, бо не пракрочыць
Ізноў юнацкія шляхі,
Ды сэрца ўсё ж —
Прабіцца хоча,
Нібы пралеска, праз снягі.

* * *

Скуль жа з'явілася ты —
з воблакаў, з чэрвеньскіх траў,
Можа, цябе й не было, толькі згадаў я, паэт,—
Дым валасоў тваіх мары мае спавіваў,
Вуснаў агонь працінаў, думаў, што спаліць нашчэнт.

Што гэта — ява ці сон, сам я не знаю, павер,
Толькі і сёння хачу — гэткае мусіла быць,
І, каб цябе не было, думаю так я цяпер,
Як найвышэйшую з мар, варта было б уявіць!

## КАЛІ З ТАБОЮ ШТО ЯКОЕ...

Калі з табою што якое,
Ты не хавай, ты не маўчы.
Але разваж душою сваёю
І ўсім аб горы не крычы.

Калі ты смуткам апавіта,
Калі ў душы тваёй адчай,
Ты лепш скажы мне шэптам жыта
Ці пазвані мне, як ручай.

Я ўсё, як трэба, зразумею
І цёплым ветрам адкажу,
Я пашкадую, я прыгрэю
І асушу тваю слязу.

## ЯШЧЭ РАЗ АБ ХЛЕБЕ...

Я помню, на пасту калі выпраўлялі,
Дык лустачку хлеба з сабою давалі.
Які ж ён быў смачны!
                                        Як сёння прыпомню —
Збіраў беражліва і крошкі з далоні.
Я помню,
                    як з хлебам выходзілі з дому,
Каб серп і каса не прысталі ад стомы.
Я помню.—
                    у кайстры буханкі складалі,
Калі навабранцаў у войска склікалі.
Я помню, дарылі і хлеба акрайцам,
Што грукаўся ў дзверы,
                                        галоднага старца.
Я помню хлеб горкі,
                                    з мякінай, з паловай
І сціплую пайку ў час грозны,
                                                вайсковы.
Я помню, як крошцы былі вельмі рады
Няшчасныя дзеці з пакут Ленінграда.
Калі ж я зняважаны хлеб дзе пабачу,
Дык вельмі балюча,
                                    я ледзьве не плачу.
Хто кінуў,
                    дык годнасць людскую ён страціў,
Абразіўшы гэтым зямлю, сваю маці.
Нанёс ёй, няўдзячны, глыбокую рану,
Я думаю, кім жа такі ўзгадаваны?!

## ЛЯСНАЯ ШКОЛА

Заместа сцен — дубы наўкола,
Сядзелі ж на замшэлых пнях...
Вось так жыла
Лясная школа —
У партызанскіх лагерах.

Настаўнікі былі байцамі.
У хвілю вольнае пары —
Лічыць вучылі жалудамі,
Пісаць — чарнілам, што з кары.

Пісаць на тым, хто знойдзе штосьці,
На тым, што мелася тады,
Дый выпадала на бяросце,
Бы ў старажытныя гады.

Калі ж трывогі покліч гучны
Гуў над лясною грамадой —
Ішлі настаўнікі і вучні,
Ішлі на ворага, на бой!

А пасля бою самавіта
Лічылі з радасцю, услых,
І колькі ворагаў забіта,
І колькі зброі ўзята ў іх.

Калі вярталіся з дарогі
Байцы у свой гасцінны двор,
У часе кожнай перамогі
Пеў урачыста школьны хор.

Давала тон гамонка дрэваў,
Найвыразнейшы — ў ветравей,
Адсутнічаў настаўнік спеваў,
Ім быў, вядома, салавей.

І хай у золь, і хай у сцюжу
Было нялёгка, і не раз,
Ды хор гучаў магутна, дужа,
Што перамогі блізкі час!

## КРАМЛЁЎСКІЯ ЗОРЫ

Стаю ў глыбокім задуменні,
Гляджу на зоры над Крамлём,
Што свету шлюць свае праменні,
Гараць рубінавым агнём.

Гляджу на іх, і мне здаецца,
Яны нам кажуць: жыць і жыць!..
І з імі зліты нашы сэрцы,
А марам дык няма мяжы —

Яны ў касмічным акіяне
Лятуць, дзе людзі не былі...
Калі і бачаць марсіяне,
Дык гэты зоры на зямлі.

## РАЗВІТАННЕ З ПАЎДНЁВЫМ СОНЦАМ

Радкамі ў радасным уздыме
Уславілі паэты Крым,
Люблю я сёння сонца Крыма,
Любіў жа болей маладым,—

Калі, з-за мора ўстаўшы, ранне
Абдыме ласкаю ўсяго,
Калі наперадзе чаканне
І сам не ведаеш чаго.

Калі, праменнямі забраны,
Не знаеш, дзе свой крок спыніць,
Калі ты ўвесь пераканаы,
Што шчасце, шчасце мусіць быць.

І не адно прайшоўшы ўзгор'е,
Кажу з падзякай той вясне:
— Ах, сонца поўдня, што на ўзмор'і,
Неабыякава ты мне.

Кажу я сёння ў Ялце сонцу:
— Ты ў верасні, бы ў нас у маі.
І хоць ласкавае бясконца,
І хоць ты шчодрае:
— Бывай!

Мяне дамоў бяруць клапоты
Свае і любых мне людзей,
Люблю і нашых дзён яснoты,
Хоць там страчаешся радзей.

Бывае, раніцай ты ўстанеш,
Ды з хмар над гомаы вятроў,
Нібы адзіным вокам глянеш,
Ды ў іх схаваешся ізноў.

Ды што кажу. Бывае, кросны
Развесіш восенню між дрэў,

Ах, як тады па сэрцы млосна,
Ах, каб ды ўзяў — памаладзеў!

Бывае ж так — і ў лістападзе
Запаліш ты, як меддзю, лес
І зжоўклыя рабіны ў садзе
Нібы крывёю наліеш.

Ды і зімовымі шляхамі,
Бывае, хопіш цераз край,
Так разгарышся між снягамі,
Што ажно вочы заслапяй.

Але зіма не доўга грэе,
Цябе, бы ў торбу, заграбе,
Ты так схаваешся ў завеях,
Што вельмі горка без цябе.

Пакуль вяспой расплюшчыш вочы,
Пачпецца клёкат ручаёў,
І ты пралескаю абскочыш,
Бы нараджаешся нанова.

Люблю я сонца, мне паверце,
Дзе родны дом і тут, дзе Крым,
Люблю яго па небе, ў сэрцы,
У вершы, позірку,— ва ўсім!

## ТРУБА І ЛІРА

Адзін калісьці крытык вырак
І ўсіх хацеў пераканаць,
Што я трубач,
Што я не лірык,
Пяшчотных струн мне не кранаць.

Што ж, я хадзіў з грымотным вершам,
І з аўтаматам,
І з трубой
І крочыў у шарэнгах першых
Паміж заклікаluных на бой.

І абуджаў, будзіў салдата,
Будзіў адпор рашучы даць,
Трубіў —
Звінелі вокны ў хатах,
Каб Перамогі не праспаць.

Мой крытык не заўважыў ліры,
Ёй за трубой
Адкрыўся шлях,
Яна ж у дні спакою, міру
Гаіла раны на грудзях.

А сёння, сёння толькі гляньце
На шлях яе —
І не адзін,
Яна ж і пасабляе працы,
І сэрца цешыць у спачын.

## МЕХАНІЗАТАРЫ

Слаўлю я, слаўлю дужае, новае,
Хай сабе быццам ужо і звычайнае,
Цешуся трактара ў полі размоваю.
Ах, як прыгожа поле з камбайнамі!

Шлях ваш бязмежны,
Працы наватары,
Механізатары,
Механізатары!

Вы, нібы волаты тыя былінныя,
Вамі нанова палеткі ўзараныя.
Вы пазнішчалі межы палынныя
І пахавалі сохі драўляныя.

Шлях ваш бязмежны,
Працы наватары,
Механізатары,
Механізатары!

Клопат ваш шчасце народа выспоўвае,
Радасць крылатая ў сэрцы не месціцца.
Вам, працавітым, дня мала вясновага —
Часам і ночка падсвечвае месяцам.

Шлях вам бясконцы,
Працы наватары,
Механізатары,
Механізатары!

Сонца вас лашчыць, промні вам дорачы,
А на сялібах, з працы чакаючы,
Хлебам і соллю вітаюць вас горача,
Радасці й поспехаў шчыра жадаючы.

Шлях ваш бясконцы,
Працы наватары,
Механізатары,
Механізатары!

## ВЕРА, НАДЗЕЯ І ЛЮБОЎ

Веру сэрцам, галавою,
Веру ў творчы я разгон,
Веру ў шчасце я людское,
Веру цвёрда ў працы плён.

Вы надзея — наша змена,
Вы надзея — маладосць,
Вы надзея — сёння дзейных,
Вы надзея ўсіх, як ёсць!

Ты любоў — мая Радзіма,
Ты любоў — дачок, сыноў,
Ты, любоў, заўсёды з імі —
Непагасная любоў!

## ГЕРОІ

Шмат вас, героі, за волю змагалася,
Шкода, зарана жыццё абарвалася.

Сэрцу народнаму родныя, блізкія,
Вы пад курганамі, пад абеліскамі,

Славаю ўзвышаны, славаю вечнаю,
Хочацца слова сказаць вам сардэчнае.

Хоць засмучоных нас вы пакінулі,
Ды недарэмна, сябры, вы загінулі,

Ворага нішчачы злоснага, грознага.
Ваша жыццё — у жывога, у кожнага,

Сцяг ваш над роднай зямлёю красуецца,
Сёння вы ў новых
і плошчах і вуліцах.

Сёння вы ў дзецях,
што сталі шчаслівымі,
Сёння вы ў спевах калоссяў
над нівамі,

Сёння ў садах вы
на даўніх пажарышчах...
Спіце спакойна, сябры і таварышы!

Коўдрамі мы вас прыкрылі зялёнымі,
Перапавіўшы сцягамі чырвонымі,

Спіце спакойна! А мы між палеткамі
Вас ўваслалі блакітнымі кветкамі

І абкружылі праменнямі веснімі,
Звонам крынічным, птушынымі песнямі...

Нашымі сэрцамі вы заўладарылі,
З вамі мы марым,
З вамі як марылі!

## ЗАЎСЁДЫ Ў СЭРЦЫ ТОЕ ЛЕТА...

Што даражэйшае паэту
За волю роднае зямлі?
Заўсёды ў сэрцы тое лета,
Калі дамоў мы ўсе ішлі.

І Беларусь страчала ласкай
Сыноў, братоў іх баявых,
Ішлі з засадаў партызанскіх,
Ішлі з траншэяў франтавых.

Ішлі такою грамадою,
Якой ніхто не мог спыніць,
Знішчаючы ярмо цяжкое,
Што нас хацела задушыць.

Сясцёр і матак нашых слёзы
Не абсыхалі ў гэты час,
І слёзы падалі з бярозак,
Што бачылі ў абдымках нас.

Яліны, сосны нас віталі
Між акрываўленых шляхоў,
А нас чакалі, нас чакалі
Шарэнгі чорных камяноў —

На ўсіх дарогах і закутках,
Паміж баёў і цішыні,
Як быццам помнікі — у смутку
Па-над ахвярамі вайны.

Ды паміж стогнаў і між плачу
Мы кветкі бачылі ў руках,
Мы чулі першы смех дзіцячы
І промнік бачылі ў вачах.

Ды йшлі з прыпынкаў, як віхура,
Далей па бої за родны край —
І першы бачылі падмурак,
І першы волны ураджаі.

І першы рой на-над садамі,
І першы ў бляску зорным дом,
І родны сцяг, які над намі
Кружыў чырвоным галубком!

## І БЕЛАРУСЬ І ПАРТЫЗАН...

Калі на нас прыйшлі з вайною,
На бой смяротны ідучы,
Мой край, не ведаў ты спакою
На міг ні ўдзень, ані ўначы.

На помсту клікала трывога,
Лясы разгневана гулі,
І ад старога да малога
Ўсе абаронцамі былі.

Мне не забыцца дзён агністых,
Ні страт цяжкіх, ні горкіх ран,
Гучаць суладна і ўрачыста:
І Беларусь і партызан!

## ДЗІВОСНЫ МОСТ

Жыцця глыбокая рака —
Віры, адмелі, трысцягі...
Дзівосны мост, выносны мост,
Злучаў ён нашы берагі.

У дні вясны, калі я жыў
У захапленні маладым,
Здаваўся мне, здаваўся мне
З прыгожай аркаю над ім.

Я помню, бачыўся ў той час,
Калі, як птушкі, мчалі дні —
Адзін блакіт, адзін блакіт,
І толькі зоры ў вышыні.

Але жыццё не толькі з руж,—
Паўзлі нягоды чарадой.
Мост прагінаўся, мост стагнаў,
Ледзь-ледзь трымаўся над вадой.

Ды ўсё ж мінулі дні нягод,
Мост знішчыць беды не змаглі,
Бо сэрцаў моц, бо сэрцаў моц
Яму падпорамі былі.

А плыні ўсё далей, далей,
Рака жыцця далей цячэ.
Дзівосны мост, выносны мост,—
І шмат нязнанага яшчэ...

## МАЙСКАЯ НОЧ

Я захаплення не стрымаю,
Душа гарыць, бунтуе кроў,
Ах, дзякуй, дзякуй, ночка маю,
Што ты з'явілася мне зноў.

У белай квецені між лісця,
У ледзь прыкметным шуме траў,
У тым салоўку, што калісьці
Мяне кружыў і чараваў.

А ветрык, ветрык цёплы, свежы,
А месяц звесіўся на дол,
А пах чаромхі, пахі бэзу,
А шэпты, шэпты навакол...

На сэрцы шчасця асалода,
Бы зноў юначая пара,
І нават шкода, нават шкода,
Што ўжо займаецца зара.

# ЖЫЦЦЁ — НЕ ЎСЁ АДНО СУКВЕЦЦЕ...

Я, ассенизатор
и водовоз,
революцией
мобилизованный и призванный...

*У. Маякоўскі*

Пакуль сягнем да высі зорнай
Мы працавітаю хадой,
Нямала працы чыстай, чорнай,
Нямала лёгкай і цяжкой.
А праца — першая патрэба,
Без працы немагчыма жыць.
І так, як піць і есці трэба,
Штодня нам трэба і рабіць.
У нас вялікая дарога,
Мы йдзём у зладжаным страі,
На жаль жа, ёсць, хоць іх нямнога,
І абібокі, гультаі,
Якім жывецца добра, спіцца,
На працу клікаць — не чапай!
Адны ў іх клопаты — ўхіліцца
Ці найлягчэйшую падай.
Жыццё ж — не ўсё адно суквецце,
Не толькі цешыцца, спяваць,
І за сабою трэба смецце,
Што назапашана, прыбраць.
Нам трэба ў працы адмысловай
Быць і ў цяжары пабудоў —
Даволі дваццацігадовых
Няўмелых мамчыных сынкоў.
Даволі дочачкам і ўнучкам
Дыван у ножкі падсцілаць,
Бо камунізма беларучкам,
Бясспрэчна, не пабудаваць.
Не, гультаямі жыць няможна,
Другі ў нас час, другі наш век —
Знайдзі ж ты ў працы радасць, кожны,
І ты — шчаслівы чалавек!

## ГРАФАМАНУ

Ніякай думкі, ні памеру,
Ні добрай рыфмы хоць бы раз,
Скажы, нашто псуеш паперу
І ў чытачоў займаеш час?

Не бачыш ні людзей, ні сонца,
Чытаючы радкі свае,
Бы хтосьці малатком бясконца
Па бляшаной страсе клюе.

## МЫ ПА АДНЫХ ХАДЗІЛІ СЦЕЖКАХ...

*Пімену Панчанку*

Хоць мы таго вярнуць не можам,
Ды памяць ледзьве закране —
Юнацтвам бедным і прыгожым
Праходзяць перад намі дні:

Яшчэ між межаў і паўзмежкаў
Стыў шэпт сярпа і звон касы,
Мы па адных хадзілі сцежках,
Хоць трошкі ў розныя часы.

Ты прыгадай сцяжыны тыя,
Калі — усё ішло ў руку...
Лясы ля Бегамля грыбныя,
Бярозу — рыбную раку.

І пчол па верасах гудзенне,
І між дарог — пяскі адны,
І як сядзелі між камення
Дзяды — сівыя валуны.

Згадай куточак небагаты
Лясной пявучае зямлі
І тыя хаты, тыя хаты,
Што нам прытулкамі былі.

І шлях на ўзгорку з грушай дзікай,
Што йшоў праз лес і праз палі,
Якім пайшлі мы ў свет вялікі,
Пакуль увесь не абышлі.

Ды будзем помніць нашы сходкі,
Што маладых збіралі нас,
І першы покліч пяцігодкі,
І першы запіс у калгас;

І збор з палёў шырокіх хлеба,
І бляск здабытага святла,

І яркае ў сузор'ях неба,
Калі краіна расцвіла;

І помнім мы, як злосны вораг
Занпога ўсім прынёс пакут,
І тое гора, тое гора,
Што спапяліла родны кут;

Як шыпялі з табой насілі
На розных лініях франтоў,
Як нашы словы ў бой хадзілі
Між партызанаў і байцоў.

Прайшлі мы разам з грамадою,
Паміж людскіх трывог раслі,
Ды сёння нам відаць такое,
Пра што і марыць не маглі.

Напяты ўвысь дарогі-струны,
Яны мінулі Марс ужо,
І верш твой гучны, верш удумны,
І верш твой востры, як лязо,—

Кранаў ён сэрцы шчырым словам
І, неспакойны, ўсіх будзіў,
На першай лініі ён з Новым
Заўсёды, як і сёння, быў!

## ВАМ ЖЫЦЬ І ЖЫЦЬ...

Не, не забыцца ўсёй зямлі,
Як вы ішлі,
На смерць ішлі.

Гарэлі ў цемрадзі начы,
Каб смерцю смерць
Перамагчы.

Вы злую свастыку з арлом
Знішчалі куляй
І штыком.

І на таран на самалёт
Ішлі,
Кідаліся на дот.

Не зналі страху ў барацьбе —
Танк узрывалі
І сябе.

Вы зналі —
Волі не згарэць,
Вам жыць і жыць,
І палымнець,

Бо ў пераконанні сваім
Вы цвёрда верылі
Жывым,—

Што сцяг ваш мужна панясуць,
Што вашы справы
Не памруць.

Агонь душы не затушыць!
Радзіма вечна
Будзе жыць!

Вы ў пераконанні сваім
Надзейна верылі
Жывым —
Жывым і сёстрам і братам...
І мы гаворым
Сёння вам:

Ваш сцяг насля цяжкіх дарог
Гарыць
У славе перамог.

Ён стаў агнісцей палымнець,
А каб маглі вы
Паглядзець —

Як узняліся мы ў жыцці,
Як родны край наш
Стаў расці,

Як гарады, мільёны сёл
Закрасавалі
Навакол.

Ах, каб маглі вы ўзняцца, ўстаць,
Сваіх мясцін
Вам не пазнаць.

Між кранаў, вышак буравых
Нідзе няма
Куткоў глухіх.

Растуць няспынна кожны дзень —
Ангарск, і Ліпецк,
І Цюмень...

Здзіўляюць свет Нурэк, Памір,
Брэст, і Лукомль,
І Мазыр.

Штодня, штодня ўскрыляюць нас
Караганда, Данбас,
КамАЗ.

Зямлю ўзнялі з-пад дзірвана,
Загаманіла
Цаліна.

Скарылі мы нябёс прастор,
Сягнулі першыя
Да зор.

Вышэй, вышэй мы кожны раз,
Наш герб заззяў
Для зорных трас.

Вышэй, вышэй Чырвоны сцяг!
Да нас —
Сцягам Сусвету
Шлях.

Вы зналі, ідучы ў паход,
Што будзе ў славе
Наш народ.

І ў перакананні сваім
Вы цвёрда верылі
Жывым.

Мы з вамі скрозь ва ўсе гады,
Вы ў сэрцы нашым
Назаўжды!

Вы з намі між усіх гадоў —
Паміж сяброў,
Паміж сыноў.

Мы вас, таварышы, браты,
Ў дзень будні помнім
І ў святы.

У дзень, як волю здабылі,—
Дзень Перамогі
Ўсёй зямлі.

І слава вашая жыве
На плошчы слыннай
У Маскве.

Вам аддаюць пашаны шмат,
Дзе невядомы
Спіць салдат.

Адкуль ён сам, дзе родны дом
І хто пад вечным
Тым агнём?

Не скажа нам салдат таго,
Адкуль ён,
Маці дзе яго.

Не сірата ж ён, наш герой,—
Ён матак сын
Радзімы ўсёй.

Сярод бароў, гаёў, палян
Шануем
Слаўных партызан.

І ноч усю аж да зары
Гараць па месцах тых
Кастры,

Дзе быў у іх прытулак свой,
Дзе ворагам
Давалі бой.

Магутны ж у братоў саюз —
Латыш, літовец,
Беларус...

І рускі брат, што побач жыў,
Святкуюць разам
На мяжы.

Быў я штогод на зборах тых,
Ах, колькі песень
Агнявых

Па-над прасторамі гулі,
На ўсе рэспублікі
Плылі...

Каб горда слухалі яны,
Як іх змагаліся
Сыны.

Дык слухай жа, Дняпро, Каўказ,
Ніхто з іх
Не забыты ў нас.

Шляхамі спраў іх баявых
Ідуць, ідуць
Унукі іх.

Па вёсках, сёлах, гарадах,
Па ўсіх палях,
Па ўсіх барах.

У ціхім пошуме дуброў,
У веснім звоне
Ручаёў,

Дзе давялося легчы вам,—
Пасталі абеліскі
Там.

Імёны вашыя наўкол
Ў найменні вуліц,
Клубаў, сёл.

Масква, кліч сэрцаў чуеш ты,
Не знаць героям
Нематы!

Героям скрозь вянкі нясуць
І клятву вернасці
Даюць.

А клятва тая на ўвесь свет,
Што дзейсна споўняць
Запавет.

Што будуць жыць і працаваць,
Каб век Радзіме
Красаваць.

Свет цэлы бачыць наш узлёт,
Як мы дужэем
З году ў год.

Не спыніць тых ніхто, нідзе,
Хто ў сэрцы
З Леніным ідзе!

## СУДДЗЯ

Суддзя, ў цябе цяжкія справы,
Закон ты мусіш бараніць,
Быць і суровым і ласкавым,
Заўжды на варце праўды быць.

Адзінай воляю злітыя,
Мы выйшлі свет свой будаваць,
Але, на жаль, ёсць і такія,
Каб менш зрабіць, а больш узяць.

Мы ўсе таварышу таварыш,
Ды ёсць між нас не без заган,
Страчаюцца яшчэ пачвары —
Бандыт і злосны хуліган.

Ты іх судзі з законам згодна,
Карай як след і не мякчы,
Ты мусіш воляю народнай
Закон народны берагчы.

Каб мы савецкай грамадою
Парадак мелі і спакой,
Дзяржаўны герб на-пад табою
І ўся дзяржава — за табой.

## МАЁ ДВАЦЦАТАЕ СТАГОДДЗЕ

Я не скажу ніколі: — Годзе!..
Бо век і так не доўгі мой,—
Маё Дваццатае Стагоддзе —
Усё пражытае з Табой!

Рэвалюцыйнай волі хвалі
У твой вядомы Пяты год —
Маю калыску калыхалі,
І зваў расці мяне народ.

Я рос, як рос у вёсцы кожны,
Звычайным ціхім пастушком,
Ды ўжо Кастрычнік пераможны
Сустрэў дапытным хлапчуком.

Імкнуўся быць заўжды ў народзе,
Бо ўспалымніла ў сэрцы кроў
Маё Дваццатае Стагоддзе
Чырвоным полымем сцягоў.

Я ў захапленні быў, вядома,
Ты ж несціла мяне ўсяляк —
Дало шынель у валрэўкоме
І «КІМ» на грудзі — любы знак!

Хай чорным хлебам гадавала,
Хай з корту ў галіфэ хадзіў,
Ты раскрывала, раскрывала
Перада мною многа дзіў.

І новы гмах наш час узводзіў.
Завод і ДЭС, саўгас, калгас,
Маё Дваццатае Стагоддзе,
Ты першым нарадзіла ў нас.

Гудзеў народ, як быццам мора,
Ўздымаючы за долам дол,

І я ў яго бязмежным хоры
Спяваў, як мог, сваім радком.

Ды безліч гругання ўзнялося,
Каб нас папішчыць, растаптаць,
І ўсім, усім нам давялося
Супроць навалы той устаць.

Мы ўсе былі ў цяжкім паходзе
Сярод смяротных тых дарог,
Маё Дваццатае Стагоддзе,
Не знаю большых перамог.

І дом наш волат ёсць, няйначай,
Яму ж закон — расці, расці...
І я іду ў страі і бачу,
Чаго й не марыў у жыцці —

І моц, што з-пад зямлі паўстала,
На поўначы вясны сляды,
Паміж пустынь сады, каналы,
Між дзікіх нетраў гарады.

Машыны ж сёння заўладалі,
Адчынены ўсе далі ім,
І самалёты распісалі
Ўсё неба, быццам той кілім.

І новы дзень, як сонца, ўсходзіць,
Прыносіць Новае з сабой...
Маё Дваццатае Стагоддзе,
А колькі даляў прад табой!

## ПРА БУСЛА І ВЕРАБ'Я

Звычайны звычай у людзей,
Падрос, працуе ў грамадзе...
А ты, як быццам верабей,
Сядзіш у буславым гняздзе.

Паволі дом бусліны рос,
Цяпер здалёку ўсім відзён,
А ты ні галінкі не прынёс,
Калі прытулак ладзіў ён.

Ад сораму ты й не гарыш,
Цябе нічым і не прабіць,
Што толькі крыллем шабуршыш,
Буслу перашкаджаеш жыць.

Яму такі не ў першы раз.
Прымі ў параду колькі слоў:
— Лепш выбірайся ў ціхі час,
Бо дзюбы вострыя ў буслоў.

## ХІБА НЕ ШЧАСЦЕ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ...

Ёсць хуткасць думкі. Дзіва гэта —
Хіба не шчасце для людзей,
І як ні лёталі б ракеты,
Яны за думку не хутчэй.

За міг плыву праз акіяны,
Праз міг імчу на самы Марс,
Хачу, і ўміг — я закаханы,
Праз міг — са мной маленства час.

Хачу — я побач з вынаходцам,
Магу і ў дні Пампеі жыць,
Хачу — я разам з палкаводцам!
З кім захачу — магу з тым быць.

Пабуду ў высі нескаронай,
Пабуду ў нетрах пад зямлёй,
За ноч адну гадоў мільёны
Мільгнуць у думках прада мной.

Хачу — гляджу на свет паэтам,
Хачу — я ў безлічы падзей,
Ёсць хуткасць думкі. Дзіва гэта
Хіба не шчасце для людзей.

* * *

Далёка ў горы я зайшоў.
Прылёг.
А думы чарадой...
Ледзь шчыліпка між камянёў,
А мора ўсё перада мной.

Гляджу на мора,
Хай здалёк.
Знаходжу ў ім нямала дзіў,
Ды раптам з долу ўзнік дымок —
І кругагляд мне заслапіў.

Нібы й маленькі курадым.
Не абысці,
Не разагнаць...
Вось так бывае — за малым
Жыцця прастору не відаць.

* * *

Відаць, такое ўжо з усімі
Яшчэ ў дзяцінстве мусіць быць,
Калі былі зусім малымі,
Мы тайны марылі раскрыць.

Між тэлеграфнымі слупамі
Ад правадоў, што ўдаль бягуць,
Здавалася, што словы самі
Да нашага чуцця ідуць.

Шукаць — патрэбна чалавеку.
Усё адчуць, усё спазнаць.
Цяпер, ужо ў дарослым веку,
Здаецца, з Марса штосьці чуваць...

## ПРА ІНВАЛІДА-ВЕТЭРАНА

Нялёгкі шлях у ветэрана,
Прайшоў праз воды і агонь,
У ветэрана — чатыры раны,
Чатыры раны носіць ён.

Займеў іх у баях крывавых
За Ленінград, за горад Клін,
Адну пад самаю Варшавай,
Адну аж там, дзе паў Берлін.

Ён падаў ніц на бруку вуліц,
Палі, балоты перапоўз,
Але хоць раз ці вы пачулі
Ягоны енк пра горкі лёс.

Яму б ляжаць і адсыпацца,
Другім папрацаваць чарод,
Яго ж не ўбачыце без працы,
Хоць ветэрану многа год.

І для яго клапотаў поўна,
Ў грудзях яго не згасне жар —
То муляр ён, то ён садоўнік,
То вартаўнік, а то пчаляр.

А колькі ў ім спагады, ласкі,
Жыве вялікаю сям'ёй,
І дзецям ён, як быццам казку,
Раскажа пра страшэнны бой.

Ён маладым, як жыць, пакажа,
Не абміне старых нідзе,
Ён і параіць і развяжыць,
Ён і пасобіць у бядзе.

У бег жыцця ён закаханы,
Яму ї далёкае відно —
У ветэрана — чатыры раны,
Іх сэрца злечыла даўно.

* * *

Зямля! Ты тайнамі багата,
Не разгаданы й воблік твой.
А ты з пагляду касманаўта,
Здаешся нават і малой.

А мы ж не знаем як належыць,
Хоць немалы ў навукі шлях,—
Якога полымя бязмежжа
Не гасне ў тваіх грудзях.

Шмат са здабытага зрабілі —
Дзівоснай моцы й пекнаты,
Дый сотай долі не адкрылі
Багаццяў тых, што маеш ты.

Зямля — стыхіі, бур армады,
Між іх існуеш і жывеш,
А ты з касмічнага пагляду
Такой блакітнаю плывеш...

А на табе, як блізка глянуць,
Няма спакою ні на міг,
Гудуць не толькі акіяны,
А акіяны душ людскіх.

І хто іх сілы змераць мог бы —
Шуканне праўды, здзек, спадман...
Бывае і ў адной асобы
Пачуццяў бурных — акіян.

Зямля! Шмат колераў ты маеш,
Ёсць з іх прывабныя і горш...
Адно, адно нас суцяшае:
Між іх чырвонага ўсё больш.

Шугае ўвысь ён і наперад
Надзейна, моцна, на вякі!..
Зямля! А з ім — мы ў гэта верым —
І твой ратунак і людскі!

## НА СХІЛЕ ПРОЙДЗЕНЫХ ГАДОЎ

На схіле пройдзеных гадоў,
Што адгулі, бы вадаспад,
Мне шкода й дня, што адышоў,
Бо ён не вернецца назад.

Ні той, калі ў маленстве быў,
Ні той, калі дарослы стаў,
Ні той, калі ў лясах трубіў,
Ні той, калі я пакахаў.

Ні той, калі ў шуканні слоў
Я пачынаў збіраць дары.
Ні той, калі ў сям'і сяброў
Спяваў да самае зары.

Аб тым далёкім толькі сны,
Гляджу на сцішаны вятрак...
А думы, думы ўсё адны —
Навошта я спяшаўся так?

* * *

Хоць сталасць з'явіцца па ўзросце,
Не растлумачыш усяго,
І часта мне журботна штосьці,
Я й сам не ведаю чаго?

Прыемны шчыры смех наўкола,
Застолля шум, жаданы госць...
А дні,— былі б адны з вясёлых,
Відаць, абрыдла б весялосць.

І рады я, што сум не страціў,
Што я сумую па табе,
Па сонцу, па сцягах, па працы,
Па неспакою й барацьбе.

## ПАМЯЦІ ПАЭТА

У слыннай Ялце вераснёвай
Плывуць, плывуць лятункі мар,
Перад тваім апошнім словам,
Сын Беларусі і пясняр.

І тая ж даль. І тое ж сонца
Плыве, як шар па-над гарой,
І тое ж самае аконца,
Па-за якім гудзе прыбой.

І пенных хваль — на грэбень грэбень,
І той жа гул, што чуў паэт,
І кіпарыс на сінім небе,
Нібы зялёны мінарэт.

Куды ні глянеш — люба, гожа,
І чайкі клічуць бы каго,
Дый што казаць — усё прыгожа...
А ў сэрцы сум. Няма яго.

## Я НЕ ЛЮБЛЮ ПАХМУРНЫХ ДЗЁН...

Ну, як, мой дружа, не кажы,
Калі бязмежжам бавоўняным
На ўсё насунуцца туманы,
Журботна стане на душы.

Я не люблю пахмурных дзён,
Гляджу, гляджу на іх з дакорам —
Ні рэк, ні возера, ні бору,
Дый сам ніколі не відзён.

На шчасце, мала дзён такіх —
Не можа цемрадзь быць бясконца,
Праб'юцца промні, ўспыхне сонца,
І ты шчаслівы між усіх.

## ЗАЙЗДРОШЧУ МАКАВАМУ ЗЕРНЮ

Ах, колькі дзіўнага ў пасенні,
А нам яго і не відно —
Гляджу на макавае зерне,
Якое дробнае яно.

Здаецца, дзе яму прачнуцца,
Не суджана такому жыць,
А варта глебы дакрануцца,
Нібы ад шчасця задрыжыць.

І праз яе знаходзіць выйсце,
Пасля ўмацуецца як след —
І пойдзе ў рост, і пойдзе ў лісце,
І пойдзе ў прыгажэйшы цвет.

А я гляджу на луг зялёны,
І радасць, радасць у вачах —
Ах, мак чырвоны, мак чырвоны,
Што ў свята плошча — ўся ў сцягах.

## ЯК ДЗВЕ БАБУЛІ...

Вятры ад поўначы падзьмулі,
І восень, быццам дзве бабулі —
Адна ўзялася дзень зыначыць,
Але ласкавая сама.
Другая ж плача, плача, плача,
Што і ратунку ўжо няма.

Адна заве спачыць уволю
І рыбакоў і грыбнікоў,
Другая гэтак заскуголіць —
Ані той рыбы, ні грыбоў.

Адна ў каралях ягад здасца,
Не звесці воч ад пекнаты.
Другую бы калоціць трасца,
Лятуць пажоўклыя лісты.

А хутка ўслед за ёй прымчыцца
З нябёс мятлюга на зямлю...
Калі бабуля восень быццам,—
Я больш ласкавую люблю.

* * *

Зіма яшчэ не наступае
І, дбаючы пра пекнату,
Западта доўга прымярае
Сваю вясельную фату.

Хаджу па лесе. Лісце ліпне
Да ног, да курткі, да ўсяго...
Здаецца, дрэва гэтак скрыпне,
Нібы раматус у яго.

Нідзе, ні ў верасе, ні ў доле,
Хоць бы жывы адзіны гук,
Адно — вятры шкумацяць голле,
Як пальцамі сцюдзёных рук.

Ледзь-ледзь пароша сыпле з ходу,
Да нас дацягнецца здалёк...
Хутчэй, зіма! Са снегам, з лёдам,
З прывабнасцю ружовых шчок.

## А ЧАС, ЯК ПРЫЙДЗЕ, СКАЖА ЦВЁРДА...

Няма нічога без змагання,
Відаць, прырода ў тым сама,
Ды і вялікага кахання
Без кроплі рэўнасці няма.

Здаецца, розум аж цямнее,
І выйсця, выйсця не відно,
Каханне ж болей палымнее,
Бы ў свеце толькі ёсць адно...

Кахай бязмежна, мужна, горда,
Дай вернасці сваёй зарок,
А час, як прыйдзе, скажа цвёрда,
Каму гарыць твой аганёк!

## А Я Ж У СЭРЦЫ НЕ ЗМЯНІЎСЯ...

Ты пакахай, я буду рады,
Ты не глядзі на воблік мой,
Я не хачу зусім спагады,
Ні кроплі літасці тваёй.

Ты не лічы ні зім, ні летаў,
Жыццё — даўжэзная рака,
Ты пакахай мяне, а гэтак,
Так, як калісьці юнака.

Ну што, калі крыху схіліўся
І галавою пабялеў.
А я ж у сэрцы не змяніўся,
А можа быць, папрыгажэў.

Больш дум, сардэчнага багацця,
Хоць раздавай другім бяры...
Нашто, нашто, прырода-маці,
Кладзеш маршчыны без пары?

* * *

Відаць, што доля ўжо такая,
I да няўдач гатовым будзь.
Бывае, доўга ты шукаеш,
А словы, як на злосць, ідуць —

Ні да чытання, ні да спеву,
I формаю не цешаць воч...
I раптам верш, як тое дрэва,
Зазелянее ў адну ноч.

Калі прыйшла часіна выйсця —
Верш узляціць да самых зор,
I словы ў ім, як тое лісце,
Пяюць і маюць свой узор.

## ЗА ВАЛАМ ВАЛ...

Жыццю, як мору,
многа год.
І ў пакаленняў
свой чарод.
А змена новая
ідзе,
Нібы дзевяты вал
гудзе...

Сустрэнеш новых,
бы ўзнырнеш,
Па адышоўшых —
уздыхнеш,
І зноўку ціш,
І зноўку —
шквал,
Жыццё ідзе —
за валам
вал!..

## НІБЫ ІМКНЕЦЦА ЎСЁ ДА ЎЗЛЁТУ

Нам звычна, што было нязвычна.
Адкрыўся Месяц, хутка й Марс...
І недарэмна ўжо касмічным
Завуць наш непаўторны час.

Нібы імкнецца ўсё да ўзлёту...
Дамы ж увысь, увысь растуць,
І вокны іх, няйначай, соты,
Дзе людзі рояцца, жывуць.

І кожны з іх кірунак мае —
Да ніў, фабрычных карпусоў,
На працу ранкам вылятаюць,
На ноч злятаюцца дамоў.

На працы мкнуць увысь, вядома,
Так праца кліча іх сама,
А думам — вернуцца дадому,—
Здаецца, і мяжы няма.

## РАЗМОВА З МАСТАКОМ-МАДЭРНІСТАМ

Малюеш не заўжды да толку:
Не зразумець, дзяўчо ці ўрод?
Ты намалюй мне камсамолку
З найдарагіх дваццатых год.

Так, каб адчулі мы ў дзяўчынцы
Байца, што йшла ў рашучы бой,
У той чырвоненькай касынцы,
У сціплай куртцы скураной.

Сяброўку нашу мы кахалі,
З ёй чулым будзь, а то глядзі,
Каб хлопцы ўсе не засмяялі,
Калі прыкрыкне: — Адыдзі!..

Так намалюй: яе наўкола
Стаяць за волю змагары...
Ты намалюй яе вясёлай
На ўсходзе сонечнай зары.

## ПРА ВАС Я ДУМАЮ ЗАЎСЁДЫ

Ты прыгажэеш год ад году,
Мой край! Якім ты дзіўным стаў!
І я вось думаю заўсёды
Пра тых, хто гэта дараваў,—
Пра вас, каго турылі з хаты,
Зганялі па сібірскі шлях,
Пра вас, хто ў царскіх казематах
Гібеў у стылых кайданах.
Пра вас, хто не чакаў спагады
У долі чорнай і цяжкой.
Пра вас, хто паў на барыкадах,
Успалымніў свой сцяг крывёй.
Пра вас, што дружна ў дні «Аўроры»
За лёс усіх на бой ішлі,
Пра вас, хто даў чырвоным зорам
Праліць святло на ўсёй зямлі.
Пра вас, хто знаў, што ёсць патрэба,—
Недаядаў, недасыпаў,
Дзяліў на ўсіх васьмушку хлеба —
З руінаў край свой уздымаў.
Пра вас, хто знёс пакуты, раны
Між розных франтавых дарог,
Пра вас, хто ў бітве нечуванай
Не ўпаў, а гора перамог.
Высока вы ўзнялі краіну.
Ад шчасця нам далі ключы,
І ўсё, што вы далі, павінны
Мы, як святыню, берагчы!

## ТЫ МНЕ ЎЯЎЛЯЕШСЯ ТАКОЮ...

З прыгожай, светлай галавою,
З вачамі — срэбрам ручая,—
Ты мне ўяўляешся такою,
Радзіма любая мая.

Гудуць дубы, гамоняць клёны...
Званочкам жаўра падпяе,
Ва ўбранні Беларусь зялёным,
Здаецца, з возера ўстае.

Шмат у яе сыноў і ўнукаў,
Дачок і ўнучак дарагіх,
Ах, як яе ласкавы рукі,
Ах, колькі ж і пяшчоты ў іх.

Дзе б ты ні быў — далёка, блізка,
Якім бы лёс ні стаўся твой,
Яна ад самае калыскі,
Нібы матуля, над табой.

Яна заўсёды дапаможа,
Каб твой праменны шлях не згас.
І калі гора — вытра слёзы,
Падорыць песню ў шчасны час.

І ўсіх — сузор'ем прамяністым —
Вядзе ад гарадоў і ніў,
Каб кожны з нас адданым, чыстым,
Як і яна, заўсёды быў.

## Я НІЗКА ПРАД ТАБОЙ ХІЛЮСЯ...

Адкрыты для паэтаў далі,
Аддзячыць краю наш чарод.
А мы яшчэ не ўсё пазналі,
Таго, што трэба, не сказалі,
Пра родны кут, пра свой народ.

Я нізка прад табой хілюся,
Мой родны дом, мой любы край!
Я не хачу, каб слова «гусі»
Стаўлялі ў рыфму Беларусі,
Яе з арліцай параўнай!

Мне люба з ёй ісці па свету,
З ёй кожны добры чалавек,
Маёй радзіме быць успетай,
Каб словы ззялі, што каметы,
Каб словы не згасалі век!

## ПАРТЫЗАНСКІ ПЧАЛЯР

Вайной клапот для ўсіх хапала,
Каб знішчыць навалачы зло.
І ў партызанцы спраў нямала
Для дзеда-пчаляра было.

Дзе пад сасною, дзе пад ёлкай
Ён пасеку сваю трымаў:
— Ляціце, пчолкі,
Ляціце, пчолкі,
І ў вас цяпер нямала спраў.

На ўсходзе сонца, рана-рана,
У пасецы ў лясной глушы,
Збіраў ён мёд для партызанаў
І асалоду для душы.

І кожны дзень прачула, з толкам
Ён пасланцам даваў наказ:
— Ляціце, пчолкі,
Ляціце, пчолкі,
Вы — што разведчыкі для нас.

Прыносьце нам пра зграю тую
Вясціны. Лёгка вам знайсці.
Прыносьце, дзе яны лютуюць...
Як нам да злыдняў падысці?

І тых, ў каго душы ніколькі,
Адно — рабуюць, б'юць усіх,
Кусайце, пчолкі,
Кусайце, пчолкі,
Кусайце проста ў вочы іх.

Нямала розных бедаў, гора
Ханае ў лесе тут у нас,
Малым, параненым і хворым
Вы пасабляеце ўвесь час.

Бывае голадна і золка,
Вы ж, дзёны скончыўшы аблёт,
Насіце, пчолкі,
Насіце, пчолкі,
На лекі верасовы мёд.

І быў ва ўсім у нас парадак,
Мацнелі номсвікаў страі,
Раслі атрады і брыгады,
Раслі пчаліныя раі.

Заззялі перамог вясёлкі,
І дзед гукнуў на ўвесь калгас:
— Ляціце, пчолкі,
Ляціце, пчолкі,
Бо кветкі ўсе для нас і вас!

## РАНІЦУ ЛЮБЛЮ...

Дзень і ноч красою
Славяцца сваёй,
Больш за ўсё да сэрца
Час, што раніцой.

Час, калі паволі
Набірае сіл,
Раскрывае вочы
Сіні небасхіл.

Сонейка з-за бору
Гляне ад крыніц,
Сыпануць праменні,
Як мільён расніц,

На палі, на рэкі,
На малы ручай,
У птушыных песнях
Забушуе гай.

І, здаецца, ў кветках
Загамоніць дол,
Зашыбуе праца,
Праца навакол.

Мурашок нястомны
Ведае адно —
Цягне ён ігліцу,
Быццам бервяно.

Бусел мчыць галінку
Да гнязда здалёк,
Ластаўка над дахам
Лепіць свой куток.

Певень правярае
Даўжыню крыла,

Быццам і не спала,
Загула пчала.

Кожны пачынае
Дзень па ўласны лад,
У мяне і працы,
І надзеі шмат.

Пра штодзённы клопат
Думы чарадой...
Гэта ж дзень вялікі
Ўвесь перада мной!

## ДВА ХВАЛЬКО

Каханне — гэта ў сэрцы рана,
Нікога не мінае нас,
Каханне — тайна закаханых,
І асабліва ў першы раз.

Маўчыць, а ласкі вочы просяць,
Не падабраць належных слоў,
А мне, паверце, давялося
Сустрэць аднойчы дзівакоў.

Яны прад цэлай грамадою,
Не чуючы сябе саміх,
Так выхваляліся красою
Сваіх каханак маладых:

— Мая ўсіх вабіць. Вочы цешыць...
— А на маю мільёны воч...
— Мая сабрыстая, як месяц...
— Мая чарнюткая, як ноч!

— Мая спявае — задзівіся...
— Ах, да чаго ж пяе мая...
— Мая, што жаўра ў сіняй высі...
— Мая званчэй за салаўя!

— Мая хадою так ласкава...
— Мая — другой не можа быць...
— Мая ідзе, ну проста пава...
— Мая, што козачка, бяжыць!..

— Мая ўвесь свет... Мая ўсё сонца...
— Хай скажуць людзі: — лепш чыя?..
І так з запалам і бясконца,
І чым далей: мая!.. мая!..

Сказаць хачу я: — Хлопцы, хлопцы!..
Так пра каханне не крычаць,
Абодвум сёння вам зайздрошчу,
Але ўсё ж раю памаўчаць!

* * *

Колькі мінула часін, колькі надзеі адцвіло,
Колькі разоў без цябе — маі палымнеў, красаваў,
Што ж запазнілася ты, доўга цябе не было,
Грукнула ў дзверы калі, я ўжо цябе не чакаў.

Я не спытаўся, адкуль зноўку вярнуў цябе шлях,
Можа, для зроку спадман, можа, я зблытаў з другой,
Глянуў я — ты ці не ты,— раптам пажар у вачах,
Сам я не ведаў тады, што адбылося са мной?!

Толькі пажар так не мог. Раптам кране халадок
І загамоніць з-пад броў погляд таемны, другі,
Ды ўжо і сам я ручай, якога праз зімку лядок
Цісне мацней і мацней, зводзіць яго берагі.

Каб жа пачуцці схаваць, сіл я не знаю такіх,
Зноўку ручайкі вясны, як і ў юнацтве, звіняць,
Іскры ў прывабных вачах, поціск гарачы рукі...
— Помню юнацтва сваё — я не хачу разважаць!

## «БЕЛАРУСЬ» ПЛЫВЕ ЗА АКІЯН...

І, нарэшце, мы ўзялі сваё,
Здзейснілі натхнення творчы план,
Сёння сэрца цешыцца маё —
«Беларусь» плыве за акіян.

Мы яму не граем славы марш,
Толькі ўсе з павагаю стаім,
Хоць малы на выгляд трактар наш,
Што за моц закладзеная ў ім!

Ні ў пясках, ні ў багне не прыстаў,
Здольны, як гавораць, да ўсяго —
Ён амаль паўсвету абараў,
І далей паклікалі яго —

Дзе такім умеюць даць цану,
Маюць папярэднікаў здавён,
Стуль жа у калгасную вясну
Заяўляўся з гонарам «Фардзон».

Дык чалом жа, трактар наш, чалом,
Справай пакажы сябе як след,
Ведай, што цябе прадстаўніком
Сёння шле сапраўдны Новы свет!

## З ЖЫЦЦЯ БАЛЬНІЧНАГА

Палата, белая палата,
Як пападзеш — ляжы, маўчы.
Ах, невясёлая ты, хата,
Адно жаданне — уцячы!

А на душы так горка-горка,
Што за хваробу ёсць гарчэй,
Ды прыйдзе ўважная дакторка,
І раптам стане весялей.

Яна ласкавым вокам змерыць
І, вызнаўшы тваю бяду,
Паспачувае, пульс праверыць,
Прызначыць лекаў чараду.

А там паколюць і пагрэюць,
То пачастуюць парашком,
І ты ўжо ўвесь жывеш надзеяй,
І так праходзіць дзень за днём.

Кладзешся спаць з рэжымам згодна,
З'ясі, што скажуць, будзь здароў,
І хоць усё тут неабходна,
Ды вельмі ж хочацца дамоў.

Ды не! Пад пахаю трымаеш,
Каб знаць, а варты ты чаго,—
Тэрмометр. Потым пазіраеш
Ты, як на ворага свайго.

Нічога ты яму не значыш,
Хоць ты зусім ужо раскіс,
А ён, як хоча,— скача, скача,
То вельмі ўгору, а то ўніз.

І ты зняверышся нарэшце,
Злуешся ўжо на свет увесь...

І раптам стане ён на месцы,
На пажаданым трыццаць шэсць.

І ты ўжо мужны і харобры —
Дакторкі цешышся красой,
Яна такой здаецца добрай,
Бы ўсё здароўе толькі з ёй.

І ты з бальніцы болей значным
Ідзеш з задорам баявым —
І ты бальніцы вельмі ўдзячны,—
І ўсім у ёй — сябрам сваім!

* * *

Натура ўжо, відаць, такая,
Што чалавеку з кожным днём
Заўжды чагосьці не хапае,
Хоць і ў парадку ўсё кругом.

І першай думка, ўстаўшы ўранні,
Нястачу знойдзе дзе-нідзе,
Ці то на працы, ці ў каханні,
Ці то ў адзенні, ці ў ядзе.

І сіл нямала давядзецца
Прыкласці, каб усё знайсці,
Ды ён здабыць сваё імкнецца,
І рух заўжды ў яго жыцці.

* * *

Хоць плот бальнічны не вышэйшы
За ўсіх другіх і не шчыльней,
Ды ўсё за ім мне прыгажэйшым
Здаецца сёння, чым раней.

Палі, лугі, прастор мурожны,
Шляхі, сцяжынкі між бароў,
І так трывожна, так трывожна,
Што я не ўсе іх абышоў.

А рэкі, рэкі, што імкнуцца
Туды, куды не даплываў,
І мушу я хутчэй вярнуцца,
Яшчэ ў мяне нямала спраў.

* * *

Ты захварэеш неспадзеўкі,
І гэта так каторы раз —
Хвароба нападзе знячэўку,
Рыхтуецца ж працяглы час.

І вось ты на бальнічным хлебе,
Хоць розных лекаў і стае,
Ды не малы ўжо час патрэбен,
Каб добра выбрацца з яе.

Хвароба ж хай не спадзяецца
Перамагчы, і без пары,
Цябе па шчырасці, ад сэрца
На ногі ставяць дактары.

У іх і веды й вынаходкі.
Што боль падолеюць скарыць,
Ты просіш бюлетэнь кароткі,
Ды каб даўжэй здаровым быць!

* * *

Яно, жартуючы, вядома,
Сказаў нам весялун адзін:
— Няма лягчэй, як астраному,
Сядзі, ў трубу сваю глядзі.

Жыццё праседзець можна гэтак,
Нічога не знайсці наноў.
А зоры ходзяць па сусвету,
Ніхто не змерыць іх часоў.

А зор бязмежнае багацце,
Ты паспрабуй іх палічы.
І ў астранома безліч працы,
Яму — за зорамі сачы.

Яму і трэба знаць заўчасне,
Каметы з'явяцца калі? —
Што з іх успыхне, што пагасне,
Што гэта значыць для Зямлі?

Каб выведаць пра тайны неба,
Пускаем зоры мы ў палёт,
Наш век такі, што думаць трэба
Наперад, на мільёны год!

## ЧЫТАЧАМ

Не, сэрца ў радасці не плача,
І толькі цешыцца магу,
Калі каля кіёскаў бачу
Я за газетамі чаргу.

І хваляванне вырастае,
Што слоў сказаць я не знайду,
Калі часопісы чытаюць
У цягніках і на хаду.

Іду ля кніжных магазінаў,
Як быццам чытачоў напад,
І на ўпрыгожаных вітрынах
Навінка не прагосціць шмат.

Яна па свеце павандруе,
Дарогаї кожная сваёй,
І думка раптам усхвалюе,
Што недзе ёсць чытач і мой.

А як мой верш, ці дапаможа
Ў хвіліну вольную каму?
І разважаю я ў трывозе,
Ці западзе ў душу яму?

Ці станецца яму прыемнай,
Ці прыпадзе красой да воч,
А можа, я спяваў дарэмна
І хваляваўся ўдзень і ўноч,

І раптам радасць. Здалі, зблізку,
Як роднаму, як сваяку,
Прыходзяць весціны з Нарыльска,
З Лагойска, з Полацка, з Баку.

Чытаю іх. І сэрцам хоча
Падзякаваць усім паэт —

Іх шле калгаснік і рабочы,
Вучоны, школьнік і студэнт.

І я хвалююся без меры,
Расце мой творчы неспакой,
Прыходзяць новыя намеры,
Я дзякую часіне той.

А мары, мары — роем, роем,
Адно жаданне жыць і жыць,
І хочацца зрабіць такое,
Чаго яшчэ не мог зрабіць.

## ПЕРАКЛІКАЮЦЦА КВЕТКІ...

Гляньце вы, гляньце на наша багацце,
Гляньце на поле і на сенажаці,
Гляньце, паслухайце ўвесну і ўлетку —
Пераклікаюцца кветкі,
Пераклікаюцца кветкі.

З поля жытнога — блакітныя вочкі.
— Мы для спатканняў,— шумяць васілёчкі.

— Мы ў адзіноце не чутна, не звонка,
— Любіць, не любіць,— скажуць рамонкі.

— А пакахае, не згасіць і сцюжа,—
Скажуць ля вокнаў чырвоныя ружы.

— Я ж на вяселлі ля сэрца бялею,—
Чуецца голас бялюткай лілеі.

Гляньце вы, гляньце на наша багацце,
Гляньце на поле і на сенажаці,
Гляньце, паслухайце ўвесну і ўлетку —
Пераклікаюцца кветкі,
Пераклікаюцца кветкі.

## КАЛІ Б САБРАЛІ СЛЁЗЫ МАТАК

Калі б сабралі слёзы матак,
З тых, што ў жалобе ў вёсках хатак,
Ў кварталах нашых гарадоў.
Па тых, што не прыйшлі дамоў,
Па тых, што знеслі безліч ран —
Быў найвялікшы б акіян!

Ах, як яго б грымелі хвалі,
Знішчаючы па ўсёй зямлі,
Каб іх ніколі не было —
Тых, што вайну распачынаалі,
А самі ў слодычы жылі,
Без іх — вякі б жыццё цвіло!

## ЗЯЗЮЛЯ

Зязюля, што ў цябе за сіла,—
Усіх нас вабіш варажыць,
Гадоў мне столькі налічыла,
Што я й не здолею пражыць.

І нездарма твой любіць голас,
Тваё куванне ўвесь народ,
Пакуль не высыпецца колас
І змоўкнеш ты ізноў на год,—

Бо ты куваеш і жадаеш
Дабра для ўсіх — малых, старых...
Вось за адно не паважаю —
Дзяцей кідаеш ты сваіх.

* * *

Ідуць, ідуць і дні і ночы,
Ідуць пражытыя гады,
І час гаворыць нам аднойчы:
— Ты ўжо даўно не малады!

Пачуццяў адшумелі крылы,
Мінулі песень ручаі,
Жыццё маю душу накрыла,
Як кветкі снегам у маі.

## ДАВАТАР

Змагаўся за родны
Савецкі Саюз —
Даватар, Даватар,
Казак-беларус.

Ён вёў за сабою
Любімых братоў,
Арлінае племя
Сваіх казакоў.

Ён рваўся наперад
Праз буры і дым,
І хмараю бурка
Ляцела за ім.

За помсту яго
Не было гарачэй.
Ён шаблю-маланку
Трымаў у руцэ.

Імчалі віхурай
За ім казакі,
Калолі іх пікі,
Крышылі клінкі.

І каты спадалі
На дол, як пласты,—
Таптаылі, мяшалі
З зямлёй капыты.

Спытайцеся ў сосен,
Ялін і бяроз.
Ён людзям нямала
Збавення прынёс.

Ды гора спаткала
Часінай адной —

Загінуў Даватар,
Загінуў герой.

Загінуў аднойчы
На сходзе начы,
Загінуў, на захад
Арлом лятучы.

Ён наў у палёце
Да дому свайго,
Дзе ўсе з хваляваннем
Чакалі яго.

Туды, дзе чакалі
Бацькі, сваякі,
Прымчалі, прымчалі
Яго казакі.

Вітаў іх ад сэрца
Шчаслівы народ,
І быў іх на захад
Нястрымны палёт.

І песня ляцела
На ўвесь наш Саюз —
Даватар, Даватар,
Казак-беларус!

## СЯСТРЫЦА

Іх многа — адважных і слаўных герояў —
Была сандружынніца й наша такою!

Па росту, як глянеш,— дзяўчына малая,
А выпала кволай дарога цяжкая.

Не лёгка, хоць звалі ласкава сястрычкай,
Не зразу адчула сябе франтавічкай.

У кірзавых ботах і ногі смылелі,
Было мулкавата і ў шэрым шынелі.

І ў сотнях прывалаў дарог незлічоных
Было жаркавата, было і сцюдзёна.

І ў першыя бойкі разгубленай птахаі:
— Ой, мамачка-мама! — шаптала ад страху.

Было, што й слязіну цішком выцірала,
Ды хутка зусім непазнанаю стала.

Такой, што адвазе дзяўчыны заўзятай
Дзівіліся нават старыя салдаты.

І міны і кулі бязлітасна секлі,
Яна ж дапаўзала ў самое іх пекла.

І стуль, між кустоў і лагчын, памаленьку
Параненых несла на плечах слабенькіх.

Не ведала страху і стомы не знала...
Ах, колькі, ах, колькі жыццё ратавала!

Ах, колькі, вярнуўшыся ў бойку ізноўку,
Успаміналі сястрыцы галоўку.

І вусны, што ціха, ласкава шапталі,
І вочы, што ўсім ім жыццё абяцалі.

Я ўпэўнены цвёрда, удзячнасці поўны,
Па ласцы, адвазе — няма да іх роўных!

* * *

Вясна! Вясна! Часы кахання,
І спевы сэрцаў, і святло...
Усё, усё, куды ні глянеш —
Закрасавала, зацвіло.

І дзе дзяўчат ні сустракаеш,
Палоняць дзіўнаю красой,
Ах, колькі іх, падобных Маю,
Нібы чаромхі маладой,

Як бэзу, вішні і ажыны...
Ну, з чым яшчэ іх параўнаць?
Сама вясна — нібы дзяўчына,
І ты, дзяўчына,— як вясна!

## АРБІТА

Мой даўні кут несамавіты
Успамінаю, як у сне,
Дзе невялікая арбіта
Была наканавана мне.

Ад саламяных стрэх нішчымных,
Лазой абплеценых двароў,
З пастушай торбай за плячыма,
Між сенажацяў і гаёў —

Кружыў сцяжынамі цяжкімі,
Пакуль свабода не ўзышла —
І між арбітамі людскімі
Мая ўзнялася і ўзрасла.

І ўсцешыла душу і вока —
На колах, крылах, як калі,
Няхай не так ужо высока,
Ды абышла вакол зямлі.

Арбіты ўсё вышэй імкнуцца,
Дзе незлічоны зорны рой...
Хоць мне у космас не крануцца,
Арбіце рады я сваёй!

## ЛЯСНІЧЫ

Жыццё ідзе. Жыццё крынічыць.
І ў кожнай працы воблік свой.
Зайздрошчу я табе, ляснічы,
Прывабнай дзейнасці тваёй.

Між гулу дрэў твой шлях,
І слава
Табе ў вяршалінах гучыць,
Бяскрайні лес — твая дзяржава,
Яе багаццяў не злічыць.

Любуйся з рання да заходу,
Натхнення высіцца запал —
Тут што сасна — салдат прыроды,
А што ні дуб — дык генерал.

А хор птушыны — неабсяжны:
І свой аркестр, і спеў, і свіст,
Калі прыслухаешся ўважна —
На кожным дрэве свой артыст.

Табе ж усіх вядома мова,
І між пявучых жыхароў —
Тысячагодняя размовы
Срабрыстых рэчак, ручаёў.

А ты ідзеш... Табе ўсё чутна,
Тут сцежкі родныя, свае.
Кут партызанскі, кут славутны
Перад табою паўстае.

Ты помніш, як народ збіраўся
У свой лясны, вячысты дом.
Ты помніш — сам, калі змагаўся
Тут партызанам-юнаком.

Ты помніш — у баях харобра
Змаглі мы ворага разбіць.
І так табе на сэрцы добра,
Адно жаданне — жыць і жыць...

А лес расце, як волат быццам,
І з ім ты вышай галавой —
Зайздрошчу я табе, ляснічы,
Прывабнай дзейнасці тваёй!

* * *

Жыццё! Яно праходзіць рана.
Прапішаш ты ці праарэш —
Ад хлапчука да ветэрана
І не заўважыш, дажывеш.
Гады ж былі, што й цяжка верыць —
З мякінным горкім праснаком,
Былі ў лапцях, у зрэб'і шэрым
І з абгарэлым лучніком.
Былі ў нялёгкіх панскіх путах,
Што хоць ты лепей не жыві,
Былі ў вайне, былі ў пакутах,
Былі ў жалезе і крыві.
Ды мне з сябрамі ў маладосці
Прайшлі гады, што й не прысніць,
Гадам тым можна пазайздросціць,
Мы ж мелі шчасце іх пражыць.
Калі ўсіх твары сонцам ззялі,
І больш і больш расло падзей,
Калі, што птушкі, песні мчалі
З раскрытых радасцю грудзей.
А сёння ўсё для чалавека,
Ні сумных гарадоў, ні сёл!
Здаецца мне — спяваюць рэкі,
Азёры, пушчы навакол.
А як спявае наша поле,
З чым тую песню параўнаць?..
Ах, каб такіх гадоў паболей
Мне, ветэрану, падлічаць!

* * *

Калі праз меру суха-суха,
Зпямеюць жоўклыя палі...
А пройдзе дождж — дык ты паслухай,
Прыклаўшы вуха да зямлі.

І хай нішто, што ёсць навокал,
Твайго ўжо слыху не крапе,
А ты пачуеш, як глыбока
Зямля з палёгкай уздыхне.

## ДЗЯРЖЫНСКІ Ў МІНСКУ

Жыву я ў старадаўнім Мінску.
Мне вызначыў прытулак ён
У доме тым,
Дзе жыў Дзяржынскі,
Няхай не многа, колькі дзён...

Я ўжо другога пакалення,
Не бачыў самаго, на жаль,
Але са мной
Гамоняць сцены,
І вокны раскрываюць даль.

Сачу за постаццю высокай:
Шынель, надзеты у паход...
Яговыя чутны мне
Крокі —
У грозны той, дваццаты год.

Вось ён ідзе, усхваляваны,
Прад ім — назбыты даўніх слёз
Народ,
З няволі раскаваны,
З якім ён у маленстве рос.

Чырванакрылы сцяг палошча.
Ідуць на фронт байцоў палкі.
А далей Польшча,
Далей Польшча,
Дзе белапанскія штыкі.

А ён хацеў бы так сустрэцца
І з ёй, шчаслівай ад святла,
І ён імкнецца,
Ён імкнецца,
Каб Польшча вольнаю была.

Яна заўжды ў яговых думах,
Там ў бойках юнаком сталеў,

І за яе —
Сядзеў па турмах,
Шляхамі ссыльнымі гібеў.

Люд працавіты, летуценны,
Дзе меў прыстанне колькі год,
Успамінаў
Таварыш Ленін,
Як выпраўляў яго на фронт.

Было да мэты гэтак блізка,
Ды давялося адысці.
А мары,
Што натхнялі ў Мінску,
Сягоння здзейснены ў жыцці.

Гады прайшлі. Той час мінуўся.
А дом стаіць — прытулак мой.
Сюды Дзяржынскі
Не вярнуўся,
Ды ён заўсёды прада мной!

## ВЯСНОВЫ ДОЖДЖ

Ах, словы, словы, словы, словы...
Жаданых вас не падбяру.
— Які цудоўны дождж вясновы! —
Я моўчкі сэрцам гавару.

А гром, як выбух, як зенiткi,
Усё гудзе... А я люблю,
Як быццам срэбраныя ніткі
Злучаюць неба і зямлю.

А дождж, як хлапчапё пад сонцам,
Бы скача на адной назе...
Са мной гаворыць праз аконца
Па шкле сістэмаю Марзе.

А дождж з душой, як толькі можна,
Прымае яблыняў паклон.
І быццам кропелькаю кожнай
Цалуе вусны кветак ён.

Такі ён цёплы і ласкавы,
Што птушак пазбіраў да гнёзд,
І чую я, як дрэвы, травы
Ідуць, ідуць ў нябачны рост!

# ЯНЫ СТАЯЦЬ, ЯК МАЯКІ...

Ёсць людзі з мудрай галавою,
З нязгаслым сэрца аганьком,
З магутнай сілай і красою —
Мы іх героямі завём.

На іх шляхах, калі разважыць,
Былі нягоды і імгла,
Да іх вядомасць не адразу,
Цяпер праслаўленых, прыйшла.

У сем'ях працавітых, дбайных
На роднай, бацькаўскай зямлі
На свет прыходзілі звычайна
І між усіх раслі, раслі...

І ўсё людзям ахвяравалі,
Іх памяць не сатруць вякі —
Паміж жыцця бунтоўных хваляў
Яны стаяць, як маякі.

## АХ, ЗНОЎКУ Б МАЛАДОСЦЬ!

Няхай жыццё не страчана,
Але мінула штось,
Ах, зноўку б дні юначыя,
Ах, зноўку б маладосць!

Душой высока ўзнесены
Між сёл і гарадоў,
Я б не адну прафесію
Любімую знайшоў.

Каб зноўку праца стрэлася,
Што легла б на душу...
Чаго б яшчэ хацелася?..
Ды лепей не скажу!

Няхай жыццё не страчана,
Але мінула штосць...
Ах, зноўку б дні юначыя,
Ах, зноўку б маладосць.

## ЯНЫ ІДУЦЬ...

Даўно, даўно баі пад Мінскам
Адгрукацелі, адгулі.
Ляжаць байцы пад абеліскам
На беларускае зямлі.

Да родных хат, да родных ганкаў
Ім не дала дайсці вайна,
Ды ім сталіца-партызанка
У маладой красе відна.

І хоць паміж святочных плошчаў
Не бачна іх, ды і не чуць,
У шэрагах між пераможцаў
Яны ідуць, яны ідуць...

## ТОЛЬКІ ЎСПОМНІ...

Калі стомішся ты вельмі
У цяжкі, далёкі шлях,
Быццам ветрык, быццам ветрык,
Пагуляю ў валасах.

Калі спёку, калі спёку
Ты сустрэнеш на бяду,
Я на вусны, я на вусны
Хай хоць кропелькай паду.

Калі твой настрой пагасне
І цябе спаткае зло,
Промнем ясным, промнем ясным
Асвятлю тваё чало.

Я табе параю шчыра —
Гора хмаркай праміне,
Толькі ўспомні, толькі ўспомні,
Толькі ўспомні пра мяне.

## Я СВОЙ ЗБІРАЮ ЎРАДЖАЙ

Нядоўгае жыццё людское,
Глядзі, што скажа час: «Бывай!»
Як быццам з яблыні старое
Я свой збіраю ураджай.

У кош бяру, што варта кошту,
І не хачу абы-чаго —
Апад мінаю. Ён навошта,
Раз голле скінула яго.

Мяне прываблівающь тыя,
Што залацяцца на віду,—
У кош крамяна-налітыя
З любоўю, з гонарам кладу.

Ды каб напоўніць кош з гарою,
Яшчэ не мала падкладаць...
Дык значыць — яблыні вясною
І неаднойчы красаваць!

## ПАЭТУ-СЯБРУ

Гудзе паэзіі прыбой,
Магутны гул-разгон...
І я хачу, каб голас мой
У хоры быў чуцён.

І кожны дбае, каб не згас
Ледзь бачным агеньком,
Спявае хтосьці басам з нас,
А хтосьці — тэнарком.

І я цябе пазнаў, прызнаў,
Што майстра ты.
Аднак
Я не хачу, каб мне сказаў:
— Я сам умею так!

* * *

Вядома нам — усё не вечна,
У кубку поўным ёсць і дно.
Жыццё цікавае, бясспрэчна,
Шкада, што дадзена адно.

Ты ў ім то сумны, то шчаслівы.
І ночы, дні — цямней, ярчэй...
Ах, як мінае час імкліва,
Ды чым далей — усё хутчэй.

Гады ідуць бесперапынку,
А як замнога набярэш —
Ты сам маленькаю адзінкай
Нібы ў гісторыі жывеш.

## ЁСЦЬ СЛЁЗЫ РОЗНЫЯ...

А слёзы йдуць і без разбору
Ў маленстве, ў старасць, ў маладосць...
Ёсць слёзы радасці і гора,
Але й прытворства слёзы ёсць.

Слязіна радасці пры шчасці,
Нібы крышталь ці біруза,
Яна вачэй зусім не засціць,
Душы асветленай сляза.

Інакшая слязіна гора,
Ах, як не лёгка з ёй маўчаць —
Няхай малая — болю гора
У ёй не цяжка распазнаць.

Хто ў слёзах плача, хто смяецца,
Ды ў кожнае характар свой...
Ну, а прытворная здаецца
Пустою кропляй дажджавой!

## БУЛЬБА

Каб толькі мог, дык я б, няйначай,
Даў бульбе лепшую з адзнак —
Ах, бульба, бульба, што за ўдача,
Што за выгода, што за смак!

І са стала, з вялізнай міскі,
Па ранніх, поўднях, вечарах
Маломў мне яшчэ ў калыску
Ляцеў яе прывабны пах.

А давялося добра вызнаць,
Што бульба лепшая са страў,
Калі я сеў за стол вялізны,
Тады ўвесь смак яе пазнаў —

Пячонай, з сокам журавінным,
З капустай, з квасам, з агурком;
Варонай, чыстай ад лушпіння,
Найлепей — з кіслым малаком.

У кашы, салам затаўканай
(Ядзе на хуткую руку),
Ў аладках, драніках прызнаных,
У бабцы смачнай у гаршку.

З каўбаскай, з рознай смажанінай,
Ў малочных клёцках і — з душой...
Лічыць, лічыць усё няспынна,
Ды пералік не скончыць мой.

Ну, а без бульбы што за госці
(Дай на талерку хоць са дзве!),
Няхай сабе жартоўна хтосьці
Мяне бульбянікам заве.

Люблю я бульбу маладую,
Што ўлетку выбераш з зямлі,
Ах, не забыцца мне на тую,
На пасце ўвосень што пяклі.

Якую з прысаку ахвотна,
Бывала, дбайна прыгарнеш,
Якую пожыкам пяшчотна
Ад цёмнай гары адскрабеш —

І ў рот. Няма смачней ядунку,
Што сам ты спёк часінай той,
Ніяк не сутрымаеш слюнкі,
Калі памкнешся за другой,—

Пасля яшчэ... І так бязмежна,
Да бульбы ж вельмі быў ахвоч,
А што казаць пра час належны,
Пра гэта знае толькі ноч.

Ах, бульба-бульба, смак жаданы,
Цябе ж у нас паміж баёў
Варылі ў касках партызаны,
Як не знайсці было гаршкоў.

Яда ў будзёншчыну і ў гульбы,
Яда і ў самы грозны час,
Ой, недарэмна звауся Бульбай
Вядомы сечавік Тарас.

Калі ж няма ні крошкі хлеба,
А бульба ёсць, дык не бяда,
Кажу з паклонам, так як трэба,—
Ты беларуская яда.

Табой здаўна, кажу я пэўна,
Народ усіх нас гадаваў,
І хтосьці ўжо цябе дарэмна
Чарцям на яблыка аддаў.

Я ж адкажу на гэта верпам,
Няма ў цябе такой віны,
Калі ж і чорт спатрэбіў нерны,
Дык чорт, відаць, быў — не дурны.

Ды ліха з ім! А мы загоны
Шырэй пад бульбу аддаём —
І да цябе — заўжды з паклонам,
Бо хлебам і табой жывём!

* * *

Помню змалку,
Помню змалку
Горкіх дзён нямала,
Чорнай галкай, чорнай галкай
Гора прылятала.

Шчасце ж наша,
Шчасце ж наша,
А ці ўдзень, ці ўночку —
Прылятала, прылятала
Белым галубочкам.

# ПАМЯЦЬ

Жыццё, якое ёсць, прымаеш —
То шчасце мець, то гараваць,
А, памяць, ты ж ўсё хаваеш,
Чаго б не варта ўспамінаць.

У дні, ў якія закаханы,
Я і не ведаў, што рабіць,
І тыя раны, тыя раны,
Якіх ніяк не загаіць.

Чаму ж за ўсю жыцця дарогу —
Я дакапаўся ўжо здавён —
Хаваеш светлых дзён не многа,
Наадварот — шмат чорных дзён.

І ўсё ж мы дзякуем сардэчна,
Што можам мы, паміж клапот,
Успамінаць, што з намі вечна —
З малых аж да апошніх год.



П. Броўка, А. Суркоў, А. Твардоўскі.
1960-я гады.



У прэзідыуме юбілейнага вечара,
прысвечанага 70-годдзю паэта. 1975 г.

# Я НЕ ЛЮБЛЮ САМАЎЛЮБЁНЫХ

Зрабіў ён між усіх найменей,
Такога знаю гультая,
А дзе яго мы ні сустрэнем,
Адно пачуем: — Я ды я!..

Сябе самога бачыць вока,
А нос задраў аж да нябёс,
І каб угледзець што далёка,—
Перашкаджае ўласны нос.

* * *

Калісьці я не ведаў мора,
Адно — азёры ды бары,
Ды ўсё ж ушацкія азёры
Здаўна нагадваюць мары.

Калі ты прыйдзеш да любога,
Глядзіш — бязмежнае яно...
Стаіш на беразе. Другога,
Як ні хацеў бы, не відно.

А чаек столькі! Скуль сагналі
Вятры сюды, з дарог сваіх,
Вятры разгортваюць і хвалі,
Нібы старонкі сініх кніг.

І ўміг успыхне, як ніколі,
Жаданне новае знайсці,
І так захочацца, да болю,
Між гэтых хваль у свет плысці!

* * *

Паэты ёсць —
Зіму і лета
Між кніжных полак іхні ход.
Баяцца выйсці з кабінетаў,
Іх мала ведае народ.

Такіх паэтаў —
Кліч не звонкі,
А голас хрыплы, слых аглух.
І пажаўцелыя старонкі
Яны бяруць на псуты нюх.

Крычаць,
Як ледзьве што прыкмецяць,
А іх знаходкі — міражы,
Чытай ды пахадзі па свеце
І штосьці новае скажы!

## ЗАСПЯВАЕ ХОР ДЗЯВОЧЫ...

Заспявае хор дзявочы —
Сэрца растае,
Бо ж у кожнае дзяўчыны
Крылцы ёсць свае.

Што мацней за гэты крылцы?
Ды няма ў жыцці —
Заварожаць і абдымуць,
Месца не знайсці.

А іх крылцы, а іх крылцы
Уздымаюць ўвысь,
І здаецца: разам з імі,
Разам ты ляціш.

Іх узлёту, іх палёту
Нельга сутрымаць,
Сорам, хлопцы, сорам, хлопцы,
Крылцы іх ламаць.

Беражыце ад абразы,
Ад тугі і слёз,
Хай на крылцах узлятаюць
Ажно да нябёс.

Заспявае хор дзявочы —
Сэрца растае,
Бо ж у кожнае дзяўчыны
Крылцы ёсць свае!

## ПРА СМЕРЦЬ

Такая ўжо прыроды воля —
Калі на свет жыццё даюць,
Мы ўсе з'яўляемся без болю,
А маці боль за нас нясуць.

Усё пасля сустрэцца можа —
І гаравать, і палымнець...
Жыццё ж найболей так прыгожа.
Але стаіць на варце й смерць.

А ў смерці ёсць адна задача:
Хутчэй зламаць, забраць з сабой.
З маленства я яе пабачыў,
Намаляваную з касой.

Знаходак у яе багата:
Калі не даражыш сабой,
Ды і калі баішся надта —
Хутчэй сустрэнешся ты з ёй.

Хоць прыйдзе час усіх, нарэшце,
Як ні спрыяў бы ты сабе,
Калі ж не думаеш аб смерці —
Смерць адступае ад цябе.

## УСЁ З ЛЮБОЎЮ

Шчаслівы той,
Каго натхніла
Адно з прыгожых, ціхіх слоў.
Ах, што за моц
І што за сіла
У слове, што гучыць: любоў!

Яго, куды ні стаў,
Дык стане,
І загарыцца бляск вачэй,
Я не кажу ўжо пра каханне —
Аб ім размовы гарачэй.

Любоў —
І пачуццё святое
З грудзей ўздымаецца, калі
Любоў да існасці людское,
Любоў да неба і зямлі.

Любоў штодзённая
Да працы,
Любоў, каб новае адкрыць,
Любоў шукаць і дамагацца
І да ўсяго, з чым добра жыць!

Любоў —
Вялікая патрэба.
Ва ўсім не след яе губляць.
Упэўнены:
З любоўю трэба
І двор надмесці і прыбраць!

* * *

— Чаму так сонца чырванее
У свой заходні час?
— Таму што з працы аж да поту
Пачырванее ў нас.

— Чаму ж, узняўшыся з-за мора,
Чырвоным нам відно?
— Ды, паглядзеўшыся на гора,
Наплачацца яно.

## Я АДЗІНОКІМ НЕ БЫВАЮ

Бывае так:
Паміж клапотаў,
Між працы, тлумных вечароў
Агорне часам адзінота.
Ані найблізкіх, ні сяброў.

Здаешся ты
Зусім адзіным —
Нямая пустка навакол.
Між гор, па вузкай каляіне,
Гатовы кінуцца на дол.

Такога часу
Не багата.
Калі ж у грудзі ён залез,
Я зачыняю дзверы хаты
І падаюся ў блізкі лес.

— Дзень добры,
Елкі і сасёнкі!
— Дзень добры, стужкі-ручаі!
І вось ужо ідзе гамонка,
І свой ты у лясной сям'і —

І славіць
Асака латоку,
Пад ветрам дорачы паклон.
Гудзе пра сілу дуб звысоку,
І нешта шэпча шустры клён.

І па зялёных
Скача ўзгорках
(Так прыгадаецца здалёк),
Па ўсіх вяршалінах вавёрка,
Як рыжаваты агапёк.

Стракозы —
Быццам самалёты.

Цвіркуюць конікі ў траве.
Ну дзе, якая адзінота —
Усё хвалюецца, жыве!

І цягне ў верш,
Бо ты ім родны,
Хоць ты на лісціку пішы.
І ўжо на сэрцы так лагодна,
І так ласкава на душы!

## Я ЎСЁ СВАЁ АДДАМ!

Наш час —
Вяшчун чырвоназорны,
Нязгаслыя агні.
І нельга пуста, безвіхорна
Пражыць такія дні.

Мне далі
Нашы дні адкрылі.
Я ўдзячны. І таму,
Што мне па розуму, па сіле,
Я ўсё сваё вазьму.

І ўзгадаваўшы
Песень крылы,
Насустрач новым дням,
Што мне па розуму, па сіле,—
Я ўсё сваё аддам!

## БРАХУНЫ

Назваўшы думкаю свабоднай
Прадажны подлы голас свой,
Як з ланцуга эфір заходні
На нас кідаецца з брахнёй.

Ах, колькі там сумленнем грэшных
І што надумалі яны,
Паслухаеш — і злосць, і смешна:
— Ах, брахуны вы, брахуны!..

Плятуць, што нібы ў іх краінах
Рабочы можа зарабіць
За год ажно на тры машыны
Ды асабняк яшчэ набыць.

Там кожны, што захоча, можа,
Абы паважыўся як след,—
У цікавейшым падарожжы
Аб'ездзіць нават цэлы свет.

Купляй усё, што толькі ў модзе,
У банку грошы ашчаджай...
Ах, як прыгожа ў іх выходзіць,
Ды гэта ж проста цэлы рай!

Усім вы баіце суцешна,
Што раю там няма цаны...
Паслухаеш — і злосць, і смешна:
— Ах, брахуны вы, брахуны!

Я ж бачыў сам. Ды не адзіны,
Чаго пра рай другі вярзе,
Чаго, хто дзве набыў машыны,
Стаіць за працаю ў чарзе!

Навошта вучаць вас пляткарыць
І бессаромна. Гэта ж так!

Чаму тої спіць на тратуары,
Хто мае ўласны асабняк?

Чаму аб гулях, аб раскошы
Ўздымаеце вы гэткі звон,
Навошта, меўшы ў банку грошы,
Талерку супу просіць ён?

Няўдумна кроіце, паспешна,
Хітрушчы вашы ўсім відны,
Паслухаеш — і злосць, і смешна:
— Ах, брахуны вы, брахуны!

* * *

Калі з яе глыбінь напіцца,
Памножыш сілы ты свае,
Паэзія — нібы крыніца,
Што не з зямлі, а з сэрца б'е.

Яна і сумаваць паможа,
І веру дасць далей ісці,
Усё ў ёй ёсць: і смех, і слёзы,
Усё магчыма у жыцці.

Яна і на працу разам крочыць,
З ёй жыць лягчэй, мацней кахаць.
Хто паспытаў з яе аднойчы,
Таго праз век не адарваць.

## ЯК УЗДЫМАЕЦЦА СОНЦА

Сонца штодня ўзыходзіць, радасць жыццёвую дорыць,
Не толькі з-за бору, з-за гор, не толькі з-за мора.

Сонца ўздымаецца раннем, сыплючы промні сустрэчы,
З сэрцаў, вачэй, з думак-задум чалавечых.

Сонца драбок у грудзях з нас кожны
ў жыцці сваім носіць,
Помню восень, калі сонца вышэй узнялося.

Сонца чырвоных сцягоў над роднаю нашай зямлёю —
Сонца ў кожным акне і сонца са мной і з табою!

## АХ, СЭРЦА!..

Ах, сэрца!.. А тваім жаданням
Няма мяжы, няма мяжы —
Патрэбен летні жар кахання
Ды і вясновыя дажджы;

І восень з лістападам звонкім,
Мятлюга ў снежную зіму...
Патрэбна гулкая гамонка
І тайна толькі аднаму.

Ужо і час майго змяркання,
А дзе спакой, а дзе, скажы?..
Ах, сэрца!.. А тваім жаданням
Няма мяжы, няма мяжы!

## ВАЗЬМІ МАЁ СЭРЦА, ТАВАРЫШ!

Вазьмі маё сэрца, таварыш,
І смела па свеце вандруй,
І хай твае збудуцца мары,
Ды толькі свайго не шкадуй!

Каб гора не ведаць ці зморы,
Ты сэрцам сваім надзялі,
Каб мог я вясёлы, бадзёры
Бясконца хадзіць па зямлі.

Вазьмі маё сэрца, таварыш,
І смела па свеце вандруй,
І хай твае збудуцца мары,
Ды толькі свайго не шкадуй!

## НЕЗАБЫЎНЫ МАЙ

У кветкі луг прыбраўся,
Спяваў зялёны гай,
Ах, як ты красаваўся,
Той незабыўны Май!

Пра радасці і ўцеху
Сказаць я не магу...
А ты, а ты паехаў
Ў сібірскую тайгу.

Насустрач ты падаўся
Далёкае вясне,
Прашу, не забывайся
Ніколі пра мяне.

Працуй, працуй старанна,
Дарогі пракладай,
Ды не шукай каханак,
Адну мяне кахай.

Прыедзеш ты, я знаю,
На родную зямлю,
Бо я цябе чакаю,
Бо я цябе люблю.

А здарыцца такое —
Прывабіць новы край,
Дык ты мяне з сабою,
З сабою забірай!

## СПОВЕДЗЬ САБЕ САМОМУ

Ну што ж, пра гэта і нікому
Другога не сказаць чаго —
Я не прасіў жыцця, вядома,
Але я ўдзячны за яго.

Мне продак пэўны шлях азначыў,
Дый сам шукальнікам я быў.
І многа-многа перабачыў,
І многа-многа перажыў.

Парою час губляў. І шкода
Таго, што дарма адышоў,
Ды ёсць па сэрцы асалода,
Што нешта я і ў ім знайшоў.

Жыццё і радасцю, і болем
Маю дарогу спавіло.
Але такіх гадоў найболей,
Як сэрца ўцехаю цвіло.

Былі ж гады (ды іх нямала) —
Не меў спакойнага жыцця,
І нада мною навісала
Не раз пагроза небыцця.

Ды змрок знікаў. Ясnелі вочы.
Жыцця гудзеў нястомны вал.
І я, бадзёры, зноўку крочыў,
Цяжкі мінуўшы перавал.

## КНІГАЎКА

У птушак назвы і мянушкі —
Часамі дзіўна і пачуць.
І ў нас адну малую птушку
Чамусьці кнігаўкай завуць.

А можа, кніга ёсць ў прыродзе,
Яна вядома толькі ёй.
— Кігі...— чытае і адводзіць
Ад хаткі з дробнаю дзятвой.

Глядзіш, і кніга ёй пасобіць,
Спрабуй знайдзі тых немаўлят.
Што ні кажы, а мудра робіць,
Бы мае школьны атэстат.

Відаць, у тым і сэнс вялікі,
Што назва гэткая твая,
Бо спеваком ды і музыкам
Завуць з любоўю салаўя.

* * *

Бывала так,
Што ледзь не гінуў,
Ды шчыра вам скажу,
Як і належала мужчыну —
Скупы быў на слязу.

А слёзы ўбачу —
Сам заплачу...
Ды ад людзей хаваў.
І каб таго ніхто не ўгледзеў —
Употай выціраў.

* * *

Зімовы час і без віхуры
Імкнецца да майго жытла,
Ды неспакойная натура
Усё жыццё маёй была.

Мне кажуць:
— Стань нарэшце сталым,
А ты не ўрымсцішся нідзе,
Бо маці, як відаць, купала
Цябе ў гарачае вадзе.

Ну што ж, мяне — я згодзен з імі —
Так маці здолела сагрэць,
Што я і сёння з маладымі
Хачу на працы палымнець.

У людзі йсці, у цэх, у поле,
Каб вершам скрозь нагрузку меў,
І чымся ў хаце тлець паволі,
Хай лепей скажуць:
— Ён згарэў!

* * *

Каб з круп знікалі пыл, лушпінне,
Каб іх святлела чысціня,
Дык мела спосаб гаспадыня —
Вымала рэшата штодня.

І зерне з пылам насыпала,
І трэсла з сілай, то лягчэй,
І так ссыпала, рассыпала,
Пакуль не цешыла вачэй.

Бываюць вершы і такія
У нас, паэтаў, у жыцці,
Папросту кажучы, благія,
Што ў іх і ладу не знайсці.

Ані красы, ні дум у змесце,
За смеццем сэнсу не відаць...
І нам бы рэшата завесці:
Радкі ад пылу адсяваць.

## МАЯ УШАЧКА

Мая маленькая Ушачка,
Спачатку ты —
Лясная плачка
Ды з камянька па камянёк —
Яшчэ рывок,
яшчэ рывок,
І ўжо дзяўчынаю гарачай
Ты даплываеш да Ушачы.

Пасля, набраўшы сінізны,
Аж да Заходняе Дзвіны,
Яшчэ далей —
Дзе полем,
борам —
Да Балтыкі ідзеш у мора.

Калі я словы падбіраў,
Я чуў —
верш сілу набіраў,
Ён шчасным быў і небаракам,
Ён і смяяўся, ён і плакаў,
З камення падаў,
але й рос
Між камянёў і між бяроз...
Але сцвярджаць таго не стану,
Ці дойдзе ён да акіяна.

# БЕЗ КРОКАМЕРА

Цяпер хадзіць няма клапотаў —
Лічыльнік крокаў хтось знайшоў,
А я зямлю сваю ў ахвоту
Без крокамера абышоў.

За плечы ўзяўшы торбу з хлебам,
Пры скораме па добры лад
За дзень праходзіў пры патрэбе
Па кіламетраў пяцьдзесят.

Лясоваю дарогай звычнай
Не цяжка ягаду знайсці,
Дый запіваў вадой крынічнай,
Якую цяжка абысці.

Хадзіў адзін. І з кім хоць слова
Прамовіць там было, калі? —
Адно што — з птушкамі размовы
Мне ўсёй забаваю былі.

Было ў дарозе весялосці,
Не меў я часу сумаваць,
Бо столькі бачыў прыгажосці,
Што цяжка нават апісаць.

Любуешся сцяжынкай шустрай,
Што кліча ў лес пакінуць след,
І што ні возера, дык люстра,
Што ні гаёк — задумны дзед.

Бярозак на шляху найболей,
А і такіх прысадаў шмат,
Дзе, як салдатаў, тых таполяў
Панастаўляна рад у рад.

Ну, а ў канцы, пры іх, найпачай,
Каб аглядаць бязмежны шыр,

Магутны дуб а так маячыць,
Ну, як сапраўдны камандзір.

Ажно пад неба шапка-шаты,
А моцы у руках-суках,
А жалуды, як аксельбанты,
Паміж галінаў па грудзях.

Пры генерале невялічкі
Ручаї з празрыстаю вадой,
А воддаль груша, груша-дзічка
На ўзгорку — поля сіратой.

Дзе ні хадзіў, краса такая,
Другое нават і не сніў...
Ды ўсё ж усім я спачуваю,
Хто на Вушаччыне не быў!

* * *

Тысячагоддзі ў час лучыны
Ледзь вынаходзіў штосьці люд,
А мы жывём у век машыны,
І кожны дзень —
За цудам цуд.

То там, то там
Мы дзіва чуем,
Хоць ты на веру не бяры,
Ужо ёсць робаты —
Працуюць.
Ды і спрабуюць гаварыць.

А можа, й рыфмы адшукаюць
Ды і напішуць нейкі верш.
Адна ж машына —
Падлічае
Чым сто бухгалтараў найлепш.

Я веру,
З часам лепей, вышай
Яна кранецца розных тэм,
Ды не напіша, не напіша
Ніколі пушкінскіх паэм
Аніякая ЭВМ.

## ЯК БЫЦЦАМ ВОЛАТЫ СТАЯЦЬ...

Часіна новая настала,
Раней не мелі з'яў такіх,
Гляджу на дзіўныя кварталы
Мікрараёнаў гарадскіх.

Гляджу, любуюся дамамі,
Як быццам волаты стаяць,
Нібы разумнымі вачамі
Яны на нас усіх глядзяць.

І ўдзень і ўноч глядзяць няспынна,
Глядзяць на горад свой, герой,
За кожным за акном сябрына,
Сваё жыццё і клопат свой.

Умельства іх нічым не змераць,
Майстры ў жыцці свой значаць след.
Ёсць дактары і інжынеры,
Вучоны ёсць, і ёсць паэт.

У вокны тыя ўвечар, рана
Глядзіць шмат сталых і малых,
А колькі там і закаханых
З надзеяй пазірае з іх.

Такіх дамоў ужо нямала —
Аж дабіраюцца да сёл,
Растуць, растуць увысь кварталы,
Іх з кожным годам больш наўкол!

# ДОБРЫ ДЗЕНЬ!

Як я выйду на світанні,
Чую дрэвы і траву:
— Добры дзень, таварыш ранні!..
Я схіляю галаву.

Бачу шмат асобна, купна
Я рамонкаў з васільком:
— Добры дзень, таварыш рупны!..
Нахіляюся чалом.

Колькі сцежак разнастайных
Рассыпаюць пчолак звон:
— Добры дзень, таварыш дбайны!..
Аддаю я ім паклон.

Я іду пад небам ясным,
Чую — ветрыкі пад ім:
— Добры дзень, таварыш шчасны!..
Шчыра дзякую я ўсім!

## ПЕРШЫ ДЭЛЕГАТ

Паверыць у смерць не магу ні на міг,
Памерці не мог ён:
Памылка, няйпачай.
Заўсёды жывога між мужных жывых
Я Леніна бачу!

Да сонца ён вывеў дзяржаву з-за хмар.
Дапытлівы розум
Спакою не мае,
З суботнікаў першых
Адказны цяжар
З плячэй не здымае.

На працы ад рання да вечара ён:
Для сталі
Руду здабывае крутую,
Кладзе ў Енісей
Найтрывалы бетон
І ў бітве за хлеб
Перамогу рыхтуе.

Ён словам знішчае брахню чужаніц,
Прадажных двурушнікаў
Лютую зграю.
Стаіць між дазорных на варце граніц
І ў космас з адважнымі першы ўзлятае.

Размах яго спраў
Сёння свету відзён,
Усюды
Цяпло яго сэрца пазналі.
Наведаў планеты далёкія ён —
Сусвету раскрыў яспазорныя далі.

Няма перашкод —
І не будзе такіх! —
Каб думак ягоных
Пазбавіць народы,

Бо ён, неўміручы,
Жыве між усіх
І ў будні, і ў святы навечна,
Заўсёды.

На плошчы Чырвонай у моры сцягоў
Жыве ён у сэрцах
Адданых, гарачых,
Між вучняў ягоных і верных сыноў
Я Леніна бачу!

Ідуць камуністы да свята свайго,
Ідуць камуністы
На з'езд свой крылаты,
І першым на з'ездзе мы бачым яго
Сярод дэлегатаў,
Сярод дэлегатаў!

## НА МЯЖЫ ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ

Ты яшчэ пядаўна як з калыскі,
Я ж з даўно задуманай прамовай.
Добры дзень, мой сябра, сэрцу блізкі,
Добры дзень у двухтысячагадовым.

Хай мяне не будзе, ты паверыш
Гэтым словам шчырым і гарачым,
Хоць я размаўляю на паперы,
Я цябе жывога быццам бачу.

Тое, што мы сеялі — збіраеш,
Дадаеш на поўныя прыгоршчы,
І найперш за ўсё сказаць жадаю,
Што табе надзвычай я зайздрошчу.

Дзень жа твой у самай яснай поўні,
Мы ж жыццё і хмурае пазналі,
Ты жывеш у тым грамадстве сёння,
За яго жыццё мы аддавалі.

Я цябе віншую з грамадою,
У якой няпраўды быць не можа,
Тое ж неба й сонца над табою,
Ды зямля змянілася прыгожа.

Ад ламачча, хлуду ўся прыбрана,
І нідзе бутэлечнай абразы,
Скрозь палі, а так распланаваны,
Хоць садзіся ды малюй адразу.

Дзе сады, а дзе пшаніц бязмежжа,
Сажалкі й каналы засінелі,
Мы ж жылі — разбітыя на межы,
Не жылі, больш правільна — гібелі.

Пекната ўсіх ваша захапляе,
Воблік сёл утульны і вясёлы —
Люстрамі паверхаў пагдядаюць
Гарадкі, не колішнія сёлы.

Школ і ясляў для дзяцей багата,
Каб раслі, як птушкі, гамапілі...
Мы ж жылі — у гэткіх курпых хатах,
Вы б туды жывёлу пе пусцілі.

Вам паехаць выпадзе ахвота,
Будзеш там, дзе толькі пажадаеш,
На аўто, а трэба — самалётам
Праз гадзіну ў сябра пабываеш.

Хоць куды адкрыта вам дарога,
Блізка вам уся як ёсць Радзіма...
Нам кіёк адзін быў дапамогай
І, вядома, торба за плячыма.

Суткі мы хадзілі да павету,
Ты ж за суткі, у свой час, вядома —
Злётаеш па іншую планету
І адтуль павернешся дадому.

І табе нішто не пагражае,
Чалавецтва больш вайны не хоча.
І яшчэ, яшчэ паведаць маю,
Што табе надзвычай я зайздрошчу.

А калі ты вельмі пажадаеш,
Ты да пас наведаешся ў госці —
Пра гады пра нашы пачытаеш,
Дык і пам нямала пазайздросціш!

Як ішлі мы повымі шляхамі,
Як раслі і ў працы і ў змаганні.
Мы ўжо блізка падышлі і самі
Да тваёй часіны красавання.

А сцягі ляцелі нашы роем,
Як ішлі мы з Леніным па волю.
Мы жылі і бачылі такое,
Што ўжо больш пе ўбачыцца ніколі.

Я цябе паклікаў да размовы,
Бачу, задаволены ты быццам,
Добры дзень, двухтысячагадовы,
Нам абодвум ёсць чым пахваліцца!



Пятрусь Броўка з жонкай Аленай Міхайлаўнай
на дачы. 1975 г.



Пятрусь Броўка ў Ялце.
Верасень, 1974 г.

## ІДЗІ ПРАЦУЙ!..

Ідзеш па вуліцы з пагардай.
Ледзь паглядаеш спадылба,
І барада, і бакенбарды,
І валасы, як у папа.

А куртка, куртка, дайце веры,
У нейкіх плямах, проста жах,
Ды і ў стракатых, аж праз меру,
Ці то ў спадніцы, ці ў штанах?

З якога ты грамадства, культу,
Які ты ўвасабляеш час?..
А я ўсё думаю — адкуль ты,
Адкуль такі з'явіўся ў нас?!.

Відаць, не ўзрос на ўласным хлебе,
Вучыўся і рабіў не шмат,
Ды за цябе і жаўра ў небе
Шырэйшы мае далягляд.

---

Не, гэтак сёння жыць не можна,
За дзікай модаю паўзці...
Ідзі працуй, пакуль не позна,
Сябе ты знойдзеш у жыцці!

## ВЕЧНЫ АГОНЬ

Вечны агонь
Ніколі не чах.
Вечны агонь —
У сэрцы,
          ў вачах.

Ласкай і гневам
Вечна гарыць.
З вечным агнём
Нам суджана жыць...

Вечны агонь —
Славутыя дні,
Бачу герояў
У вечным агні.

Жменьку зямлі
Бяру на далонь —
Чую зямлі
Вечны агонь.
Вечны агонь!

## НЕ, ВАМ НІКОЛІ НЕ ПАМЕРЦІ!

Зямля! Не ведала ты, мусіць,
Такіх пакут паміж вякоў —
Ах, колькі легла ў Беларусі
Яе дачок, яе сыноў.

А колькі, сэрцамі адданых,
Між дзён суровых і цяжкіх —
Братоў, сясцёр тут пахавана,
Што ратавалі нас усіх.

Мне гэта ўсё да болю блізка,
І я ўспамінамі жыву,
Дзе ні іду ля абеліскаў —
Схіляю нізка галаву.

Дзе ні іду між ніў шляхамі,
А ці ў барах паміж галля,
Дык мне прымроіцца часамі —
Нібы шавеліцца зямля.

Не, вам ніколі не памерці,
Што разам з намі ў бой ішлі —
Ў чырвоных кветках вашы сэрцы
На Беларусі расцвілі!

## АДНА СЯМ'Я

Усім, усім па свеце цэлым
Адна зямля,
Адна зямля.
І людзі — чорны, жоўты, белы —
Адна сям'я,
Адна сям'я!
Жыві, расці, працуй на славу,
А працы шмат.
Ніхто, ніхто не мае права
На здзек і гвалт,
На здзек і гвалт.
Павінен быць народ народу,
Як родны, свой.
Ды ёсць яшчэ зашмат прыгнёту —
Бяды цяжкой,
Бяды цяжкой.
Расіст і кат — то ж безумоўна —
Адна гайня,
Хоць я па скуры з імі роўны,
Ды не радня,
Ды не радня!
Хай кожны ланцугі зрывае,
Яшчэ іх шмат —
Табе, табе я спачуваю,
Мой чорны брат,
Мой жоўты брат!
Да вас імкнецца — дужых, смелых,
Душа мая,
Бо людзі — чорны, жоўты, белы —
Адна сям'я,
Адна сям'я!

## АХ, КАБ Я МОГ!

Ах, каб я мог
Без стомы ног
Прайсці яшчэ
Мільён дарог.
Пракласці след
Праз цэлы свет,
Людзей пазнаць,
Паклон аддаць
З усіх дарог...
Ах, каб я мог!

Як быў бы рад
Знайсці той сад,
Дзе я хадзіў шмат
Год назад,
Калі ён цвіў,
Адну любіў...
Прыйсці назад
Як быў бы рад!

Ах, каб я мог
Знайсці той рог,—
Каб затрубіць
На высь, на лог,
Зноў юным стаць,
Сяброў сабраць
На братні сход
З усіх дарог...
Ах, каб я мог!
Ах, каб я мог!

* * *

Гадам чым далей, болей ліку,
Усё часцей разважыш ты:
— Жыццё, няйначай, бор вялікі,
Зялёны, стромны і густы.

Над ім то хмары табунамі,
То спёка сонца... Што калісь...
І між стагоднімі дубамі
Падлеткі-сосны мкнуцца ўвысь.

Бываюць буры ўдзень, і ўвечар,
І ўноч, ажно гудзіць зямля,
Ды ўвесь цяжар бярэ на плечы
Яго шматлікая сям'я.

Любуюся сям'ёй такою —
І моцны гарт і дружны спеў...
Стаіць адзіны — сухастоем.
Ды невядома, хто пад'еў?

Ці то чарвяк лясной зямлі,
Ці то няўрымслівы дакор,
Ці мо карэнні падгнілі,
Што рос усім наперакор?

А трэба ў радасць і ў напасці
Не адрывацца ад усіх —
Жыццё, жыццё! Якое шчасце
Быць хоць маленькім між усіх!

## КАПЛІЦА І РАКЕТА

Пакора цярпення, пакора маўчання,
Адзіная ўцеха людской беднаты,
Капліца, капліца, на ўсіх скрыжаваннях
Стаяла між вёсак стагоддзямі ты.

І кожны спыняўся, жагнаючы грудзі,
Над кожным таемнай была высакосць,
Маліліся, плакалі, верылі людзі,
Што ў небе ля бога ратунак ім ёсць.

А бацьку і ўнуку ад дзеда йшло гэта,
Хоць вера слабела, ды ўпрытай жыла,
І вось, як маланка, ўзляцела ракета,
Ды бога між зораў нідзе не знайшла.

Капліца, капліца, дарма ты чмуціла
Людзей і ў цямноце трымала праз век,
Бо нашай планеты і розум, і сілу
Стварыў не ўсявышні, а бог-чалавек!

* * *

Куды ад роднае бярозы
Я плыў за мараю якой,
Кірунак мне даваў мой розум,
А сэрца, сэрца — ветразь мой.

І ў ясны дзень і ў дзень пахмуры
Мінаў я рыфы не адны,
Ды прад ніякаю віхурай
Ніколі не згінаў спіны.

Я зведаў радасць, і турботы,
І засмучэнне не адно,
Але праз град, праз золь і слоту
Было жаданае відно!

* * *

Ты мне здавалася адзінай
На цэлы свет сваёй красой,
Калісьці вабіла сцяжына,
Дзе сустракаліся з табой.

Ах, колькі год з таго мінула,
Ды сцежка ў сэрцы назаўжды.
Як быццам песенька імкнула
Ў гаёк сасновы маладьі.

Я быў вясёлы і шчаслівы,
Як слухаў твой і смех і спеў,
Але навошта так імкліва
Той час жаданы праляцеў.

Ані той сцежкі, мне знаёмай,
Стаў гай старым, як пагляджу...
Цябе няма. Усім вядома.
А я ў той гай хаджу,
Хаджу!

## НАЙЛЕПШ У РОДНАЕ ЗЯМЛІ

Ідаць, спачыць, калі загінеш,
Найлепш у роднае зямлі —
Ляжыць зямляк у дамавіне
З тых сосен, што пры ім раслі.

У веснавыя сеяў ранні
Жыты, пшаніцы і аўсы —
Спяваюць песні развітання
Яму журботна каласы.

Шумяць над галавой бярозы,
Якія некалі садзіў,
Спусціўшы аж да долу косы...
З бяроз тых сок гаючы піў.

Кахаў зямляк, меў голас звонкі,
Клаў бёрны гулкія ў вянкі,
І да яго прыйшлі рамонкі,
Чабор, мядункі, васількі.

Ляжыць зямляк, а я дык мару,
Мо не памёр ён, можа, спіць?..
Плывуць яму ўсё тыя ж хмары,
І той жа самы гром грыміць...
Але яго не разбудзіць.

## СІРОТЫ

Ах, колькі мы сірот зазналі
Даўней па вёсках — проста жах!
Яны ж, бяздомныя, блукалі
І па мястэчках, гарадах...

У зрэб'і, з торбаю нямала
Сірот пабачыла сяло.
Гарышчы, брудныя падвалы
Для іх прыпірышчам было.

Ані кутка, ні родных хатак!
А колькі іх было такіх,
Што змалку ні бацькоў, ні матак
Яны не ведалі сваіх.

На іх, худых і заняпалых,
Было балюча паглядзець.
Нішто пакутных не чакала,
Штодзень іх забірала смерць.

Хто гінуў з рознае напасці,
Хто ж торбу да скančэння нёс...
Якое ж гэта сёння шчасце,
Што іншы ў нас дзіцячы лёс!

Калі ж і выпадзе застацца
Дзе аднаму з маленькіх год —
Дык дзякуй,— ёсць Дзяржава-маці,
Таму і ў нас няма сірот!

## ЗАСУМАВАЎ...

Засумаваў, прызнацца, Броўка,
Ды і відаць, што
Недарма —
Мае сябры,
Мае сяброўкі,
Ах, колькі вас ужо няма.

Знайшлі прытулак свой астатні
У часе боек агнявых —
Хто партызанамі —
Ў змаганні,
Хто на дарогах франтавых;

Хто на будоўлі,—
На заводзе,
На родных гонях змагары,
А хто, як кажуць, у народзе —
Пакінуў нас і без пары.

А я іду яшчэ ў паходы,
Няхай
Са срэбнай галавой,
І дзе б ні йшоў я,
Вы заўсёды —
Плячо ў плячо — усе са мной.

Мы выйшлі ў даль
Сваёй краіны,
Сябры — юначкі, юнакі,
І хто застаўся, той павінен
Дайсці за ўсіх —
Наказ такі!

## ЧАКАННЕ

Надзеі. Хваляванні.
Бясконцыя ўвесь час.
Усё жыццё — чаканне,
Яно ўскрыляе нас.

Калі ты сам зашпіліш
Сарочку, як найлепш,
Калі буквар асіліш,
Калі ты падрасцеш,—

Каб лёгка і вясёла
Стрэць кожную з патрэб,
Калі ты скончыш школу,
На ўласны пойдзеш хлеб!

Калі прыйдзе прызнанне
Ўсіх якасцяў тваіх
І шчаснае каханне,
Найлепшае з усіх!

І як сям'я складзецца,
Як з'явіцца пара,
І як узняцца дзецям,
І ўнукам,
І пра-пра...

І кожны так жадае
Дабра сваім гадам...
А я чаго чакаю?
Ды шмат.
Я знаю сам!

## ДАРУЙ, РАКА!

Чыя бязглуздая рука
На твар твой
Сыпле бруд, грабе...
Даруй, рака,
Даруй, рака,
Што недагледзелі цябе.

Я крыўду чую,
Хай без слоў.
І адчуваю твой цяжар,
Што смеццем, брудам з берагоў
Закрылі твой празрысты твар.

Хіба не ведала рука,
Што шкода робіцца сабе,
Даруй, рака,
Даруй, рака,
Мы недагледзелі цябе.

Але пазбавім ад пакут,
Зноў будзеш
З тварам маладым,
Прыберам смецце, розны хлуд,
Табе загінуць не дадзім!

На радасць людзям,
У вяках
Твой твар заіграе малады...
Даруй, рака,
Даруй, рака,
Цябе пазбавім ад бяды!

## КУРЛЫ-КУРЛЫ...

Як пазаве нябёсаў шыр —
«Курлы-курлы» —
Іх кліч адзін...
Хто ў жураваоў за камандзір,
Што так будзе востры клін?

Відаць, заслужаны.
З такіх,
Якому невядомы страх,
Ён і мацнейшы ад усіх,
І шмат разоў праплыўшы шлях.

А першаму —
За ўсім сачыць,
Мінаць віхуры, туманы...
«Курлы-курлы» — за ім гучыць,
Што задаволены яны.

* * *

Мяне чужынец,
Мо на жарты,
Спытаў часінаю адной:
— Адкуль ты гэтакі упарты,
З чаго ён склаўся, воблік твой?

— Хіба не чуеце,
Мой голас
Я ўзяў з бярэзінскіх бароў,
А колер воч, блакіт вясёлы,—
У крынічных колерах знайшоў.

А валасы,
Як мне здаецца,—
Ад выспелых жытнёвых ніў,
Ну, а галоўнае —
Я сэрца
Ад зор маскоўскіх запаліў.

* * *

Хвароба,
Што супроць ты маеш,
Што за таемны нораў твой?
Дарма!
Мяне ты не зламаеш,
Я не схілюся прад табой.

Якая б ні была
Цяжкая,
Упраў знойдуць дактары,
Яны мне шмат дапамагаюць,
Мае жаданыя сябры.

Адкуль, хвароба, ты ўзялася?
А я, з настроем —
Жыць і жыць,
Цябе адолею, не здамся,
Мне шмат яшчэ чаго рабіць!

* * *

Ты кажаш,
Што я дужы, быццам...
Адкуль жа
Сіла мая ўся?

Ад вод рачулкі
І крыніцы,
Ад зерняў жыта і аўса,
Ад бульбы, морквы і капусты,
Гароху, бобу, агуркоў,
Ну, а яшчэ —
Ад скваркі тлустай,
Ад розных ягад і грыбоў,
Ад груш і сліў, ад гарбузоў...

І не злічыць, чаго люблю,
За ўсё я дзякую зямлю!

## ЧАКАЎ Я АДКАЗУ...

Вочам дзявочым, што ў сэрца запалі,
Пісаў я пісьмо, як сады красавалі.

Ды ў вочах дзяўчыны — калодзезь таемны,
Чакаў я адказу, чакаў я дарэмна.

Чакаў. І да болю мяне хвалявала,
Бо, бачыў, увагі яна не звяртала.

І думаў — яна не стрымала сакрэту.
Здавалася, ведалі шмат хто пра гэта.

Найболей жа той, што і сам заляцаўся,
Нібы пры сустрэчы з мяне насміхаўся.

Дык, вось ён характар суровы, дзявочы,
А я ж спадзяваўся на сінія вочы.

Яны ж мне нанеслі глыбокую рану,
Каб ведала толькі, пісаў як аддана:

— Ратуй маё сэрца! — прасіў я ў маленні
І літарай кожнай стаяў на каленях.

Яна ж мо на іх і не глянула разу,
Дарэмна,
Дарэмна чакаў я адказу.

## ЗМЯНІЎСЯ ТОЛЬКІ ВОБЛІК ВАШ

Няхай гады і праляцелі...
Ва ўсіх бывае не інакш,
Ды з вамі мы не пастарэлі,
Змяніўся толькі воблік наш.
Хай твар маршчыны працінаюць,
Нібы шляхі, што мы прайшлі,
Я вас такімі ўспамінаю,
Якімі некалі былі.
Хлапечы жарт і смех дзявочы,
Дзе б ні сышліся, хоць на міг,
І тыя вочы, тыя вочы...
Здаецца, больш няма такіх.
І тыя хустачкі — заранкі
З чырвоным, зыркім агеньком,
І пашарпаныя скуранкі,
Шаломы, кепкі над віхром,
І тая дружба. Болей цеснай
Няма на памяці маёй,
І тыя песні, тыя песні,
Што хоць адразу — смела ў бой!
Мы ўжо дзяды. А як інačай?
І ўнукі ёсць, як спарышы.
А калі й сёння вас пабачу —
Вы камсамольцы па душы.
Няхай гады і праляцелі...
Ва ўсіх бывае не інакш,
Ды з вамі мы не пастарэлі,
Змяніўся толькі воблік наш.

* * *

Калі на ўзлессі, ля сасёнак,
Шукаў я тэму на вясне,
На вуха мне шапнуў рамонак:
— Ты напішы лепш пра мяне...

— Цябе ж усе ў вянках насілі,
Табою кожны варажыў...
Ён пацягнуў мяне, шматкрылы,
Ды так, што сэрца захапіў.

— Па даўняму, былому следу
Я павяду цябе й сябе,—
Ах, каб ты ведаў, каб ты ведаў,
Як мне шапталі пра цябе.

— Ты нават падысці баяўся
Да той галоўкі ільняной,
Дзе я спакойна красаваўся
І раючы кірунак ёй.

— Мяне любілі, шанавалі,
Я сэрца дзеўчыны крануў.
І тыя вусны цалавалі,
З якіх ты слова не пачуў.

Пайшлі вы па дарожках розных,
І той не вернеш, што міне...
І хоць цяпер ужо запозна,
Ты ўсё ж напішаш пра мяне.

## ПЛЯТКАР

Лухту ўсялякую вярзеш ты,
Такога цяжка і знайсці —
А ты абнюхаў усё дарэшты
І ўсё патрапіў абысці.

Я б не хацеў цябе і слухаць,
Даўно вядомы ўсім пляткар,
А ты пішчыш, пішчыш над вухам,
Як той абрыдлівы камар:

— Як нехта нешта ўзяў, няйначай,
Як нехта нештачка глынуў,
Як нехта некага пабачыў,
Як нехта некага пачуў...

Не зразумець, што яў, што казкі,
Мяне не здолеў ты крануць,
І я прашу адзінай ласкі —
Цябе не бачыць і не чуць!

## ЧАРАЎНІКІ

Збіраў ён травы, зёлкі, лісце,
Здаваўся ўсім таемным ён.
Чараўніком у нас калісьці
На ўсю акружку быў Сахон.

Пра медыцыну мы не зналі,
Сахона зналі аднаго,
Калі хваробы нас згіналі,
Ішлі па раду да яго.

Казалі бабкі, пасабляла
Яго старанне збыць бяду,
А ён адкурваў, чым траляла,
Шаптаў таемна на ваду.

Шаптаў ён моваю сваёю,
Сам часам ведаў, што мяну,
Рабіў прысыпкі парахнёю,
Паіў адварам з палыну.

Казалі — здаравела многа,
А больш у вечнасць адышло,
Відаць, каб не рабіў нічога,
Дык тое б самае было...

Так пагаворвалі ў народзе,
Я чуў яшчэ малы зусім,
Што быў Сахон у добрай згодзе
Нібы з нячысцікам самім.

Часамі іншы так пакпіцца,
Што чортам ганарыўся ён,
А вы сурова не судзіце,
Бо пасабляў, як мог, Сахон.

Ён да сваёй падходзіў справы
Нібы сапраўдны той артыст,

Нібы каваль найлепшай славы
Ці на вяселлі цымбаліст.

Не дужа пасаблялі чэрці,
Шмат сам чаго дазнаўся ён,
І я скажу, сябры, наверце,
Валодаў чарамі Сахон.

Прайшло даўно перажытое,
У чары верыць не з рукі,
Ды цвёрда я стаю за тое,
Што ёсць і ў нас чараўнікі.

Люблю я гэтакіх, дый годзе,
Надзейных, грэшных і святых,
І сёння ўсюды я знаходжу
Такіх умельцаў залатых.

Яны ў адзенні ўсім знаёмым:
У робах, хустках, хвартухах,
У касманаўтаўскіх шаломах,—
Вялікі іхніх спраў размах!

Яны і ў касках, і ў бушлатах,
Ды і ў манцёрскіх паясах,
У белых доктарскіх халатах,
У звычных куртках, пінжаках.

Сакрэты ж у майстроў і сёння!
У справах гарадоў і сёл
Пра чары іхнія гамоняць
З падзякай людзі навакол!

* * *

Мая Радзіма!
Ты мне дорыш
Пад промнямі крылатых зор
І пах бароў,
І пахі мора,
І пахі стэпаў,
Пахі гор.

З братамі,
З сёстрамі сустрэцца
Мне шмат даводзіцца калі.
І чую я, што б'юцца сэрцы
Суладна,
Дзе б мы ні жылі.

Адны ў нас думы
І клапоты
З пізін да выспаў снегавых.
Радок мой
Моц сваю і ўзлёты
Бярэ ад шчырых думак іх.

* * *

Шчаслівы той,
З кім сон у згодзе,
Міне таму за момант ноч,
А ты — і сонейка ўзыходзіць —
На хвілю не заплюснеш воч.

А ты хоць плач,
Не йдзе ўсё роўна
Сон — толькі чуеш між клапот —
Над дахам гулам манатонным
Плыве кудысьці самалёт.

Гудзе матор,
Гудзе няспынна,
Як быццам той чмяліны спеў...
Падступіць гэткая хвіліна —
Здаецца, ўстаў бы, паляцеў!

* * *

Браты, таварышы!
Вітанне!
Я чую Вас, маіх сяброў,
І песень стэпавых гучанне,
І горных рэк і ручаёў!

І што ў каго —
Ці стэп, ці горы,
Ды ў кожнага адменны край,
Я чую Вас ў дзівосным хоры —
Расул, Кайсын, Давід, Мустай!

Я адчуваю
Ваша сонца
І пах хурмы і алычы,
І стаў стэпавіком і горцам
Я, з вашай песняй ідучы.

І я сказаць
Не пабаюся,
У словах Вам няма цаны,
Што Вы для любай Беларусі
Таксама родныя сыны!

## НЯХАЙ БЫ,
## ЯК У МАЙСКІМ РАНКУ...

Жыццё!
Куды такое гожа,
Прыгожых пагадуеш нас,
Пасля з нас робіш непрыгожых
І адкідаеш, і не ў час.

Дасі
Пажыць спакойна колькі,
Усё цудоўна, нават сны...
Пасля пашлеш хваробы-болькі,
Ламоты крыжа і спіны.

А то
Пакрыўдзіш нас вачыма,
А то прымусіш закульгаць,
Усё злічыць і немагчыма,
Ах, лепш бы іх не ўспамінаць.

Няхай бы,
Як у майскім ранку,
Пажыў бы кожны, як юнец.
На адыход святлом маланкі
Бліснуў прыгожы, і канец!

## ЖЫЦЦЁ ІДЗЕ...

Жыццё ідзе, нясшыпна крочыць
І між суровейшых часін...
І з маладых людзей аднойчы
Сказаў мне, бы на жарт, адзін:

Пытаюць часам: — Скуль з'явіўся,
Дзе вёска, а ці горад твой?..
— Я ў партызанцы нарадзіўся,
Паміж Ушачай і Дзвіной.

Там — бацька, маці ваявалі.
І я ў калысцы, вольны, рос,
Мяне яліны калыхалі
Пад спеў задумлівых бяроз.

Я быў аблашчаны іх ласкай,
Што йшла ад роднае зямлі,
Сваёю песняй партызанскай
На ўсё жыццё мне шлях далі.

Калі трывога па-над борам
Там навісала — і не раз,
«А ты расці! — шапталі зоры,—
Ты, можа, ўзнімешся да нас!»

Ківалі ім кляноў галовы
З лістотай дзіўнае разьбы,
І моцнай вартай стогадовай
Стаялі волаты-дубы

Ды благаслаўлялі ў шлях паходны.
Няхай адчуў зашмат пакут,
Ды вырас тут усім я — родны,
І родны мне тут кожны кут!

* * *

— Мне дайце, дайце.
Болей, болей!..—
Я не крычаў і не крычу,
Бо я празмернага ніколі
І не хацеў і не хачу.

Не трэба
Злосці мне ільвінай
І кіпцяў,
маюць што арлы.
Мне б толькі
сілы мураўінай
І пільнай працы,
што ў пчалы.

## САВЕЦКІ НОВЫ ЧАЛАВЕК

Ёсць новае на ўсёй планеце —
Скарае космас новы век,
А я сцвярджаю, што на свеце —
Савецкі — новы чалавек!

І я сцвярджаю без вагання,
Хто там інакш і не кажы,
Яго — адменныя жаданні
І новы склад яго душы.

Яго ва ўсім — цікавіць праца
І рост ва ўсім. Не любіць ён —
Ні ўласных замкаў, ні палацаў,
Ні ўкладаў уласных на мільён.

А адпачыць ён мае права
І не баіцца быць старым.
Ён ведае — яго дзяржава
Заўжды, як маці, разам з ім.

Калі ж пануе дзе пагроза
І ад напалму ўсё гарыць,
Няхай далёка кроў і слёзы,
Ах, як яму, ах як баліць!..

І сэрца так яму гаворыць,
Што ў дружбе братняй узрасло,
Каб анідзе не зналі гора,
Каб скрозь усё, як ёсць, цвіло!

Каб свет увесь напоўніў гулам
Любові моцнаї акіян,
Тады б сама зямля ўздыхнула
Ад грозных, шматгадовых ран.

## НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ СВАЕ КЛАПОТЫ...

Наш новы дзень — у шматгалоссі
Заўжды прыходзіць баявым —
Для ўсіх і радасць ён прыносіць
І заклапочанасць усім.

Каму палі, каму палёты,
Каму спякоту, а ці лёд...
На кожны дзень — свае клапоты,
Ды і не можна без клапот.

## ЧЫРВОНЫЯ КВЕТКІ

Чырвоныя кветкі на плошчах, палетках,
І кожная — чысты агеньчык, няйпачай.
Чырвоныя кветкі,
Чырвоныя кветкі,
Я рады, што ўсюды, што ўсюды вас бачу!

Калі я праходжу ў святочных калонах.
Калі я з сябрамі іду ўсхваляваны —
Мне вельмі здаецца,
Што сцяг наш чырвоны,
Агністы, праменны з вас, ясных, сатканы.

Чырвоныя кветкі!
Сплаў волі і працы,
Вы, зорныя, дзень наш наступны натхнялі.
Як сцяг,
Заклікаеце нас не спыняцца,
А можа, з яго вы і колер забралі!

Вы нашай любові натхнёныя сведкі,
Вас болей і болей сягоння пад сонцам.
Чырвоныя кветкі,
Чырвоныя кветкі,
Расціце, красуйцеся вечна, бясконца!

## А ТЫ З'ЯВІЛАСЯ ЯКОЙ?

Вясну прывыклі мы заўсёды
Страчаць прыгожай, маладой.
Цябе чакалі блізка году,
А ты з'явілася якой?..

Засыпаў сакавік імжою,
І красавік не лепшым стаў.
Вясна, вясна! Не для такое
Я словы з сэрца выкрасаў —

Абсыплеш снежным пілавіннем,
Ледзь блісне сонца, зноўку дождж...
І ты, як злосная жанчына,
Нямнога ласкі, злосці больш.

## УСІХ ЯК ЁСЦЬ ПЕРАМАГЛІ!

Хай сілай славяцца мужчыны,
Куды ні глянь — на ўсёй зямлі,
Дзяўчаты нашыя, жанчыны,
Вы ўсіх як ёсць перамаглі.

Яно бывала ўсё між намі:
З пагардай у дзіцячы час
На вас глядзелі хлапчукамі
І крыўдзілі малых не раз.

А як юнацтва агарнула,
Такое стала дзіва з дзіў —
Пагарда знікла, прамінула,
Нібы хто сэрцы падпаліў.

Вы асвятлялі нас красою,
Сваім паглядам і хадой.
І мы не зналі, што з сабою
Зрабіць у час чароўны той.

Нас хвалявалі летуценні,
Спаць не давалі па начах.
І мы блукалі, быццам цені,
Па вашых маладых слядах.

І клятвы з мольбамі пісалі,
Ад блізкіх таячы сакрэт,
Ва ўсіх пастацях малявалі
Мастак, музыка і паэт.

Мы вам спявалі, як умелі,
І падалі да вашых ног.
Было ж, хадзілі на дуэлі
І шлях канчалі — хто як мог.

Вы ж даравалі не адразу.
І мы пагаравалі шмат,

Бо за дзіцячыя абразы
Вы адплацілі нам стократ.

І мы да дзён сваіх змяркання,
Хто б з нас ні жыў як найдаўжэй,
За вашу ласку, за каханне
Не ведаем найдаражэй.

І хочам шчыра і аддана,
Каб вашых сэрцаў чуць узлёт,—
І адчуваць жаданні рана,
Як адчуваюць птушкі ўсход.

Хай сілай славяцца мужчыны,
Куды ні глянь — на ўсёй зямлі,
Дзяўчаты нашыя, жанчыны,
Вы ўсіх як ёсць перамаглі!

## ІДУЦЬ У НАСТУП РЫБАЛОВЫ...

Да возера ў гушчар лазовы,
Каб там ім зацішней было,
Ідуць у наступ рыбаловы,
Ледзь сонейка пашле святло.

Гудуць размовы, перагуды,
Нібы збіраюцца на бой...
А на ўзбраенні стрэльбы-вуды
І плашч-палаткі за спіной.

Калі ж са зброяю сваёю
Яны пасядуць пры вадзе,
Усё спаўецца цішынёю...
Адно усплёскі дзе-нідзе.

І ў сілу іхняй даўняй звычкі,
Як пераможны кліч, найбольш —
Чуваць гамонка пераклічкі:
— Акунь...
— Шчупак...
— Уклейка...
— Ёрш!..

Пачуеш рыбака й такога:
Ажно ад шчасця закрычыць!
А да каго не йдзе нічога,
Той дзень цалюткі прамаўчыць.

Ды кожны, як дамоў збіраўся,
Казаў, пакуючы рукзак,
Што і ў яго з кручка сарваўся
Найбольшы язь, а то й судак!

# ЖДАНОВІЧЫ

У Ждановічах у 7-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі я быў на зборах многа год назад разам з Пятром Глебкам.

Ждановічы.
Лясок прыгожы.
Куток з прываблівым садком.
І сямікрылая бяроза
Шуміць па-над маім акном.

І возера,
Нібы без краю...
Яго калісьці не было.
А я хаджу і ўспамінаю
Юнацтва,
Што даўно прайшло.

Мне многа кажа
Строй сасновы,
Нібы салдату, шэпча ён;
Ды сустракаюцца й падковы
Са звонам тых крылатых дзён.

Дывізія.
Пра моц, адвагу,
Здаецца, ўсё вакол пяе,
Самарскай сёмаю
З павагай
Калісьці звалі так яе.

Клінкі і шаблі
Сёмай коннай
Кідалі ворага ў адчай.
Яе вадзіў на бой Будзённы,
Камандаваў ёй Гая Гай.

Буржуяў
Трэскаліся зрэнкі,
З ёй сустракаліся калі.
Калісьці Жукаў, Цімашэнка
Ёй кіравалі і раслі.

Ды пра былое
Толькі згадкі.
Прайшлі суровыя гады...
Там, дзе былі даўно палаткі,
Ледзь захаваліся сляды.

Старэем хай сабе
Усе мы,
І сам цяпер я іншым стаў,
Я тут пачаў сваю паэму,
Хоць шмат чаго недаказаў.

Вярнуўся я
Пасля Айчыннай
Як гаспадар, не толькі госць,
Хаджу ізноў па тых мясцінах,
Нібы іду я ў маладосць.

Хаджу
З задумаю пясьнярскай,
Хоць надышла й мая зіма —
Няма кіраўнікоў Самарскай,
Даўно сяброў маіх няма.

Ды часу ў памяці
Не сцерці
Іх,
З кім калісьці сябраваў...
І мне так радасна на сэрцы —
Падкову даўнюю спазнаў.

## НЕБА

Люблю я неба ў сініх хвалях,
Глядзіш, як быццам сам плывеш.
А як пра зоры нам спявалі,
Ды і пра месячык не менш.

А загрыміць — з гарматы быццам,
Ажно дрыжыць душа мая.
Казалі, едзе ў калясніцы
Кудысьці сам святы Ілья.

А колькі меў ён коні, коні...
Усё гудзе ад краю ў край,
І хмары сонейка заслоняць.
Ды дзе ён, той чароўны рай?

Дзе ж рай, дзе ўсё як ёсць спявала
І бог з сівою галавой,
Той рай, дзе, бабка абяцала,
Калісьці стрэнуся я з ёй?

А неба пагражала громам,
Сляпіла бліскавіц святло...
Ах неба, неба, мне малому
Ты ўсё загадкаю было.

Ды ўсё ж часамі больш відочна,
Старыя байкі, нібы ў сне.
Падрос, прызнаюся я — моцна
Запала ў сэрца неба мне.

І з песняй жаўра ў раннім ранні,
І ў час, як вечар засынаў,
І ў час юнацкага кахання,
Калі сам небу я спяваў,

І ў час, як радыё мне весцяў
Прыносіла здалёку шмат,

І ў час, калі ў бязмежжы дзесьці
Імчаўся першы касманаўт.

І неба я люблю без меры,
Што Млечны ёсць і Зорны коўш,
Што ёсць і Марс, што ёсць Венера,
А непазнанага і больш.

Пра неба мары разам з хлебам,
З ім крыллі думак узраслі.
І хоць люблю я вельмі неба,
Ды што мне неба без зямлі!

## МЫ ЎСЕ ТАДЫ ЯЕ КАХАЛІ

У панскім доме нашай Ганне
Пакой улада адвяла.
Ён зваўся хатаю-чытальняй,
Яна ж —
загадчыцай была.

Была ласкавай, сінявокай
І неўгамоннай, проста жах.
Ах, як тады яна высока
У нашых вырасла вачах!

Між кніг, газет,
што прысылалі,
Больш вылучалася красой.
Мы ўсе тады яе кахалі,
Баяліся ж адкрыцца ёй.

Яна ж,
нібы не заўважала
Нікога з нашага сяла,
Спявала,
добра танцавала,
На сцэне дзіўнаю была.

Была такою гераіняй,
Што нас ажно кідала ў жар...
— Ну й камсамолка, малайчына! —
Хваліў прыезджы камісар.

Мы ганарыліся сяброўкай,
Што красавалася як след...
Яе ж па перападрыхтоўку
Ад нас паклікалі ў павет.

Шкада было яе, прыгожай,
Ды што ж,
прыйшоў вучыцца час.

Ну, вернецца!..
                    Бо быць не можа,
Каб кінула назаўжды нас.

Спішалі так сваю трывогу,
Разлікі маючы свае,
Але прыслалі нам другога,
Не дачакаліся яе.

Яна ў павеце працавала,
Ды і прыйшоў такі чарод —
Кагосьці моцна пакахала...
Мы ж уздыхалі
                    многа год!

## ВЯСНЫ МАСТАЦТВА

Расцвіўшы бэз — вясны мастацтва.
Цвіце, здаецца, аж пяе...
А мне
Ён, бэз майго юнацтва,
Спакою й сёння не дае.

Вясна нас бэзам хвалявала,
Ды і другой яшчэ красой.
Дзе ж тая,
Што пад ім стаяла
Прыгожай кветкай палявой?

Мы ж не знайшлі тады і слова
Аб тых пачуццях, чым жылі.
Вясна
Кружыла нам галовы,
А мы й прызнацца не маглі.

Ах, колькі ўжо гадоў прамчала,
А бэз цвіце, любімы мой!
Дзе ж тая,
Што пад ім стаяла
Прыгожай кветкай палявой?!

## РАЗМОВА З КАСМАНАЎТАМ

Мы часта гаворым,
Мы,
Людзі зямлі,
Калі вы між зораў
Ў сваім караблі,

Бо кожны пра тое
Даведацца рад:
— Якою ты бачыш
Зямлю, касманаўт?

З дарогі арбітнай
Адказ чуем твой:
— Блакітнай!.. Блакітнай!..
Мы згодны з табой!

— Ці бачна герою,
Хто выслаў у шлях
Над нашай зямлёю
Чырвоны наш сцяг?..

І голас твой шчыры
Мы чуем такім:
— Ён вышай і шырай
Над светам усім.

Мы бачым, як свеціць
Ён нам
Над Крамлём,
Світае ў Сусвеце
Чырвоным святлом.

Герою за гэта
Мы дзякуем шмат,
Чакаюць планеты
Наш сцяг, касманаўт!

## ЖЫВУ ЗА ВАС!

Бары, падлескі з хмызнякамі,
Кавалкі беднае зямлі...
Мае вы продкі,
Вы вякамі
На іх гібелі і жылі.
На іх вы зерне ледзь збіралі
На свой з мякінай каравай,
На іх вы ціха паміралі,
Вам абяцалі
Светлы рай.
Хіба маглі вы жыць прыстойна,
Бо не для вас жа быў закон.
Цары
Ганялі вас на войны,
Паны, падпанкі — на прыгон.
Жылі трывогаю глыбокай,
Каб хоць што-небудзь нарасло,
Пра час наступны
І далёкі
Вам думаць некалі было.
Хацеў бы я,
Каб вы пачулі
Пра наша шчасце галасы,
Жыву за вас,
Дзяды й бабулі,
За вас, і Броўкі і Сысы.
Наш край узрос непазнавана,
Я з ім узняўся, акрыяў,
Праплыў я
Моры, акіяны
І ледзь да зорак не дамчаў.
Прызнаюся,
Мне вельмі шкода,
Што вы жылі ў пакутны час,
Пра вас
Я думаю заўсёды.
Ах, каб вы бачылі, што ў нас!

## УСЁ СПЯВАЕ

У дзень пагодны,
Ды і ў золкі,
Ты іх пачуеш хоць калі...
Ах, колькі песень, песень колькі
У нашай роднае зямлі.

Спявае ўсё,
Не знаўшы зморы.
Куды ні глянеш — гусляры...
Спяваюць рэкі і азёры,
Спяваюць пушчы і бары.
Спявае колас
Песню хлебу,
Спявае і рабінцы клён,
Спявае ўсё, спявае неба,
Як неабдымны сіні звон.

Пяюць вятры
Ў часіны лёту,
Далёкі іх, далёкі шлях...
І быццам флейты і фаготы
У тэлеграфных правадах.

# ЛІПЕНЬ

Яно ўжо ветрам закружыла,
І дзень пайшоў крыху на спад,
Хоць ён яшчэ і поўны сілы,
Але нібы крутнуў назад.

І не чутно зязюлі спеву,
Чаго збаялася яна?..
І першы жаўталіст па дрэве,
Нібы на скронях сівізна.

І я як быццам страціў штосьці.
Вясновых дзён не адгартаць.
Вакол жа многа прыгажосці.
Ну дык ці варта сумаваць?!

## ХТО Б МОГ ПАДУМАЦЬ...

Хто б мог падумаць, як успомню,
Што гэта будзе,
Хай і лепш —
Шляхоў-дарог на небе сёння,
Чым па зямлі, памала менш.

Дзе б ні паехаў ты па свету,
Як толькі
Зазірнеш увысь,—
І самалёты, і ракеты,
І трэск, і гул, і рэзкі свіст.

І ў нас на небе завялося
Ці мала
Розных летакоў —
Шмат тупарылых, вастраносых,
Шыракакрылых, што арлоў.

Лятуць дарогаю сваёю...
Паглядзіш,
Кружыць галава,
Трашчыць над самым над табою,
Нібы па бруку, наш «У-2».

Ляцім кудысьці і аднекуль,
Няхай
Ці лета, ці зіма...
Ды задаволіць чалавека,
Відаць, мяжы такой няма!

## А НЕ МАГУ

Імклівы я, і цераз край,
З маленства сіл не берагу.
Кажу сабе: — Цішэй давай!..
А не магу,
А не магу!

Спакойна, як усе, рабі.
А я, бывае, аж бягу.
Кажу сабе: — Даўжэй паспі...
А не магу,
А не магу!

Я ўсё спяшаюся, дзівак,
Хоць і нікому не ў даўгу.
Кажу сабе: — Навошта так?..
А не магу,
А не магу!

Што нарабіў ты больш ці менш,
Хай час праверыць на вагу.
Кажу сабе: — Спачынь ты лепш!..
А не магу,
А не магу!..

## КАМЕНЬ

Вякоў мінулых адгалоскі
Цікавілі заўжды мяне —
Ляжыць валун ля нашай вёскі,
Які і трактар не скране.

Малыя, як мы падрасталі,
Калі авец з нас кожны пас,
За той мы камень ваявалі,
Ён быў бы крэпасцю для нас.

Я з ім калісьці так зрадніўся,
Што сумна без яго было,
На ім спахмураны садзіўся
Я, пакідаючы сяло.

Мацней нічога ж у акружжы
Не бачыў я нічога з дзіў.
Прыгадаваў, які быў дужы
Ляднік, што камень прыкаціў.

Ляднік. Былой каханкі сілу
З ім параўноўваць я звык —
Яна ж на сэрца прыкаціла
Такі мне камень, што й ляднік.

## З ТАКІМІ ДУМАМІ ІДУ...

Мая Масква! Мая Айчына!
Ну дзе я лепшае знайду —
Я па ждановіцкіх сцяжынах
З такімі думамі іду.
    Іду ў настроі, лепш не трэба,
    Аж іскаркі ў вачах маіх,
    Мой лес — палац пад дахам-небам
    Ў калонах сосен медзяных.
Хто прыгажосць яго абдыме —
Напевы траў, вяршалін звон,
Бо не стагоддзямі якімі,
Мільярдам год ствараўся ён.
    Мой лес-палац бясконца будзе
    Для нас і жыць і красаваць...
    Адно яго калечаць людзі,
    Ды і людзьмі іх нельга зваць.
Яны прыходзілі з разбоем,
Хоць мы і правучылі іх.
Стаю ў задуме прад сасною,
Што ўся ў асколках бомб чужых.
    Я прыглядаюся старанна —
    Чужая літара відна,
    Я прад сасною ў хваляванні:
    Ах, колькі зведала яна!
Ардой бязлітаснай, паганай
Тут сіла набрыдзі прайшла.
Ды тут і слава партызанаў,
Што іх змяла, расла, расла...
    І вось стаіць сасна. І зноўку,
    Нібы ажыўшая, пяе,
    І заліваецца салоўка
    Заўсёды поблізу яе.

## МАСКВА

А я ў Маскве быць рад заўсёды,
Бо ў ёй шмат ласкі і цяпла,
Іх людзям ёй дарыць не шкода,
Яна ж і мне дапамагла.

Калі я ў раз наведаў першы,
Паверыць, здзіўлены, не мог,
Што з першай кніжкай маіх вершаў
На сотню выведзе дарог.

Дарог ад выраю і ў вырай,
Дарог да пальмаў, да ільдоў —
Ах, колькі іх, адданых, шчырых,
Я сустракаю там сяброў.

Ад іх размоў сардэчных, весніх
Узбагачаюся я шмат,
А кожны з іх і сам, як песня,
І кожны сябра мне і брат.

Масква гасцінна сустракае,
І колькі я ў Маскве ні жыў,
Калі вярнуся, адчуваю,
Нібы я ў мацеркі пабыў.

## А Я НІЧОГА НЕ ХАВАЮ...

А я нічога не хаваю,
Што праспяваў,
Што прапяю.
Я і набытак,
                    што збіраю,
Заўсёды людзям раздаю.

Бабры і лісы скарб у норы
Нясуць.
У кожнага нара,
А я свой скарб,
                    нібы шахцёры,
З глыбіняў сэрца —
                    на-гара!

## УГОРУ-ЎНІЗ...

Яшчэ і цёпла ў наваколлі,
Бо летні дзень не адступіў.
Віхор лісток сарваў з таполі,
Узняў яго і закружыў...

І ён бы літасці не знае,
Ці мо такі яго капрыз,
Сарваны той лісток кідае —
Угору-ўніз,
Угору-ўніз!..

То панясе яго на здзекі
Туды, дзе й воку не знайсці...
Бывае лёс у чалавека
Падобны гэтаму ў жыцці.

## У САНАТОРЫІ «КРЫНІЦА»

Я хачу
Вам пахваліцца,
Я хачу
Вам пахваліцца:
Мае сілы —
Узраслі
Ў санаторыі «Крыніца»,
Ў санаторыі «Крыніца»,
Дзе вада,
Як шкло, свіціцца,
Дзе вада — крышталь
Бруіцца
З-пад сярэдзіны зямлі.

Розны лечыцца
Тут люд,
Не вада —
А проста цуд.
Кожны дзень
Як пажывеш —
Адчуваеш лепш
І лепш.
Хай стары,
Хай малады —
Вып'е кубачак вады,
Ну, а трохі
Вып'еш болей,
Дык вясёла, як ніколі,
Як ніколі, запяеш!

Тут жывецца
Без клапотаў,
Без ніякае маркоты —
Хто гуляе адзінотай,
У касцяшкі
Б'е заўзята,
Хто чытае,

Хто ў шахматы,
Ходзяць гуртам
І з гітарай,
А часцей за ўсё
Па парах.
Ды і гэта не бяда,
Вінавата тут — вада!

Ёй ніколі не спыніцца
Ў санаторыі «Крыніца»,
Ў санаторыі «Крыніца»!

## МЫ САМІ НЕКАЛІ СПЯВАЛІ

На моладзь гэты кут багаты,
Найбольш падлеткавы народ —
Ідуць хлапцы,
Ідуць дзяўчаты...
Ім паспяваць прыйшоў чарод!

А ў іх транзістары зайгралі,
Гучыць замежжа лабуда...
Мы самі
Некалі спявалі,
І песень тых мне так шкада!

# ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ У МІНСКУ

Іду па ім, не чую ног, здаецца,
Іду адной з галоўнейшых дарог —
Праз родны Мінск, цераз сталіцы сэрца
Наш родны Ленінскі праспект пралёг.

Стары жыхар, здаюся навасёлам,
Калі гляджу я на ягоны ўзлёт.
Цераз палі Гісторыі прайшоў ён,
На светлы шлях склікаючы народ!

Мой любы Мінск! Якая ў сэрцы радасць,
Што я з табой у думках кожным днём.
Вось я стаю насупраць Дома ўрада,
Схіліўшы галаву прад Ільічом.

А навакол люстраныя вітрыны.
Ах, колькі ў іх прывабнага святла.
Сталіца, ты ўзнялася з-пад руінаў
Прыгожаю, якой і не была.

Прайшлі гады нягоды злоснай, чорнай,
Ах, як памог братэрскі нам Саюз,
І Ленінскі праспект наш жыватворны —
Цераз усю прайшоў ён Беларусь.

Шмат зроблена. А колькі ж у праектах,
Будуецца, будуецца яна,
Мне Беларусь — ад гэтага праспекта —
Уся як ёсць працоўная, відна.

Мой родны край, мой родны кут бацькоўскі,
Ты партызан і працаўнік-герой.
Іду праспектам — ў любы бок маскоўскі,
І не хаваю радасці сваёй.

Гляджу на гмах, прыгожы, светлы, новы,
Ах, колькі ж у вітрынах, колькі кніг,

Ах, колькі іх на розных, розных мовах
І роднай беларускай паміж іх!

Я рады іх на школах, клубах, хатах
З прыязнаю цікавасцю сустрэць,
І думаю, што ў царскі час пракляты
Мы іх зусім не мелі права мець.

А мова наша сёння ў родным Мінску
Звініць і па рэспубліцы усёй...
Глядзіць з праспекта на мяне Дзяржынскі,
І ён як быццам цешыцца са мной.

Ён тут, паблізу Мінска, нарадзіўся,
І ў бой супроць прыгнечання пайшоў,
І быў між нас, калі народ наш біўся
Са зграямі пілсудчыкаў-паноў.

Іду далей. Суровыя часіны
Прыпамінаю, што трывожаць сны.
Іду, гляджу — а вось музей Айчыннай
Вялікае і грознае вайны.

І шапку я з павагаю здымаю
Прад тым, што бачу ў кожным я акне,
А здымкі, здымкі зноўку напаўняюць
І горыччу, і гордасцю мяне.

Бары, бары, што змалку нам вядомы,
Зямлянкі між ялінаў векавых,
І тыя, дзе абкомы і райкомы
Не мелі супакою ні на міг.

Я пазнаю сяброў, сяброў нямала шчырых,
І кожны з іх як партыі салдат.
Сакратары, яны ж і камандзіры
І камісары баявых брыгад.

А ў тых брыгадах беларуса з рускім
Дый шмат яшчэ братоў іх пазнаваў —
Ды што казаць, народ наш беларускі
З братамі разам храбра ваяваў.

Яны ў бядзе не гнуліся ні разу.
Вось здымкі жахаў. Слёзы на вачах...

Але калоны нашых дружных МАЗаў
Мяне ізноў паклікалі у шлях.

Ах, родны Мінск, ты дужы і шматжыльны,
Чаго-чаго няма ў цябе, чаго?..
І волат я ўявіў аўтамабільны,
І трактарны — не меншы ад яго.

А колькі мне прыгадваюць кварталы,
Калі праспектам Леніна іду —
Ў яго ўпадае вуліца Купалы,
Крыху далей — і Колас на віду.

Іду далей, а сэрца добра чуе:
Тут шмат работы для працоўных рук...
Гляджу з гары. Ах, як яна красуе,
І наша Акадэмія навук.

І рост вучоных плённы і нязменны,
І іх адкрыццяў поспехі як след.
Ты быў, мой край, калісьці непісьменны,
Навукай знаны сёння на ўвесь свет!

Ах, родны Мінск! Твой слаўны шлях і доўгі.
Ты і герой! І гэта ўсім відаць.
Вось я прыйшоў на плошчу Перамогі,
І хвалявання мне не сутрымаць.

Гляджу на вечны язычок агністы,
Які гарыць насустрач новым дням
Пры помніку вялікасна-ўрачыстым
І партызанам, і франтавікам.

Ідзе народ з удзячнасцю аддапай
Да помніка вядомага таго,
І домік невялікі і драўляны
Глядзіць з павагай на красу яго.

Тут некалі адказнае спатканне
Прайшло даўно ў суровейшых гадах.
Ў дамку малым, дзе просценькія
стаўні,—
Тут партыі распачынаўся шлях.

Глядзіць дамок, як барацьбіт за волю,
Прайшоўшы шлях нястомны ў барацьбе,
Ён помніць, як, сабраўшыся ў падполлі,
Быў першы з'езд у ім РСДРП.

Ён кінуў кліч — і мудры і глыбокі,
І хоць на з'ездзе змушана не быў,
Ды аж з Сібіры, з высылкі далёкай
Ільіч за ім захоплена сачыў.

А праз гады, напружана, аддана,
Вялікай, мудрай сілаю сваёй
Ён партыю загартаваў так дбайна,
Што цэлы свет раскрыўся перад ёй.

І справу яе мы бачым красаванне,
І я з душой узрушанай стаю
На Ленінскім праспекце ў хваляванні
І славу роднай партыі пяю!

Жыццё! Прашу цябе я аб адзіным —
Дай мне пабыць і як найбольш з табой,
Каб кожны дзень, нібыта ўзнос
партыйны,
Уліваўся ў лёс Айчыны дарагой!

## ДАЛЁКА РОЗУМАМ ПАЙШЛІ...

Бязмежныя ў людзей клапоты —
Шукаюць зоры для жылля.
Вядома, з першым самалётам
Паменшала для нас зямля.

Цяпер усё так стала блізка,
Як выйшаў у адстаўку конь.
Яно, паснедаеш у Мінску,
А на абед — аж на Цэйлон.

Яшчэ й не гэтакае будзе,
Далёка розумам пайшлі...
Вось каб адно,
Каб толькі людзі
Паміж сабой бліжэй былі.

## КАЛІ САДЖУСЯ ЗА ПАПЕРУ

Бывае, што —
сядзіш без меры
І ўсё ж ніяк не йдуць радкі.
Але я дзякую паперы,
Чый шлях і дзіўны і цяжкі.

І часта думаю пра тое,
Адкуль з'явілася яна,
Відаць,
істотаю сваёю
А ці яліна, ці сасна.

Дзе цешыла людское вока
Сваёй зялёнаю красой?
Яна на поўначы далёкай
Шумела голлем над ракой

Ці, можа, бліжай,
па Палессі,
Стаяла побліз ручая,
А можа,
дзесьці ў нашым лесе,
Дзе пасвіў у дзяцінстве я,

Дзе ёй, магутнай, любаваўся?
Я ўжо аб ласцы не кажу,
Калі пад ёй не раз хаваўся
Ад невірутнага дажджу.

Гады вятрамі адшугалі,
Гады лятуць як найхутчэй.
І вось прыйшлі ды спілавалі
І на калёсы, а далей —

Як на муку,
яе змалолі
Ды ў чан гарачы, проста жах,

Бяліць спачатку як найболей,
Пасля пад прэс — і ў новы шлях.

Ну, што ж, не менш,
чым тої сасною,
Відаць, у новай яве жыць...
І вось сягоння прада мною
Яна бялюткая ляжыць.

Я з ёй у пошуках няспынных,
Што прыйдзе, што мяне кране...
А вось ці жыць,
ці ёй загінуць —
Усё
залежыць ад мяне!

## МЫ ПРАЦУ ВЕДАЛІ З ДЗЯЦІНСТВА

Мы працу ведалі з дзяцінства
Па працавітых галасах:
Калі каса пяе, са свістам,
Шырокі ў касара размах!

Калі ў істопцы цьмяпай, чорпай,
Дзе мліва белыя сляды,
Гудуць, гудуць, аж стогнуць жорны,
Дык, значыць, меле малады.

Што на таку? Няхай і ўпоцем,
Было не цяжка разгадаць,
У колькі там цапоў малоцяць —
У тры, чатыры, а ці ў пяць?..

Калі жытное жаць прыспее,
Як толькі песня паплыла,
Мы ведалі, ці нашы жнеі,
Ці то з суседняга сяла.

Імкпуцца песень адгалоскі
Да ўсіх сцяжыпак і дарог...
Той голас, голас роднай вёскі,
Я і да гэтага збярог.

# ЯНО — ПРЫТУЛАК МОЙ ЖАДАНЫ

Іду.
Ля рэчкі сосны-свечкі,
Ля возера пансў бяроз...
А як ушацкаму без рэчкі,
Ну, а без возера тым больш.

Бягуць да возера ручайкі,
Да новага свайго жыцця.
І зпекуль — з ветрам вокліч чайкі,
Нібы заплакала дзіця.

А хвалі, хвалі...
Хай не горы,
Але да гор яны імкнуць...
Мо недарэмна Мінскім морам
З павагай возера завуць.

Яно — прытулак мой жаданы —
Дапамагае мне ўявіць
Крутыя хвалі акіяна,
Што пашчасліўіла праплыць.

## ВІДАЦЬ, ЖЫЦЦЯ ТАКІ ЗАКОН...

Відаць, жыцця такі закон —
Дзяцінства дні навек з табой!
І тая восень даўніх дзён
Як быццам сёння прада мной.

Адкуль такі віхор узнік —
Наш бор аж стогне, проста жах,
І хваляў гуд, і птушак крык,
І сонца чэзне на вачах.

Вятры пажоўклы ліст нясуць
Ажно на неба ад зямлі,
Вось-вось, здавалася, ўзлятуць
І ветракі, як матылі.

Праз міг не верыцца. Глядзіш —
Куды падзелася яно?..
Блакіт і сонейка. І ціш...
А тлуму й следу не відно!

## ВОСЬ Я САПРАЎДНАЯ!..

Ну, што ёй, злоснай, заўжды мала,
Нанакавала скрозь ільды,
Без літасці абшкуматала
Мае дубровы і сады.

Ды што ў яе такі за пораў!
Пад ледзяністы свіст вятроў
У дуплы і глыбока ў норы
Лясных загнала жыхароў.

Напоўніла трывожным шумам
Усё навокал, як знарок,
Ды я і сам не раз надумаў
Пра ўратавальны кажушок.

Часіна ж іншая наспела,
Загаварыла так зіма,
Паклаўшы скрозь іскрысты вэлюм:
— Вось я сапраўдная, сама!

## ВУЧЫСЯ ГОРА ПЕРАЖЫЦЬ...

Бывае —
Гора чорны ком
Так пачынае нарастаць,
Што ўжо, здаецца,
І не ўстаць.
А ты,
Як трэба змагару,
Развваж цвярозай галавой —
Няхай той ком
Ужо з гару,
Перш-наперш ты
Спакойна стой.
Мо гэта
Заходы чые,
Хто хоча сцерці
Твой і след.
Не збоч!
Аб грудзі аб твае
Ён разаб'ецца — і нашчэнт!
А за жыццёвыя гады
Бывае ў нас
І шмат пакут,
А калі гора сапраўды —
Цябе ўратуе добры люд!

## ГРАНІТ

Не, шчасця гэткага ніколі
Не ведаў наш працоўны люд:
Займеў ён нафту, спірты солі,
І вось — граніт! Ну проста цуд!

Сярод балот, дзе і прысніцца
Такое не магло каму,
Штогод адкрыцці і адкрыцці...
А справа ясная — чаму:

Зарой чырвонай разгарэўся
Наш край, пакутны праз вякі,
І на абуджаным Палессі
Не тыя, брат, палешукі!

Яны зусім інакшай долі —
Тут веды і тэхнічны спрыт,—
Гранітнай постаці і волі,
Таму і здабылі граніт!

## ЛЕНІНГРАД

Кружыць ліст.
Лістапад.
Бачу восень тваю,
Ленінград,
Ленінград,
Я прад Зімнім стаю.

Час ідзе.
Шэсцьдзесят.
Ленін. Піцер. Разліў...
Ленінград,
Ленінград,
Як ты многа пражыў.

Стрэл «Аўроры».
Раскат
Не прыціх,
Не аслаб.
Ленінград,
Ленінград,
Сёння чую твой залп.

Ты народу даў шмат.
Вера, шчасце ў вачах.
Ленінград,
Ленінград,
Смольны ў вечных агнях.

Гора чорных блакад
Перажыў ты вайной,
Ленінград,
Ленінград,
Непахісны герой.

— Пушкін... Ленін...—
Шматкрат
Не спыняю шаптаць.

Ленінград,
Ленінград,
Мне іх крокі чуваць.
Ты паэт
І салдат
Над дзяржаўнай Нявой.
Ленінград,
Ленінград,
Я заўсёды з табой.
Ты
Савецкі даў лад,

Ты
Адкрыў новы час.
Ленінград,
Ленінград,
Бессмяротны ты ў нас!

## НА МАРСАВЫМ ПОЛІ

Тут стукату сэрца ніхто не стрымае,
Дзе словы «Вы жертвою палі» пяюцца...
На Марсавым полі мяне абдымаюць
Агні рэвалюцый, агні рэвалюцый!..

А словы, а словы сталёвыя тыя
Мяне уздымаюць і клічуць з сабою.
На Марсавым полі, як быццам жывыя,
Героі Радзімы ўстаюць прада мною.

У кожнага ў сэрцы чырвоная зорка,
Ідуць да Камуны яны маладымі,
Хоць часам бывае і цяжка і горка —
Іду я за імі,
іду я за імі!

## НАРОДНЫ ХОР

Найперш цымбальны звон пачуўся
І дружных скрыпак стройны лад,
І хор на сцэне разгарнуўся,
Як быццам той вішнёвы сад.

Прыўзняўся дырыжор увішны,
І заспявалі, і пайшлі:
Дзяўчаты ў белым, быццам вішні,
Хлапцы за імі — матылі.

Пачуўся мне і бору гоман,
І кліч харобрых ваякоў —
І «Волга-маці», «Бацька Нёман»,
«Рэвэ та стогне», «Суліко».

Расіі голас, Украіны.
Таджыкістана і Тувы.
І разгарнулася Айчына
Аж ад Паміра да Масквы.

А хор спяваў суладна, згодна,
І так мяне зачараваў —
Мой хор ушацкі, хор народны,
Глыбока ў сэрца ты запаў.

Як ты расцвіў у роднай хаце,
Бязмежжа звонкім галасам!
Спявайце, родныя, спявайце,
Скажу адно: зайздрошчу вам!

## НУ ШТО Ж, БЫВАЙ, ПЕРАЖЫТОЕ!..

Ну што ж, бывай, пеWhile ражытое,
А сёння — сталасці чалом!
Ды ёсць і ў старасці такое,
Што цешыць сэрца дзень за днём.

Ты на жыццё глядзіш, як з вышкі:
Ах, колькі, колькі ўспамінаць,
Нібы старонкі тоўстай кніжкі
Наноў гартаць, наноў чытаць!

І так душу сваю сагрэеш,
Што ледзьве ўжо не запяеш,
Ты здаравееш, маладзееш,
Нібы зусім наноў жывеш!

* * *

Спяшаўся я ўранні, ледзь толькі абуўся,
Ну што ж, неспакойны я быў у жыцці,
Ляжаць не любіў я, бо заўжды імкнуўся
Куды-небудзь выйсці, кудысьці дайсці.

Калі ж, каб узняцца, і сіл не знайду я,
І як ні паклічуць, я буду маўчаць,
Мяне не цікавіць, з чаго пабудуюць
Апошні той ложак, з якога не ўстаць.

Апошні прытулак. Навошта ён здаўся?
Зямля, не пачуеш ты крылаў маіх.
Я спёкі і золі, дажджоў не баяўся,
Чаго ж я павінен хавацца ад іх!

## ТЫ НЕ КАЖЫ ЛІСЛІВЫХ СЛОЎ...

Ты не кажы
лісліўых слоў,
Ім добра ведаю цану.
Я адчуваю іх ману
Яшчэ
з малых-малых гадоў.

А слоў,
хоць моцнай вастрыні,
Не бойся шчыра мне сказаць.
Хай непамысныя яны,
Ды лепей
праўду адчуваць!

* * *

Убранне кожнае птушыне
Прырода здолела пашыць,
Няхай на ўсё жыццё адзіны,
Ды гарнітур як мае быць!

Буслу, як на прыём гасцінны,
Салоўку — шэранькі пінжак,
Граку — прасцейшы, чорна-сіні,
Затое ў ластаўкі — што фрак.

Ружовых, жоўтых, белых стрэціш,
Такіх, аж уваччу мігціць,
Ах, колькі іх на цэлым свеце,
Што колераў і не злічыць!

Ды ўсе яны не ў дружбе штосьці,
Адно другога церпяць ледзь.
Збіраюцца не часта ў госці...
На іх бы разам паглядзець!

## ЦІ ГЭТА ПОМНІЦЦА КАМУ?

Бывае, зашчыміць былое...
Ці гэта помніцца каму?
Калісьці скончылі вясною
Мы незабыўны БДУ.

Калі мы сцены пакідалі
Яго празрыстым ручайком,
Пісаць, збірацца абяцалі
Хоць раз на год якімсьці днём.

Хто ў дальні шлях, а хто і ў блізкі,
Па нашай роднае зямлі
Мы разляцеліся, як пырскі,
І ўжо сабрацца не змаглі.

## Я ПЕСНЮ ПРЫГАДАЎ СТАРУЮ

Хоць палітычным, значным ростам
Не вызначалася сяло,
Мы, камсамольцы, вельмі проста
Дзялілі цемру і святло.

Што ў свеце войны, турмы, краты,
Што шмат галечы і бяды,
Буржуі у гэтым вінаваты! —
Мы цвёрда верылі тады.

Я песню прыгадаў старую,
Якую некалі спяваў:
— Пабачыць мне б таго буржуя...
А што?
Я б з ім паразмаўляў!

Запалу даўняга не трачу,
І гэта скуль ідзе, відаць:
Таго буржуя добра бачу,
Яго б мне сёння — уламаць!

## НЕ ЎСЁ ВІДОЧНА, ШТО ПРАЦУЕ...

Мы ўсе шчаслівыя бясконца,
Усё жыве,
Расце,
Калі —
Суладдзе і дажджоў і сонца
З жыццём, схаваным у зямлі.

Не ўсё відочна, што працуе —
І сок зямлі,
І цела кроў,
Калі вясною
Закрасуе —
Карэнням працы ў сем пятоў!

## ПАЎНОЧНЫ ВЕЦЕР

Паўночны вецер невыносны,
Чаго яму там не стае?
Апоўначы ён гэткі злосны,
Што жыць спакойна не дае.

А вецер так гудзе, сваволіць,
Згінае дрэвы па садах...
Палова верасня, а золлю
Наскрозь праймае, проста жах.

Ён вые, вые, што няміла
Яму бывае і вясна.
Лядовы цар. Яго скарыла
Пакуль што «Арктыка» адна.

А ён злуецца, сівакрылы,
Недружалюбны да ўсяго,
Ды мы, што царскі трон скрышылі,
Прыцішым з часам і яго.

## РОЗДУМ НА ЎСХОДЗЕ СОНЦА

Іду гуляць на самым ранку,
Як толькі ўсход узніме зрок —
І неба бронзавай чаканкі,
І жартаўлівы вецярок.

Паветра ж чыстае, ляснае,
Нібы з таго крышталю шкло,
А сонца чырвані такое,
Быццам толькі з кузні адышло.

Вакол птушыныя размовы,
Настройку бы яшчэ вядуць,
І ў грудзях водар-пах сасновы,
І ногі быццам самі йдуць.

І сэрца гэтак ускрыяла,
Што не згінаю галавы,
І хоць гадоў ужо нямала,
Дайшоў, здаецца б, да Масквы!

## ШУКАЕМ СЯБРА МЫ СВАЙГО

У нашае цяжкое працы
Пражыць нялёгка без сяброў.
Бывае,
Не магу дазвацца,
Хоць і заву на сто ладоў.

І хоць страчаешся без ліку
З людзьмі найдобрымі ў жыцці,
Здаецца,
Выбар і вялікі,
Ды як патрэбнага знайсці?

Відаць, аднолькава, не лепей,
Шукаем сябра мы свайго.
— Э-гэй!.. Э-гэй!..—
Крычыш ты ў стэпе,
А я ў бары: — О-го-го-го!..

Ды як ні клічам мы старанна,
Маўчаць, бывае, стэп і бор,
І раптам
Сябра нечакана
Цябе гукне з-пад самых гор.

* * *

Даўно мінулыя, сівому,
Успамінаюцца гады —
Зноў прывялі мяне дадому
Мае дзіцячыя сляды.

Гляджу на рэчку ў дзень вятрысты.
Насустрач хвалі загулі,
Дзе ж хвалі дзён майго дзяцінства,
Відаць, далёка заплылі?

І ўсё, што цешыла навокал —
Перамянілася ў жыцці,
А хвалі тыя так далёка,
Што мне ніколі не знайсці.

* * *

А зоры ззяюць, як і ззялі,
Ніхто іх не адолеў зняць,
Хоць іх паэты абяцалі
Сваім каханкам параздаць.

Калі ж мы разам у дарогу
У маладых пайшлі гадах,
Не абяцаў табе нічога,
Адно, што мог — нялёгкі шлях.

Мы радасць зведалі і гора,
Калі прасторамі ішлі,
Мы разам здабывалі зоры,
Іх уздымаючы з зямлі.

Хай безліч зор, што бачыць вока,
Заўжды іх можна распазнаць,
З зямлі ж, узнятыя высока,
Чырвоным полымем гараць.

# ЯК МЫ АРТЫСТАМІ БЫЛІ...

Мы п'есы гралі з першай чыткі,
У вёсцы шмат было такіх —
Ну, што ж, мы ставілі агіткі,
Яны даходзілі да ўсіх.

Ігралі мы, ігралі з жарам,
Хоць і спрачаліся з агнём —
Хацеў быць кожны камісарам,
Ніхто — буржуем і папом.

Мне добра помніцца й сягоння,
Быў на спектаклях поўны збор,
Як з коўдраў сшытую заслону
Рашуча адкрываў суфлёр.

Пасля ж са збітай проста будкі
Падказваў ён, як мог цішэй,
Мы ж паўтаралі не ціхутка,
На поўны голас, як мацней.

Спектакль наш хутка развінаўся,
Глядач быў пільны да ўсяго,
А з бізуном як пан з'яўляўся,
Крычалі нам: — Лупі яго!

Пазнаўшы блізкія прыкметы,
Дапамагаючы ўвесь час,
Як поп хінуўся да кабеты,
Крычалі нам: — Ну, рыхтык наш!

Па некалькі так п'ес мы гралі
Ажно да позняе начы
А што паставіць — меркавалі
Яшчэ дадому ідучы...

# АХ, КАБ МНЕ РАДАСЦЬ ЗНОЎ ТАКУЮ

Не тая радасць, хоць злаўлю я
Хай рыбы і па сотню страў.
Ах, каб мне радасць зноў такую,
Як плотку першую спаймаў.

Не тая радасць, хоць збяру я
Паўнюткі кош баравікоў.
Ах, каб мне радасць зноў такую,
Як першы баравік знайшоў.

Пішу я вершы. Шмат друкую,
Нямала радасці спазнаў...
Ах, каб мне радасць зноў такую,
Як першы верш надрукаваў.

## Я НЕ СХІЛЯЮСЯ ПАКОРНА

Калі маю душу агорне
Небеспрычынная туга,
Я не схіляюся пакорна,
Трымаюся, і як мага.

І не кладуся жаўталісцем,
Каб хтосьці здолеў растаптаць,
Я веру: ёсць заўсёды вышэй,
Яго імкнуся адшукаць.

Іду, хай горка, мулка, золка,
Няхай прамёрзлая зямля,
А ўспыхне прада мной вясёлка,
І так мне радасна пасля!

## ЛЁН

Лён — краса нязменная,
Лён — успеты песнямі,
Роўненькі, зялёненькі
Ты дзянькамі веснымі.

А калі расквецішся,
Быццам мора выткана,
На людзей наглядзішся
Вочкамі блакітнымі.

І расцеш і цешышся
Ночкамі з салоўкамі,
Зашуміш, узняўшыся
Звонкімі галоўкамі.

Збяруць не па каліву,
Як раней звычайна мы,
Прыбяруць, спарадкуюць
І цябе камбайнамі.

Прыбяжыш у цэхі ты
Ільнянымі ножкамі,
А пасля рассцелешся
Белымі дарожкамі.

Пабяжыш аздоблены
Кветкамі-узорамі,
Быццам што абсыпаны
Веснавымі зорамі.

Пад праменнем сонечным
І пад ззяннем месяца
Будуць людзі ў радасці,
Лён, табою цешыцца!

## ХАЦЕЎ БЫ ЎСЮДЫ Я ПАБЫЦЬ...

Ідзе вясна,
Як добра жыць!
Хацеў бы ўсюды
Я пабыць.

Успомніць
Даўнюю вясну
І пераплыць
Хоць раз Дзвіну.

Спаймаць
Хоць плотачку ў Дняпры,
І першы грыб
Знайсці ў бары.

Пачуць моц ветру
У плячах
Ды ірвануць
У дальні шлях.

Адчуць шырэй,
Як добра жыць,
Вады баржомскае
Папіць.

Пабыць
У Кіеве ізноў,
Паслухаць
Песні каштаноў.

Калмыцкіх стэпаў
Зведаць шыр.
Адведаць
Нават і Памір.

Дабрацца
Ажно да Тувы,

А як жа можна
Без Масквы?

Ідзе вясна.
Як добра жыць!
Чаго хачу,
І не злічыць.

Задумак шмат
Цікавых ёсць...
Ах, каб ды зноўку
Маладосць!

## ЖОРНЫ ЧАСУ

Не аксамітны шлях нам сцелюць,
І шмат залежыць ад саміх.
А жорны часу мелюць, мелюць,
Няма прыпынку ні на міг.

А жорны часу мелюць лоўка,
Мы самі ім даём разгон,
І адбіраецца пытлёўка,
Палова сыплецца на згон.

А зерне росцяць, зерне спеляць,
Штогод наш вышай ураджай,
І жорны часу мелюць, мелюць
На наш савецкі каравай.

## САМАЕ САРДЭЧНАЕ

У Беларусі многа сілы,
У Беларусі — воблік свой,
Ёй колькі б год ні налічылі,
Яна здаецца маладой.
Яна, што кветка-маладзіца
На лузе ў кропельках расы,
І сівізною не свіціцца,
А колькі дзіўнае красы.
І не сагнула свайго стану,
Хай гора-горкае было,
Было яно, былі і раны,
Ды ўсё навечна зажыло.
Спявае, што званочкам звоніць,
А вочы — вочы з сініх зор.
Ты да яе прыгледзься сёння,
Якой яна паміж сясцёр!
У дружбе з імі моцнай стала.
Ёй шмат наперадзе дарог,
І правады, нібы цымбалы,
Ёй граюць песні перамог.
А трубы, трубы пад нагамі,
Скуль промні зыркія гараць,
А вежы, вежы над палямі,
Як быццам волаты, стаяць.
А гарадоў сцягі палошчуць
Прастор, што зрокам не абняць.
І ўсюды вуліцы і плошчы
Вачэй мільёнамі глядзяць.
І мала слоў, каб песню скласці,
Як з кожным годам зноў і зноў
Яна вядзе далей да шчасця
Сваіх дачок, сваіх сыноў.
У Беларусі ж многа сілы,
У Беларусі — воблік свой,
Ёй колькі б год ні налічылі,
Яна здаецца маладой.

## ПОЛАЦАК

Як бы нядаўна ўсё было —
Мой Полацак! Наддзвінне!
А ўжо і пяцьдзесят прайшло,
Калі я вас пакінуў.

Да горада я так прывык
З гісторыяй багатай...
Скажу, садзіўся я ў цягнік
Даволі сумнаваты.

Мой камсамол! Юнацтва дні —
Дваццатых год суровых.
З пашанаю да Скарыны
Жылі мы ўзлётам новым.

Мы многа песень баявых
Спявалі маладыя.
За шмат вякоў, відаць, такіх
Не чула і Сафія.

Хоць пажыла даўно і шмат,
Ды камсамолак дзіўных —
Чырванахустачных дзяўчат —
Не знала Ефрасіння.

Мясцін даўных і пекнаты
Пералічыць не можна —
А знаны вал ля Палаты,
Дзе бойкі вёў цар Грозны.

Шлях Полацка даўно відзён
Усім. Ды шлях змагання
І веліч нашых слаўных дзён
Былі на першым плане.

Знішчаўся ў песнях польскі пан,
Мяжу хацелі зрушыць.

Жыццё рабочых і сялян
Нам сагравала душы.

Мы блузы сінія гады
З павагаю насілі,
Аб першым трактары тады
Нямала гаварылі.

А як сялу дапамагчы,
Каб сілы аб'ядналі —
У акругкоме да начы,
Было, што засядалі.

З нас кожны быў нібы герой,
Мужнела наша сіла.
Мой Полацак! І воблік твой
Юнацтва маладзіла.

За намі ўслед другія йшлі,
Далей нас звала праца,
Бо час ішоў. Мы пачалі
Паволі раз'язджацца.

Нам не кружыла галаву,
Што слалі ўдаль ці блізка —
Каго ў раён, каго ў Маскву...
І трапіў я да Мінска.

Ужо мінула пяцьдзесят,
Ды не магу забыцца,
Няхай пабачыў свету шмат,
Ды Полацак мне сніцца!

## А ХТО ЯК ПІША?

Хто піша пашча, да снядання,
А хто, прыпяўшы дар зямлі,
Хто ўдзень, хто ўночы, хто ж уранні,
А хто й няведама калі.

Бывае, ўночы верш разбудзіць.
Ён хоча неадкладна жыць.
Тады агонь апаліць грудзі,
Якога нельга пагасіць.

Ідзеш, гуляеш — раптам звонкі
Ускалыхне цябе радок.
Другі шукаеш і ўдагонку
Свой прыспяшаеш хуткі крок.

Бывае,
Што ў гурме гасціннай
Цябе ўсхвалюе тайна слоў,
І ты, шукаючы прычыны,
Кідаеш здзіўленых сяброў.

Цябе завуць сюжэт і форма,
І бачна ўдаль імкнецца след,
Хоць розных графікаў і нормаў
Нідзе не ведае паэт.

Што добра створана,
У народзе
Жыве з падзякаю ў душы,
А як ні сілься — не выходзіць,
Адна парада — не пішы!

* * *

Радкі такія на паперы
Каго не здолеюць крапуць?
Хто глыб і шыр
іх можа змерыць,
Хто можа сілу іх адчуць?

Стаю на беразе высокім,
Паглядам зорачы сваім:
«Белеет парус одинокий...»
І акіян — малы прад ім.

## Я САМ САБЕ НАСТРОЙ СТВАРАЮ

— Настрою сёння я не маю,—
Гудзе другі, як авадзень...
Я ж сам сабе настрой ствараю
Ці ў сонечны, ці ў хмурны дзень.

Люблю на золаку ўздымацца
І дзень распачынаю свой,
Я ведаю — натхняе праца,
А з працай добры і настрой.

Бывае гэтак не заўсёды,
Зрабіць, што думаў, не магу —
Ды тымчасовыя нягоды,
Упэўнены: перамагу.

Заходзіць сонца. Спачываю
І веру ў заўтрашні прамень —
Я сам сабе настрой ствараю
І ў сонечны, і ў хмурны дзень.

## ЯК ВЕРШ БУДУЮ?..

Зайздрошчу — спрытна хто майструе,—
Я змалку тым жаданнем жыў.
І верш, як добры дом будую,
Каб ён заўжды трывалым быў.

Каб быў будовы адмысловай
І не баяўся перашкод —
Кладу ў падмурак тыя словы,
Якія выверыў народ.

Са слоў нязгасных і праменных,
Далёка каб былі відны,—
Стаўляю я такія сцены,
Каб вочы цешылі яны.

Са слоў, што моц граніту маюць,
Узятыя з глыбінь пластоў,
Я моцным дахам накрываю,
Каб не баяўся перуноў.

Са слоў такіх, што быццам струны
Маглі б любы найграць напеў.
Я будаваў, каб дбала, чуйна
Спяваў мой верш і не старэў.

## ПЕРАД ВЯСНОЙ

Перад вясной,
Яе спаткання
Усёй чакаючы душой,
У кожнага свае жаданні,
У кожнага лятунак свой.

Тады хлапчук пяцігадовы
Вясновай мараю жыве —
Ягоны чоўнік папяровы
У даль пязнаную плыве.

І кожнаму вясна дарэчы,
І мары ў кожнага свае —
Юнак чакае той сустрэчы,
Калі салоўка запяе;

А рыбакам прысніцца мора,
Вандроўнікам — турысцкі шлях,
А поле сніцца камбайнёру,
Ды ўсё ў мядзяных каласах;

Начлежнікам — кастры да ўсходу
І адпачынак — шкаляру,
Сады ў цвіценні — садаводу,
А з іх узяткі — пчаляру;

Матацыклісту — шлях рухавы
Да мары даўняе паўпрост...
Дый што казаць — усё цікава,
І кожнаму па свой узрост.

Адно старому і зайздросна:
Не ўсё яму, як ні кажы,
Ды ўспамінаць былыя вёсны
Таксама ўцеха для душы.

## КАРПАТЫ

Карпаты, Карпаты...
Ля кожнае хаты,
На цэлым акружжы
Дзяўчаты — як ружы,
А горы,
А горы —
Па самыя зоры,
А трубы-трэмбіты,
Спрабуй дзе знайдзі ты,
Каб так заклікалі,
Каб гэтак спявалі!

Карпаты, Карпаты...
Ля кожнае хаты,
Пры кожным садочку
Хлапцы — як дубочкі,
Іх погляд агністы,
Яны й трактарысты,
Яны й камбайнёры,
Не ведаюць зморы,
А вочы — маланкі,
Іх любяць каханкі.

Карпаты, Карпаты...
Ля кожнае хаты
Хлапцы і дзяўчаты.
Калі вас пабачу,
І высі, і долы,
Раблюся вясёлы,
У круг стапаўлюся
І песняй імкнуся
Вітаць вас крылата —
Карпаты, Карпаты!

# КРЫЎДА

А крыўда ж, яна ўсялякай бывае,
У кожнае свой непрадбачаны шлях.
Бывае, з крупінкі яна вырастае
Да той, што не месціцца больш у грудзях.

Яна спавівае, яна так агорне,
Што нават не хочацца рады шукаць.
Нічога не міла, і свет увесь чорны,
Нібы й прасвятлення нідзе не відаць.

А сэрца, а сэрца сціскае да болю,
І ў вочах пакуты і смутку сляды,
Бывае, што крыўда знікае паволі,
Што цяжка пазбыцца яе праз гады.

Адзіны ратунак — і вера, і праца,
Ратунак ад крыўдаў, хай самых цяжкіх,
Ах, каб было можна, ну так, як дзіцяці:
Раптоўна заплакаць, смяяцца праз міг.

# МУЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Музей Айчыннай.
Ён узняўся
На плошчы, знанаю з будоў.
Я увайшоў — гул лесу здаўся
І смольны пах начных кастроў.

А экспанаты, экспанаты
Займаюць сцены, стэлажы —
Тут самаробныя гранаты,
Абрэзы, міны і нажы.

Клінкі, вінтоўкі розных строяў,
Што на палях вайны знайшлі,
І першаякасная зброя,
Што йшла з Вялікае зямлі.

Газет, лістовак шмат навокал
З лясной друкарні, не адной,
Іду, бы ў час вайны далёкай
Па роднай Беларусі ўсёй.

Іду, нібы ў начах бяссонных,
І бачу — скрозь ў крыві зямля.
Нібы я ў Брэсце і ў Расонах,
Нібы ў Пуцілкавічах я.

Гляджу я на зямлянкі ў хвоях,
Каб жыць, народ іх зладаваў,
А што не фота, дык героі,
А колькі іх я добра знаў.

Ад іх умелых спраў байцоўскіх
Было фашыстам горш і горш —
Казлоў, Заслонаў і Арлоўскі,
Дуброўскі, Дапукалаў, Корж...

Было шмат мужных і гарачых,
Якім навечна жыць і жыць...
Даруй, чытач! Ты сам пабачыш,
Не мог я ўсіх пералічыць.

А дзеі тых, што па-геройску
Здзяйснялі вызвалення план —
Дзе Жукаў вёў, дзе Ракасоўскі,
Дзе Чарняхоўскі, Баграмян.

І вёў змаганне за свабоду
Увесь Савецкі наш Саюз,
Як ёсць усе яго народы
Цябе ўслаўлялі, Беларусь.

І кожны тут, як брат, змагаўся,
Сіл не шкадуючы сваіх,
І шмат хто з іх навек застаўся
На сцежках польных, баравых.

І кожны з іх аб шчасці марыў
І за свабодны біўся свет...
На жаль, вялікія ахвяры,
Але адпомсцілі як след.

Ляжалі горы зухаватых,
Што йшлі наш край запаланіць,
І паразбітыя гарматы,
І танкі, змоўклыя ў агні.

Былі гразёю прытаптаны
Ўсе іх загады і лісткі,
Між іх і фюрэр апантаны
Ляжаў, падраны на шматкі.

У падзямелле з пераляку
Забіўся, звар'яцелы, ён.
І йшлі бясслаўныя ваякі
Палкамі цэлымі ў палон.

Нас партыя усіх з'яднала
Пад сцягам творчым, баявым —
І я іду, іду па залах
І ганаруся моцна тым,

Што перамогу бачыць кожны
Над злоснай набрыддзю чужых,
Што мы ў вяках непераможны,
Што з намі Волі сцяг для ўсіх!

## ПРЫВАБНЫ ШЛЯХ

Разважыш, глянеш —
Сэрцу люба,
Што недарма прайшлі гады.
Скрозь пад зямлёю трубы, трубы,
Па-над зямлёю правады.

Каналы, рэкі
І азёры
Прыйшлі туды, дзе не былі,
А птахі мкнуцца вышай зораў,
Што мы й падумаць не маглі.

Дый што казаць,
Мы шмат зрабілі,
Але й далей прывабны шлях —
Глянь,
На бязмежным небасхіле
Зара, нібы чырвоны сцяг.

# У ВЕК РАКЕТНА-САМАЛЁТНЫ

У век ракетна-самалётны
І міжпланетных караблёў,
Калі б панова жыць,
Ахвотна
Зямлю б я пешкам абышоў.

І жыў бы я адзінай справай
І найжаданаю з надзей —
Пазнаць ўсе дрэвы, кветкі, травы,
А найгалоўнае — людзей.

Хто шчасны з іх,
А хто ў суровых
Умовах шчасця не пазнаў.
Паслухаў бы ўсе песні, мовы
І з кім бы мог паразмаўляў.

Пра наш Саюз усім бясконца
Я б гаварыў, як сам жыву,
Найбольш пра Леніна, як сонца,
Пра Беларусь і пра Маскву.

З людзьмі б я добрымі спазнаўся
Краін вялікіх і малых...
А вось каму б не спадабаўся —
Яны ж вядомыя для ўсіх.

Пазнаўшы люд зямнога шара,
І я б узняўся як паэт!
Шкада, шкада,
Што толькі ў марах
Я абыходжу цэлы свет.

## У КОЖНАГА СВАЯ ДАРОГА

У кожнага свая дарога,
І кожнаму сваёй ісці.
Пясок.
Вярблюд...
Другі й нічога
Нібы й не бачыць у жыцці.

Яго жыццё па-свойму поўна,
Прывабных мае шмат адзнак,
І з тым, што думаем адмоўна,
Ён не пагодзіцца
Ніяк.

Дзе сонца гэтак залаціцца
Патрэбнае гарачыні
І дзе такая
Ёсць крыніца,
Што б'е з бязмежнай глыбіні.

Як вецер ноччу асвяжае,
Прамчаўшы ростані шляхоў!
А як прыгожа
Пальма тая,
Што, як маяк, паміж пяскоў!

Як поўніць грудзі прыгажосцю
Пустэльні жоўты аксаміт.
Ды што каму,
Мне ж любы штосьці
Зялёны, ціхі краявід!

## У ЯСНАЙ ПАЛЯНЕ

Калі зямля мая скавана
Была жандарскім ланцугом,
Свяціла Ясная Паляна
На свет нязгасным аганьком.

Стуль думы генія шугалі
Праз загароды перашкод,
І вочы, вочы абдымалі
Увесь пакутлівы народ.

Ах, як ён дум сваіх узмахам
Скідаў зняволення цяжар,
І калаціўся трон ад страху,
І выў спалоханы алтар.

Яны ягоных дум і сэрца
Пераіначыць не маглі.
А быў ён просты, ну, здаецца,
Як той араты на зямлі!

* * *

А ты за сэрца ўсё трымаеш.
А дні бягуць,
А дні бягуць...
Даўно лістоў тваіх не маю.
І здагадацца не магу:

Няўжо ў няўмольны час суровы
Ўзяла Харонава рака?
Няўжо, каб напісаць хоць слова,
Твая не ўзнімецца рука.

А я б хацеў прайсці хоць следам
Пачуцця даўняга свайго.
Не, лепш чакаць, чым добра ведаць,
Што ўжо чакаць няма чаго.

* * *

Дажджы вясною,
                    што жывыя,—
Зямлі здымаюць немату.
Ах, кроплі,
                кроплі веснавыя,
Пад вамі быццам сам расту.

Здаецца,
            кроплі пахнуць хлебам
І чуцен гоман спелых піў...
Здаецца б, кожную,
                          што з неба,
Я сам бы піў,
Я сам бы піў!

## ЗВЫЧАЙНЫ ДЗЕНЬ

Скажу, што не люблю я ночы,
На золку ў ночы на краю
Я ўжо валяцца не ахвочы,
Ледзь сонца ў шыбы — я ўстаю.

Я рады з новым днём пазнацца.
У кожнага характар свой.
Іду ці з лесам павітацца,
Ці то са Свіслаччу-ракой.

Ці дзень сцюдзёны, ці гарачы,
Праходжу месціны свае...
А што пасля?
Пасля за працу.
Што больш прывабней за яе!

А ці то горад, а ці вёска,
Ад самай раніцы кругом
Я чую працы адгалоскі...
Дык значыць — добра мы жывём!

Гудуць мартэнаўскія печы,
Чуцён камбайна гул здалёк —
Мне радасна, калі й дарэчы
Ім дадаецца мой радок.

Куём, будуем, сеем, пішам —
І б'юцца сэрцы гарачэй,
І з кожным днём мы вышай,
вышай,
А нашы зоры ўсё ярчэй!

## ПЕРАД ВЯСНОЙ

Хай вакол і бела,
Ды чуваць вясна,
Хоць яшчэ нясмела,
Рушыла яна.

Са страхі са спевам —
Першы капяжок.
Аблятае з дрэва
Срэбраны пушок.

А глядзіш, пад поўдзень
Кропелькі хутчэй,
І напіўся смачна
Шэры верабей.

Дзесьці лёд як трэсне —
Ну, сапраўдны гром...
Праз разлом прадвесні
Паглядае сом.

Чуць сініц размовы,
І гракі крычаць,
І брані зімовай
Рэчак не стрымаць.

Белыя аблокі
З-за лясоў плывуць,
І шпакі здалёку
Ўжо лятуць,
Лятуць!

## Я ЎСЁ ПАЗНАЎ...

Я жар спазнаў, і холад лёду,
І крыўду слоў, і ласку воч,
Бо ты змянялася заўсёды
З начы на дзень, са дня на ноч.

Была вясёлай, бесклапотнай
І палахлівым матылём,
Была ты ветрам пералётным
І чорнай хмарай з перуном.

Было ў жыцці ўсяго багата —
І непагоды, і святла.
Была ты палыном і мятай,
Чырвонай вішанькай была.

## ІМ НАРОД КЛАДЗЕ ВЯНКІ...

Помніць маці іх з калыскі,
Падрасталі як сынкі —
Дома ў Жодзіне, пад Мінскам
Стала з імі навякі.

Вельмі я расхваляваўся,
Як да помніка прыйшоў,—
Выпраўляе ў бой Настасся
Ажно пяцера сыноў.

Ім бы толькі шчасце ў працы,
Ім бы толькі жыць і жыць...
Выпраўляе любых маці
Край свой родны бараніць.

Выпраўляе, благаслаўляе:
— Будзьце мужнымі, сыны!
Доўга, доўга іх чакала,
Не вярнуліся з вайны.

Палі ў мужнай, ратнай славе
У баях за Пскоў і Клін,
Пад Смаленскам, пад Варшавай,
Хто, дабраўшыся ў Берлін.

Хоць іх недзе пахавалі,
Ім не згінуць праз гады:
Як жывыя ў бронзе сталі,
Маці з імі назаўжды.

Чуюць — з гоманам у ранак
Прасынаецца калгас,
Чуюць трактары, камбайны
І магутнейшы БелАЗ.

Чуюць — песні мкнуцца звонка
Між абуджаных палёў,

Чуюць рэчку-неўгамонку
І ласкавы шум гаёў.

Расцвіло жыццё нанова,
Зноўку росквіт, ды які!..
І, схіляючы галовы,
Ім народ кладзе вянкі.

# АДЗНАКІ ЧАСУ

Адзнакі час кладзе дарэчы,
Пакуль не возьме небыццё,
Гляджу на твар, на твар старэчы,
Нібы чытаю ўсё жыццё.

Вось звіліны, нібы дарогі,
Вось маршчакі спакойных дзён,
А вось глыбокія трывогі,
Якія ледзь адолеў ён.

Вось, што з'яўляліся звычайна
І доўгі час цаной таму,
А вось ля вуснаў — леглі тайнай,
Што толькі ведама яму.

Хай твар мужчынскі ці жаночы,
Нам ўсяго ў ім не адчуць,
Найбольш, найбольш хаваюць вочы,
Што ўсё з сабою панясуць.

Часамі — шкода маладосці,
Што ўжо не вернецца наноў,
А часам моцна пазайздросціш:
— Ах, колькі пройдзена шляхоў!

* * *

І ў кветак ёсць як быццам доля,
Іх доля часам закране —
Я з васільком сустрэўся ў полі...
Ах, як уразіў ён мяне.

Паміж жытоў зсінеў адзіны,
Як нежаданец ён які —
І той мне здаўся напамінам,
Што плёў я некалі вянкі.

## КАЛІ Б Я МЕЎ ТАКУЮ СІЛУ...

Калі б я меў такую сілу,
Як маю ў марах і руках,
Я б на блакітным небасхіле
Прымацаваў чырвоны сцяг.

Няхай бы ўсім свяціў ён шчасна
Сваёю ласкай і дабром,
Я б зорку з ім змясціў з нязгасным,
Праменным, зыркім аганьком.

Каб з пакалення ў пакаленне,
Паміж святынь нам дарагіх,
Ішоў жывы заўсёды Ленін,
Да волі клікаючы ўсіх.

## ЛЯЎКІ

Цяпер часамі толькі сніцца,
Нібыта ў казцы ўсё было,
Ляўкі, Ляўкі, мне не забыцца
На тое лета, што прайшло.

Ах, як жа сэрца хвалявалі
І спеў Дняпра і сонца ўсход,
Як быццам я пражыў з Купалам
Не чэрвень месяц — многа год.

І хоць Ляўкі былі не блізка
(Вёрст дзвесце ў Мінск, як падлічыць),
Параіў сябра з Оршы ў Мінску,
Што там не блага адпачыць.

Тады не мелі моды дачнай,
Абы знайсці прытульны кут,
І мы былі яму удзячны,
Пабачыўшы сапраўдны цуд!

Дняпро. Гайдалі срэбра хвалі,
Сасновы бор ківаў чалом,
Ах, як вы нас зачаравалі
Тады Ляўкі па-над Дняпром!

І птушак песні і размовы,
Вакол шаўковая трава,
І пах сасновы, пах чабровы
Такі — што кругам галава,

Усё там хвалявала грудзі
На прыдняпроўскае зямлі,
А што яшчэ, дык гэта людзі,
Бы з імі змалку мыраслі.

Мы па гаях там вандравалі
І спачывалі, хто дзе мог,

А ўвечар вершы мы чыталі —
Здабытак з пройдзеных дарог.

І я стварыць імкнуўся штосьці,
Западта ўзяўшы свой разгон,
А «Хлопчык-лётчык», «Лён» і «Госці»
Забралі і мяне ў палон.

Што сам я рос увысь, здаецца,
Я рад быў дзядзьку віншаваць.
І так хацелася ад сэрца
Мне нешта добрае сказаць:

— Ах, дзядзька Янка, Вы павінны
Пабудавацца тут якраз —
Шаўчэнка ў Каневе па плыні,
Ды і ў Смаленску сябра Ваш.

І дзядзька Янка не па жарты
Задумаўся пра свой дамок:
«А што ж, падумаць, можа, й варта,
Ты праўду кажаш, Петрусёк!»

І вырас там дамок Купалаў,
І слава ў ім яго расла,
І ён там жыў, пакуль навала
У край наш вольны не прыйшла.

А ў іх адзіныя размовы,
Дарэшты ўсё як ёсць скрышыць —
Спалілі дом. Купалы ж словы
І не спаліць, і не спыніць.

Іх шлях бязмежны і бясконцы,
І зноў ляўкоўскае жыве!
І ў кожнай шыбіне па зорцы —
Купалаў дом зайсці заве!

## УСЁ З ЦЯБЕ...

З таго, як ты была гарачай
І стыгнуць пачала ў пасля,
Усё, што бачым і не бачым,
Усё як ёсць з цябе, зямля.

І да слана аж
Ад амёбы
Усё, з душой і без душы,
Усё, што лётае па небе
І што імчыцца па шашы,—

І рэчак серабро жывое,
І гоман дрэў па ўсіх садах,
І дахі ўсе над галавою,
І ўсё адзенне і яда;

І небаскробы ўсёй планеты,
Што ўгору, як грыбы, растуць,
Маланкахуткія ракеты,
Што ў даль Галактыкі імкнуць.

Ты працу нам дала святую
І адпачынак уначы,
А вось цябе мы не шануем,
А ты пакуль яшчэ маўчыш.

Цябе пажарамі палілі,
Шчырэлі ў жудаснай сяўбе.
Цябе снарадамі парылі,
Пабілі бомбамі цябе.

Яшчэ і горш мяркуюць штосьці,
Не з дабрыні яны дайшлі,
Што ўжо і атамнаї, ад злосці,
Ажно да сэрца дапяклі.

Ах, людзі, людзі, што ж такое —
Зямля ў крывавай малацьбе,

Павінна ўсё як ёсць людское
Падумаць добра пра сябе.

Свой зямны хлеб
з павагай ешце,
Не высявайце злы свінец.
Бо можа здарыцца, нарэшце,
Канец цярпенню —
і канец!

## КАЛІ ЗМЯНЯЛІ ЯВАЇ МАРЫ...

Калі б мяне спыталі недзе:
— Ну, як жылося,
Як пражыў?
Сказаў бы:
— Шмат я недагледзеў
І шмат чаго недарабіў.

Была ў жыцці няўтольнаї смага,
Шукаў крыніцы нездарма,
Ды ўсё ж пражыў жыццё не блага,
Недаравальнага няма.

Быў час цяжкі,
Быў час гарачы,
Калі жылі мы, юнакі,
Шматлікім нашчадкам не ўбачыць
Таго ніколі праз вякі.

І перад нашым пільным вокам
Былых часоў знікала тля,
Ды і сама, як ёсць навокал,
Пераўтваралася зямля.

І паўставалі явай мары,
Спраў кожны дзень прыносіў шмат,
Ажно ад нашых сэрцаў жару
Палаў чырвоны далягляд.

## НЕ, ЛЕПШ ПРАМОЎЧУ...

Жыву як след паміж усімі,
Раблю, што дужыцца плячу,
І мне даецца, што магчыма,
Ды немагчымага хачу.

Часамі так сагрэе штосьці,
Аж кругам пойдзе галава,
Ах, каб, здаецца, маладосці,
Ну, хоць бы год, ну, хоць бы два...

Яе б я выкарыстаў тройчы,
Каб па-інакшаму пражыць.
Здаецца б, я...
Не, лепш прамоўчу —
Чаму не быць, таму не быць!

* * *

Каб песню мне пра гэта скласці,
Не хопіць самых звонкіх слоў,
Нямала я пабачыў шчасця
Паміж сваіх гаёў, дуброў.

Нямала й перажыў пакутаў
І засмучаўся воблік мой,
Як дуб, стаяў маразам лютым,
Бярозай плакаў веснавой.

І зноўку-зноў, расцвіўшы Маем,
Як чмель, збіраючы радкі,
Я верыў, што над родным краем
Не згасне сонца праз вякі.

## ЛАПЦІ

Хаджу я па музеях стала,
Гляджу, што новага ўзышло,
Ды бачу паміж тым нямала
Таго, што ў даўнасць адышло.

Вісяць і лапці там, у зале,
Што шмат хадзілі па зямлі...
Ах, лапці, лапці,
Ці чакалі
Такой павагі вы калі?

Хто быў у вас гаспадарамі,
Не разгіналі век спіны,
Лупілі часта бізунамі
Іх аканомы і паны.

Хто вас насіў, імкнуўся прагна
Ну хоць бы чым напоўніць рот,
Мясілі вы і снег і багну
На ўсіх дарогах круглы год.

Вы неважнецкае убранне,
А ці то з лыкаў, ці з лазы,
І прэлі пальцы часта ў тване
І дубянелі ў маразы.

Нялёгка вам было агорацць
Калі далёкі шлях які,
І часта мулялі аборы
І націралі сіпякі.

Клялі жыццё, прасілі бога,
Каб дапамог, як мог, сялу,
Ды ўсё ж, як не было нічога,
Хачу я ўзнесці вам хвалу.

Што ні хлапец, што ні дзяўчынка,
Былі і ўдзячны ад душы,

Скакалі ў вас па вечарынках,
Хадзілі ў вас на кірмашы.

Былі вы рознымі па модзе
І прыглядаліся людзям,
Дый што казаць, вы шмат стагоддзяў,
Няшчасным, паслужылі нам.

Няма цяпер ад вас і следу,
Наш час вас даўна перарос,
Ды лапці, ўсім вас трэба ведаць,
Каго ад вас пазбавіў лёс.

## АЛЕ Я СЭРЦАМ МАЛАДЫ

Дзе б ні гасціў, дзе б я ні быў,
Бы ласку даючы мне тым:
Ты, кажуць, многа пражыў,
Ты ветэран, вядомы ўсім!
Маўчу. Але не згодзен, не!
Гляджу пахмурна на зямлю,
На сэрцы непамысна мне,
Бо слоў такіх я не люблю.
Не стаўце між старымі ў рад,
Хоць што зрабіць, ідуць гады,
І пражыў, папраўдзе, шмат,
Але я сэрцам малады.
І свет, нібыта піянер,
Пачаў нам тайны адкрываць.
Яшчэ й Галактыку цяпер
Шырока сталі пазнаваць.
Навука! Высь відна твая,
Але табе няма мяжы...
— Чакай! — кажу сабе і я.—
Ты штосьці новае скажы!
Не ветэран я, а паэт.
Кажу сабе: — Уважным будзь!
Бо новы дзень і новы свет
На міг спакою не даюць.
Усё мяняецца, цячэ —
Праўдзіва некалі знайшлі.
Але наперадзе яшчэ —
Чаго і ў марах не дайшлі.
Хачу, каб шлях трывожны мой
Прайшоў праз дум і слоў гушчар.
Яшчэ я ў працы і ў такой,
Што ад задум кідае ў жар!

* * *

Паэт, сядзі не доўга дома,
Тым больш як малады пакуль.
Патрэбен рух табе самому,
Але найбольш твайму радку.

Радок, нібы карэнь у глебе,
Радок, нібы віхуры свіст,
Радок, нібы маланка ў небе,
Радок, нібы вясновы ліст.

Ты на ручай паглянь, паслухай,
Як ён струменіць і пяе,
А без паветра і без руху
І ён заплесніць, загніе.

## ТАЛАКА

Ах, як плечы прагнуць працы,
Як напружана рука.
Талака, талака,
Вясковая талака.

Вось дык дзіўная сябрына,
Што за дружны люд такі,
Тут магутныя мужчыны,
І дзяды, і хлапчукі.

Паглядзіш — ах, як заўзята
Ставяць сцены, ладзяць дах,
Для суседа ўзводзяць хату,
Што ўзрастае на вачах.

Ад світання да змяркання
Працавітай грамадой —
Пасабіць адно жаданне
І за плугам, і з касой.

Скончаць працу і не верацъ,
Што паладзілі гуртом.
Ах, як смачна за вячэрай
Бульба з кіслым малаком.

У сумеснай працы выйсце
Люд знаходзіў і ў той час,
Што з'ўлялася калісьці
Першым крокам у калгас.

## Я ПАСАДЗІЎ ТРЫ ЖАЛУДЫ

Даўно, ў дзіцячыя гады,
Я пасадзіў тры жалуды
На ўзгорку па-над ручаём
За нашым вузенькім гумном.

І вось аднойчы ў дні вясны,
Каб жыць, прабіліся яны
Праз глебы цвёрдую кару
І стрэлі першую зару.

Ах, як, па першай іх вясне,
Дубкі усцешылі мяне
Спачатку востранькім растком,
Пасля зялёненькім лістком,

Што быў, нібы вясны сцяжок,
З зямлі забраўшы першы сок.
Як бы зрабілі разьбяры...
Пасля — галінкі дзве ці тры.

Калі ж я пакідаў сяло,
Галін нямала парасло.
Пад іх пязмоўклаю ліствой
Я ўжо хаваўся з галавой.

Яны ж вышэй ішлі, на ўзлёт.
Прайшло, прайшло нямала год,
Я зведаў многа гарадоў,
Пакуль вярнуўся да дубкоў.

Адведаць я дубкі прыйшоў,
Ды не дубкі — дубы знайшоў.
Няўжо, падумаў, я садзіў?
Малым я прад дубамі быў.

Ну, сапраўды, як той пігмей,
Дый жыць ім суджана даўжэй,

Іх нават бура не скране —
І гэта цешыла мяне:

Што пад аховай іх вяршынь
Прытулак знойдзе не адзін,
Ці то стары, ці малады,
І ўвосень знойдзе жалуды.

І дума, дума зноў мая —
Пасадзіць гэтак, як і я...
Зноў жалуды зямлю праб'юць,
Ізноў дубкі, дубы ўзрастуць.

Зямля дасць моц асілкам тым,
Нішто, нішто не страшна ім,
І нам дасць моц, як тым дубам —
Нішто, нішто не страшна нам!

## ГАЛУБ НА АНТЭНЕ

Праз акно гляджу я ўранні:
На антэне галубок.
І як быццам ён звычайны —
Дробны, беленькі чубок.

Як ва ўсіх, такія крылцы...
Толькі нешта іншы ён —
То заскача на развілцы,
То бярэ увысь разгон,

То прысядзе ён са спрытам,
То ўзварушыцца ізноў,
То суцішыцца... Нібыта
Нешта слухае з дратоў.

То ўсплыве над дахам дома.
Зноў унізе — скок ды скок...
Я й пазнаў. Дык то ж, вядома,
Гэта міру галубок.

Як пра свет цудоўны слухаў —
Проста люба паглядзець!
А пачуе завіруху —
Дзе спакойна там сядзець?

Чуе грукаты з усходу
Ці вайну ў другім баку,
Ён хвалюецца з нягоды,
Стогне ён: вур-ку... вур-ку...

Ён як ёсць усё заўважа,
Хай то зблізку ці здалёк...
Праўду, праўду сэрцу кажа
На антэне галубок!

* * *

Ёсць час, напоўнены праз меру,
Ёсць час
Нібыта небыцця...
Чым час —
мінутнай стрэлкай мерадь
Альбо падзеямі жыцця?

Ёсць час —
падзеі роем-роем...
Ёсць час,
Які нібы стаіць.
Ёсць час — перажывеш такое,
Што за гады не пережыць!

## КАБ МЫ, ЯК ЗЕРНЕ, ПРАРАСТАЛІ

Ну хто там выдумаў такое,
Што мала нам на свет глядзець?
Жыццё нам дадзена такое.
Ледзь ладу дойдзеш — і канец.

Зямля, няўжо табе так шкода,
Недаўгавечны мы ў цябе.
Была б ты добраю, прырода,
Каб прыраўняла да сябе.

Каб не давала рана гінуць,
Каб кожны здолеў столькі жыць,
Каб кожны мог ва ўсёй пустыні
Усе пясчынкі падлічыць.

Каб мы, як зерне, прараслі
Нанова кожнаю вясной
І валасы свае мянялі,
Як дрэвы ліст мяняюць свой.

## КАЛІ СМАЛЕНСК Я ПРАЯЗДЖАЮ...

Калі Смаленск я праязджаю,
Як улюбёны, і даўно,
Шчаслівы я, што пазіраю
На гэты горад праз акно.

Зубчастыя відны мне сцены
Стагоддзяў даўніх і сівых.
Смаленск, ты рос ў сваім імкненні
На падабенства да Масквы.

І цешыць тое мае вочы,
Што над Дняпром ты горда стаў...
Смаленск, Смаленск, ты неаднойчы
Маскву, як шчыт, абараняў.

І мне прыгадваюцца цені
Разбітых, хто ярмо нам пёс.
І тут жа, тут жа Глінкі геній
Расіі славу ўвысь узнёс.

Тут пад гамонку хваль дняпроўскіх
Раслі за волю змагары,
Жылі Твардоўскі, Ісакоўскі,
Што нам на ўсё жыццё сябры.

Смаленск, ты ні прад кім не гнуўся,
А нішчыў ворагаў нашчэнт;
Тут лёс Савецкай Беларусі
Абвешчаны па ўвесь сусвет.

І вось, як толькі давядзецца
Сустрэцца хоць на міг з табой,
Ты ўсіх вітаеш нас, здаецца,
Нібы маяк перад Масквой!

* * *

Калі якоі бядой-насланнем
Маю атуліць галаву,
Мне не патрэбна спачуванне,
Усё я сам пераджыву.

Бывае так, што маслам мажа...
Я ж ведаю яго такім:
Табе адно, здаецца, кажа,
Другое ж думае зусім.

Каб не абразіць, слухаць мушу,
Хоць думаю: пляці... пляці...
Што за ману, за крывадушша
Ёсць больш паганага ў жыцці?

## КРЫЖЫ

Пад імі спяць старыя, дзеці,
Там, кажуць, лепш — спакой і ціш...
Крыжы ёсць розныя на свеце.
Пахмурнейшы — магільны крыж.

І дзён ласкавейшых, вясновых
З-пад іх нікому не відно,
Хай з-пад бярозавых, сасновых,
Хай з-пад дубовых — ўсё адно.

Хай надпісы ну хоць якія,
Ды хто спачыў — таму не ўстаць;
Не дапамогуць ім і тыя,
Што нават золатам гараць.

Але ёсць крыж, што сілу мае,
Бо кліч яго адзін: — Жыві!..
Ён жыць нястомна заклікае
Чырвоным колерам крыві.

Той крыж ратуе нас ад смерці,
Вядзе далей жыццёвы шлях.
Той крыж у дактароў над сэрцам,
Ва ўсіх сясцёр на ўсіх франтах.

І моц яго нічым не змерыць,
Ратуе ён здалёк і зблізь.
І я ў цябе бясконца веру,
Чырвоны крыж,
Чырвоны крыж!

## МАРОЗ

Відаць, што трэба пагадзіцца,
Хоць і не ўсё ідзе з душой:
Была зіма, як чараўніца —
Снягі пушыстыя, спакой...

Задумліва бялелі хвоі.
Такая ціша, хоць пяі,
Бы сеймавалі між сабою
Дзятлы, сініцы, вераб'і.

І на катках, дзе лёд іскрыўся,
Дзіцячы гоман рос і рос.
А ты адкуль, адкуль з'явіўся,
Такі няўрымслівы мароз?

І ты, мароз, парушыў цішу,
Здружыўся з ветрам. Злосны ён.
Ты так прыгожа, грозна пішаш
На шыбах студзеньскіх акон.

Ты нават пад кажух забраўся,
Дрыжу ад вострых кіпцюроў.
Дзе злосці ты такой набраўся,
З якіх сівых ледавікоў?

Ды не чапай ты руні-хлеба,
Мы аддалі ёй працы шмат.
Чаго табе, нарэшце, трэба,
Ідзі ў свой полюсны пасад!

Сядзі сабе і злуйся недзе,
Дзе і жывому ты не страх.
Мы ж да вясны сваёй паедзем
На спеўных снежных палазах!

* * *

Не я адзін такі, вядома,
Якому лёгка не заснуць:
А што на свеце,
А што дома? —
Спакою думы не даюць.

І ложак — скарб для даўгалецця,
Падушка — пух над галавой,
А ты ўсё кружышся
Па свеце —
І там, дзе ціш, і там, дзе бой.

Зямлю абкружыш... Досыць! Годзе!
Глядзіш, і сонейка ўзышло...
Чаму ж сон гэткі
Не прыходзіць,
Такі, як некалі было.

Як пасля паствы з доўгай пужкай,
Прыляжаш. Міг. І раптам знік.
Дзе ж тая
Бабчына падушка,
Дзе той з саломаю сяннік?

Я сну прашу, ды так ласкава,
І ледзь ад злосці не крычу.
Не ў сенніку, вядома, справа...
А ў чым?
І думаць не хачу!

* * *

Паэт сапраўдны —
Ён шматсільны,
Паперу ўзварухне:
— Жыві! —
З пяра не кропелькай чарнільнай,
А з сэрца кропляю крыві.

Хай часта смеццем,
І глыбока,
Засыпаць мкнуцца, і не раз,
Паэзіі сапраўднай вока,
Яно ж іскрыцца, як алмаз!

* * *

Жыццё складанае бясконца:
І шчасця шмат, нямала й ран,
У кожнага ў вачах ёсць сонца
І свой у грудзях акіян.

Прайсці жыцця нялёгка далі,
Бывае, выпадае даль,
Што сонца промнямі апаліць
І аж аглушыць гулам хваль.

Але скарацца ім нягожа,
Змагацца трэба, трэба жыць,
Хоць часам доўга боль не можаш
Ні пагасіць, ні прыглушыць.

## МАЙСТЭРСТВА

Ёсць рэчы ў свеце на здзіўленне,
Чаго не вытварыць рука,
Якое дзіўнае майстэрства,
Ну хоць бы ўзяць у павука.

Паглядзіш, аж зайздросна часам —
Ў кутку, на шыбіне акна,
Ён распаўе такія кросны,
Дзе павуцінка, што струна.

А павуку адно што слухаць
І нагатове толькі быць,
Бо ледзьве муха дакранецца,
Як павуцінка зазвініць.

А павукова вуха востра,
Спяшаецца да мухі той,
Сок выпівае ён з ахвяры
І, адпачыўшы — да другой.

Яго я прызнаю за майстра,
Ён болей майстра, чым герой,—
Усюды, скрозь жыве майстэрства,
І ў павука ёсць спосаб свой.

## МЭТА

Даўно ж усіх цікавіць гэта,
Як жыць на свеце, што рабіць?
У кожнага быць мусіць мэта,
А як бязмэтна можна жыць?

Калі ж яе не адшукалі
І не імкнуліся знайсці,
Вам дробнай трэскай плыць на хвалях,
Імчацца ўлегцы па жыцці.

А можна чым захочаш стацца,
Ды варта толькі пажадаць,
Ах, колькі ў нас цікавай працы,
Ах, як бы ўсё паспрабаваць?

Як гадаваць калоссе хлеба,
Як зведаць майстрам маладым
Нутро зямлі, у зорах неба
І космас, таямнічы ўсім.

Дык хай жа з нас пазнае кожны,
Пра гэта здолее адчуць —
Без мэты ані дня не можна,
Шмат з мэтай можна дасягнуць!

## НЕ ЗАВУШНІЦЫ ЗАЛАТЫЯ...

А я любіў, калі на шыі
Былі ў дзяўчатак тых часоў
А не маністы залатыя —
Вянкі з рамонкаў, васількоў.

А з імі самі расцвіталі
Яны ў праменьчыках вясны,
Ах, як, ах, як яны спявалі,
Ах, як смяяліся яны!

А вочы іх агнём адорадь,
Ім спадабаешся калі,
Іх вышываныя уборы
Куды хацелі нас вялі.

Мне кажуць: сёння ў іншым сіла,
Краса другое моды ёсць,
Што старасць мпой загаварыла,
А я не згодзен — маладосць!

## РАМОНАК

Рамонак любы мне бясконца
З дзяцінства даўняга майго:
Ў яго сярэдзіне — бы сонца,
Пялёсткі — прамянямі яго.

Ён захапіць любога можа,
Дзяўчыне люб і юнаку,
Як непаўторна ён прыгожы,
Калі красуецца ў вянку.

Такім звычайным ён здаецца
На ўзроўні дробнага растка,
А ў красаванні разліецца —
На лузе морам малака.

Яшчэ бабулі ўнукам раяць:
Паваражыце ў пэўны час...
Мо нездарма ж усе гадаюць,
Адзін чакаючы адказ.

Не ведаю, ён праўдзіў колькім,
І для мяне той час мінуў,
І я гадаў... Ды крыўдна толькі,
Мяне не раз ён падмануў.

Ну што ж, прайшло, мінула тое,
Не крыўджуся — цяпер люблю!
І бачу светлай, маладою
З рамонкам родную зямлю.

# САЛОЎКА І ВАРОНА

Ноч. Як быццам блізка ранак,
Хоць і морак не растаў...
А салоўка, ледзь світанак,
Голас свой паспрабаваў.

Ён і голле не парушыў,
Срэбра здолеў скрозь разліць,
Ах, як ён мяне узрушыў:
Жыць хацелася і жыць!

А ў салоўкі болей сілы,
А насустрач і зара...
Ды варона супыніла,
Знекуль побліз: «кра» ды «кра»...

Вось між голля промень б'ецца,
І салоўку весялей,
Ды як толькі ён зальецца,
«Кра» ды «кра» гучыць мацней.

Бачыш, здольны вырастае,
Нам такога б віншаваць,
А яно й інакш бывае:
«Кра»... паэта й не чуваць.

«Кра»... праз меру вельмі шкодна,
І хоць зрэдку між гадоў
Пазабаўляцца нам выгодна
Варання і груганоў.

## КАЛІ Б Я МОГ

З чаго пачаць? Нялёгка гэта,
Каб хоць і сотні год я жыў,
Калі б я мог — усю планету
На лепшы б лад перарабіў.

Пяскі пустэльняў, дзе жывое
Было няведама калі,
Я б спалучаў найлепш з вадою,
Здружыў, каб сёстрамі жылі.

Я да пяскоў (такія планы,
Каб там расло, каб там цвіло)
Прывёў бы частку акіяпаў,
Глядзіш, пяскоў бы не было.

А што далей?.. Задуме згодна,
Я, як і справу пачынаў,
Дык шмат народаў там выгодна,
Без крыўды б скрозь парассяляў.

Мне кажуць: — Быць рэальным раім,
За гэта ўзяўся ты не ў час!
Ах, мары, мары! Шмат іх маем...
Мо рэчаіснасць дасць адказ?

## ПАДАРОЖЖА
## МІНСК — МАСКВА

Я ў чарговым падарожжы
Ў век аўто і век шашы —
Сто імчым і болей, можа,
Паспрабуй жа, апішы!

Стала ўсё западта блізка,
Погляд свой куды ні кінь,
Толькі выехалі з Мінска —
Ўжо Лагойск і ўжо Хатынь.

Вёсак ледзь відаць абрысы,
Бо мацнее наш разгон,
Вось ужо і сам Барысаў,
Дзе гібеў Напалеон.

Лес, а голлейка не маша,
Бег слупоў ў вачах мільгаў...
Вось яна і Ворша наша,
Дзе Заслонаў ваяваў.

На мяжы з Расіяй — зорка:
Дружна побач мы жывём.
Мільгануў Смаленск узгоркам
І асрэбраным Дняпром.

Вязьму я мінуў з Мажайскам,
Вось і ўжо Барадзіно.
Чуцен покліч: «Калі ласка»,
Ледзь сталіцы не відно.

Бессмяротная прапіска
Дом Твардоўскага — Пахра,
Купцава, дзе жыў Багрыцкі,
І Акулава гара.

І той дом, дзе Маякоўскі
З сонцам чула размаўляў

І па-хатняму, па-свойску
Сонца ў госці запрашаў.

Вельмі хуткая дарога,
Трошкі кружыць галава...
Еxаў я гадзін нямнога —
Пяць гадзін — і ўжо Масква.

Еxаў я даволі ўдала.
Паспрабуй жа, дагані!..
Шкода, што пабачыў мала,
Значна менш, чым на кані.

## ПЕВЕНЬ

Табой заўжды я ганарыўся,
Душу глыбока ты крануў —
Калі на свет я нарадзіўся,
Цябе мо першага пачуў.

Ты разнаколерны адзеннем,
Шалом з чырвоным грабянём,
Ты нездарма завешся неўпем,
Ты чымсьці сходны з песняром.

Хай узляціш на плот пахілы,
Ты азіраеш грозна дол,
А размахнеш свае ты крылы —
Ну, сапраўды, як той арол.

Ты даглядаеш куранятак,
Шмат гадаванчыкаў сваіх,
А колькі ж у цябе кудлатак,
Ты мнагажэнец, як жаніх.

Пясняр,
                той можа выхваляцца,
Сабраў ён песень шмат адкуль,
Ды ты з ім можаш паспрачацца,
Няхай адным:
                        ку-ка-рэ-ку!..

Пад стрэхамі з лучынным дымам
Звычайна цэлую зіму
Не па гадзінніку жылі мы —
Па клічу звонкаму твайму.

З табой мы ўсюды паспявалі,
А ты як быццам пасабляў —
І малацілі,
                пралі,
                        ткалі,
А ты ў час пэўны падпяваў.

Але, мой дружа,
                    хай між намі,
Не мог цябе я ўпадабаць,
Як часта біўся ты з сябрамі,
Ну, што ж,
               ты можаш раўнаваць.

Я многіх птушак паважаю
І ў іхніх спевах
                    і ў гульбе,
Калі ж дадому прыязджаю,
Шукаю першага цябе.

## РАЙ

Ну, дзе той рай... Каб дамагаўся
З нас кожны выйсці ў райскі шлях,
Як быў малым, ён падабаўся
Ў кутках хацін на абразах.
Глядзеў я цэлыя гадзіны
І думаў: добра быць святым —
Ў раі той бог, што на пярыне,
Блакіт аблокаў па-над ім.
Напэўна, бог не ведаў долу —
Ў раі зямлі і не відаць,
Нашто зямля яму? Анёлам
Без ежы хораша спяваць.
Мне божы рай не кінуў следу,
Хоць быў я згодны за слугу...
Падрос. І я, набыўшы ведаў,
Дзе рай знайшоў, сказаць магу.
Любіў на неба я дзівіцца,
Аблокі — толькі сустракай,
А чым не рай каля крыніцы?
А пад бярозкай чым не рай!
Ну возьмем мы хаця Палессе —
І шум садоў і гул дуброў...
А чым не рай на ўзгорку ў лесе,
Дзе шмат суніц, баравікоў?
Сяджу пад дубам, пад кашлатым,
Які нікому не скрануць...
Ну, чым не рай, дзе мне дзяўчаты
Лепш за анёлаў тых пяюць?
Калі б нас лёс куды ні кінуў
І дзе б нам у гасцях не быць —
Ёсць столькі раеў на Айчыне,
Што іх нікому не злічыць!

## СОЛЬ

Што ж, пра гэтую патрэбу
Адказаць табе дазволь:
— Што за ўсё важней да хлеба —
Соль, соль, соль, соль!..

Самы просты, самы ласы
Роўна мусяць паважаць:
Без яе — нішто закраса,
Ды і нельга захаваць.

Я скажу табе, таварыш,
Тлушч без солі —
                    проста брак,
А як соллю хлеб прыправіш,
Хай нішчымны —
                    самы смак!

Што без солі блін бульбяны?
Шмат чаго ў ім не стае...
Ах, як нашы партызаны
Гаравалі без яе!

Як ішлі яны да бою
З ненавіснаї чужынної,
Ім яна была за зброю,
Ды і важнаю якої!

Пасля бою ў тых варунках
У сяброўскі кацялок
Самым лепшым падарункам
Солі быў малы драбок.

Шмат без солі гаравалі,
Потым весціна дайшла,
Што пад самымі нагамі
Соль ўвесь час у іх была.

Хто тады ў трывожным лесе
З іх пра соль падумаць мог,
Што з паверхні
                    на Палессі
Соль у метрах двух ці трох?

Соль знайшлі цяпер.
                    Даволі
Скарбаў солі там ляжыць,
Смела можна
                    тою соллю
Ўсю планету засаліць!

## СТАРЦЫ

Насунуўшы ў латах старыя абноскі,
З торбамі накрыж,
З прыгнутай спіной
Хадзілі, старцы, вы ад вёскі да вёскі,
Ля кожнае хаты гудзелі адно:

— Падайце, што ласка, кавалачак хлеба,
Абвесіла торбамі нас беднота,
Падайце хоць бульбінку
Нам на патрэбу,
Падайце, падайце... мы молім Хрыста.

А твары худыя. Яны са слязамі,
Сляпыя, крывыя...
Хапала ўсяго —
Іх звалі старцамі, альбо жабракамі,
Яны прад вачамі дзяцінства майго.

Калі прыгадаю, ажно ўскалыхнуся —
Як быццам здалёку
Старцоў галасы,
Ах, родная маці, зямля Беларусі,
Ах, як жа гібела ты ў тыя часы!

І сёння усім нам няцяжка разважыць,
Куды тваёй моцы
Знікалі дары,
Цябе рабавалі, да торбы, як кажуць,
Вякамі, вякамі паны і цары.

А сёння гляджу на цябе, маладую,
На нівы, на поле,
Што буйна ўзрасло...
Калі прыгадаю часіну былую,
Дык думаю толькі: «Няўжо так было?»

## КАЛІ БУДУЕЦЦА КРАІНА

Калі будуецца краіна,
Калі на ўздыме
                    ўвесь народ,
Працуй упарта
                    і няспынна
І набліжай
                    яго ўзлёт.

Калі змагаецца краіна,
Калі ў трывозе ўвесь народ,
Адданым будзь
                    і мужным сынам,
Перамагай!
Хай кроў, хай пот...

## ЁН НЕЎМІРУЧЫ

Подзвігу Трыфана Андрэевіча Лук'яновіча — салдата-беларуса, які ў гады вайны ад куль эсэсаўцаў выратаваў жыццё нямецкай дзяўчынкі, стаўшы пасля прататыпам вобраза савецкага салдата ў мемарыяльным помніку ў Трэптаў-парку горада Берліна,— прысвячаецца.

Пасля вайны, для ўсіх балючай,
Ён стаў,
Дзе ратаваў калісь,—
У Трэптаў-парку, неўміручым,
Дзіця ля сэрца,
Меч уніз.

Знаёмы ён да дробнай рыскі,
У даўні, мой юначы час,
Ды, можа быць,
У ціхім Мінску
Мы сустракаліся не раз.

Бялявы твар. Густыя бровы.
Пагляд, што пільна бачыць звык...
Ды то ж
Наш Трышка Лук'яновіч,
Радыёзавода працаўнік.

У першы ж дзень вайны праклятай
На кут,
Дзе быў яго дварок,
Зляцела бомба, знесла хату,
Забіла бабку, дзвюх дачок.

Ён злосным катам не скарыўся,
А выйшаў помсціць:
— Кроў за кроў!
Ён з аўтаматам нарадзіўся
І да Берліна з ім дайшоў.

І вось у логаве разбою,
Што свет крывёю заліло,—
У байцы ўбачыў ён такое,
Што сцярпіць сэрца не магло.



Рачны порт, Пхоў, г. Мазыр.
1969 г.




Максім Танк і Пятрусь Броўка ў сталіцы Тувы — Кызыле.
1964 г.

Эсэсаўцы бесперапынку
Знішчалі ўсё перад сабой:
Забілі маці,
А дзяўчынка
Ляжала, плачучы пры ёй.

Дачушак з памяці не сцерці,
Іх так балюча ўспамінаць,—
І ён папоўз
Прад пэўнай смерцю
Дзіцё малое ратаваць.

Дзіця не можа быць чужое,
Для ўсіх дзяцей адна любоў!
І ён прынёс яго,
Жывое,
Аддаў на схову.
Сам жа зноў —

Туды,
Дзе кулі сцены секлі,
Дзе ўсё ляцела
Ўпрах і ўсторч.
А сам жа зноў у бойку пекла,
І ўдзень, і ўноч,
І ўдзень, і ўноч.

Ён біўся мужна,
Біўся ўдала,
Ён берагчы сябе не мог,—
І вось, на жаль, яго не стала
Пад блізкім сцягам перамог.

Няўжо было так немінуча?
Паў Лук'яновіч, як сакол,
Але ён стаў
Як неўміручы —
Дзіця ля сэрца,
Меч на дол.

Ён не імкнуўся быць героем,
Ён здзейсніў
ленінскі наказ,
І кожны мог зрабіць такое —
Савецкі воін, воін наш!

# СОН

Сабіла ж гэткаму ноччу прысніцца —
Чуў я гамонку кніг на паліцах:

З вокладак голас гучыць і праменіць —
Горкі і Блок, Маякоўскі, Ясенін...

Быццам бы заклік веку да веку:
— Горда гучыць імя чалавека...

Крокам змагання крочаць мільёны:
— Вораг не дрэмле яшчэ неўгамонны...

Хочуць святло пагасіць цемрашалы:
— Іх асяняю я свістам трохпалым...

Шчырай адданасці голас узнік:
— Маці-Радзіма! Я бальшавік!..

Сабіла ж гэткаму ноччу прысніцца —
Чуў я гамонку кніг на паліцах.

Парасчыніўшы вокладак дзверы,
Кнігі гавораць на мове даверу.

Здолелі ў далі бязмежныя выйсці.
Гэтак жывыя казалі калісьці.

Ранкам падумаў: сон мой цікавы...
Ды і не сон ён — сапраўдная ява!

## ЧАГО ДАЎНО ЧАКАЛІ МЫ...

Такое кожны бачыць мусіць —
Задум і працы нашай дар,—
Сягоння роднай Беларусі
Мяняецца дзівосны твар.

Паселішчы,
                ну проста цуды,
Як бы пасталі на парад...
Няхай яно яшчэ не ўсюды
І ёсць яшчэ старога шмат.

Хоць і няма шнуроў-палосак
І скрозь камбайны на палях,
Яшчэ нямала даўніх вёсак
Я сустракаю на шляхах.

Хаціны збіліся без меры,
Парадак не змянілі свой,
Ды тое,
            што ідзе наперад,
Увысь сягнула галавой.

Відна мне плошча —
                        гул вясёлы,
Аднекуль спевы,
                        гукі струн,
А паглядзіш — якая школа,
А Дом культуры — прыгажун!

Глядзіш, за плошчай —
                            наваколле
Каля пятлястае ракі —
Дамы паверхаў пяць і болей
І паасобныя дамкі.

Стаяць яны сямейнай згодай,
І хвойны лес —
                        рукой падаць.

Пры іх садкі і агароды,
На іх сланечнікі гараць.

І я вяду з сабой размову:
Антэны,
              вежы,
                         люстраў шкло...
Там уздымаецца нанова
А ці то горад, ці сяло?

Будынак спорту —
                              душ, басейны,
Купайся ў іх сярод зімы...
Ды гэта ж тое нараджэнне,
Чаго даўно чакалі мы!

## ГАЛУБІНАЯ ДУША

Дзе ён, дружа найадданы?
Рыга,
Дзе ён можа быць —
Клічу Яна Судрабкална,
Не адказвае,
Маўчыць.
Быў сустрэцца заўжды згодны
І чакаць не прымушаў.
Дзе ён, Рыга,
Брат наш родны,
Галубіная душа?..
Можа, дома ён?
Ні следу...
Кажуць, што даўно не быў.
Можа, Райніса наведаў?
Я й да Райніса схадзіў...
Да настаўніка мо сёння,
Як устаў, падаўся ён?
Адказаў сумотна помнік:
— Не прыходзіў ён здавён...
Можа, ў Домскім, бы ў яспоце,
Між музычнай пекнаты,
Можа, дзе на адзіноце
Піша дзіўныя лісты?
Можа, выкліканы спехам
У жаданую Маскву,
Можа, ў Беларусь паехаў
Ці наведаўся ў Літву?
Грудзі з Залатою Зоркай,
А саромлівы такі,
Вочы ж, вочы — два вазёркі,
Два вазёркі-васількі.
Дзе?
Спакою я не маю,
Дзе ён,
Дружа любы мой?..
Судрабкална я шукаю
З галубінаю душой.

## РАЗМОВА З ДУБАМ ПАСЛЯ ДОЎГАЙ РОСТАНІ

— Было нам абодвум і горка і цяжка,
Я, дубе, вярнуўся з павагай і ласкай...
— Гадоў мне нямала, з павагай не
шкодзіць...
— І мне ўжо, мой дубе, зашмат
падыходзіць.

— Ты ездзіш далёка ад роднага краю,
А я, брат, зямельку карэннем трымаю.
І мне асабліва ў час грозны, трывожны
Яе ні на хвілю пакінуць не можна.
А войны. А войны, я ведаю змалку,
Хацелі зямлю разабраць па кавалку.
Хацелі, што неслі разбой, папялішчы,
Зямлю запалоніць, а ўсіх нас — панішчыць.
Гула й нада мной павальніца ліхая,
Ды я, брат, зямельку карэннем трымаю.

— А я, франтавыя дарогі як мераў,
У моц тваю, дубе, па-моцнаму верыў.
Я верыў, мой дубе, ты, дужы, трымаўся...
Я ж падаў, стагнаў ды ізноўку ўздымаўся.

Мы многа, мы многа сяброў пахавалі,
Ды волю і шчасце навекі прыдбалі.
Каб нас раз'яднаць, заняволіць з табою,
У свеце не знойдзецца сілы такое!

## САВЕЦКІ ЧАЛАВЕК

Ты ганарыцца права маеш
У наш бурлівазменны век —
Адразу ўсюды ўсе пазнаюць,
Што ты савецкі чалавек.

Вачам сяброўскім, ці варожым,
Ты выглядаеш сам сабой,
Бо ты інакшым быць не можаш —
Вядомы ўсім характар твой.

Нязломны, вогненнага гарту,
Адкрыта вымавіш як след,
Што паглядаеш ты з пагардай
На той, што дажывае, свет.

Дзе небаскробаў лес бяскрайні,
Жыве там па дзялку дзялок.
За надпісам суровым Private
Недатыкальны іх куток.

Ніхто магната не крапае,
Ліхвяр спрадвеку быў такім:
Ён ганарыцца тым, што мае,
Ягоны Private заўжды з ім.

Ну што ж, няхай жыве як хоча.
Маё жыццё куды ярчэй!
Я вам, банкіры, не зайздрошчу,
За ўсіх за вас я багацей!

Закон рашыў надзвычай мудра:
Усюды, скрозь усё сваё —
Куды ні глянь — сады, і тундра,
І мора Чорнае маё!

Бярозы сок мненаліваюць,
Пчала збірае мёд і воск,

Я дзе хачу адпачываю —
Карпаты, Нарач, Кіславодск.

Багаты я. Усё я маю,
Што не магу падвесці й лік,
Дае вушанку мне напаец,
З бавоўны вопратку — таджык.

Я сын і брат ў аленнім чуме,
І ў горах сын, і ў стэпах сын,
Я сын Палтавы, сын Сухумі
Ды і Ташкенту родны сын.

Мне жыць і жыць без дум аб смерці,
І скрозь мой дом — далёка й бліз.
Вядзе маё наперад сэрца
Адзіны надпіс — Камунізм!

# II
# ПАЭМА

## МАРАТ КАЗЕЙ

Марат!
Ты вечны, як народ,
Ты ў бронзе
Ў чатырнаццаць год!

Хай час
За годам год цячэ,
А ты —
З гранатаю ў руцэ

Стаіш...
А прад табой вайна.
Здаецца, крыкнеш:
— Вось вам!.. На!..

Граната
Вырвецца з рукі —
І рвуцца каты
На шматкі.

Марат Казей!
Няма вайны,
А ты —
Не разагнуў спіны.

Гатовы ў бойку
Зноў і зноў...
Марат!
З тваіх палёў, лясоў
Прагналі зграі дзікуноў.

Устань, Марат!
Навокал глянь —
На ўвесь юначы рост
Устань!

Паслухай
Песні ўсіх дарог,

Марат Казей,
Ты перамог!

Між дзён вайны
І між начэй
Ты быў душой,
Марат Казей,

Ты быў смялей,
Казей Марат,
За злосных катаў
Мнагакрат.

Марат Казей!
Народны сын,
Нямнога ты пражыў часін.
Вірыў крывавы
Вадаспад...
Ды прыгадаць ты
Можаш шмат!

### 1. ДЗЕД АЛЕСЬ

Марат
Запомніў праз гады:
З ім дзед Алесь
Быў заўсягды.

Ён і не мог
Таго ўявіць,
Як можна
Без дзядулі жыць?

З тых дзён,
Калі з'явіўся свет,
Відаць, і жыў
Ягоны дзед.

Ах, дзед Алесь,
Як з казак Бай,
Ён знае ўсё,
Што ні спытай.

Калі сухвей,
І дождж калі,

І што расце
На ўсёй зямлі.

Як поле жаць,
Дзе сенажаць
І кветку кожную
Як зваць.

Сабрана шмат
Яго рукой —
Ручайкаў зёлак
Пад страхой.

А больш за ўсё
Дык дзед Алесь
Унуку
Гаманіў пра лес.

Пра лес
Нябачнай пекнаты,
Пра выспы, ўзгоркі,
Балаты,

Пра сосны,
Елкі і дубы
І пра чарніцы,
Пра грыбы,

Пра пчол лясных
Ды шмат чаго
Пра ўсё
Насельніцтва яго,—

Дзе вепрукоў,
Дзе воўчы след,
Што ні спытай,
Адкажа дзед.

І ўнуку
Бацьку ўспамінаў,
Чаму
Імя Марата даў.

— Твой бацька
Моры пераплыў,

Твой бацька
За матроса быў.

Ён перамог
Віхураў шмат,
Быў карабель яго
«Марат».

На ім
За волю ваяваў...
Табе ж —
Імя Марата даў.

А дзед сам
Коней даглядаў...
Марат
Дзядулю пасабляў.

Любіў ён
Коней даглядаць,
Карміць, і чысціць,
І купаць.

Ды і скакаў —
Хоць на парад!
Стаў добрым коннікам
Марат.

Быў дзед
Захоплены малым...
А маці
Жартавала з ім

(Яна дасціпнаю
Была —
Паштавіком
Свайго сяла):

— Нашто мне
Тэлеграмы слаць?
Хутчэй ты можаш даскакаць!

Ах, як заіздросціла
Яму

І Ада,
Брацiку свайму.

А колькі
Зайздрасці
Ў сяброў,
У аднагодкаў-хлапчукоў!

Ды ўсё ж між іх валодаў мір,
Марат —
Прызнаны камандзір.

Забавам
Ведалі цану!
Гулялі хлопцы
І ў вайну.

Які б ні быў
Налёт, напад,
Перамагаў заўжды
Марат!

За днямі дні
Вясёла йшлі —
Ў забавах
Хлапчукі раслі.

Была іх песня
Скрозь чутна...
Ды раптам —
Грымнула вайна.

І танкаў гул,
І бомбаў гром...
Закалаціўся
Кожны дом.

Нібы
Перавярнуўся свет...
І спахмурнеў
Дарэшты дзед.

І Ада ў смутку.
Больш маўчыць.

І маці плакала
Ўначы.

Бо злосны акупант
Прыйшоў —
Усюды гвалт
І ўсюды кроў.

Спалілі клуб,
Дзіцячы сад...
Не можа вытрымаць
Марат.

Нялёгка
Гэта наглядаць...
Марат
Не можа даравацъ!

## 2. МАРАТАВА СЯМ'Я Ў ГОРЫ

Гарыць
У полымі зямля.
Гаруе
Ўся як ёсць сям'я.

У гневе, ў горы
Люд увесь,
Гаруе маці,
Дзед Алесь.

Ад папялішчаў
Дым і чад...
Гаруюць
Ада і Марат.

І кожны думае,
Як быць,
Як лютых ворагаў
Пабіць?

І чым з іх можа
Кожны сам
Дапамагчы
Сваім байцам?



А. Гапчар, В. Васілеўская і П. Броўка
на Сусветным кангрэсе за раззбраенне і мір.
Масква, 1962 г.



Міхась Лынькоў і Пятрусь Броўка (у цэнтры)
сярод дзеячаў літаратуры і мастацтва.
Масква, 1960-я гады.

І вось вайна
Прайшла на ўсход...

. . . . . . . . .

Марат
Знаходзіць кулямёт.

Маўчалі
Кінуты «максім»
І ўзгорак могілак
Пры ім.

Байцоў
Паспелі пахаваць,
Яго ж
Не здолелі забраць.

І кулямёт,
Між гільз пустых,
Марату
Скардзіўся, бы ўслых:

— Дарэмна
Ў забыцці
Тужу,
Яшчэ я
Службу саслужу!

І вось,
Нібы яго пачуў,
Марат
Той кулямёт сцягнуў —

Сцягнуў
З акопчыка ўпачы,
Сцягнуў —
У рэчцы зберагчы.

Ды тайну
Ў сэрцы захаваў...

. . . . . . . . .

Аднойчы
Дзеду ўсё ж сказаў.

І пахваліў унука
Дзед,
Ды так параіў
Як і след.

Дый сам
Унуку дапамог —
І сталі
Завіхацца ўдвох.

З травы,
З кустоўя, з чаратоў,
З вады ўзнялі
Для новых схоў.

А каб надзейна
Захаваць,
Паспелі
Дбайна разабраць

Ды змазаць,
Каб не гінуў ён,
І ўладкаваць
У добры схрон.

Парадаваў
Марата дзед —
Прынёс
Аднекуль пісталет.

Пасля
Яшчэ прыдбалі шмат
Патронаў,
Некалькі гранат...

І ведалі:
Са зброяй той,
Час прыйдзе,
Выйдуць і на бой!

## 3. МАРАТ І АДА

Марат
Заўсёды чулым быў.

Сястрыцу Аду
Ён любіў.

І слухаўся
Яе парад...
Ёй болей год
Было не шмат.

Ды ўсё ж дзяўчына,
Што ні казаць...

. . . . . . .

І мусіў
Тайну ён хаваць.

Не ведаў жа,
Што пра сакрэт
Паведаў
Маці й Адзе дзед.

Хоць заўважаць
Ён часта мог —
Яны шапталіся ж
Утрох.

Што ў хату
Потайкам з лясоў
Прыйшло
Пяць раненых байцоў.

Што маці з Адай,
Як сваіх,
Кармілі
І лячылі іх.

Калі ж іх раны
Зажылі —
У лес
Байцы ўсе адышлі.

А ў хату
Ў вечар зімавы
Прыпоўз аднойчы
Ледзь жывы...

Быў пажылы ён
На гады,
Зусім знясілены,
Худы.

Не мог крануць
Ані рукой
Ад раны
Вельмі ўжо цяжкой.

І непрытомны
Быў у жар...

. . . . . . . .

— Ды гэта ж, дзеці,
Камісар.

Яго мы мусім
Ратаваць...
А прыйдуць немцы —
«Татам» зваць.

Хвароба
Пройдзе, праміне,
А вы ж
Разумныя ў мяне —

Павінны
Так дапамагаць,
Каб як хутчэй
Ён мог устаць!

І пажаданы час
Настаў,
Іх цяжкахворы
Ачуняў.

І ведалі,
Калі ён знік,
Што ён —
Галоўны кіраўнік

Для ўсіх
Няскораных людзей,

Для ўсіх —
За волю хто ідзе.

Ён у падполлі
Быў герой.
І ў партызанаў —
Галавой.

І гэтым цешыўся
Марат —
Паведаў ён яму
Пра склад.

І вось узнік
Іх план увесь —
Марату й Адзе
Шлях у лес.

І маці
Падтрымала план,
Як сувязная
Партызан.

Прыходзіў часта
Ў начны змрок
З лясоў
Камалаў-Каласок.

Марат цяпер
Сядзеў ціўком,
Калі шаптала
З Каласком

Аб тым,
Якое войска йшло
І колькі
Танкаў прагуло.

Дзе што схованас
Ляжыць,
Што вытварае
Здраднік Сыч.

Марат
Не мог ужо маўчаць,

Ён
Маці стаў дапамагаць.

— Ты партызан ужо,
Сынок!..—
Хваліў Марата
Каласок.

Марат жа
Захапляўся ім,
Адважным волатам
Лясным.

Быў рады
Стрэчы з Каласком,
Што ўноч прыходзіў,
Залачком,

У шапцы,
Пахла што сасной,
З чырвонай
Стужкаю на ёй.
Марат
У лес прасіўся зноў...

. . . . . . . . . .

І вось
Аднойчы час прыйшоў,

Як апынуліся
Ў бары,
Дзе
Партызаны-змагары

Прытулак,
Лагер мелі свой,
Адкуль
Яны хадзілі ў бой!

## 4. МАРАТ У ЛЕСЕ

Гудзе вяршаліннем
Дазор,
Шуміць, гудзе
Вячысты бор.

Астроў вялізны.
Хмыз. Кусты.
Вакол —
Імшары, балаты.

Яго пялёгка
І знайсці —
Адна ёсць сцежка,
Каб прайсці.

А каб
Прыходзіў сцежкай свой,
Яшчэ
І варта ёсць на ёй.

Пад дзірванамі,
Між бяроз,
Нібы сяло —
Зямлянкі скрозь.

Там кожны мае
Уласны кут —
І штаб, і кухня,
І медпункт.

Куток,
Дзе збройныя майстры
І дзе працуюць
Друкары.

Знайшлі там родных,
Блізкіх шмат
І дзед, і Ада,
І Марат.

І Аду
Прынялі байцом.
Стаў дзед Алесь
Вартаўніком.

А вось з Маратам
Што рабіць?
Яшчэ малы
Як мае быць.

Ды хтосьці
Добра падказаў:
— Ды я б яго
Ў разведку ўзяў!

І вось хлапца
Аднойчы днём
Паслалі ў вёскі
Жабрачком.

Кавалак хлеба
Каб прасіў
І весткі стуль
У лес насіў.

Марат вярнуўся.
Быў ён скрозь.
І весткі важныя
Прынёс.

Пра немцаў
І пра служкаў іх.
Сабе ж — чарнейшую
З усіх.

Ад весткі тое
Ледзьве жыў
І Аду з дзедам
Захмурыў.

Ён спапяліў
І сэрцы іх,
Што маці больш
Няма ў жывых.

Яе прыкончылі
Пятлёй...
Ды смерць сустрэла
Як герой.

Такі ўжо лёс
Ім выпаў тром —
І камісару
З Каласком.

Марату
Чорным быў цяжар...
І ён,
Схаваўшыся ў гушчар,

Сядзеў
З панікла́й галавой
І думаў зжурана
Аб ёй...

У Мінску,
Як яму дайшло,—
На пляцы Волі
Ўсё было.

Там шыбельню
Наладзіў кат...
Пляц Волі горды,
Як жа гад

Цябе ў палоне
Ачарніў,
Што сведкай шыбельні
Зрабіў?

Пляц Волі,
Мусіш цвёрда знаць,
Адпомсцім —
Нельга даравацьІ

За тых,
Хто паў у барацьбе,
Адпомсцім мы
І за цябеІ

### 5. ПРЫСЯГА МАРАТА

Адна
Задача ў партызан:
Бурыць, крышыць
Варожы стан.

Дзе міны выбух,
Дзе напад...

Ды выпадаюць
Дні для свят.

Паміж бяроз,
Яліц густых
Парадны пляц
Як быццам іх.

Там сходы.
Весціны з вайны.
І прысягаюць там
Яны.

Стаіць у лесе
Новы строй...
Марат
З узнятай галавой.

А слоў гарачыню,
Як жар,
З душой
Чытае камісар:

— Вам,
Беларускія сыны,
Быць
Пераможцамі вайны.

За волю
Гарадоў і сёл!..
— Клянёмся!..—
Чутна навакол.

Марата галасок,
Як звон:
— Клянёмся! —
Сэрцам кажа ён.—

Між першых
Буду ў барацьбе,
Клянуся, маці,
Я табе!

Усхвалявана
Да слёз

Яго: — Клянуся!..—
Да бяроз.

— Радзіме
Я аддапы сын!
Яго: — Клянуся!..—
Да ялін.

— Я катаў
Буду біць і біць!
Клянуся!..—
Да нябёс гучыць.

А неба,
Бы ў сцягах зары...

. . . . . . . .

Як бы падрос
Ён з той пары.

Адчуў,
Што не завуць малым,
Ён роўным стаў
Сябрам сваім.

Ды і ў мінёрах
Каб хадзіў,
Сямён Пятровіч
Запрасіў.

Былы настаўнік
Рыхтаваў
Хлапцоў
Да выбуховых спраў.

І міны ўмела
Сам рабіў,
І ў ноч
На выбухі хадзіў.

І вось Марат
Запомніў ноч,
Калі не мог
Адвесці воч

Ад шляху,
Што на ўсход ляжаў,
Ад рэек,
Міну дзе падклаў.

Ах, як жа
Хваляваўся ён,
Калі
Загрукаў эшалон!

І раптам — выбух:
Бляск і гром...
Пайшло грымець
Усё кругом.

І паравоз
З адхону знік.
І дзікі енк,
І дзікі крык...

Марат жа гойкнуў
У той міг:
— Вось вам за маці
І за ўсіх!

І хоць парушыў тым
Загад,
Быў задаволены
Марат!

### 6. АДЫХОД. РОСТАНЬ З АДАЙ

А лес
Гудзеў, што акіян...
Дужэла
Сіла партызан.
У немцаў
З розпаю гайнёй
Ніколі не гасціў
Спакой.

Трывога
І някелыны жах
На ўсіх дарогах
І шляхах

І скрозь
Па гарнізонах іх,
Хоць і пад сховаі
Вартавых.

Рашылі карнікі —
Зімой
Пакончыць
З сілаю ляснсі.

І вось на лес,
Дзе жыў атрад,
Кідаюць немцы
Войска шмат.

І абкружылі
Лес вакол,
А бомбы з неба —
Стогне дол.

І гул снарадаў,
Посвіст куль,
А міны, міны —
Адусюль.

Дык што ж
У гэткі час знайсці?
Адзін ратунак —
Адысці!

І зняўся лагер.
І пайшоў,
Паміж хмызоў
І гушчароў,

На новы стан,
Прытулак свой —
Ў Палессе сцежкай
Баравой.

І кожны харч
І зброю нёс...
А быў бязлітасны
Мароз.

І быў загад
Для ўсіх байцоў —
Ані гамонкі,
Ні кастроў.

Ідзі, кульгай,
Паўзі ўначы,
Хоць як балюча,
А маўчы.

Паміж усіх
Часінай той —
Марат і Ада,
Брат з сястрой.

І Ада часта прыстае,
Бо ногі мерзнуць
У яе.

Валёнкі ёй
Дае Марат.
Яна ж баіцца —
Змерзне брат.

Маўчыць.
Каб ён хоць выйсці мог.
І хоць ужо не чуе ног,

Хоць адчувае —
Быць бядзе,
Яна ідзе,
Ідзе, ідзе...

А побач з ёй
Заўжды Марат.
І раптам бомбы...

Зноў напад.

І міны скрозь,
З бакоў усіх...
. . . . . . .
Так разлучыла
Бойка іх.

Не знали,
Хто падзеўся дзе?..

. . . . . . . .

Сышліся ж
У цяжкой бядзе.

У снежнай яме, у бары,
Адмерзлі ногі
У сястры.

Пабіліся на многа ран.
Хірург
І ён жа партызан

Рашае:
Ногі трэ адняць
І без наркозу
Пілаваць.

Ах, Ада, Ада,
Ты без ног!..
Ніяк Марат
Стрываць не мог,

Калі пачуў з зямлянкі ён
І болю крык,
Пакутны стогн.

Ён,
Горам змучаны увесь,
Пабег далей
У цёмны лес.

Ніхто й не бачыў,
Не спазнаў,
Як ён і плакаў
І стагнаў,

Як, знепрытомлены,
Уначы
Ён маці зваў
Дапамагчы.

І чуў з зямлі,
Нібы здалёк:

— Трывай, Марат!
Цярпі, сынок!

Стрываў . . .
Цяжэйшую з нягод...
Прымчаў па Аду
Самалёт.

Аж у Маскву яе павёз...
. . . . . . . . .
Марат
Усцешыўся да слёз!

## 7. МАРАТ-РАЗВЕДЧЫК

Палескі час зімы
Прайшоў,
Пад Мінск
Вярнуліся ізноў.

І тут,
Між лагерных падзей,
Вядомым стаў
Марат Казей.

Аб ім жа лагер
Гаманіў,
Разведчыкам
Ён слаўным быў.

За ноч, за дзень
Нямала сёл
Ён абыходзіў
Навакол.

Ён ведаў
Кожны гарнізон.
Марат блукаў...
Які ж быў ён?

Хадзіў то з торбаю
Сіратой,
То
З берасцянаю трубой,

Як быццам з пасты
Ледзьве брыў...
То солі ў кожнага
Прасіў.

То быццам бы
Бацькоў шукаў,
А сам
Дасціпна прыкмячаў —

Дзе з фрыцамі
Паўпютка хат,
Дзе колькі танкаў
І гармат.

І што такое
За сяло,
Дзе паліцаяў
Не было?

Трапляў хоць
У бяду не раз,
Заўжды
Знаходзіў ён адказ.

І ў лагер
З розных тых мясцін
Марат
Прыносіў шмат навін.

Вясціны ж раілі,
Як жыць...
І штаб рашаў,
Як што рабіць...

Дазорцаў
Штаб любіў сваіх.
Было ў іх спраў
І шмат цяжкіх...
Былі ж,
Што і здзіўлялі ўсіх!

Марат
Аднойчы залачком

Пайшоў па розвед
З сябруком.

Пад вечар
Абяцалі быць...
А лагер
Уначы не спіць.

Чакае камандзір.
Дарма.
Няма хлапцоў,
Няма й няма...

Вяшчае сонца
Новы дзень.
Не чуць хлапцоў.
Не чуць нідзе.

Схадзіў на поле.
Не відны.
Няўжо загінулі яны?

Вярнуўся ў штаб.
«А што рабіць?
Так па хлапцах
Душа баліць».

А думы ў горы
Зноў і зноў...
. . . . . .

І раптам гул
І трэск сукоў —

Машына немцаў,
А на ёй —
Хлапцы,
І кожны, як герой.

Яны і вестак
Шмат знайшлі,
Яшчэ й машыну
Здабылі!

Маў сябрука
Марат Казей —

Быў па мянушцы
Верабей.

Калечыц зваўся
Вераб'ём.
А ён мог звацца б
І арлом.

Любіла мужная сям'я
Свайго героя —
Вераб'я.

Ён сярод мужных
Храбрым быў,
Разведку смелую любіў.

Што хочаш
Мог ён адшукаць.
Выдумшчык —
Цяжка й прыгадаць.

Аднойчы неяк,
Летнім днём,
Убраўся Верабей
Папом.

А каб паездзіць
Мог папок,
Здабыў кабылку
І вазок.

Вусы й бародку
«Ўзгадаваў»...
За возчыка
Марата ўзяў.

І вось, дзе ціха,
Дзе хутчэй,
З Маратам
Едзе Верабей.

Гаворкі, думы ў іх свае...
А немцаў страпуць —
Поп пяе.

Пяе,
Ды мала што чуваць.
З малітвы ж
Можна й разабраць

Паціхеньку:
— Каб Гітлер здох,—
А ўжо мацней:
Памілуй, бог!

— Памілуй, бог!
— Паб'ём мы вас!..—
Папок гудзе
І алілую завядзе.

Паціху:
— Прыйдзе волі час...
Мацней:
— Ратуй жа, божа, нас.
— Ратуй жа, божа, нас!

Паціху:
— Гітлер — д'ябал, згінь!
Мацней:
— Амінь, амінь...
Амінь!..

Дарога полем,
Блізка лес.
Насустрач
Афіцэр СС.

І стаў Мікола
Так шаптаць:
— Чаму б яго нам
Не стрымаць?

Марат параду
Ледзь пачуў,
За аўтамат —
Ды крануў.

Скаціўся фрыц.
Загінуў ён,

Паў з матацыклам
Пад адхон.

Хлапцы ж
Яго ператраслі
І карту карнікаў
Знайшлі,

З якой відаць быў
Катаў план,
Як хутка знішчыць
Партызан.

Хлапцы ўзялі
Здабытак свой,
Ды раптам кулі чарадой...

Мінуў адзін, здаецца,
Міг.
Адкуль жа
Фрыцы б'юць па іх?

А толькі іх
Не сутрымаць,
Адзін ратунак —
Уцякаць.

У лес, Марат!
У лес, папок!
. . . . . . . .
Кабылку кінулі,
Вазок.
Каб не матлялася
Ў нагах,
Поп рызу скінуў
У кустах.

Ледзь да сваіх
Прыйшлі хлапцы,
Сказалі ў штабе:
— Малайцы!

— Схавайце крыж,
Што бралі ў шлях,
Насіць вам
Зоркі на грудзях!

## 8. АПОШНЯЯ ГРАНАТА

Грымяць баі.
Ідзе вайна,
Але вясна
Ўсё ж ёсць вясна.

Ёсць у вясны
Свае правы —
І песні кветак,
І травы.

І песні
Цвецені ў садах,
І песні
Ў звонкіх ручаях.

Пралесак сінія агні,
І песні жаўра
Ў вышыні.

А смольны пах
Вячыстых хвой!
Марат
Нібы расцвіў вясной.

Ён адчувае
Сэрца ўзлёт,
Ён чуе ўжо,
Што бліжай фронт.

Дачуўся
І пра лёс сястры:
Уратавалі
Дактары.

Здаецца, чуе фронт,
Калі
Прыложыць вуха
Да зямлі.

Здаецца,
Поступ родных чуць,
Здаецца,
Што ідуць, ідуць...

Нішто не можа
Іх стрымаць!..
Ах, трэба ж ім
Дапамагаць

Між партызанскіх
Дзён, начэй,
Каб стрэцца
З роднымі хутчэй.

Ён рады
Пасабіць ва ўсім!
. . . . . . .
Сам начразведкі
Едзе з ім.

Каб добра вызнаць,
Што рабіць,
Як моцны гарнізон
Разбіць.

Прыбіць там катаў
Да зямлі,
Каб родныя
Лягчэй прыйшлі.

І начразведкі
І Марат
Аб'ехалі ўжо
Вёсак шмат.

Наведалі там
Сувязных,
Сабралі вестак
Шмат ад іх.

Але не ўсё змаглі
Здабыць.
Рашылі ў адпаго
Спачыць,

А ранкам
Здзейсніць план увесь
І ўжо тады
Вярнуцца ў лес.

У сувязнога
Ціш. Спакой.
Маўклівы хутар
Над ракой.

Праз ноч гамонку
Там вядуць...
Марату ж раілі заснуць.

Казалі:
— Вельмі ты прыстаў!..
Хоць ён спрачаўся,
Задрамаў,

Шчакой
Прыпаўшы да сцяны,
І сніць Марат
Канец вайны.

Ім вольна жыць,
І Ада з ім,
Яны ўсе
Ў Станькаве сваім.

І зноў на лузе ля ракі.
Настаўнік.
Школа. Хлапчукі.

І скрозь у Станькаве
Спакой,
І ў кожнай хаце
Ён герой.

Ды ў час
Відовішча таго
Перапынілі
Сон яго.

Удвох,
Начальнік, сувязны,
Штурхалі хлопца
Ў бок яны.

— Хутчэй адсюль!
— Хутчэй ўцякаць!

— Гергечуць немцы...
— Нам чуваць!

І вось праз міг,
Нібы віхор,
Яны па конях
Мчаць у бор.

А кулі, кулі —
Адусюль,
Няма ратунку ім ад куль.

Бесперапынку
Б'е гайня...
І начразведкі
Паў з каня.

Марат імчыцца.
Бор відзён,
Зваліўся конь.
Застаўся ён

Цяпер адзін,
Адзін Марат,
З ім дзве гранаты,
Аўтамат.

А немцаў шмат.
Злічыць не мог.
Марат
За ўзгорачак прылёг.

А немцы, немцы
Сугрупём.
Ён паліваe іх агнём.

Ды ўсіх яму не перабіць.
Хто падае,
А хто бяжыць...

Крычаць,
Чуваць абрыўкі слоў:
— Здавайся, рус!..
Бягуць ізноў.

Іх колькі можа
Б'е Марат...
Але змаўкае
Аўтамат.

Не здасца ж ён,
Пакуль жыве,
Яшчэ ў яго
Гранаты дзве.

Кідае ў катаў.
Выбух...
Дым...
Ды мала!
Немцы ўжо пры ім.

Марат крычыць:
— Ну, вось я вам!..
І кінуўся
З гранатай сам.

З зямлёю разлучыўся так...
Апошні выбух.
Знік юнак...
Жыццёвы подзвіг
Здзейсніў свой!
. . . . . . . . . .
Але не знік Марат-герой!
Марат-змагар,
Марат Казей,
Ты біў за ворагаў
Дужэй!

Марат Казей,
Ты перамог!
Ты чуеш песні ўсіх дарог —

А ім плысці
Бясконца год...
Марат!
Ты вечны як народ!

# III
# ПЕРАКЛАД

*Уладзімір Маякоўскі*

## УЛАДЗІМІР ІЛЬІЧ ЛЕНІН

*Паэма*

*Расійскай*
*Камуністычнай партыі*
*прысвячаю*

Час —
пачынаю пра Леніна гаварыць.
Толькі не таму,
што гора няма болей,
час,
бо тугой
душа мая гарыць,
ясным
і прачутым болем.
Час,
ленінскія лозунгі
віхурна зноў узвей.
Нам хіба разлужыцца
слязою?
Ленін
і цяпер
за ўсіх жывых жывей.
Нашы веды,
сіла,
наша зброя.
Людзі — лодкі.
Хоць і на сушы.
Пражывеш
свой час,
за які
многа ўсялякіх
брудных ракушак
наліпае
нам
на бакі.
А пасля,
прабіўшы буру напшалёную,
сядзеш пад сонцам, што выяспіла высь,
і счышчаеш
водарасцяў
бараду зялёную

і мядуз малінавую слізь.
Я сябе
пад Леніным чышчу,
каб плысці
далей
праз рэвалюцый гром.
Я баюся
радкоў гэтых тысячы,
як баішся
фальшу хлапчуком.
Галаву
вяночкам разуквецяць.
Непакоюся,
вянка таго святло б
не закрыла нам
сапраўдны,
чалавечы,
ленінскі,
вялікі, мудры лоб.
Непакоюся,
каб шэсці
і маўзалеі,
пакланенняў
вызначаны статут
не залілі б апрыкраўшым ялеем
ленінскую прастату.
За яго баюся,
сэрца б'ецца важка,
каб цукерачнай
красой
не быў абхлушаны.
Галасуе сэрца —
па мандату
абавязку
я пісаць мушу.
Уся Масква.
Зямлёй прамёрзлай
б'ецца гул.
Каля вогнішчаў
здубелыя
стаяць да рання.
Што зрабіў ён?
Хто ён
і адкуль?

І чаму ён
у такой пашане?
За словам слова
з памяці цягаю,
не скажу
ніводнаму —
па месца сядзь.
Слоў майстэрня
ў свеце
бедная якая!
Слова вартае
адкуль узяць?
Сем дзён
у нас,
у нас
гадзін — дванаццаць.
Даўжэйшы за сябе
не пражывём мы час.
Смерць не хоча
з прабачэннем знацца.
Калі ж
з гадзінамі гора,
каляндарная
замалая мера,
«эпоха» —
гаворым,
гаворым —
«эра».
Мы спім
уначы.
Дзейнічаем
раніцой.
Любім
сваю таўчы
ваду
ў ступцы сваёй.
Калі ж скіраваць
змог
крок
адзін
усіх здзяйсненняў,
мы гаворым —
«прарок»,

мы гаворым —
«геній».
Прэтэнзіі ў нас —
ніякой,
не клічуць —
мы і не рушым;
падабаемся
жонцы сваёй,
і то задаволены дужа.
Калі ж хто,
целам і духам зліты,
да нас не падобны
крочыць,
«выгляд цара» —
глядзі ты,
«дар боскі» —
дзівяцца вочы.
У словах такіх —
ні разумнага,
ні дурнога —
яны павісяць
і паплывуць туманамі.
З гэткіх шкарлупак
не выкалупаеш
нічога.
Ні галавой не адчуеш іх,
ні рукамі.
Як жа
Леніна
такім аршынам мераць!
Бо вачыма
бачыў кожны, як —
«эра» гэтая
праходзіла праз дзверы,
нават
галавой
не закранаючы вушак.
Хіба так
пра Леніна можна:
«правадыр
з ласкі божай»?
Каб ён быў,
як цар, як бог узнесены,

лютасці сваёй
не змог бы я збароць,
стаў бы я
наперакор
працэсіі,
пакаленням
і натоўпам насупроць.
Я б знайшоў
і слоў
для праклінанняў многа,
і пакуль
маіх
не знішчылі б
прамоў,
я кідаў бы
ў неба
зневажанні богу,
па Крамлю
кідаў бы
бомбамі:
далоў!
Але цвёрды
крок Дзяржынскага
каля труны.
Сёння Чэка
магла б
з пастоў сысці Чэка.
У мільёнаў на вачах,
і на маіх,
відны
толькі слёз
ільдзінкі,
што замёрзлі
на шчаках.
Ушанаваннямі казённымі
не здзівіш
бога.
Не!
Сапраўдным болем
сёння,
сэрца,
ледзяней.
Мы хаваем
самага зямнога

ад усіх
прайшоўшых
на зямлі людзей.

Ён зямны,
але не з тых,
хто вокам

у свае карыта
упіраецца старанна.

Ён
усю зямлю
акідваў зрокам,

бачыў тое,
што ў вяках
схавана.

Ён, як вы
і я,
такі якраз,

толькі,
можа стацца,
каля вока

думкі
болей нашага
маршчыняцца глыбока,

цвёрдасці
і ўсмешкі ў вуснах
болей, чым у нас.

Не сатрапа цвёрдасць
трыумфатарскаю каламажкай
падмінае вас у жудаснай хадзе.
Да таварыша
людской
мілеў ён ласкай.
Ён
да ворага
жалеза
быў цвярдзей.
Меў ён
слабасці
і нам вядомыя,
як і мы,
перамагаў хваробы боль.
Скажам,
мне — більярд —
я вока адгадоўваю,

шахматы яму —
правадырам ад іх
карысці больш.
І ад шахматаў
на ворага,
найшоўшы ў бой
натурай,
ў людзі
вывеўшы
пядаўніх пешак строй,
ставіў іх
рабочай чалавечай дыктатурай
над турэмнай капіталавай турой.
І яму
і нам
тым самым захапляцца.
Ды чаму ж
аддаў бы я
дазвання
ўсё жыццё сваё,
блазнеючы
ад шчасця,
за адно
адзінае
яго дыханне.
Ды не я адзін!
Хто я такі
сабою?!
Толькі б рот раскрыць,
навошта той ківок —
хто б з вас
з сёл,
са скуры вон,
з забояў
ўперад не зрабіў бы крок?!
Кружыць голаў,
бы хапіў
віна і гора лішку —
інстынктыўна
беражуся я
трамвайнай сеці.
Хто цяпер
аплакаў бы
маю смярцішку

у жалобе гэтай
неабсяжнай смерці!

Тысячы ідуць —
на тысячы намножаны,

быццам зноў Расія
ў качэўі стэпавым.

І Калонны зал
дрыжыць,
наскрозь праходжаны.

А чаму?
Навошта
і зачым?

Тэлеграф
ахрып,
жалобным поўны гулам.

Слёзы снегу
са сцяговых
счырванелых век.

Што зрабіў ён?
Хто ён
і адкуль ён —

гэты
самы чалавечны чалавек?
Кароткае
і да апошніх імгненняў
нам
вядома
жыццё Ульянава.
Але доўгае жыццё
таварыша Леніна
трэба пісаць
і апісваць нанава.
Здалеку, даўно,
гадоў за дзвесце,
першыя
пра Леніна
ўзыходзяць весці.
Чуеце —
жалезны
і луджоны,
кроіць
пласт вякоў
наўскасяка

голас
прадзеда
Брамлея і Гужона —
першага паравіка?
Капітал
яго вялікасць,
пекаранаваны,
зрызыкоўшчаны,
абвяшчае
скоранаю
сілу ўсю вяскоўшчыны.

Горад рабаваў,
гроб узагроб,
грабастаў,
глыбіў
пузы кас,
а пры станках
худы і гарбасты
устаў
рабочы клас.

І пагражаў,
уздымаючы
каміны за неба:
— Мы для вас
да золата замошчаны памосцік.

Мы народзім,
вышлем,
прыйдзе калі-небудзь
чалавек,
змагар,
карца
і помспік!

Воблакі і дым
змяшаліся,
як воіны,
як аднаго палка радавыя.

І нябёсы
робяцца падвойнымі,
заслапяюць воблакі
дымы густыя.

Тавары растуць
між галечы,
як горы.

Дырэктар,
чорт лысы,
узнік,
усё
як след
надлічыў у канторы,
буркнуў:
«крызіс»,
вывесіў слова
«разлік».

Прысмакі
ў накрапах
мушынага сеева,
зерня стухлага
элеватары
поўныя,
а пад вітрынамі
ўсіх Елісеевых,
жываты падцягнуўшы,
брылі беспрацоўныя.
Вантробы трушчоб
у голаду ў палоне
гурчэлі,
дзіцячы глушачы плачык:
— Пад работу,
ці пад вінтоўку,
бяры —
дзве далоні!

Прыходзь жа,
заступнік
і расплатчык! —
Гэй,
вярблюд,
што адкрыў калоніі!
Марш
у пустыні,
што ад агню гарачэй!
Гэй,
караблёў сталёвых калоны!
Пеньце пену,
што ад паперы бялей!
Пачынаюць
чорнымі лапікамі займацца
аазісы пальмавых кунег.

Вунь сярод
залацістых плантацый
замучаны
вымычаў негр:
— У-у-у-у-у,
у-у-у!
Ніл мой, Ніл!
Прыгані
і вычарпні
чорныя дні!
Каб чарней былі,
чымся я ў часе сноў,
і пажар каб быў
чырваней за кроў.
Каб ва ўсёй гэтай каве,
што ўраз ускіпела,
кіпець пузатым —
чорным і белым.
Кожны
здабыты
сланоўы клык —
тык яго ў мяса,
ў сэрца тык.
Хаця б для праўнукаў,
кроў каб
не ліць задарам,
выплыві,
заступнік сонечны тварам,
я канаю —
бог смерці прыйшоў па мяне,
не стае ўжо сіл.
Помні
гэта закліканне,
Ніл,
мой Ніл! —
У снягах Расіі,
ў трызненні Патагоніі
варштаты
паставіў час патагонныя.
Ля Іванава ўжо,
ля Вазнясенска
каменныя туны
ліхаманяць
выкрыкі частушак:

«Эх, завод магутны ў нас,
аграмадзіна.
Кліча новага наш час
Сценьку Разіна».
Унукі
спытаюць:
— Што такое капіталіст?

Як дзеці
цяпер:
— Што гэта
г-а-р-а-д-а-в-ы?..—

Для ўнукаў
пішу
ў адзін ліст
капіталізму
фамільны партрэт жывы.
Капіталізм
у маладыя гады
быў хлопец нішто,
меў спрыту лішку:
працаваў —
не баяўся тады,
што ў яго
ад работ
зашмальцуецца манішка.
Трыко феадальнае
яму зацеснае!
Лез
не горай,
чым сёння лезуць.
Капіталізм
рэвалюцыямі,
днямі сваімі веснімі,
расцвіў
і нават
надпяваў «Марсельезу».
Машыну
ён выдумаў
і надзяліў законам.
Да яе —
прыставіў людзей!
Па ўсім свеце
ён
незлічона

рабочых напладзіў
дзяцей.
Зжаваў ён
царствы,
сеўшы за стол,
з каронамі іх
і з арламі.
Разбух,
як біблейская карова
ці вол,
аблізваецца.
Язык — парламент.
З гадамі
знясілела мускулаў сталь,
раздаўся ён
і распух,
такім жа
з цягам часу стаў,
як і яго гросбух.
Палац збудаваў —
усё шыкоўнае!
Мастак —
не адзін! —
па сценах паёрзаў.
Падлога ампірыстая,
столь ракаковая,
сценкі —
Людовіка XIV,
Каторза.
Вакол,
з тварам,
што аднолькава мог пагадзіцца
быць і тварам
і ягадзіцай,
задатварая паліцыя.
Да фарбаў,
да песняў
у душы глухата,
як у каровы
да красак
з палянкі.
Этыка, эстэтыка
і іншая лухта —

проста —
яговыя
жапочыя служанкі.
У яговым раі
і ў пекле суровым
прадаюць бабулькам,
з пашэнтам на вуха,
дзюркі
ад цвікоў
у крыжы хрыстовым
і пяро
з хваста
святога духа.
Нарэшце
і ён
перарос сябе,
за яго
робіць
раб.
Адно нажываецца,
жарэ
і сапе,
капіталізм азыз
і саслаб.
Саслаб
і ў гісторыі на шляху
лёг
у свет,
як у ложак свой,
спачываць.
І не аб'ехаць,
не абысці бярлог,
адзінае выйсце —
ўзарваць!
Ведаю,
лірык
скрывіцца горка,
крытык ганарысценькі
дасць бізунную характарыстыку:
— А дзе ж душа?!
Ды гэта ж —
рыторыка!
Паэзія дзе?
Адна публіцыстыка!!

Капіталізм —
непрыгожае слова,
куды прыгажэй —
«салаўіны май».
Я ж
буду ўжываць яго
неаднаразова.
Радок,
нібы заклік трыбуны, ўздымай!
Пісаць буду ўсё я
пра тое,
пра гэта,
ды сёння
для пешчаў любоўных
не час.
Я ўсю сваю
звонкую
сілу паэта
табе аддаю,
атакуючы клас.
Пралетарыят —
няўклюдна
і вузка
таму,
каму камунізм —
пастка адна.
Для нас
гэта слова —
магутная музыка,—
мёртвых
змагацца ўздымае
яна.
Ужо
за наверхам наверх
дрыжыць у бядзе,
кліч сутарэнняў
уверх
па наверхах ідзе.
— Мы прарвемся
у расчыненую
неба сінь.
Праз каменны
пройдзем мы калодзеж.

Будзе:
з гэтых пар
рабочы сын —
пралетарыятаводзец.
Ім
ужо
зямнога шару
мала.
І рукою,
абцяжаранай
пярсцёнкамі ўсяляк,
цягнецца
раскормленая
туша капітала
ухапіцца
за чужы гарляк.
Ідуць,
жалезам
бразгочуць і бразгаюць.
— Забівайце!
двум буржуям цесна!
Кожнае сяло —
магіла брацкая,
гарады —
завод пратэзны.
Абрусы засланы —
скончаны часы акопныя.
Перамога пірагамі
пазірае са сталоў.
— Слухайце
магілаў галасы
вантробныя,
кастаньеты кастылёў!
Калі зноў
вясновыя пачуем весці,
не даруе
час
нам гэтую віну.
Ён разлічыцца,
і прыйдзе,
і абвесціць
вам
і вашае вайне
вайну!

Вырастаюць
на зямлі
слязы азёры,
непралазныя
крыві людской
затопы.
Здзейсніць марылі
адзінкі фантазёры
планы марныя
пустых сваіх
утопій.
Аб жыццё
ілбы
разбілі філантропы.
Хіба для мільёнаў —
філантропаў тропы?
І бяссільны
сам ужо
капіталіст,
так
яго
машына размахалася,—
лад яго
нясе,
нібы пажоўклы ліст,
крызісаў
і забастовак хаосам.
— У чыю кішэнь
сцякаць мы лавай залатой
гатовы?
З кім ісці,
вініць каго ў кляцьбе? —
Клас мільённагаловы
зрок напружвае,
каб зразумець сябе.
Над
цемрай свету
святло
ўставала,
перад святлом тым
пражэктар гас.
Час
нарадзіў
брата Карла —

старэйшы
ленінскі брат,
Маркс.
Маркс!
Перад вачамі
сівізны партрэтнай рама.
Як жа мы
яго жыццё
ўяўляем памылкова! —
Людзі бачаць
замураванага ў мармур
дзеда,
гіпсам
схаладзелага сурова.
Ды калі
рэвалюцыйнай сцежкаю
таропка
першым
крокам
пралетарыі
ішлі,
о, якою
найдзівоснай топкай
сэрца Маркс
і думку запаліў!
Быццам сам ён
мазалі
на ўсіх руках прыкмеціў,
стоячы
з рабочымі
ля ўсіх станкоў,
за руку злавіў
усіх на свеце
дадатковай вартасці
рабаўнікоў.
Дзе дрыжалі целам,
стоячы ля касы,
зірк не ўзняўшы
нават
да пупа
біржавіка-купца,
Маркс павёў
знішчаць
вайною класавай

залатога,
стаўшага быком, цяльца.
Нам здавалася —
у камунізмавы затоны
толькі
хваля выпадку
закіне нас
адна.
Маркс раскрыў
гісторыі законы,
пралетарыят
паставіў ля стырна.
Кнігі Маркса —
не набору касы.
Не сухія лічбы
на старонках кніг.
Маркс
падняў
рабочага
наногі ўласныя
і павёў
калонамі
страйней ад лічбаў тых.
Вёў, казаў:
у бойцы ляж,
калі змагання праг ты.
Справа —
карэктура розуму
цяпер.
Прыйдзе,
прыйдзе ён,
вялікі практык,
павядзе
палямі боек,
не папер!
Думак жорнамі
дамолваючы рэшту
спакваля
і дапісваючы
рукой васковаю,
знаю,
бачыў
Маркс
відовішча Крамля

і сцягі
камуны
над чырвонаю Масквою.
Наспявалі,
спелі дні,
як дыні,
вырас пралетарыят
з хлапцоў
такі.
Капіталавы
высозныя
цвярдыні
валам размываюць,
крышаць на драбкі.
На працягу
некалькіх гадоў
змагання
колькі навальніц гудзе
ад нарастанняў.
І канчаецца
паўстаннем
гневу нарастанне,
вырастаюць
рэвалюцыі
па выбухах паўстанняў.
У буржуяў
азвярэлы,
люты нораў.
Т'ерамі разбітыя,
сыходзячы крывёю,
цені прадзедаў —
парыжскіх камунараў,
і цяпер
крычаць
парыжскаю
сцяною:
— Слухайце,
таварышы!
Мы ўвагі вашай
вартыя!
Гора адзінотным —
вучыцеся на нас!
Узрывайце разам!
Біце партыяй!

Узнімайце
кулаком
адным
рабочы клас.
Скажуць:
«Мы правадыры»,
а самі —
шаркунамі?
За прамовай
скуру
распазнаць
умей.
Будзе правадыр
такі,
што дробязямі з намі —
найпрасцей ад хлеба,
ад рэек найраўней.
Мешанінай класаў,
вер,
саслоўяў
і гаворак
зямлішча сунулася
на рубялёвых колах.
Капітал мацнеў,
штыкі ўздымаў угору
вожыкам супярэчнасцей,
калючым ад іголак.
Камунізма здань
Еўропаю блукала;
бліскі,
адыходзіўшы,
здалёк праменіла.
Вось па ўсім па тым
у глушыні Сімбірска
нарадзіўся
просты хлопчык
Ленін.
Я ведаў рабочага.
Ён быў непісьменны.
Не разжаваў
нават азбукі соль.
Але ён чуў,
як гаварыў Ленін,

і ён
ведаў — усё.
Чуў
апавяданне
селяніна з Сібіры я.

Адабралі,
адбілі вінтоўкамі сяло,
і радасць у ім праменіцца.

Яны не чыталі
і не чулі Леніна,

але гэта
былі ленінцы.
Я горы бачыў —
на іх
і куст не рос.

Толькі
хмары
на скалы
ўпалі
нічком.

І на сто вёрст
у адзінага горца
лахманы
блішчэлі
ленінскім значком.
Гэта,—
скажуць так,—
пра шпількі ахі,—
чулі.

Паненкі
іх прыколваюць
у вечаровы час.
Не шпілька —
прапякло значком
кашулі

сэрца,
поўнае
любві
да Ільіча.
Гэтага не растлумачыш
царкоўнымі славянскімі кручкамі,
гэтакім ён стаў
не з ласкі
боскіх слоў.

Крокам чалавечым,
рабочымі рукамі,
ўласнай галавой
ён гэты шлях
прайшоў.
З гары
Расія
здаецца такой:
рассінелася,
рэчкамі разлітая,
быццам тысяча розаг
разгулялася на ёй,
быццам
бізунамі збітая.
Але сіней
ад вады сцюдзёнай
сінякі
Русі прыгоннай.
Ты
з бакоў
на Расію глянь —
і куды
вокам ні кінь,
упіраюцца небу
ў шклянь
горы,
катаргі
і руднікі.
Ды за катаргі
балючэй была
ля фабрычных станкоў
кабала.
Былі краіны
багатыя болей,
прыгажэйшыя бачыў
не ў сне.
Але зямлі
з яшчэ большым болем
не давялося
бачыць мне.
Так,
не кожны
ўдар
сатрэш са шчакі.

Крык мацнеў:
— Узнімайцеся
за зямлю
і за волю вы!

І бяруцца
бунтаўшчыкі —
адзінкі за бомбу
і за рэвальвер.
Добра
абойму ўвагнаць
у цара злога!
Ну, а як толькі пыл уздымеш
ля кола ля самага?!
Падрыхтоўшчыкам
царазабойства
злоўлен
брат Ульянава,
нарадаволец
Аляксандр.
Аднаго заб'еш —
другі
яго змяніў,
здзекамі
знябытых
пераплюнуць тужыцца.
І Ульянаў
Аляксандр
павешаны быў
тысячным са шлісельбуржцаў.
І тады
сказаў
Ільіч семнаццацігадовы,—
гэта слова
мацней за прысягу
салдатам узнятай рукі:
— Брат,
цябе мы
замяніць гатовы,
пераможам,
але шлях наш
будзе не такі!
Аглядзіце помнікі —
ці бачыце
герояў род вы?

Стане Гогалем,
а ты вяпком яго ўзвяліч.
Не такі —
чорнарабочы свой,
штодзённы подзвіг
на плечы сабе
ўзваліў Ільіч.
Ён вучыць
ля пашчы кузневай —
слухай! —
як быць,
каб узрос пятаком заробак —
твой хлебадар,
што рабіць,
калі майстар
падбадзёрвае аплявухай,
як быць,
каб кіпетнем
паіў гаспадар.
Не канчатковая мэта —
дробязь гэта;
перамогшы,
не стой над адной
змеценай
лужай былою.
Сацыялізм — мэта.
Капіталізм — вораг твой.
Не венік —
вінтоўка зброя.
Тысячы разоў
адно і тое
ён у тугі
ўбівае слых.
А назаўтра
з'яднае адну з адною
рукі,
што зразумелі
сябе саміх.
Учора — чатыры,
сёння — чатырыста.
Хаваемся,
а заўтра
адкрыта ўстанем,

і гэтыя
чатырыста
ў тысячы вырастуць.
Працоўных свету
узнімем паўстаннем.
Мы ўжо
не цішай вады
і травінак ніжай —
гнеў працоўных
навальніцаю цішу мацае.
Рэжа
маланкамі
Ільічовых кніжак.
Сыпле градам
лятучак
і пракламацый.
Біўся
аб Леніна
цёмны клас,
цёк ад яго
ў прасвятленні,
і, абдадзены
сілай
і думкамі мас,
з класам
рос
Ленін.
І дзейсніцца ўжо,
як быль,
тое,
у чым юнаком
Ленін кляўся:
— Мы
не адзінкі,
мы —
саюз барацьбы
за вызваленне
рабочага класа.
Ленінізм ідзе
ўсё далей
і ўсё болей —
шырыцца
вучнямі
Ільічовай выверкі.

Крывёй
упісаны
гераізм надполля
у пыл
і ў плюхоту
бясконцай Валадзіміркі.
Сёння мы
стаім
пад цэлым сусветам.
Калі
нават мы
ў крамлёўскіх крэслах з вамі —
колькім з нас
раптоўна
Нерчынск з-за дэкрэтаў
раззвініцца ў крэслах
кайданамі!
Зноў
вам пагадаю
птушак шлях стракаты.
За ваўчком —
трамваяў электрычных рысь.
Хто
з вас некалі
турэмных вокнаў краты
лютасцю не кратаў
і не грыз?!
Лоб
разбі
аб камень
сценкі цеснай,—
за табою
змылі камеру
і замялі.
«Служил ты недолго, но честно
на благо родимой земли».
Стала падабацца Леніну
ў якой са ссылак
песні гэтай
жалобная сіла?
Гаварылі —
мужычок
сваёй патупае дарогай,

завядзе
сацыялізм
хітры свой.

Не,
і Русь
ад камінаў
зрабілася старогай,
горад абрастае
дымнай барадой.
Не запросяць так у рай: —
заходзьце,
калі ласка,—
цераз труп буржуазіі
камунізма крок.
Пралетарыят —
важак
мільённых мас сялянскіх,
Ленін —
пралетараў зрок.
Панаабяцае ліберал
альбо эсэрык кідкі,
для рабочых шый
хамут нарыхтаваўшы свой,—
Ленін
фразачкі
з яго
паабарве да ніткі,
каб ён з кніг
свяціў
дваранскай галізной.
І нам навошта
размовы пра тое —
што браты мы,
што свабода — найвялікшая з мэт,—
мы ва ўзбраенні
марксавай зброі,—
бальшавіцкая партыя
адна
на ўвесь свет.
Амерыку
перасякаеш
у экспрэсным купэ,
ідзеш Чухламой —
табе

у вочы
ўпіваецца цяпер
РКП
і ў дужках
маленькае «б».
На Марсаў
палюе цяпер
Пулкава знакамітае,
з зорнага шляху
не зводзіць вачэй.
А для свету
гэта
малая літара
ў сотні разоў
чырванеи
і ярчэй.

Словы
старэюць у нас
паступова,
робяцца
будзённымі
нават
самыя вартыя.

Хачу
зіхацець прымусіць
нанова
найвелічнейшае слова —
«ПАРТЫЯ».

Адзінка!
Каму патрэбна яна?!
Голас адзінкі
танклявей ад піску.
Хто ўчуе яе? —
Хіба жонка адна!
І то,
калі не на рынку,
а зблізку.

Партыя —
гэта адзіны ўраган,
да таго
з галасоў спрасаваны
ціхіх
і тонкіх,—

ворагаў
умацаванні
лопаюцца ад яго,
як у кананаду
ад гармат
перапонкі.
Кепска чалавеку,
гора аднаму!
Калі ён адзін,
адзін не воін,—
кожны дужэйшы
пан яму,
і нават слабейшыя,
калі іх двое.
А калі
ў партыю
згрудзіліся адужалыя —
здайся, вораг,—
ты ўжо
мярцвяк!
Партыя —
рука мільённапалая,
сцятая
ў адзін
грымотны кулак.
Адзінка — нуль,
глупства адно,
адзін —
калі нават
і дужа здаровы —
не ўзніме
простае
пяцівяршковае бервяно,
тым болей
дом пяціпавярховы.
Партыя —
гэта
мільёнаў плечы,
плячо ў пляча
паяднаныя шчыльна.
Партыяй
будоўлі
ў неба
ўвекавечым,

адзін аднаму
падсабляючы
пільна.
Партыя —
спінны хрыбет рабочага класа.
Партыя —
неўміручасць нашае справы.
Партыя — адзінае,
што мне не здрадзіць.
Сёння прыказчык,
а заўтра
царствы сціраю з карты я.
Мозг класа,
справа класа,
сіла класа,
слава класа —
вось што такое партыя!
Партыя і Ленін —
двайня братняя —
каго больш
маці-гісторыя цэніць?
Мы гаворым Ленін,
разумеем —
партыя,
мы гаворым
партыя,
разумеем —
Ленін.
Яшчэ,
як горы,
каранаваныя главы,
і буржуі
чарнеюць,
як вароны
ў зіме,
але ўжо
гарэнне
рабочай лавы
па кратэры партыі
рвецца з-пад зямель.
Дзевятае студзеня.
Канец гапоншчыны.
Падаем,—
царскія кулі скасілі.

Трызня
пра літасць царскую скончана
з бойняй Мукдэнскай,
з трэскам Цусімы.
Досыць!
Не верым размовам хвалёным!
Самі
са зброяй
паўсталі прэснепцы.
Здавалася —
хутка
расквітаемся з тронам,
за ім
і буржуева
крэсла трэспецца.
Ільіч ужо тут.
У час трывожны
праводзіць з рабочымі
пяты год.
Ён побач
стаіць на барыкадзе кожнай,
паўстання ўсяго
накіроўвае ход.
Але хутка
прабеглі
хітрыя весцейкі —
«свабода».
Без банціка — чалавека ніводнага,
выходзіў цар
на балкон
з маніфесцікам.
А пасля
мядовага тыдня
«свабоднага»
прамовы, банты,
песняспевы плаўныя
гарматны рык
заглушае басам:
па рабочай крыві
пусціўся ў плаванне
цароў адмірал
карнік Дубасаў.
Плюнем у твар
той белай плюхоце,

каторая енчыць
пра зверствы Чэка!
Глядзіце,
як тут,
навязаўшы за локці,
білі рабочых
насмерць па шчаках.
Звярэла рэакцыя.
Інтэлігентчыкі
ад усяго адышлі,
нашакалілі.
Заперліся дома,
дасталі свечкі,
ладан смуродзяць —
богашукальнікі.
Таварыш Пляханаў
ад енку бялее:
— Ваша віна,
наблыталі, братцы!
Вось і пусцілі
крыві балеі!
Не варта
дарэмна
за зброю брацца.
Ленін
у гэты енкат нядужы
урэзаў голас бадзёры
і зычны:
— Трэба
за зброю
брацца дружна,
толькі болей
рашуча і энергічна.
Новых паўстанняў бачу дзень я.
Узнімецца зноўку
рабочы клас.
Не абарона —
а нападзенне
стаць павінна
лозунгам мас.
І гэты год
у крывавай пене
і гэтыя раны
ў рабочым стане

здадуцца
школай
першай ступені
у буры,
ў навале
наступных
паўстанняў.
І Ленін
зноўку
выгнанне зведаў,
рыхтуе
нас
на новую бойку.
Ён вучыць
і сам набіраецца ведаў,
разбітую партыю
збірае
зноўку.
Глядзі, што ні год —
забастоўкі
скрозь,
яшчэ —
і паўстанием
паўстанеш змагацца ты.
Ды вось
з гадоў
уздымаецца
страшны чатырнаццаты.
Так пішуць —
салдат
люльку прыпаліць ад крэсіва
і поўдзе хваліцца
даўнейшай славай,—
але гэтую
сусветнейшую мясарэзку
з якой параўнаеш
Плеўнаю
ці Палтавай?!
Імперыялізм
ва ўсім агаленні —
жывот навыпуск,
з устаўнымі зубамі,
і мора крыві
яму па калені —

паядае краіны,
уздымае штыкамі.
Падхалімы вакол
сагнуліся крукам,—
патрыёты Вовы
падвываюць ахвоча —
пішуць,
вымыўшы здрадныя рукі:
— Да апошняй крыві
змагайся,
рабочы!
Зямля —
гарой
жалезнага лому,
які на шматкі
чалавека
парваў.
Сярод
усяго вар'яцкага дому
цвярозы
устаў адзін Цымервальд.
Ленін
адсюль
са жменькай таварышаў
устаў над светам
і ўзняў над —
думкі;
ярчэй
ад усялякага пажарышча,
голас,
гучней
ад усіх канапад.
Адтуль —
канападаю ў вушы
мільёны,
бліскат
стотысячнашабельных рэк,

адсюль
супроць шабель,
гармат —
стамлёны
скуласты і лысы
адзін чалавек.

— Салдаты!
Буржуям
крывавым не гора,
да туркаў шлюць,
за Вердэн,
на Дзвіну.
Досыць!
Народаў вайну
ператворым
у грамадзянскую вайну!
Досыць,
каб гінуў
бацька і сын,—
у нацый
няма
ніякай віны.
Супроць
буржуазіі ўсіх краін
узнімем
сцяг
грамадзянскай вайны!
Думалася:
адразу гармата-печка
чохне агнём,
ненажэрнае грозбішча,
потым ідзі,
шукай чалавечка
ідзі,
ўспамінай ягонае прозвішча.
Горлам гармат,
што ад лютасці вые,
краінам краіны
равуць:
На калені!
Змагліся,
і вось —
не відно пераможцаў,—
якія?
Адзін перамог
таварыш Ленін.
Імперыялізму прорва!
Цярплівасць сваю ўсю
мы страцілі ўчора.

Ты Расіяй-паўстанкай
прарвана штормам
ад Чорнага
да Белага мора.
Імперыя —
гэта табе не гагара!
Двухгаловы арол
з уладай
дзюбастаю.

А мы,
як дапалены папяросны агарак,
проста
сплюнулі
іх дынастыю.

Вялізны,
пакрыты
крывавай іржою,
народ,
галодны і галаштанны,
пойдзе к Саветам
ці будзе
буржую
цягаць,
як раней,
з агню каштаны?
— Народ
разарваў
ланцуг цараў.
Расія ў буры,
ў навале імпэтнай,—
чытаў
Уладзімір Ільіч
у Швейцарыі,
хвалюючыся
над кінай газетнай.
Ды мала ў газетах —
як ты не хочаш.
На аэраплане
прарвацца б увысь
давідна,
туды, на дапамогу
паўстанцам-рабочым,—
адно жаданне,
думка адна.

Паехаў,
пакорны партыйнай волі,
ў нямецкім вагоне,
нямецкая пломба.
О, калі б
ведаў
тады Гогенцолерн,
што Ленін
і ў іх манархію бомба!
Пінцерцы
ўсё яшчэ
ўсім на радасць
цалаваліся,
скакалі дзецьмі гадавалымі,
а ў чырвонай істужцы —
гатоў на парад ісці —
Неўскі ужо
кішэў генераламі.
За крокам крок —
і дойдуць
да кропкі,
дойдуць
і да паліцэйскага свісту.
Выпускаюць
ужо
кіпцюркі нетаропка
буржуі
з лапак сваіх пушыстых.
Спачатку дробязь —
накшталт малькоў.
Потым сталейшыя —
ад шпротаў да кілечак.
Потым Дарданельскі,
у дзявоцтве Мілюкоў,
за ім
з карапацыяй
прэ Міхаільчык.
Прэм'ер
не ўлада —
вышыванне гладдзю!
Гэта табе
не грубы нарком.
Проста дзяўчынка —
ідзі і гладзь яе!

Заходзіцца ў істэрыках,
пяе тэнарком.
Яшчэ нам
не трапіла
ані расінкі
з лютаўскіх
гэтых так званых свабод,
а ў абаронцаў —
ужо хварасцінкі —
«Марш, марш на фронт,
рабочы народ».
І ў давяршэнне
пейзажу слаўненькага,
што здрадзілі нам
і да
і потым
дзялкі,
вартаўнікамі
наўкол
эсэры ды савінкавы,
катом вучоным —
меншавікі.
І ў горад,
што заплываў ужо салам,
раптам адтуль,
з-за Нявы,
з Фінляндскага вакзала
па Выбаргскай
загрукатаў браневік.
Зноў
вецер свежы,
дужы,
злюцелы
узняў
валы рэвалюцыі
ў пене.
Блузы і кепкі
залілі
Ліцейны.
«Ленін з намі!
Няхай жыве Ленін!»
— Таварышы! —
і над галовамі
першых соцень

уперад
руку-правіцу
выставіў.
— Скінем
эсдэцтва
спарахнелае ашмоцце!
Далоў уладу
згоднікаў і капіталістаў.
Мы —
голас волі нізу,
рабочага нізу
ўсяго свету.
Няхай жыве
партыя,
што ўзводзіць камунізм,
няхай жыве паўстанне
за ўладу Саветаў!
Упершыню
перад натоўпам,
яскрава,
тут жа,
перад табою,
зблізь
устала,
як проста здзейсненая справа,
недасяжнае слова —
«сацыялізм».
Тут жа
з-за гудкоў заводаў бунтоўных
неба развіднела,
нібы сонца ўзышло
наноў.
гэта ўстала
заўтрашняя камуна працоўных —
без буржуяў,
без пралетарыяў,
без рабоў і паноў.
На тоўсць акрутных
згодніцкіх вяровак
словы Ільічовы
ударамі тапара.
Абваламі гулу
перапыняла прамову:

«Правільна, Ленін!
Верна!
Пара!»
Дом Кшасінскай,
за дрыганоства
падараваны,
цяпер —
рабочая блузніца.
Сюды сцякаецца фабрычнае мноства,
тут гартуецца
ў ленінскай кузні.
«Еш ананасы,
рабчыкаў жуй,
дзень твой апошні
прыходзіць, буржуй».
Да таго,
хто ў гаспадарскім крэсле,
ліпне —
ды як жывеце,
ды што ў вас у роце?
Прымерваючыся,
ў ліпені
за глотку пакраталі
і за жывоцік.
Буржуевы зубы
ашчэрыліся, як гады.
— Раб бунтуе!
Бізунамі, на кроў яго! —
І ручкай
Керанскага
водзяць загады —
на мушку Леніна!
Ў Крыжы Зіноўева!
І партыя
зноўку
пайшла ў падполле.
Ільіч на Разліве,
Ільіч у Фінляндыі.
Ды ні будан,
ні гарышча,
ні поле
правадыра
не дадуць
азвярэлай бандзе іх.

Не відно Ільіча,
але ў тым, як штодня
усюды не моўкне
работа кіпучая,
думка ленінская
накіроўваючая відна,
відаць
ленінская рука
вядучая.
Ільічовым словам —
лепшая глеба:
падаюць,
і справы
растуць ураз,
плячо рабочага
падмацаваць трэба?
Ёсць
плечы
мільённых сялянскіх мас!
І калі
засталося
на барыкады выйсці,
дзень той
з тыдняў
выбраўшы сам,
Ленін
сам з'явіўся ў Піцер:
— Таварышы,
годзе
марудзіць нам!
Войны бандыцкія
супроць рэвалюцыі,
буржуйскія ўціскі,
голад
і мор іх,
будзе! —
бялей ад радзімак
здадуцца
на целе бабулькі,
даўняй гісторыі.
І адтуль
на былое
як азірнешся
ў паходзе —

Леніна ўбачыш
над морам
галоў.
Гэта ад рабства
дзесяці тысячагоддзяў
перавал высачэзны
да камуны вякоў.
Пройдуць
гады
галечы,
знявагі,
летам камуны
сагрэюцца леты,
і шчасце
слодыччу
агромністых ягад
даспее
на чырвоных
кастрычніцкіх кветках.
І тады,
чытаючы
ленінскія ўказанні,
выкапваючы
дэкрэты
з пажоўклых тамоў,
мы слёз не стрымаем,
што выведзены з ужывання,
і нам хваляваннем
у скроні
ударыць
кроў.

Калі
падсумоўваю
пražытое,
капаюся ў днях —
ярчэйшы
дзе,
я ўспамінаю
адно і тое —
дваццаць пятае,
першы дзень.
Працінаюць неба
штыкоў
маланкі,

матросы
ў бомбы гуляюць,
нібыта ў мячыкі.

Смольны ўзбунтаваны
гудзе
з вечара да ранку.

Унізе
ў стужках патронных
кулямётчыкі.

— Вас
выклікае
таварыш Сталін.

Направа
трэцяя,
ён
там.

— Таварышы,
не спыняцца!
Чаго сталі?

У браневікі
і на паштамт!

— Па загаду
таварыша Троцкага!

— Есць! —
павярнуўся
і знік,
як у моры,

і толькі
на стужцы
ў флоцкага
пад лямпай
мільганула —
«Аўрора».

Хто мчыцца з загадам,
хто спрачаецца,
нецярплівасць морачы,
хто лязгае
затворам
на левым калене.

Сюды
з таго канца калідорынча
бачком прайшоў
непрыкметны Ленін.

Ужо
Ільічом
скіраваныя ў бітвы,
яшчэ
не ведаючы
яго па партрэтах,
штурхаліся,
крычалі,
вастрэй ад брытвы,
салдат салдата
лаяў пры гэтым.
І ў гэтай жаданай
жалезнай буры
Ільіч,
як быццам
заспаны нават,
ішоў,
спыняўся і вока жмурыў,
за спіну
заклаўшы рукі
рухава.
У нейкага хлопца
ў абмотках,
калматага,
нацэліўся вокам,
трапнейшым ад куль,
як быццам
сэрца
з-над слоў выматваў,
як быццам
душу
выцягваў адтуль.
І знаў я,
што ўсё
зразумеецца,
зробіцца
і гэтым
вокам
напэўна вылавіцца —
і крык сялянскі,
і воля побельца,
і енкі фронту,
і воля пуцілаўца.

Ён
у чэрапе
сотняй губерняў варочаў,
людзей
насіў ён
болей мільярда.
Ён свет
узважваў
па працягу ночы,
а ранкам загадваў:
— Усім!
Усім!
Усім гэта —
франтам,
крывёю п'яным,
рабам
усялякага роду,
што ў рабстве
ў паноў нягодных.—
Улада Саветам!
Зямля сялянам!
Мір народам!
Хлеб галодным! —
Прачыталі
буржуі
— чакайце,
вылавім,—
жываты паўзнімалі
доказам важкім,—
ужо ім пакажуць
Духонін з Карнілавым,
Гучкоў і Керэнскі
пакажуць ім.
Ды франты
словы гэтыя
бралі без бою,
дэкрэты
зямлю ўсю
ўслалі сабою,
і нат
неписьменны
ў іх праўду знайшоў.
Мы знаем — ім паказалі,
не нам з табою,

якое такое бывае
«ужо».
Воля гарэла
жаданнем адзіным,
сэрцы
думка будзіла адна:
«Мір хацінам,
палацам —
вайна,
вайна,
вайна!»
Біліся
ўсюды заводы і цэхі,
з гарадоў
гарохам вытрасалі,
а следам
шэсце кастрычніцкае
меціла вехі
маёнткаў дваранскіх,
якія агонь адведаў.
Зямля —
падсцілка
ад бізуноў прагорклая,
і раптам яе,
як той бохан,
у вузел
з усімі яе ручаямі,
узгоркамі
узяў селянін,
сціснуўшы заскарузла.
У акулярах манжэтшчыкі
пляваліся, харкалі,
паўзлі за царскай,
за графскай славай.
Лёгкага ветру!
Мы і кухарку
кожную
вывучым
кіраваць дзяржавай!
Вытворчасцю
гучных ратацый
жылі не ў выгодзе.
З акопаў
ляцела ў нямецкія вушы:

— Час выйшаў!
Братацца выходзьце!
І фронт
распаўзаўся
смаўжамі цяплушак.
Стрымаеш
рукамі хіба
гэту лаву?
Здавалася —
наш ужо чоўнік гіне —
Вільгельмавы боты,
званчэйшыя ад Мікалаевых,
сатруць граніцы
Савецкай краіне.
Эсэры пайшлі —
наапашкі лахмоцце —
бегуноў запынялі
спакуснай звягаю,
заклікалі
па-рыцарску
бранявыя страхоцці
прыгожа
разбіць
крывенькаю шпагаю!
Ільіч
гэтым неўнікам
крыкнуў:
— Ні з месца!
Хай партыя возьме
за справу адказ.
Хоць
перадышка Брэста,
як адышка,
ўесца.
Страта — прастора,
выйгрыш — час.—
Каб час гэты
стаў нам
карысцю вялікай,
каб дні перадышкі
не сталіся марнымі,
сябе не муштроўкай,
свядомасцю
выкуй,

стройся
радамі
Чырвонай Арміі.
Гісторыкі
з гідрай плакаты
выдзеруць
— ці гідра была,
ці не, ў тыя дні? —
А мы
вось
ведалі гэтую гідру
ў яе
натуральнай велічыні.
«Мы смело в бой пойдем
за власть Советов
и, как один, умрем
в борьбе за это!»
Дзянікін ідзе.
Дзянікіна выкінуць,
узнімуць жытло,
што набыло ў гармат на лычах —
Ўрангель вам —
на змену
Дзянікіну.
Барона абронядь —
ужо Калчак.
Мы жралі кару,
начлег —
у балотнай хлюпоціне,
ды мільёнамі зор чырвоных
ішлі наўпрост,
і ў кожным — Ільіч,
і аб кожным клапоціцца
на фронце
ў адзінаццаць тысяч
вёрст.
Адзінаццаць тысяч вёрст навокал,
а колькі ўпоперак,
колькі ўдоўж!
У кожны дом
углядалася вока,
дзе вораг хапаўся
за стрэльбу,
за нож.

Эсэр з манархістам
шпіёняць бяссонна —
дзе джаляць змяёй,
дзе крышаць спляча.
Ты знаеш
шлях
на завод Міхельсона?
Знойдзеш
па крыві,
што з ран Ільіча.
Эсэры
цэляць
не вельмі нэўна —
другім канцом
ды сабе ж у лоб.
Ды ад бомбаў страшней,
ад куль рэвальверных
аблога голаду,
аблога хвароб.
Глядзіце —
кружаць над крошкамі мушкі,
сытней ім,
чым нам
у васемнаццатым годзе,—
прастойвалі з-за васьмушкі
суткі
на вуліцы
на холадзе.
Сядзіце,
труціце,—
а не ветра,
каб знік
завод за бульбу —
запал не знішчыць!
І дзесяцікорпусны
суднабудаўнік
корнаўся
над вырабам
запальнічак.
А ў кулакоў
пуза трашчыць
ад пражонкі.
Разлік кулакоў
просты і правераны —

хлеб закапай,
прыхавай у скарбонкі
мікалаеўкі
ды керанкі.
Мы знаем,
што з голадам
трэба змагацца,
тут сіла патрэбна,
не мяккасць воску,—
і Ленін
узняўся
ў байцы з кулацтвам
і прадатрадамі
і прадразвёрсткай.
Слова «дэмакрат»
хіба якім
уб'ецца
у мазгаўню
прыдуркам.
Калі біць, дык так,
каб умакрэла
панель пад ім:
ключ перамог —
у жалезнай дыктатуры.
Мы перамаглі,
але мы
змучаны:
машына стала, абшыўка —
ашмоцце.
Валы абломкаў!
Шпалеры —
апучамі!
Ідзіце заліце!
Змыйце у поце!
Дзе порт?
Маякі
паламаліся ў порце,
хілімся,
мачтамі хрысцячы
акіян.
Нас перакуліць —
на правым борце
у сто мільёнаў
груз сялян.

Ад радасці
ворагі
выюць ажно,
так толькі Ільіч мог,—
нібы незнарок,—
раптоўна ён
павярнуў
стырно
адразу
на дваццаць румбаў убок.
І ціша адразу —
кідае у пот аж;
сяляне
падвозяць
да прыстані хлеб.
Звычайныя шыльды
— купля —
— продаж —
нэп.
Прыжмурыўся Ленін:
— Рамантуйцеся пагодай,
аршыну вучыся —
патрэбная справа.—
Каманду
ў стоме
бераг нагойдваў.
Да бур мы прывыклі,
што за праява?
Заліў
Ільічом
паказаны глыбокі
і кропка
змычкі-прычалу
дадзена,
і плаўна
у мір,
будаўніцтву
ў докі
ўвайшла
Савецкіх рэспублік грамадзіна.
Жалеза
і дрэва
сваімі рукамі

Ленін
пасіў
да прабоін рупліва.
Узнімаў
і прымерваў
сталёвымі аркушамі
крамы,
трэсты,
кааператывы.
І зноўку
становіцца
Ленін-штурман,
агні
па бартах
спераду і ззаду.
Цяпер
ад абардажаў і штурму
мы
да працоўнай
пяройдзем
асады.
Мы
адышлі,
разлічыўшы дакладна.
Хто разлажыўся —
на бераг
да азызлых морд.
Адступленне скончана.
Наперад,
каманда!
РКП,
каманду на борт!
Камуна — стагоддзі,
дзесяць год што ёй?
Уперад —
і нэпчык
ужо не відзён.
— Мы рушым
у сотню разоў паступовей,
затое
мацней, дужэй —
у мільён.
Вось гэтай
дробнабуржуазнай стыхіі

яшчэ калышацца
мёртвая гладзь,
але
бліскавіцы
на небасхіле
гатовы
грымоты
сусветныя ўзняць.
Вораг
змяняе ворага
парадзелага.
І ведаем,
небу
— каліськці —
над светам палаць.
Ды болей карысці
рабіць гэта
смела,
чым
пра гэта пісаць.
Цяпер
агулам
агульнае множце!
Агульны завод
і агульнасць дарог.
Мы ведаем —
пралетарыят — пераможца
і Ленін —
арганізатар перамог.
Ад Камінтэрна
да звонкіх капеек,
з гербам
працоўным
у новых манетах,
адна няпісаная эпапея
хады Ільіча —
перамог сусветных.
Рэвалюцыя —
важкая рэч, безумоўна,
адзін не ўзнімеш,—
сагнецца нага.
Ды Ленін быў
найпершы
між роўных

на сіле волі,
розуму рычагах.
Краіны ўзнімаюцца
адна за адной паступова —
рука Ільіча
паказвала шлях праверапы:
народы —
чорны,
белы
і каляровы —
становяцца
пад сцяг Камінтэрна.
Стаўпоў імперыялізму,
непаклонныя калоны —
буржуі
пяці часцін свету,
ветліва ўзняўшы
цыліндры і кароны,
кланяюцца
Ільічовай рэспубліцы Саветаў.
Нам
вораг не страшны
з крывавым мячом,
Паравозам працы
уперад імчым
на гадах...
І раптам
стопудовая вестка —
з Ільічом
удар.
Калі б выставіць у музеі
заплаканага бальшавіка,
увесь дзень бы
па музеі
снавалі ратазеі.
Яшчэ б...
такое
не ўбачыш і ў вяках!
Пяцікутныя зоркі
выпякалі на нашых спінах
панскія ваяводы.
Жывых
да галавы ў зямлю
закапвалі нас банды Мамантава.

У паравозных топках
паліл! нас японцы,
рот залівалі свінцом і волавам.
— Вырачцеся! —
раўлі,
а мы ж
з пякучых глотак
толькі тры словы:
— Няхай жыве камунізм!
Крэсла за крэслам,
рад за радам напружаным
гэта сталь,
жалеза гэта
увальвалася
дваццаць другога студзеня
у пяціпавярховы гмах
з'езда Саветаў.
Садзіліся.
Адзін аднаму
ўсміхаліся людзі,
тут жа
выпашаючы
дробязі спраў.
Час адчыняць!
Чаго марудзяць?
Чаго прэзідыум,
як высечаны,
рэдкі стаў?
Чаму
вочы
чырваней ад ложы?
Што з Калініным —
ледзьве стаіць.
Няшчасце?
Якое?
Быць не можа!
А калі з ім?..
Не!
Не можа быць!
Столь
на нас
пайшла зніжацца воранам.
Сагнуліся галовы —
яшчэ прыгні!

Задрыжалі раптам
і сталі чорнымі
люстраў
рассыпаныя агні.
Захліпнуўся
званочка непатрэбны шчоўк.
Перасіліў сябе
і ўстаў Калінін.
Слёзы не зжуеш
з вусоў і шчок.
Выдалі.
Блішчаць у барады на кліпе.
Думкі ў галаве —
цяжарам пакут.
Кроў — у скроні,
забілася ў вене.
— Учора
ў шэсць гадзін пяцьдзесят мінут
памёр таварыш Ленін!
Гэты год
бачыў,
чаго не ўбачаць сто.
Дзень
жалобнай датай
па стагоддзях
стане.
Жах
з жалеза
выціснуў стогн.
Па бальшавіках
прайшло рыданне.
Цяжар страшэнны!
Самих жа сябе
валачы волакам.
Даведацца —
калі і як?
Хто ўтаіў!
У вуліцы
і ў завулкі
катафалкам
Вялікі тэатр
плыў.
Радасць
паўзе непрыкметная.

У гора
шалёны бег.
Ні сонца,
ні льдзіны светлае! —
усё скрозь сіта газетнае
чорны
засеяў снег.
На рабочага ля станка
горкі лёс
вестку кінуў,
ад кулі хутчэй.
І нібы
шклянка слёз
пралілася на струмант з вачэй.
І мужычок,
якога жыццём пакідала,
які смерці ў вочы
глядзеў не раз,
адвярнуўся ад баб,
ды выдала
кулаком
расцёртая гразь.
Нібы крэмень —
людзі былі на свеце,
ды і гэткія
з сабой не валодалі.
Як старыя,
засур'ёзнічалі дзеці,
і, як дзеці,
плакалі сівабародыя.
Вецер выў бяссонніцай зямлі,
яна
ўцяміць не магла,
што гэта —
дамавіна,
што
ў накоїчыку Масквы
стаіць труна
рэвалюцыі
бацькі і сына.
Канец,
канец,
канец.
Каго

пераконваць!
Шкло —
і бачыце зноў...
Гэта
яго
нясуць з Павялецкага
праз горад,
што ён адбіў
у паноў.
Вуліца,
быццам рана
скразная —
так баліць
і стогне так.
Тут
кожны камень
Леніна знае
па гулу
першых
кастрычніцкіх атак.
Тут кожны сцяг,
тут усё,
як належа,
задумана і
загадана ім.
Тут
Леніна
чула
кожная вежа,
за ім
пайшла б
у агонь і ў дым.
Тут
Леніна
ведае
кожны рабочы,
галінкамі елак
сэрцы
сцяліце яму.
У бойку ён вёў,
перамогу прарочыў,
і вось пралетар —
уладар усяму.

Імя Леніна
селянін з усімі
у сэрца ўпісаў мацней,
чым у святцы.
Ён землі загадаў
назваць сваімі,
што ў магілах
дзядам закатаваным
сніцца.

І камунары
з-пад Краснае плошчы,
здавалася,
шэпчуць:
— Любы, любімы!
Жыві —
прыгажэйшага лёсу
не хочам —
за гэта ўваскрослі б,
на смерць зноў пайшлі мы!
Каб раптам
загад цудатворца
пачулі,
каб нам памерці,
а яго
абудзяць,—
плаціна вуліц
разнасцежыцца
ў радасным гуле,
і з песняй на смерць
кінуцца людзі.
Ды цудаў няма
і казаць пра іх нечага.
Ёсць Ленін,
труна
і прыгнутыя плечы.
Ён быў чалавек
да канца чалавечага —
нясі
і пакутуй
тугой чалавечаю.
Яшчэ
дарагога
такога
груза

не неслі вякамі
акіяны нашы,
як труна чырвоная гэта,
што да Дома Саюзаў
плыве на спінах
рыданняў і маршаў.
Несла яшчэ
каравул ганаровы
суровая гвардыя
ленінскай выпраўкі,
а людзі
чакалі ўжо,
ўдрукаваныя
ва ўсю даўжыню
і Цвярской
і Дзмітраўкі.
Было,
ў семнаццатым
у чаргу галодную
не пашлеш дачку —
заўтра з'ем!
А ў гэтую
страшную
чаргу халодную
з дзецьмі і з хворымі
сталі ўсе.
Вёска
і горад
у горы роўныя.
Дарослыя, дзеці —
ў горы адным.
Парадам праходзіла
зямля працоўная —
жыцця ягонага
вынікам жывым.
Жоўтае сонца
раскосае
з ласкаю
узыдзе,
праменнямі
ў ногі кідаецца.
Нібы
пад'ярэмныя,
надзею аплакваюць,

схіляюцца ў горы,
праходзяць кітайцы.
Ночы,
на спінах дзён
плывучы,
гадзіны блыталі,
блыталі даты.
Нібы не ноч
і не зоры ўначы,
а плачуць
над Леніным
негры са Штатаў.
Мароз нечуваны
выпальвае скроні,
а людзі днююць,
доўжачы чэргі.
Нават
ад холаду
біць у далоні
ніхто не адважыцца —
недарэчы,
нельга.
Мароз хапае,
правярае,
здаецца,—
ці моцна нашыя
сэрцы ўлюбёны.
Шыбае ў натоўпы.
Між іх таўчэцца
і разам з імі
ідзе за калоны.
Ступені растуць,
разрастаюцца ў рыф.
Дыханне
сціхае,
сціхаюць размовы,
і боязна стаць —
над нагою абрыў,
у чатыры ступені —
бяздонны, суровы.
Абрыў
ад рабства ў сто пакаленняў,
дзе ўлада золата,
прагных капіл.

Абрыў
і край —
дамавіна і Ленін,
а далей — камуна
на ўвесь небасхіл.
Што пабачыш?!
Лоб ягоны толькі,
і Надзежда Канстанцінаўна
за...
ў тумане.
Можа быць,
вачамі без слёз
убачыць можна болей.
Глядзець
не ў такія вочы
даводзілася мне.
Штандараў
наплыўных
схіляецца шоўк
апошняй
пашанай народнай:
«Прощай же, товарищ,
ты честно прошел
свой доблестный путь благородный».
Страх.
Заплюсні вочы,
не глядзі —
як быццам
праходзіш
па дроце провада.
Як быццам
хвіліну
адзін на адзін
застаўся
з вялізнай
адзінаю праўдай.
Шчаслівы я.
Марша
магутныя хвалі
адносяць
цела маё, як пушыну.
Я знаю —
ад сёння
ў жыццёвыя далі

павек я
нясу ў сабе
гэту хвіліну.

Шчаслівы,
што я
гэтай сілы часцінка,
што нават слёзы
агульныя ў нас.

І нельга
мацней і чысцей прычасціцца
пачуццю
з вялікім іменем —
клас!

І зноў
сцягоў
схіляюцца крыллі,
каб заўтра
наноў
уздымаць на баі:
«Мы сами, родимый, закрыли
орлиные очи твои».
Мне б не ўпасці тут,
плячо ў плячо,
сцягі вычарніўшы,
з вейкамі чырвонымі,
ішлі
на развітанне з Ільічом,
на апошняе,
маруднымі калонамі.
Цырыманіял ідзе якраз.
Чуць прамовы.
Выступаюць,
ну і — ладна.

Вось бяда —
малы
хвіліны час —
хіба
ўвесь
ахопіш ненаглядны!

Ідуць
і глядзяць
з трывогай важкай
на чорны,
заснежаны цыферблат.

Як скачуць шалёна
стрэлкі на Спаскай.
Ужо —
да апошняй чацвёркі няшмат.
Ад гэтае весці
замрыце
на момант!
Жыццё,
супыніся на хвілю
ў цішы!
Замрыце на месцы,
узняўшы молат,
Зямля,
замры,
кладзіся й ляжы!
Маўчанне.
Скончаны шлях выдатнейшы.
Стралялі раз,
а ці тысячу, можа, разоў.
І стрэлы гармат тых
былі
не гучней, чым
звон дробязі,
што ў кішэні
ў старцоў.
Вось я стаю
ад болю ў знямелі,
перад вачыма маімі ўстае
з цёмнай ночы,
у снягоў асвятленні,
даль
нерухомай
планеты
ўсяе.
Наш сум
пры трупе
над сусветам
устаў.
Мы пры ёй —
прадстаўнікі мільёнаў,
каб бурай паўсталі яў,
паэм і спраў
размножыцца тое,
што бачылі сёння.

Ды вось
здалёк,
з чырвонага,
што ад марозу іскрыцца,
у сцюжку,
у натоўп суцішшы наш
цечы голас.
Муралава як быццам —
«Шагом марш».
І нават загаду
не трэба такога,—
дыханне роўнае,
ясны
зрок,
адрываючы
ногі
ад цела
цяжкога,
з плошчы
ўніз
мы ўбіваем крок.
Кожны штандар
упэўненымі рукамі
зноў
горда над галавой узнялі.
Тупату патоп,
сіла кругамі
разыходзіцца,
шырыцца
ў думках зямлі.
Агульная думка
паяднана звеннямі
рабочых,
сялян
і салдатаў-рубак:
— Рэспублііцы
цяжка будзе без Леніна!
Трэба замяніць яго —
кім?
І як?
Досыць
ляжаць
на пухоўцы клапоцай!

«Таварыш сакратар!
Усе мы — от —
просім прыпісаць
да ячэйкі еркаповай
адразу,
калектыўна,
увесь завод...»
Глядзяць
буржуі —
што гэта значыць,
дрыжыць
ад тупату дужых ног панок.
Чатырыста тысяч
ад станка
гарачых —
Леніну
першы
партыйны вянок.
«Таварыш сакратар,
бяры ручку...
Заменім —
кажуць...
з гарадоў
і сёл...
Я ўжо стары —
бярыце ўнучку,
прыстала —
давай у камсамол».
Флот падшэфны,
не стой на якарах,
час
у мора
падводным кратáм.
«По морям,
по морям,
нынче здесь,
завтра там».
Вышэй, сонца!
Ёсць чаму
заглядзецца —
хутчэй разгладжвай
жалобу
каля ірта.

Разам
з дарослымі
ступаюць дзеці —
тра-та-та-та-та,
та-та-та-та.

«Раз,
два,
три!
Пионеры мы.
Мы фашистов не боимся,
пойдем на штыки».

Дарэмна
кулак Еўропы ўзняты там.
Крыем іх грукатам.
Назад!
Не шумець!

Стала
найвялікшым
камуністам-арганізатарам
нават
сама
Ільічова смерць.

Ужо над камінамі
іх чарадой нескапчонаю
рукі
мільёнаў
у дрэўка склаўшы,
чырвоным сцягам
плошча Чырвоная
угору
ўздымаецца
ў нястрыманым маршы.

З гэтага сцяга
складкаю кожнаї
зноўку
жывы
заклікае Ленін:
— Пралетарыі,
стройцеся
да бойкі апошняй!

Рабы,
разгінайце
спіны і калені!

Армія
        пралетарыяў,
                        устань,
                                шматлікая!
Няхай жыве рэвалюцыя,
                            хуткая і бадзёрая!
Гэта —
        адзіная
                вайна вялікая
з усіх,
        якія ведала гісторыя.

# КАМЕНТАРЫІ[1]

У пяты том Збору твораў Петруся Броўкі ўваходзяць вершы перыяду 1972—1980 гг., паэма «Марат Казей» (1976) і пераклад паэмы У. Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін». Творы 1977—1980 гг. не ўвайшлі ў апошні прыжыццёвы Збор твораў, таму тэксты іх падаюцца па рукапісах і паасобных зборніках, якія выдаваліся на працягу 1979—1980 гг.

Усе вершы падаюцца ў храналагічным парадку паводле даты напісання. Пры адсутнасці дакументальнага пацверджання гэтай даты твор падаецца па даце першай публікацыі. У выпадках, калі крыніца першага выхаду верша ў свет не выяўлена, указваецца зборнік, у які ўпершыню быў уключаны дадзены твор.

Крыніцай асноўнага тэксту для вершаў 1972—1976 гг. з'яўляецца тэкст 4-га тома апошняга прыжыццёвага выдання Збору твораў: Броўка Пятрусь. Збор твораў: У 7 т.— Мн.: Маст. літ., 1977.— Т. 4. Вершы і паэмы; для вершаў 1977—1980 гг.— рукапісы і машынапісы, якія захоўваюцца ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі, і зборнікі: «Што сэрца праспявала»: Вершы.— Мн., Маст. літ., 1979; «І маладосць і сталасць»: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1980; Дзень паэзіі-77.— Мн : Маст. літ., 1977; Дзень паэзіі-78.— Мн : Маст. літ., 1978; Дзень паэзіі-79.— Мн : Маст. літ., 1979.

Паколькі для вершаў 1972—1976 гг. крыніца асноўнага тэксту адна і тая ж, у каментарыях да кожнага твора яна не ўказваецца. Адзначаюцца крыніца першай публікацыі і дата напісання. Усе выключэнні агавораны. У каментарыях да вершаў 1977—1980 гг. адзначаецца крыніца, па якой друкуецца дадзены твор, і дата напісання.

Такім чынам, крыніцамі для ўстанаўлення дакладнага аўтарскага тэксту з'яўляюцца:

І. Рукапісныя і машынапісныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі.

ІІ. Прыжыццёвыя друкаваныя зборнікі:

1. І ўдзень і ўночы: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1974.

---

[1] Падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі:

Вершы 1972—1974 гг.— Строева Т. Р.

Вершы 1975—1980 гг., паэма «Марат Казей» і пераклад паэмы У. Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін» — Атаева А. Д.

2. Што сэрца праспявала: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1979.

3. І маладосць і сталасць: Вершы.— Мн., Маст. літ., 1980.

III. Перыядычныя выданні:

Часопісы «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», «Работніца і сялянка», «Бярозка», «Вясёлка», «Вожык», газеты «Звязда» і «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена», «Настаўніцкая газета», «Вячэрні Мінск».

У выніку аналітычнай зверкі ў асноўны тэкст унесены папраўкі, а даты напісання многіх вершаў пашыраны і ўдакладнены.

## НА ГАЛОЎНАЙ ДАРОЗЕ

У пятым томе Збору твораў П. Броўкі сабраны творы паэта апошніх гадоў жыцця.

Падсумоўваючы пражытае, у вершы «Я, чым далей, павольней крочу...» П. Броўка пісаў: «Я ж на галоўную дарогу, здаецца, толькі і ўзышоў». Да апошніх сваіх дзён ён заставаўся на гэтай «дарозе», утрымліваючы заваяваныя вышыні майстэрства. Сведчаннем гэтаму з'яўляюцца кнігі «І ўдзень і ўночы», «І маладосць і сталасць», «Што сэрца праспявала». Гэта пацвярджаюць яго лепшыя вершы: «Дзівосны мост», «Любая мясціна», «Мая Ушачка», «Ты мне ўяўляешся такою...», «Самае сардэчнае» і інш.

Жыццё глыбокая рака —
Віры, адмелі, трысцягі...
Дзівосны мост, высокі мост,
Злучаў ён нашы берагі.

«Дзівосны мост» — мост дружбы і ўзаемнага даверу паміж людзьмі і народамі.

У П. Броўкі свая, асабістая, непаўторная далучанасць да лёсу Радзімы. Карані яе ў зрошчанасці з духоўнай культурай народа, яго гісторыяй і паўсядзённымі турботамі сучаснасці. «Я ў партызанцы нарадзіўся, паміж Ушачай і Дзвіной»,— з годнасцю ўдакладняў ён сваю родавую прыналежнасць у вершы «Жыццё ідзе...». Радзіма кожны раз мае сваё адметнае вобразнае ўвасабленне, уяўляецца то «з прыгожай, светлай галавою, з вачамі — срэбрам ручая», то «ад самае калыскі, нібы матуля, над табой».

«Ён гаворыць часамі аб тым,— пісаў П. Глебка,— што ўжо не нова, аб чым не раз, можа, было сказана, але гаворыць па-новаму, з пункту гледжання нашага сучасніка» [1]. І сапраўды, колькі вершаў прысвечана Радзіме, але, аказваецца, і тут не вычарпаны магчымасці новых знаходак:

У Беларусі многа сілы,
У Беларусі — воблік свой,
Ёй колькі б год ні налічылі,
Яна здаецца маладой.

Шматпланавы верш «Мая Ушачка» заснаваны на паралелізме. Сталенне паэтычнага майстэрства суаднесена з узмацненнем рачной плыні:

Мая маленькая Ушачка,
Спачатку ты —

---

[1] Глебка П. Аб Петрусю Броўку.— У кн.: Паэзія барацьбы і перамогі.— Мн.: Маст. літ., 1973.— С. 63.

Ляспая плачка
Ды з камяпька на камяпёк —
Яшчэ рывок,
яшчэ рывок,
І ўжо дзяўчыпаю гарачай
Ты даплываеш да Ушачы.

Так і паэтава майстэрства мужнела, набірала сілу, верш «шчасным быў і пебаракам, ён і смяяўся, ён і плакаў, з каменпя падаў, але й рос між камяпёў і між бяроз...».

«У Броўкавым вершы,— зазначае У. Гіламёдаў,— майстэрства проста непрыкметпае, япо — арганічная ўласцівасць яго паэтычнай думкі. Мастацкая форма паэзіі Броўкі заўсёды хвалявала мяне сваім дэмакратызмам. Уражанпе такое, што для паэта праблемы формы проста пе існуе. Япа такая ж неад'емная частка яго свядомасці, як і сам змест, можпа сказаць, адзіны спосаб іспавання гэтага зместу. Таму, відаць, і ствараецца ўражанне, што паэта мала цікавяць выяўленчыя сродкі. Усё ясна, лагічна, проста, аднак разумееш, што гэта тая прастата, якая прыходзіць да мастака пасля доўгіх-доўгіх пошукаў» [1]. У гэтай прастаце адчуваецца грамадзянская страспасць і схільнасць да роздуму, публіцыстычная дэкларацыйнасць і тонкі лірычны жывапіс, адухоўленасць творчай асобы.

Поліфанічнасць гучання сваёй «ліры» («Яна ж і пасабляе працы, і сэрца цешыць у спачын») паэт вызначыў у адным з праграмных вершаў «Труба і ліра», дзе справядліва абвяргаецца аднабаковасць, спрошчанасць крытычных ацэнак яго паэзіі:

Адзін калісьці крытык вырак
І ўсіх хацеў перакапаць,
Што я трубач,
Што я не лірык,
Пяшчотных струн мне не крапаць.

Вытокі «трубнага голасу» звязапы з гераічнай памяццю парода, з абавязкам грамадзяніна і байца ісці па дарогах вайны «з грымотным вершам, і з аўтаматам, і з трубой», трубіць, «каб Перамогі не праспаць».

Сённяшнюю паэзію пельга ўявіць без грамадзянскай заклапочанасці, руплівасці, душэўнай шчодрасці і заўсёды маладой апантанасці вершаў П. Броўкі. Толькі ў адзінстве з часам, з грамадскімі зменамі можна зразумець актыўнасць пазіцыі паэта, публіцыстычны пафас некаторых яго дэкларацый, якія маюць, аднак, глыбокую жыццёвую аснову («Іду хай горка, мулка, золка, няхай прамёрзлая зямля». Або: «...і сёння з маладымі хачу на працы палымнець»).

Не ў сценах кабінетаў, не сярод кніжных паліц, а ў сустрэчах і гутарках з працаўнікамі, на прасторах палёў і заводаў

[1] Гіламёдаў У. Праз усё жыццё (Пятрусь Броўка).— У кн.: Упоравень з векам.— Мн.: Маст. літ., 1976.— С. 175—176.

(«Прастор — усё маё багацце, маё натхненне, воблік мой») стымулюецца неабходнасць паэтычнага суперажывання, набываецца літаратурны вопыт («Паэты ёсць...», «Паэт, сядзі не доўга дома...», «Відаць Жаданага абрысы»).

Калі П. Броўка заяўляў аб нястрымнай патрэбе «у людзі йсці, у цэх, у поле», то гэта была не проста канстатацыя адносін да рэчаіснасці, а выверацы ўласным вопытам творчы дэвіз паэта, які да канца дзён адчуваў сябе салдатам на баявым пасту («Наш новы дзень — у шматгалоссі, заўжды прыходзіць баявым»).

Сцішаная хада не для яго па-маладому няўрымслівай натуры («Ды неспакойная натура усё жыццё маёй была»), для якой не існуе пачэснай «вакансіі» ветэранскага ўзросту, тым больш непрымальнай для паэта. «Не ветэран я, а паэт»,— сцвярджаў ён у вершы «Але я сэрцам малады», адчуваючы патэнцыяльныя магчымасці новых адкрыццяў («Яшчэ я ў працы, і ў такой, што ад задум кідае ў жар!»). Яго нязменныя душэўныя арыенціры — заклапочанасць, мэтаімкнёнасць у заўтрашні дзень, ненатоленая прага новага ўзлёту («Ах, сэрца!..»):

Ужо і час майго змяркання,
А дзе спакой, а дзе, скажы?..
Ах, сэрца!.. А тваім жаданням
Няма мяжы, няма мяжы!

Здольнасць да абнаўлення паэтычнага мыслення пастаўлена ў прамую залежнасць ад самага запаветнага, самага жаданага («Каб мне адно — кіёк у рукі, на плечы рэчавы рукзак»), дэтэрмінавана грамадзянскай актыўнасцю, уменнем быць у гушчыні падзей («Хацеў бы ўсюды я пабыць...», «Жаданні», «Ах, каб я мог!..»):

Ах, каб я мог
Без стомы ног
Прайсці яшчэ
Мільён дарог...

Дарога — гэта і пэўны кавалак пройдзенага шляху, і абстрагаванае мастацкае ўяўленне творчых дасягненняў, і адзін са сродкаў характарыстыкі творчай асобы, і неабходная ўмова працоўнага натхнення, самавыяўлення натуры, для якой жыццё — значыць рух, мабілізаванасць духоўнай энергіі. Толькі ў няспыннай дарозе прыходзяць душэўная раўнавага, адчуванне перад днём наступным, несумяшчальныя ў інтэрпрэтацыі П. Броўкі з мяшчанскай самазадаволенасцю, спакоем.

Лірычная споведзь паэта стала як ніколі па-філасофску мудрай і разважлівай, даверлівай і шчырай. Асаблівае значэнне набывае асэнсаванне катэгорыі часу як паняцця шматмернага. «Час лучыны», звязаны з гісторыяй цывілізацыі, вымяраецца тысячагоддзямі. Час у «век машыны» — сведчанне імклівасці, паскоранасці рытму жыцця. Час у П. Броўкі можа набываць маштабныя абсягі («Наш век такі, што думаць трэба наперад, на мільёны год») і звужацца да ўяўлення пэўнай узроставай мяжы.

Узроставыя парогі маюць свае вобразныя дэфініцыі, у аснове якіх — адэкватнасць порам года. Так, сталасць нагадвае асеннюю пару («Калі губляе лета сілу...»):

У гэткі час, засумаваўшы,
Нібы спускаешся з гары,
Калі і сам, усё сабраўшы,
На схіле восеньскай пары.

Няўмольныя фізіялагічныя законы чалавечай прыроды выклікаюць душэўную нязгоду, непрыняцце хуткаплыннай рэальнасці, абумоўліваюць палемічны запал некаторых вершаў («Зімовы час і без віхуры...», «Ах, сэрца!..» і інш.).

«Асенняя пара», «зімовы час», «час змяркання» — гэта не толькі аглядка на пройдзены шлях, але і самааналіз, калі пераасэнсоўваюцца здольнасці, узважваюцца патэнцыяльныя магчымасці. Час пры гэтым набывае эстэтычныя, якасныя адзнакі: «час шчасны», які разам з тым і непажадана імклівы. У вершы «Ёсць час, напоўнены праз меру...» узнікае заканамернае пытанне: «Чым час — мінутнай стрэлкай мераць альбо падзеямі жыцця?»

З аднаго боку, прыйшло ўсвядомленае адчуванне сталасці і патрабавальнасці да сябе («Я, чым далей, павольней крочу...»), з'явілася, як відаць, жаданне запаволіць адлік па цыферблаце часу. Паэт як бы змірыўся з жорсткай рэальнасцю і прыняў непазбежнасць «хады пад гару з цяжкай жыццёвай ношай» («Я ўжо нікому не зайздрошчу і лёгкай славы не хачу»). З другога ж боку, ён па-ранейшаму заставаўся поўным творчага гарэння. Вось яго гіпатэтычны імператыў:

Каб цвёрдым крокам, станам гнуткім
Гару мінаў я за гарой
І каб гады не вельмі хутка
Адлічвалі мне тэрмін свой.

Здзіўляе ўпартае жаданне пераадолець узроставыя бар'еры («Нашто, нашто, прырода-маці, кладзеш маршчыны без пары?»), нібы паэт уступіў у адзінаборства з наканаваным яму лёсам («Ах, зноўку б маладосць!», «А я ж у сэрцы не змяніўся...», «Але я сэрцам малады», «Я не схіляюся пакорна» і інш.).

Маладосць, радасць першаадкрыцця нязменна прысутнічаюць у лірычнай споведзі паэта. Усе адкрыцці прыраўніваюцца да першасных адчуванняў далёкіх дзіцячых і юнацкіх гадоў: першы баравік, знойдзены ў лесе, першая злоўленая плотка, першы надрукаваны верш («Ах, каб мне радасць зноў такую...»). На юнацкіх дарогах нязменна бачацца постаці сяброў, камсамольцаў 20-х гадоў, захаваныя памяццю («Мы ўсе тады яе кахалі», «Як мы артыстамі былі...», «Размова з мастаком-мадэрпістам», «Змяніўся толькі воблік ваш», «Буржуйка», «Засумаваў...», «Жыву за вас!»). У роздуме над пераемнасцю пакаленняў прачытваецца смутак з прычыны незваротнасці страт дарагіх людзей («Мае сябры, мае сяброўкі, ах, колькі вас ужо няма»), усведамляецца неабходнасць працягваць іх справу: «І хто застаўся, той павінен дайсці за

ўсіх — наказ такі». Або: «Жыву за вас, дзяды й бабулі, за вас, і Броўкі і Сысы» (Сыс — дзявочае прозвішча маці паэта).

З добрай, хітравата прыхаванай усмешкай гаварыў ён пра нерастрачаную шчодрасць пачуццяў, здольнасць, як у юнацтве, адклікнуцца на голас кахання:

Ну што, калі крыху схіліўся
І галавою пабялеў,
А я ж у сэрцы не змяніўся,
А можа быць, папрыгажэў.

У інтымнай лірыцы («Скуль жа з'явілася ты...», «Ты мне здавалася адзінай...», «Ах, зноўку б маладосць», «Толькі ўспомні!..»), бадай, найбольш выразна адчуваецца шкадаванне незваротнасці, імклівасці часу («Але навошта так імкліва той час жаданы праляцеў»). Стала і мудра ўглядаўся П. Броўка ў перажытае. Ускладніліся адносіны да жыцця, больш складанымі ўяўляліся і інтымныя пачуцці. Найбольш прывабнае ў іх — гатоўнасць прыйсці на дапамогу («Калі з табою што якое...», «Калі руку на развітанне...» і інш.):

Калі ты смуткам апавіта,
Калі ў душы тваёй адчай,
Ты лепш скажы мне шэптам жыта
Ці названі мне, як ручай.

Як відаць, метафарызацыя паэзіі П. Броўкі пацвярджае непасрэдную сувязь з натурфіласофіяй, пантэістычнымі ўяўленнямі нашых продкаў. Гэта асабліва прыкмячаецца ў пейзажнай лірыцы. «У яго прырода,— пісаў П. Панчанка,— заўсёды жывая, трапяткая, адухоўленая. Грозная ў часы нягод і навальніц і ласкавая ў мірныя дні, з пошумам збажыны, з гулам векавых бароў»[1]. І сапраўды, прырода ў П. Броўкі багатая, шматколерная, шматгалосая, пераважаюць светлыя фарбы і мажорныя гукі («Чым больш жыву...», «Дажджы вясною...», «Вясновы дождж», «Усё спявае» і інш.). Тут, відаць, найбольш удала выявілася здольнасць паэта да лірычнага жывапісу: «Дажджы вясною, што жывыя — зямлі здымаюць немату». «Здаецца, кроплі пахнуць хлебам, і чуцен гоман спелых ніў». «І мне здаецца, разумею гамонку ветру, зор і хмар», «гамонку дрэў, вады, калосся, гамонку лісця і травы». «А ты прыслухайся, як зоры нібы пяюць у вышыні». Спявае ў П. Броўкі ўсё навакольнае: «Спяваюць рэкі і азёры, спяваюць пушчы і бары», «спявае колас песню хлебу, спявае і рабінцы клён».

Паэт нязменна, як руплівы гаспадар, гартаў каляндар прыроды, адкрываючы грамадзянскі рэзананс значэння кожнай пары года, кожнага пражытага дня («У неба грукае зіма...», «Перад вясной», «Калі губляе лета сілу...», «Я вельмі сонца ўсход люблю...», «Майская ноч» і інш.).

---

[1] Панчанка П. Голасам сэрца.— Збор твораў: У 4 т.— Мн.: Маст. літ., 1983, Т. 4.— С. 205.

Жыццё прыроды знаходзіцца часцей за ўсё ў гарманічнай суладнасці з настроем, душэўным станам чалавечай асобы («Я адзінокім не бываю...», «Я сам сабе настрой ствараю...», «Калі табе бывае сумна...» і інш.), лечыць сум і адзіноту:

Калі табе бывае сумна,
не выклікай пакутных слёз,
А ты прыглядзься, ты прыглядзься
да стану тоненькіх бяроз —
Плывуць у свет што ні галіна,
дык на зялёнаму вяслу,
І кожны ліст
нібы спявае жыццю падзяку і хвалу!

У свеце прыроды прыходзіць паэтычнае натхненне, а разам з ім і абнаўленне думак, пачуццяў («Ну дзе, якая адзінота — усё хвалюецца, жыве! І цягне ў верш, бо ты ім родны, хоць ты на лісціку нішы»).

Патрэба катарсісу лірычнага героя вымагае зноў і зноў звяртацца да рэтраспекцый, суадносіць перажытае з сучаснымі маральна-этычнымі крытэрыямі («Роздум», «Калі б нанова пачынаць...»). У роздуме паэта — шкадаванне, што «шмат няздзейсненых задумаў з сабою выпадзе забраць». Раздумваючы над альтэрнатывай, калі б давялося «нанова пачынаць ісці ў далёкую дарогу», паэт прыходзіў да вываду, што духоўныя «каардынаты» засталіся б нязменнымі: «трывогу б я узяў з сабой», «не надкіх да прыгожых слоў, няхай маўклівых, ды сяброў», захаваў бы і вернасць першаму каханню.

Трывогі людскія перажываюцца як свае, асабістыя. «Прайшлі мы разам з грамадою, сярод трывог людскіх раслі»,— пісаў П. Броўка ў вершы «Мы па адных хадзілі сцежках...», прысвечаным П. Панчанку. Невыпадкова разам з атэстацыяй паэтычнага майстэрства аднаго з выдатных паплечнікаў па літаратурнай справе («І верш твой гучны, верш удумны, і верш твой востры, як лязо») асаблівая ўвага завастраецца на надзённасці гучання, на неабыякавасці стаўлення да акаляючага асяроддзя.

Грамадзянская сумленнасць, трываласць маральных устояў паэзіі П. Броўкі выяўляецца вяртаннем да народных вытокаў («Карэнні песні», «Як верш будую?..», «Знак якасці» і інш.). Народным вопытам абумоўліваецца і, здавалася б, суб'ектыўная патрэба далучанасці да паэзіі («Хто паспытаў з яе аднойчы, таго праз век не адарваць»), і неабходнасць мастацкага адбору, звязанага з глыбіннымі каранямі жыцця («І я, нібы карэннем дрэва, збіраю песню з душ людскіх»). Праца паэта прыраўніваецца да працы цесляў, дзе ўсё павінна быць якасным, моцным і дакладным («І верш, як добры дом, будую, каб ён заўжды трывалым быў», «Кладу ў падмурак тыя словы, якія вывсрыў народ», «Я будаваў, каб дбала, чуйна спяваў мой верш і не старэў»).

Паэта хвалявалі адносіны шматмільённага чытача да ўласнай творчасці («Сачу, а як яе прымаюць мільёны воч, мільёны

душ?»). Самым запаветным з'яўляецца раўненне па знак якасці, пісаць такія вершы, «каб ім народ, каб ім народ знак якасці паставіў». Каб апраўдаць давер народа, «каб сэрцы браліся ў палон», ён шліфаваў вершаваныя строфы, знішчаў пустазелле слоў, «смецце» і «пыл» («І нам бы рэшата завесці, радкі ад пылу адсяваць»).

«Ні партыя, ні народ,— адзначалася ў Палітычным дакладзе Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза,— не маюць патрэбы ў парадным многапісанні і дробязным бытакапальніцтве, у кан'юнктуршчыне і дзяляцтве. Грамадства чакае ад пісьменніка мастацкіх адкрыццяў, праўды жыцця, якая заўсёды была сутнасцю сапраўднага мастацтва.

Але праўда — не абстрактнае паняцце, яна канкрэтная. Яна — у здзяйсненнях народа і супярэчнасцях развіцця грамадства, у гераізме і штодзённасці працоўных будняў, у перамогах і няўдачах, гэта значыць у самім жыцці, ва ўсёй яго шматграннасці, драматызме і велічы» [1]. Гэтымі патрабаваннямі як не трэба лепш высвечваецца сугучнасць часу і паэзіі П. Броўкі з яе непараднай, па-купалаўску мудрай прастатой, дзе выдатна спалучаны тонкае лірычнае самавыяўленне і публіцыстычная завостранасць, эпічны размах і адчуванне драматызму неспакойнага веку. «Яму ўдаецца,— зазначаў В. Бечык,— выявіць складанасць жыцця, не змяняючы голасу і не ўскладняючы перажыванні, выказаць пачуцці і думкі многіх людзей і застацца самім сабою. Паэт цудоўна ўмее выказаць пачуццё ў народнапесенным ключы, не губляючы і не раствараючы ў ім свайго, а толькі зблізіўшы яго з народным успрыманнем» [2].

Штодзённы побыт, гаспадарская беражлівасць, павага да здабыткаў людской працы апаэтызаваны ў вершах «Яшчэ раз аб хлебе...», «Бульба», «Лён», «Лапці». Абраза хлеба справядліва расцэньваецца як знявага маці, Радзімы, як страта чалавечай годнасці і прыраўніваецца да жорсткасці, бездухоўнасці. Мера духоўнага спусташэння таго, хто зняважыў хлеб, асабліва відавочная ў суаднесенасці з трагізмам пакутлівых дзён вайны:

Калі ж я зняважаны хлеб дзе пабачу,
Дык вельмі балюча,
я ледзьве не плачу.
Хто кінуў,
дык годнасць людскую ён страціў,
Абразіўшы гэтым зямлю, сваю маці.

Нанёс ёй, няўдзячны, глыбокую рану,
Я думаю, кім жа такі ўзгадаваны?!

---

[1] Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.— Мн.: Беларусь, 1986.— С. 106.

[2] Бечык В. Што сэрца праспявала...— У кн.: Прад высокаю красою...— Мн.: Маст. літ., 1984.— С. 20.

Зразумець прычыны бездухоўнасці, эгаізму можна толькі ў сувязі з выдаткамі выхавання. Да гэтай праблемы П. Броўка не раз вяртаўся ў сваіх творах, асуджаючы несумленнасць («Графаману», «Пляткар», «Два хвалько»), безгустоўнасць («Модніца»), скептыцызм, што мяжуе з антыграмадскімі нормамі паводзін («Скептык»), і іншыя заганныя з'явы ў грамадскім жыцці.

Увагу паэта прыцягваюць людзі самых розных працоўных прафесій («Механізатары», «Ляснічы», «Хірургія», «Сіноптыкам», «Талака», «Усё з любоўю», «Людской увагай мы сагрэты...», «Мы працу ведалі з дзяцінства» і інш.). Механізатар і ляснічы, хірург і сіноптык прыйшлі ў вершы П. Броўкі непасрэдна з жыцця. На падставе ўласных назіранняў і вопыту паэт рабіў выснову, што сумленнасць і працавітасць з'яўляюцца прадпасылкамі поспеху ў любой справе («Упэўнены: з любоўю трэба і двор падмесці і прыбраць!»). Ветлівасць, добразычлівасць, неабходныя прафесіі прадаўца, апаэтызаваны П. Броўкам у вершы «Людской увагай мы сагрэты...». Павага да працы павінна выхоўвацца з дзяцінства. «На працавітых галасах» у роднай вёсцы называлі, ці «шырокі ў касара размах», і ў якой хаце рыхтуюцца да вяселля, мелючы муку на вясельны каравай, і ў колькі цапоў ідзе на таку малацьба. Слухаючы жніўныя песні, «ведалі, ці нашы жнеі, ці то з суседняга сяла». Невыпадкова «голас роднай вёскі» жыва і непаўторна гучыць у паэзіі П. Броўкі.

Услаўленне працоўнага гераізму на палях і будоўлях краіны мае свае глыбокія вытокі ў герачнай памяці народа. Паўсядзённыя справы і подзвіг савецкіх людзей у Вялікай Айчыннай вайне існуюць поруч («Балада пра дуб саўгаса Сітца», «Партызанскі пчаляр», «Лясная школа», «Дума пра Веру Харужую», «Заўжды вы з намі», паэма «Марат Казей»). Памяці беларускага воіна, былога рабочага мінскага радыёзавода Т. А. Лук'яновіча паэт прысвяціў свой верш «Ён неўміручы». Гэта быў апошні апублікаваны пры жыцці твор П. Броўкі. «У напярэдадні,— зазначае С. Грахоўскі,— купіў некалькі экземпляраў «Праўды» з вершам Броўкі «Бяссмерце»... Не хацелася турбаваць Петруся Усцінавіча, і газеты я перадаў праз санітарку. Увечары пазваніла Алена Міхайлаўна і падзякавала ад сябе і ад мужа за свежую прэсу» [1]. А праз некалькі дзён давялося стаяць у ганаровай варце ля труны паэта.

У «Праўдзе» гэты верш названы «Бяссмерце». У ім падкрэсліваецца гуманнасць савецкага байца, які ў пекле агню выратаваў нямецкую дзяўчынку («Дзіця не можа быць чужое, для ўсіх дзяцей адна любоў!»). Т. А. Лук'яновіч стаў правобразам манумента воіна з выратаванай дзяўчынкай на руках у Берліне.

«Натуральна, што вобраз у Броўкі,— зазначаў М. Ярош,— нават гіпербалічны, як правіла, груптуецца на асацыяцыях, звязаных са штодзённым побытам, з рэальнымі жыццёвымі з'явамі, здарэннямі, падзеямі. Таму і здаецца ён на першы погляд звык-

[1] Грахоўскі С. Урокі Петруся Броўкі.— У кн.: Так і было.— Мн.: Маст. літ., 1986.— С. 99.

лым, у плынь аўтарскай мовы ўваходзіць непрыкметна»[1]. Вобразнасць і манера пісьма пераважна традыцыйная, у ёй моцная народная аснова, вякамі выпрацаваныя прынцыпы народнай маралі, этыкі, філасофіі. Так дуб — увасабленне велічы, непераможнасці народнага духу («Я пасадзіў тры жалуды...», «Размова з дубам пасля доўгай расталі» і інш.). Скразнымі, апорнымі ў настраёвасці лірыкі П. Броўкі становяцца «сэрца — песня — сонца». Сабраная «з душ людскіх песня» на крылах паэтавага сэрца ўздымаецца ў сонечны блакіт, набывае акрыленасць. Крылатымі сталі і многія афарызмы, што сведчаць пра дакладнасць яго думкі: «Паэзія — нібы крыніца, што не з зямлі, а з сэрца б'е». «Не тая боль, што бачна звонку, а боль, што людзям не відна». «Нас рэвалюцыя ўзбудзіла і пасадзіла за пяро». «Жыццё мы ўсе спрабавалі, а нас усіх жыццё вяло». «Не, лепш чакаць, чым добра ведаць, што ўжо чакаць няма чаго».

На жаль, не ўсё створанае П. Броўкам адпавядае духу і патрабаванням сённяшняй грамадскай перабудовы.

У цэлым жа, безумоўна, гуманістычныя ідэалы, грамадзянска-публіцыстычнае гучанне яго паэзіі сцвярджаюць веру ў заўтрашні дзень, у перамогу добрых памкненняў і цвярозага чалавечага розуму над сіламі зла, пагрозай ядзернага шаленства. Гэтым перш за ўсё творчасць паэта і прыцягвае да сябе ўвагу.

ЛЮБОЎ ГАРЭЛІК

---

[1] Ярош М. Пятрусь Броўка.— Мн.: Народная асвета, 1981.— С. 88.

# I

## ВЕРШЫ

*Адзіны шлях* (с. 7)

Упершыню — Маладосць, 1972, № 12 пад загалоўкам «Адна нам зорка...».

У апошнім прыжыццёвым выданні і зб. «І ўдзень і ўночы» датуецца 1972 годам.

*Любая мясціна* (с. 8)

Упершыню — Маладосць, 1973, № 6.

На выразцы з часоп. «Маладосць» рукой паэта пастаўлена дата: 1972 г.

*Ушаччына* — «малая радзіма» П. Броўкі, любоў да якой ён пранёс праз усё жыццё, часта наведваючы «любыя мясціны» і вяртаючыся да яе ў сваіх вершах («*** Мой кут пічым не адмысловы...», «Чаму я гэтак вас люблю?» і інш.).

*Карэнні песні* (с. 9)

Упершыню — Маладосць, 1973, № 6.

На выразцы з часоп. «Маладосць» рукой паэта пастаўлена дата: 1972 г.

*Сэрцалёт* (с. 10)

Упершыню — Маладосць, 1973, № 6.

На выразцы з часоп. «Маладосць» рукой паэта пастаўлена дата: 1972 г.

*У музеі* (с. 11)

Упершыню — Маладосць, 1973, № 6.

На выразцы з часоп. «Маладосць» рукой паэта пастаўлена дата: 1972 г.

*...І тыя, што зямлю аралі/Яшчэ на трактары «Фардзон».* — Гаворка ідзе пра сельскагаспадарчы калёсны трактар агульнага прызначэння. Выпускаўся кампаніяй «Форд» (ЗША) у 1917—1928 гг. Копія «Фардзона» выпускалася заводам «Чырвоны пуцілавец» у Ленінградзе ў 1923—1932 гг. пад назвай «Фардзон-Пуцілавец».

*...Спявалі мы: «Наш паравоз...»* — Песня ўзнікла ў асяроддзі кіеўскіх камсамольцаў. Яе з уздымам пела моладзь 20-х гадоў.

*Няхай жа вам не сняцца...* (с. 12)

Упершыню — Маладосць, 1973, № 6.

На выразцы з часоп. «Маладосць» рукой паэта пастаўлена дата: 1972 г.

*Балада пра дуб сайгаса Сітца* (с. 13)

Упершыню — Звязда, 1973, 18 лют.

У машынапісе пад тэкстам: 4.1.73 г.

Саўгас «Сітцы» размяшчаецца на тэрыторыі Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці.

Верш напісаны да Дня Савецкай Арміі. Можна выказаць меркаванне, што ў аснове твора ляжыць вядомы паэту факт, які пэўным чынам знайшоў адлюстраванне ў вершы. На тэрыторыі Віцебскай вобласці, у прыватнасці, у Докшыцкім раёне ёсць шмат помнікаў і абеліскаў, пастаўленых на магілах воінаў і партызан, загінуўшых у час Вялікай Айчыннай вайны, а таксама на могілках ахвяр фашызму. Так, у Сітцаўскім сельсавеце, недалёка ад Новай Вёскі, знаходзяцца могілкі вязняў канцлагера «Лібераўшчына» — каля 600 мірных жыхароў Бешанковіцкага, Лепельскага і Ушацкага раёнаў, закатаваных фашыстамі ў чэрвені 1944 года, і магіла італьянскіх вайскоўцаў. Восенню 1943 года, пасля выхаду Італіі з гітлераўскай кааліцыі, нямецка-фашысцкае камандаванне раззброіла і інтэрніравала салдат і афіцэраў італьянскіх вайсковых падраздзяленняў на савецка-германскім фронце. Італьянскіх вайскоўцаў, якія абслугоўвалі аэрадром каля вёскі Сітцы, кінулі ў канцлагер «Лібераўшчына». Перад адступленнем гітлераўцы ў чэрвені 1944 года ліквідавалі лагер. 200 вязняў-італьянцаў вывезлі на аўтамашынах ва ўрочышча Ходараўскі Лес і расстралялі.

У 1969 годзе на могілках і магіле пастаўлены абеліскі.

*Модніца* (с. 15)

Упершыню — Вожык, 1974, № 1.

У машынапісе пад тэкстам: Люты, 1973 г.

*** *Паміж сяброў...* (с. 16)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1973 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Сакавік, 1973 г.

*Трэба ведаць...* (с. 17)

Упершыню — Звязда, 1973, 8 чэрв.

На выразцы з газ. «Звязда» рукой паэта пастаўлена дата: Красавік, 1973 г.

Верш напісаны да выбараў (17 чэрвеня 1973 г.) у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

*Дзянікін А. І.* (1872—1947) — генерал царскай арміі.

*Пілсудскі Юзаф* (1867—1935) — польскі палітычны дзеяч, дыктатар Польшчы ў 1926—1935 гг. У барацьбе за незалежнасць Польшчы арыентаваўся на Аўстра-Венгрыю. Адзін з галоўных ініцыятараў савецка-польскай вайны 1920 г. Трымаўся палітыкі прыгнечання непольскага насельніцтва, асабліва Беларусі і Заходняй Украіны, гвалтоўнага апалячвання яго. У 1934 годзе падпісаў з фашысцкай Германіяй пагадненне «Аб мірным вырашэнні спрэчак», якое спрыяла развязванню фашысцкай агрэсіі.

*Махно Н. І.* (1889—1934, Парыж) — адзін з верхаводаў дробнабуржуазнай контррэвалюцыі на Украіне ў 1918—1921 гг. у час грамадзянскай вайны.

*Пятлюра С. В.* (1879—1926, Парыж) — адзін з верхаводаў буржуазна-нацыяналістычнага руху 1918—1920 гг. у час грамадзянскай вайны.

...*Мы павінны/Заўжды помніць аб Айчыннай...* — Маецца на ўвазе Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза 1941—1945 гг., найважнейшая частка другой сусветнай вайны 1939—1945 гг., развязанай германскім фашызмам і сусветным імперыялізмам.

*** *Бывае, хтосьці запытае...* (с. 22)

Упершыню — Беларусь, 1973, № 7, дзе датуецца 1973 годам.

У адным з машынапісаў пад тэкстам: Красавік, 1973 г., у другім — 1973 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «І ўдзень і ўночы» паэт перапрацаваў некаторыя радкі верша.

Радкі 2—3, замест: Між гор і пальмаў, ну аб тым,/Твой край завошта паважаюць // Мяне між гор і пальм аб тым,/Завошта край твой паважаюць

радок 8, замест: Ды людзі ёсць — вышэй ад гор // Але ёсць людзі вышай гор

*За вас мы рады, маладыя...* (с. 23)

Упершыню — Вожык, 1974, № 1.

У рукапісе пад тэкстам: Май, 1973 г.

*Настрой* (с. 24)

Упершыню — Беларусь, 1973, № 7, дзе датуецца 1973 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Май, 1973 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «І ўдзень і ўночы» паэт апусціў наступныя радкі:

Паміж сяброў,/Паміж каханкаў,/Якія ў думках кожны міг — /Няма ні станцый, ні паўстанкаў,/Такіх, каб раз'ядналі іх.

Калі імкнешся/Да Сустрэчы,/Не кажаш марам ты — маўчы,/ Яны лятуць уранні, ўвечар,/У час глыбокае начы.

Іх неракажуць/Любым зоры,/А ці пашэпчуць іх вятры,/Жаданняў не прыпыняць горы,/А ні пустыні, ні мары.

*** *Палі, лугі, гаі, разлогі...* (с. 25)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1973 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Май, 1973 г.

*Калі б нанова пачынаць...* (с. 26)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1973 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Май, 1973 г.

*А мы расцём!* (с. 27)

Упершыню — Звязда, 1973, 25 жн.

На выразцы з газ. «Звязда» рукой паэта пастаўлена дата: Май, 1973 г.

*Роздум* (с. 29)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1973 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 29.VII.73 г.

Машынапісны варыянт верша спачатку меў загаловак «Нялёгкі роздум».

*Праведы* (с. 30)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1973, 2 лістап.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1973 г.

*Калі табе бывае сумна...* (с. 31)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1973, 2 лістап.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1973 г.

*Людской увагай мы сагрэты...* (с. 32)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1973 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1973 г.

*Дума пра Веру Харужую* (с. 33)

Упершыню — Звязда, 1973, 27 верас. пад назвай «Вера Харужая».

На выразцы з газ. «Звязда» рукой паэта пастаўлена дата: Жнівень, 1973 г.

Верш напісаны да 70-годдзя з дня нараджэння Харужай Веры Захараўны (1903—1942) — дзяячкі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, публіцысткі, партызанкі, Героя Савецкага Саюза (1960).

...*Партыя стрэла — /Сэрцам аддапую,/З ёй пажыццёва/Лёсам звязаную*~*Межаў не знала/Словы крылатыя — /Крупскай глыбока/Сэрцам прынятыя.* — З лютага 1924 года В. Харужая знаходзілася на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. З чэрвеня 1924 года — сакратар ЦК КСМЗБ, член ЦК КПЗБ, член ЦК камсамола Польшчы. Яна вяла работу па згуртаванню рэвалюцыйнай моладзі вакол КСМЗБ, удзельнічала ў многіх канспіратыўных нарадах і сходах, выступала на мітынгах, пісала адозвы, артыкулы для падпольных газет. Арганізавала выданне газеты ЦК КСМЗБ «Малады камуніст». Пад кіраўніцтвам В. Харужай летам 1925 года была праведзена II канферэнцыя КСМЗБ (Вільня). Удзельнічала ў рабоце II канферэнцыі КПЗБ (снежань 1924 года), III з'езда КПП (1925). 15.9.1925 года ў час падрыхтоўкі Беластоцкай акружной канферэнцыі КПЗБ В. Харужая была арыштавана і прыгаворана да 8 гадоў зняволення. У час зняволення ў Беластоцкай і цэнтральнай жаночай турме «Фордан» яна вяла перапіску з паплечнікамі па барацьбе і роднымі. У 1930 годзе частка яе лістоў была сабрана ў кнігу «Лісты на волю», якая неаднаразова перавыдавалася на рускай, беларускай і польскай мовах. Высока ацаніла значэнне гэтай кнігі Н. К. Крупская.

...*Зноўку на бойку/З нягодаю рушыла*~*Віцебск, ты помніш/Як Вера змагалася?* — У першыя дні Айчыннай вайны Вера Ха-

ружая — партызанка атрада В. З. Каржа. Каб паладзіць сувязь партызан з камандаваннем Чырвонай Арміі, В. Харужая ў жніўні 1941 года пераправілася цераз лінію фронту. З вясны 1942 года, пакінуўшы малых дзяцей на выхаванне сястры, на чале групы накіравалася ў варожы тыл. Стварыла і ўзначальвала групу ў Віцебскім камуністычным падполлі, перадавала камандаванню Чырвонай Арміі і партызанам каштоўныя звесткі пра ворага. 13.11.1942 года была арыштавана з іншымі падпольшчыкамі і закатавана фашыстамі.

*Нас рэвалюцыя ўзбудзіла* (с. 37)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1973, 2 лістап. пад загалоўкам «А нас усіх жыццё вяло...».

У машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1973 г.

...*Міхась Чарот, а з ім пяцьсот*... (сапр. Кудзелька Міхаіл Сямёнавіч, 1896—1938) — беларускі савецкі пісьменнік, грамадскі і культурны дзеяч. Ініцыятар стварэння і кіраўнік першай у рэспубліцы літаратурнай арганізацыі «Маладняк» (з 1923 г.), якая налічвала ў той час каля 500 членаў.

*Маторны век* (с. 38)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1973 годам.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1973 г.

*Ах, дрэвы, дрэвы*... (с. 39)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1973 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1973 г.

*Нялёгкая дарога* (с. 40)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1973 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Верасень, 1973 г.

*Сядзяць салдаты ля кастра*... (с. 41)

Упершыню — Звязда, 1973, 18 лют.

У рукапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1973 годам.

Верш напісаны да 23 лютага — Дня Савецкай Арміі.

...*Як маршал Жукаў адзначаў/Яго і Славу прышпіліў* — Жукаў Георгій Канстанцінавіч (1896—1974), савецкі ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза (1943), чатыры разы Герой Савецкага Саюза (1939, 1944, 1945, 1956), Герой МНР (1969). Пасля вайны займаў камандныя пасады ў Савецкай Арміі.

Ордэн Славы (ёсць 1, 2 і 3 ступені) установлены 8 лістапада 1943 года.

...*Браў языка за рэчкай Прут*...— Маецца на ўвазе тэрыторыя Румыніі. Прут — рака ў УССР, на граніцы СССР з Румыніяй, левы прыток Дуная.

*Што ледзь не першаю рукой/У Дзядзькі Косці зваўся ён*...—

Гаворка ідзе пра Заслонава Канстанціна Сяргеевіча (1909—1942). Партызанская мянушка — Дзядзька Косця. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1943).

*Жаданні* (с. 43)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1973, 2 сак., дзе датуецца 1973 годам.

У рукапісе і зб. «І ўдзень і ўночы» датуецца 1973 годам.

*Не вер...* (с. 44)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1973, 2 сак., дзе датуецца 1972 годам.

У рукапісе і зб. «І ўдзень і ўночы» датуецца 1973 годам.

Паколькі тэксты рукапісу і першай публікацыі ідэнтычныя, а рукапіс датуецца 1973 годам, можна меркаваць, што дата пад вершам у газеце «Літаратура і мастацтва» недакладная.

*Мінута маўчання* (с. 45)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1973, 15 чэрв.

На выразцы з газеты рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

Можна меркаваць, што верш напісаны пад уражаннем успамінаў пра Вялікую Айчынную вайну, выкліканых святкаваннем Дня Перамогі. Свята Перамогі ўстаноўлена 8.5.1945 года.

*Відаць Жаданага абрысы...* (с. 46)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1973, 15 чэрв.

На выразцы з газ. «Літаратура і мастацтва» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

«Жаданае» — паэтычны вобраз светлага і велічнага будучага, у імя якога і паэт «дзе мог, лажыў цагліну», «спяваў пра узлёт, як толькі мог».

*І ўдзень і ўночы...* (с. 47)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1973, 6 ліп.

У машынапісе і зб. «І ўдзень і ўночы» датуецца 1973 годам.

*Скептык* (с. 48)

Упершыню — Вожык, 1973, № 8.

На выразцы з часоп. «Вожык» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*Ён для мяне адной* (с. 50)

Упершыню — Беларусь, 1973, № 7, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп. «Беларусь» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*Хірургія* (с. 51)

Упершыню — Беларусь, 1973, № 7, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп. «Беларусь» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

Тэкст друкуецца з папраўкай па часоп. «Беларусь», 1973, № 7. Радок 13, замест: Ты над мною // Ты нада мною.

Верш прысвечаны Маліноўскаму Мікалаю Нікадзімавічу (н. 1921 г.) — савецкаму вучонаму ў галіне хірургіі. Скончыў Мінскі медінстытут (1949). У Айчынную вайну — удзельнік партызанскага руху на Беларусі. З 1952 г. у Маскве. З 1965 года прафесар кафедры шпітальнай хірургіі 1-га Маскоўскага медыцынскага інстытута.

У студзені — лютым 1970 года П. Броўка знаходзіўся ў кунцаўскай бальніцы з прычыны аперацыі на страўніку. Рабіў аперацыю М. Н. Маліноўскі. Пачуццё ўдзячнасці да ўрача вылілася ў вершах «*** Многа даў наш край бацькоўскі...» (1970), «Хірургія».

*Знак якасці* (с. 52)

Упершыню — Беларусь, 1973, № 7, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп. «Беларусь» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*Заўжды вы з намі* (с. 53)

Упершыню — Полымя, 1973, № 12, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп. «Полымя» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*На знанай плошчы Перамогі — /Ля самай зоркі бачым вас!* — Маецца на ўвазе 40-метровы абеліск-помнік воінам Савецкай Арміі і партызанам, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

*Падпольшчыкі!/Я сэрцам плачу,/Што вас жывымі не знайду,/ Хоць скрозь па Мінску ўсюды бачу,/Калі па вуліцах іду.*— З першых дзён варожай акупацыі камуністы і камсамольцы, якія засталіся ў Мінску, пачалі ствараць падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі. Улетку 1941 года быў створаны Мінскі падпольны абком партыі на чале з В. І. Казловым, а ў лістападзе 1941 года ў Мінску быў створаны агульнагарадскі падпольны партыйны бальшавіцкі цэнтр.

*Чатыры штыкі над Мінскам* (с. 54)

Упершыню — Полымя, 1973, № 12, дзе датуецца 1973 годам, пад загалоўкам «Чатыры штыкі над Мінскам».

На выразцы з часоп. «Полымя» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*Славы курган,/На ім на вякі/Ззяюць здалёку,/Ззяюць і зблізку — /Чатыры штыкі...*— Гаворка ідзе пра Курган Славы — помнік на 21-м км шашы Мінск — Масква ў гонар подзвігу воінаў 1, 2 і 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў у Беларускай аперацыі 1944 г. Вышыня 70,6 м. Над земляным узгоркам (35 м) 4 штыкі-абеліскі па 35,6 м кожны, якія сімвалізуюць франты. Адкрыты 5 ліпеня 1969 г. да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

*** *Калі руку на развітанне...* (с. 55)

Упершыню — Полымя, 1973, № 12, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп. «Полымя» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*Калі губляе лета сілу...* (с. 56)

Упершыню — Полымя, 1973, № 12, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп. «Полымя» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*Пражыта мной ужо багата...* (с. 57)

Упершыню — Полымя, 1973, № 12, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп. «Полымя» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*А ты вышэй, шырэй, глыбей!..* (с. 58)

Упершыню — Полымя, 1973, № 12, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп. «Полымя» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*У неба грукае зіма...* (с. 59)

Упершыню — Полымя, 1973, № 12, дзе датуецца 1973 годам.

На выразцы з часоп.« Полымя» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*Сіноптыкам* (с. 60)

Упершыню — Звязда, 1973, 31 снеж.

На выразцы з газ. «Звязда» рукой паэта пастаўлена дата: 1973 г.

*І так мне радасна ісці...* (с. 62)

Упершыню — Маладосць, 1974, № 11.

Сярод архіўных матэрыялаў Літаратурнага музея П. Броўкі знойдзены рукапіс верша без загалоўка з датай пад тэкстам: Лістапад, 1973 г. і машынапіс з датай: Студзень, 1974 г. У зб. «І ўдзень і ўночы» змешчаны два варыянты верша. Адзін з іх супадае з тэкстам рукапісу і датуецца 1973 годам. Прыводзім гэты верш поўнасцю:

Прыгожае жыццё я маю,
Іду здаўна ў далёкі шлях...
Жыву, заўсёды адчуваю,
Што дзеецца ў маіх грудзях.

То ціш такая, лепш не трэба,
То раптам забаліць ад ран.
То ў іх бязвоблачнае неба,
То раптам выбухне вулкан —

Ці гора чорнага, ці славы,
І пазіраю я па дол,
Што плынямі гарачай лавы
Ужо залівацца вакол.

Ды сілу я над гэтым маю,
Ясе я ў розуме знайду,
І жар празмерны суцішаю,
І зноўку ўдалеч я іду!

Другі варыянт у параўнанні з машынапісам і тэкстам першай публікацыі скарочаны на адну страфу пасля слоў «То раптам — выбухне вулкан»: То гора збярыцца,/То слава./Часамі ўгледжуся на дол,/Што плынямі гарачай лавы/Гудзіць, хвалюецца вакол. Ён мае загаловак «І так мне радасна ісці...» і дату пад тэкстам: 1974 г. У такім выглядзе верш змешчаны ў апошнім прыжыццёвым Зборы твораў, т. 4.

*Смага* (с. 63)

Упершыню — Маладосць, 1974, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: Студзень, 1974 г.

...*Смага, смага — /Бачу Брэст, паўзуць да Буга,/Пад шрапнельнай завірухай, ледзь жывыя абаронцы.*— Відаць, верш напісаны пад уражаннем наведвання мемарыяльнага комплексу Брэсцкая крэпасць-герой. Адзін з яго матываў — скульптурная кампазіцыя «Смага» — узнаўляе трагічныя дні абароны крэпасці, калі кожны глыток вады каштаваў жыцця яе абаронцам. «Смага» — фігура савецкага воіна, які, абапіраючыся на аўтамат, з каскай у руцэ цягнецца да вады.

Комплекс быў адкрыты 25 верасня 1971 года.

*«Буржуйка»* (с. 64)

Упершыню — Маладосць, 1974, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: Студзень, 1974 г.

*Чым больш жыву...* (с. 65)

Упершыню — Маладосць, 1974, № 11.

*** *Гадоў нямала праляцела...* (с. 66)

Друкуецца па часоп. «Маладосць», 1974, № 11, дзе ўпершыню апублікаваны.

У машынапісе пад тэкстам: Люты, 1974 г. Кіславодск.

*** *Скуль жа з'явілася ты...* (с. 67)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, дзе датуецца 1974 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Сакавік, 1974 г.

*Калі з табою што якое...* (с. 68)

Упершыню — Маладосць, 1974, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1974 г.

*Яшчэ раз аб хлебе...* (с. 69)

Упершыню — Маладосць, 1974, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1974 г.

*Кайстра* — дарожная торба, заплечны мяшок.

*Лясная школа* (с. 70)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1974, 30 жн.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1974.

У ліпені 1974 года ў Беларусі шырока адзначалася 30-годдзе вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтай падзеі і наогул вызваленню Беларусі прысвечана, акрамя дадзенага,

яшчэ некалькі вершаў П. Броўкі — «Героі», «Заўсёды ў сэрцы тое лета...», «І Беларусь і партызан...».

*Крамлёўскія зоры* (с. 71)

Упершыню — Маладосць, 1974, № 11.

Адзін з машынапісаў датуецца 1974 годам, у другім пад тэкстам: Ліпень, 1974 г.

*Развітанне з паўднёвым сонцам* (с. 72)

Упершыню — Работніца і сялянка, 1975, № 6.

У машынапісе пад тэкстам: Верасень, 1974 г. Ялта.

Гэты верш, а таксама «Труба і ліра», напісаны ў час адпачынку ў Ялце.

*Труба і ліра* (с. 74)

Упершыню — Полымя, 1975, № 6.

У машынапісе пад тэкстам: Верасень, 1974 г. Ялта.

*Механізатары* (с. 75)

Упершыню — Сельская газ., 1975, 25 чэрв.

У машынапісе пад тэкстам: 12.XII.74 г.

*Вера, надзея і любоў* (с. 76)

Упершыню — Маладосць, 1975, № 6.

У адным з машынапісаў датуецца 1974 годам, у другім пад тэкстам: 15.XII.74 г.

*Героі* (с. 77)

Упершыню — зб. «І ўдзень і ўночы», 1974, дзе датуецца 1974 годам.

У рукапісе датуецца 1974 годам.

Гл. каментарый да верша «Лясная школа» (с. 485).

*Заўсёды ў сэрцы тое лета...* (с. 78)

Упершыню — Полымя, 1974, № 6.

У рукапісе, машынапісе і зб. «І ўдзень і ўночы» датуецца 1974 годам.

Гл. каментарый да верша «Лясная школа» (с. 485).

*І Беларусь і партызан...* (с. 80)

Упершыню — Беларусь, 1974, № 6, дзе датуецца 1974 годам.

У рукапісе, машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1974 годам.

Гл. каментарый да верша «Лясная школа» (с. 485).

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «І ўдзень і ўночы» быў перапрацаваны другі радок верша.

| Было: | Стала: |
|---|---|
| То, бой смяротны ведучы | На бой смяротны ідучы. |

*Дзівосны мост* (с. 81)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1974, 30 жн.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1974 годам.

*Майская ноч* (с. 82)

Упершыню — Маладосць, 1974, № 11.

У машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1974 годам.

*Жыццё — не ўсё адно суквецце...* (с. 83)

Упершыню — Вожык, 1974, № 24.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 недакладна датуецца 1975 годам.

У якасці эпіграфа да верша выкарыстаны радкі з паэмы У. Маякоўскага «На ўвесь голас».

*Графаману* (с. 84)

Упершыню — Вожык, 1974, № 24.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 недакладна датуецца 1975 годам.

*Мы па адных хадзілі сцежках...* (с. 85)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1974, 30 жн.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1974 годам.

Верш напісаны да дня нараджэння беларускага савецкага паэта Пімена Панчанкі (10.8.1917), з якім на працягу многіх год П. Броўку звязвала цесная дружба.

*Вам жыць і жыць...* (с. 87)

Упершыню — Звязда, 1975, 7 мая.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

Верш напісаны да 30-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

*Суддзя* (с. 93)

Упершыню — Звязда, 1975, 25 чэрв.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Маё Дваццатае Стагоддзе* (с. 94)

Упершыню — Сельская газ., 1975, 25 чэрв.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Рэвалюцыйнай волі хвалі/У твой вядомы Пяты год* — Маецца на ўвазе першая руская рэвалюцыя, якая пачалася падзеямі Дзевятага студзеня 1905 г. у Пецярбургу, калі паводле царскага загаду войскі расстралялі мірнае шэсце рабочых.

*КІМ* — Камуністычны інтэрнацыянал моладзі — міжнародная арганізацыя, якая існавала ў 1919—1943 гг. як секцыя Камінтэрна. Ідэя стварэння належала В. І. Леніну. КІМ ставіў сваёй задачай стварыць шырокі масавы рух моладзі ў абарону яе эканамічных, палітычных і культурных інтарэсаў, садзейнічаць выхаванню моладдзю тэорыі і практыкі марксізму-ленінізму. Асаблівую ўвагу КІМ удзяляў барацьбе супраць мілітарызму, вайны і фашызму, выступаў у падтрымку СССР. У маі 1943 г. услед за роспускам Камінтэрна КІМ быў распушчаны.

*ДЭС* — Дзяржаўная электрастанцыя.

*Пра бусла і вераб'я* (с. 96)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1975, 27 чэрв.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1974 годам.

*Хіба не шчасце для людзей...* (с. 97)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1975, 27 чэрв.

У зб. «І маладосць і сталасць» датуецца 1974 годам.

*Пампеі* — антычны горад у Італіі, непадалёку ад Неапаля, каля падножжа Везувія. У 79 годзе н. э. у час вывяржэння Везувія быў засыпаны 7—9-метровым слоем попелу і вулканічных парод.

*** *Далёка ў горы я зайшоў...* (с. 98)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1975, 27 чэрв.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*** *Відаць, такое ўжо з усімі...* (с. 99)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1975, 27 чэрв.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Пра інваліда-ветэрана* (с. 100)

Упершыню — Беларусь, 1975, № 5 пад назвай «Ветэрану вайны».

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

Верш напісаны да 30-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

*** *Зямля! Ты тайнамі багата...* (с. 101)

Упершыню — Беларусь, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

Тэкст друкуецца з папраўкай па часоп. «Беларусь», 1975, № 6.

С. 101, радок 3, замест: А ты пагляду касманаўта/Здаешся нават і малой. // А ты, з пагляду касманаўта, // Здаешся нават і малой.

*На схіле пройдзеных гадоў* (с. 102)

Упершыню — Беларусь, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

Пры падрыхтоўцы да выдання названага Зб. тв. паэт унёс у тэкст верша некалькі правак.

Радок 5, замест: Ні той, калі ў малецтве быў // Ні той, калі ў дзяцінстве быў

радок 11, замест: Ні той, калі ў сям'і сяброў // Ні той, калі ў гуртку сяброў

радок 14, замест: Гляджу на сцішаны вятрак // Гляджу на змоўкнуўшы вятрак

У гэтым і наступных вершах (*** Хоць сталасць з'явіцца на ўзросце...», «А я ж у сэрцы не змяніўся...»), напісаных з нагоды свайго 70-годдзя, паэт прыгадвае мінулае, азіраецца на пройдзены шлях.

*** *Хоць сталасць з'явіцца на ўзросце...* (с. 103)

Упершыню — Беларусь, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

Пры падрыхтоўцы да выдання названага Зб. тв. паэт перапрацаваў некаторыя словы верша, апошні радок.

Радок 5, замест: Прыемны шчыры смех наўкола, // Прыемны звонкі смех наўкола.

радок 6, замест: Застолля шум, жаданы госць... // Застолле, пір, жаданы госць.

радок 12, замест: Па неспакою ії барацьбе. // І па наступнай барацьбе.

*Памяці паэта* (с. 104)

Упершыню — Полымя, 1975, № 6.

У зб. «І маладосць і сталасць» пад назвай «А ў сэрцы сум. Няма яго...» датуецца 1974 годам.

*...Плывуць, плывуць лятункі мар/Перад тваім апошнім словам,/Сын Беларусі і пясняр.*— Верш прысвечаны класіку беларускай літаратуры, выдатнаму паэту, перакладчыку, літаратуразнаўцу і празаіку Максіму Багдановічу (1891—1917), які з-за цяжкай хваробы апошнія месяцы свайго жыцця правёў у Ялце. Там жа, у Ялце, паэт і пахаваны.

*Я не люблю пахмурных дзён...* (с. 105)

Упершыню — Полымя, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым выданні датуецца 1974 годам.

*Зайздрошчу макаваму зерню* (с. 106)

Упершыню — Полымя, 1975, № 6.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1974 годам.

*Як дзве бабулі...* (с. 107)

Упершыню — Полымя, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*** *Зіма яшчэ не наступае...* (с. 108)

Упершыню — Полымя, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*А час, як прыйдзе, скажа цвёрда...* (с. 109)

Упершыню — Маладосць, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*А я ж у сэрцы не змяніўся...* (с. 110)

Упершыню — Маладосць, 1975, № 6.

У зб. «І маладосць і сталасць» датуецца 1974 годам.

Гл. каментарый да верша «На схіле пройдзеных гадоў» (с. 488).

*** *Відаць, што доля ўжо такая...* (с. 111)

Упершыню — Маладосць, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*За валам вал...* (с. 112)

Упершыню — Маладосць, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Нібы імкнецца ўсё да ўзлёту* (с. 113)

Упершыню — Маладосць, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Размова з мастаком-мадэрністам* (с. 114)

Упершыню — Маладосць, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Пра вас я думаю заўсёды* (с. 115)

Упершыню — Бярозка, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Ты мне ўяўляешся такою...* (с. 116)

Упершыню — Бярозка, 1975, № 6.

У зб. «І маладосць і сталасць» датуецца 1974 годам.

*Я нізка прад табой хілюся...* (с. 117)

Упершыню — Бярозка, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Партызанскі пчаляр* (с. 118)

Упершыню — Бярозка, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

Можна меркаваць, што верш быў напісаны пад уплывам успамінаў аб партызанскім жыцці, выкліканых святкаваннем 30-годдзя вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

*Раніцу люблю...* (с. 120)

Упершыню — Вясёлка, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*Два хвалько* (с. 122)

Упершыню — Вожык, 1975, № 6.

У апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 4 датуецца 1974 годам.

*** *Колькі мінула часін...* (с. 123)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, дзе датуецца 1974 годам.

*«Беларусь» плыве за акіян...* (с. 124)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, дзе датуецца 1974 годам.

*«Беларусь»* — колавы універсальна-прапашны трактар, які выпускаецца на Мінскім трактарным заводзе. Трактары «Беларусь» экспартуюцца больш чым у 40 краін свету.

*З жыцця бальнічнага* (с. 125)

Упершыню — Работніца і сялянка, 1975, № 6.

У машынапісе пад тэкстам: 9.І.75 г.

У канцы 1974 і пачатку 1975 гг. Броўка цяжка хварэў і часта трапляў у бальніцу. Менавіта гэта і вызначыла з'яўленне ў яго творчасці такіх вершаў, як «З жыцця бальнічнага», «*** Ты захварэеш неспадзеўкі...», «*** Хоць плот бальнічны не вышэйшы...» і інш.

*** *Натура ўжо, відаць, такая...* (с. 127)
Упершыню — Полымя, 1975, № 6.
У машынапісе над тэкстам: Студзень, 1975 г.

*** *Хоць плот бальнічны не вышэйшы...* (с. 128)
Упершыню — Полымя, 1975, № 6.
У машынапісе над тэкстам: Студзень, 1975 г.

*** *Ты захварэеш неспадзеўкі...* (с. 129)
Упершыню — Беларусь, 1975, № 6.
У машынапісе над тэкстам: Студзень, 1975 г.

*** *Яно, жартуючы, вядома...* (с. 130)
Упершыню — Маладосць, 1975, № 6.
У рукапісе над тэкстам: Студзень, 1975 г.

*Чытачам* (с. 131)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1975, 27 чэрв. пад назвай «Маім чытачам».

У машынапісе, дзе загаловак «Маім чытачам» выпраўлены на «Чытачам», над тэкстам: Студзень, 1975 г.

*Пераклікаюцца кветкі...* (с. 133)
Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.
У рукапісе над тэкстам: Сакавік, 1975.

*Калі б сабралі слёзы матак* (с. 134)
Упершыню — Настаўніцкая газ., 1975, 25 чэрв.

У рукапісе над тэкстам: Сакавік, а ў машынапісе — Красавік, 1975 г.

*Зязюля* (с. 135)
Упершыню — Вячэрні Мінск, 1975, 24 чэрв.
У рукапісе над тэкстам: 14.IV.75 г.

*Пакуль не высыпецца колас і змоўкнеш ты ізноў на год...* — існуе народнае павер'е, паводле якога зязюля змаўкае, падавіўшыся асцюкамі спелага коласа збажыны.

*** *Ідуць, ідуць і дні і ночы...* (с. 136)
Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.
У машынапісе над тэкстам: Красавік, 1975 г.

*Даватар* (с. 137)
Упершыню — Звязда, 1975, 25 чэрв.
У машынапісе над тэкстам: Красавік, 1975 г.

*Даватар* — Даватар Леў Міхайлавіч (1903—1941). Генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза. У час Айчыннай вайны камандуючы асобай кавалерыйскай групай, якая рабіла глыбокія рэйды па тылах ворага. У г. п. Ула Бешанковіцкага р-на БССР адкрыты яго мемарыяльны музей.

*Сястрыца* (с. 139)
Упершыню — Настаўніцкая газ., 1975, 25 чэрв.
У машынапісе над тэкстам: Красавік, 1975 г.

*** *Вясна! Вясна! Часы кахання...* (с. 140)
Упершыню — Чырвоная змена, 1975, 24 чэрв.
У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1975 г.

*Арбіта* (с. 141)
Упершыню — Звязда, 1975, 25 чэрв.
У рукапісе пад тэкстам: 9.V.75 г.

*Лясніч**ы*** (с. 142)
Упершыню — Звязда, 1975, 25 чэрв.
У рукапісе пад тэкстам: 18.V.75 г.

*** *Жыццё! Яно праходзіць рана...* (с. 144)
Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.
У рукапісе пад тэкстам: Май, 1975.

*** *Калі праз меру суха-суха...* (с. 145)
Упершыню — Полымя, 1976, № 1.
У машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1975 г.

*Дзяржынскі ў Мінску* (с. 146)
Упершыню — Полымя, 1976, № 1.
У машынапісе пад тэкстам: 6.VII.75 г.

*Жыву... у доме тым, дзе жыў Дзяржынскі, няхай не многа, колькі дзён...*— Маецца на ўвазе дом на рагу вуліц Карла Маркса і Леніна, дзе зараз знаходзіцца Літаратурны музей Петруся Броўкі. Ф. Дзяржынскі знаходзіўся ў Мінску ў жніўні — верасні 1920 года як член Рэвалюцыйна-ваеннага савета Заходняга фронту.

*Вясновы дождж* (с. 148)
Упершыню — Вячэрні Мінск, 1975, 24 чэрв.
У рукапісе пад тэкстам: 10.VII.75 г.

*Яны стаяць, як маякі...* (с. 149)
Упершыню — Полымя, 1976, № 1.
У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1975 г.

*Ах, зноўку б маладосць!* (с. 150)
Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.
У машынапісе пад тэкстам: 1.VIII.75 г.

*Яны ідуць...* (с. 151)
Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.
У машынапісе пад тэкстам: 9.VIII.75 г.

*Толькі ўспомні...* (с. 152)
Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.
У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: 12.VIII.75 г.

*Я свой збіраю ўраджай* (с. 153)
Упершыню — Полымя, 1976, № 1.
У машынапісе пад тэкстам: 25.VIII.75 г.

*Паэту-сябру* (с. 154)
Упершыню — Полымя, 1976, № 1.

У машынапісе над тэкстам: Жнівень, 1975 г.

*** *Вядома нам — усё не вечна...* (с. 155)

Упершыню — Полымя, 1976, № 1.

У машынапісе над тэкстам: Жнівень, 1975 г.

*Ёсць слёзы розныя...* (с. 156)

Друкуецца па зб. «І маладосць і сталасць», 1980.

Упершыню — Чырвоная змена, 1975, 24 чэрв.

У рукапісе над тэкстам: 12.IX.75 г.

У зб. тв., 1977, т. 4, змешчаны пад назвай «Слёзы».

*Бульба* (с. 157)

Упершыню — Звязда, 1975, 19 верас.

У машынапісе над тэкстам: 14.IX.75 г.

У зб. «І маладосць і сталасць» радкі 29—64 («Люблю я бульбу... ~ ...быў — не дурны») адсутнічаюць.

*** *Помню змалку...* (с. 159)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.

У рукапісе і машынапісе над тэкстам: Кастрычнік, 1975 г.

*Памяць* (с. 160)

Упершыню — Полымя, 1976, № 9.

У рукапісе над тэкстам: 14.XI.1975 г.

*Я не люблю самаўлюбёных* (с. 161)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе над тэкстам: 15.XI.75 г.

*** *Калісьці я не ведаў мора...* (с. 162)

Упершыню — Полымя, 1976, № 9.

У рукапісе і машынапісе над тэкстам: 16.XI.75 г.

*** *Паэты ёсць...* (с. 163)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.

У машынапісе над тэкстам: Лістапад, 1975 г.

*Заспявае хор дзявочы...* (с. 164)

Упершыню — Полымя, 1976, № 9.

У машынапісе над тэкстам: Лістапад, 75 г.

*Пра смерць* (с. 165)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе над тэкстам: Лістапад, 1975 г.

У часопісе «Маладосць» пасля трэцяй страфы ішлі радкі:

Калі жыццё як след мінае,
Мінуўшы год, не меней сто,
Дык чалавек бы засынае —
Каса тут смерці ні на што.

Калі ж якая там прычына,
Хваробам кажа смерць: — Люблю!
Ты захварэў. Смерць з дамавінай:
— І будзь ласкавы ў зямлю.

*Усё з любоўю* (с. 166)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе над тэкстам: Лістапад, 1975.

****Чаму так сонца чырванее...* (с. 167)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: Лістапад, 1975 г.

*Я адзінокім не бываю* (с. 168)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: Лістапад, 1975 г.

*Я ўсё сваё аддам!* (с. 170)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: Лістапад, 1975 г.

*Брахуны* (с. 171)

Упершыню — Вожык, 1976, № 1.

У машынапісе пад тэкстам: Лістапад, 1975 г.

****Калі з яе глыбінь напіцца...* (с. 173)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, дзе датуецца 1975 годам.

*Як уздымаецца сонца* (с. 174)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.

У машынапісе, дзе датуецца 1975 годам, мае загаловак «Як узнімаецца сонца...».

*Ах, сэрца!..* (с. 175)

Упершыню — Полымя, 1976, № 1.

У Зб. тв., 1977, т. 4 і зб. «Што сэрца праспявала», 1979 датуецца 1975 годам.

*Вазьмі маё сэрца, таварыш!* (с. 176)

Упершыню — Полымя, 1976, № 1.

У Зб. тв., 1977, т. 4 датуецца 1975 годам.

*Незабыўны май* (с. 177)

Упершыню — Полымя, 1976, № 1 пад загалоўкам «Песня».

У Зб. тв., 1977, т. 4 датуецца 1975 годам.

*Споведзь сабе самому* (с. 178)

Упершыню — Полымя, 1976, № 1.

У Зб. тв., 1977, т. 4 датуецца 1975 годам.

*Кнігаўка* (с. 179)

Упершыню — Полымя, 1976, № 9.

У рукапісе і машынапісе датуецца 1975 годам.

**** Бывала так...* (с. 180)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: 1975 г.

**** Зімовы час і без віхуры...* (с. 181)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: 1975 г.

**** Каб з круп знікалі пыл, лушпінне...* (с. 182)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: 1975 г.

*Мая Ушачка* (с. 183)

Упершыню — Маладосць, 1976, № 4.

Пад машынапісам: 1975 г.

*Без крокамера* (с. 184)

Упершыню — Беларусь, 1975, № 6.

У рукапісе пад тэкстам: 1975 г.

*** *Тысячагоддзі ў час лучыны...* (с. 186)

Упершыню — Беларусь, 1975, № 6.

У машынапісе пад тэкстам: 1975 г.

*Як быццам волаты стаяць...* (с. 187)

Упершыню — Работніца і сялянка, 1975, № 6.

У Зб. тв., 1977, т. 4 датуецца 1975 годам.

*Добры дзень!* (с. 188)

Упершыню — Сельская газ., 1975, 25 чэрв.

У Зб. тв., 1977, т. 4 датуецца 1975 годам.

У Літаратурным музеі П. Броўкі захоўваецца рукапіс з нязначнымі праўкамі без даты.

*Першы дэлегат* (с. 189)

Упершыню — Полымя, 1976. № 2.

У Зб. тв., 1977, т. 4 датуецца 1976 г.

*...Ідуць камуністы на з'езд свой крылаты...*— П. Броўка меў на ўвазе XXV з'езд КПСС.

*На мяжы тысячагоддзяў* (с. 191)

Упершыню — Звязда, 1976, 11 мая.

У Зб. тв., 1977, т. 4 датуецца 1976 годам.

У рукапісе, акрамя загалоўка «На мяжы тысячагоддзяў», маюцца і другія яго варыянты: «Пісьмо у двухтысячны», «Пісьмо ў двухтысячнагадовы», «Пісьмо сябру ў двухтысячагадовы!», «Пісьмо нашчадку», «Пісьмо ў наступнае». Пад тэкстам: 1976 г.

*Ідзі працуй!..* (с. 193)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.

У машынапісе пад тэкстам: Май, 1976 г.

*Вечны агонь* (с. 194)

Упершыню — Полымя, 1976, № 9.

У машынапісе пад тэкстам: Май, 1976 г.

*Не, вам ніколі не памерці!* (с. 195)

Упершыню — Беларусь, 1976, № 10.

У машынапісе пад тэкстам: Май, 1976 г.

*Адна сям'я* (с. 196)

Упершыню — Беларусь, 1976, № 10.

У машынапісе пад тэкстам: Май. Чэрвень, 1976 г.

*Ах, каб я мог!* (с. 197)

Упершыню — Беларусь, 1976, № 10.

У машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1976 г.

**** Гадам чым далей, болей ліку...* (с. 198)

Упершыню — Беларусь, 1976, № 10.

У машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1976 г.

*Капліца і ракета* (с. 199)

Упершыню — Беларусь, 1976, № 10.

У машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1976 г.

**** Куды ад роднае бярозы...* (с. 200)

Упершыню — Беларусь, 1976, № 10.

У машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1976 г.

**** Ты мне здавалася адзінай...* (с. 201)

Упершыню — Беларусь, 1976, № 10.

У рукапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1976 г.

*Найлепш у роднае зямлі* (с. 202)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, з паметай: Ліпень, 1976 г.

*Сіроты* (с. 203)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, з паметай: Ліпень, 1976 г.

*Засумаваў...* (с. 204)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.

У рукапісе пад тэкстам: Жнівень, 1976 г.

*Чаканне* (с. 205)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4.

У рукапісе пад тэкстам: Жнівень. 1976 г.

*Даруй, рака!* (с. 206)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1977, 25 сак. у пізцы «Я тайну сэрца адкрываю» рубрыкі «З паэтычнага сшытка».

У рукапісе пад тэкстам: Жнівень, 1976 г.

*Курлы-курлы...* (с. 207)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1977, 25 сак. у пізцы «Я тайну сэрца адкрываю» рубрыкі «З паэтычнага сшытка».

У машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1976 г.

**** Мяне чужынец...* (с. 208)

Друкуецца па Зб. тв., 1977, т. 4, дзе недакладна датуецца 1974 годам.

У рукапісе пад тэкстам: Жнівень, 1976 г.

**** Хвароба, што супроць ты маеш...* (с. 209)

Друкуецца па рукапісе.

У рукапісе пад тэкстам: Жнівень, 1976 г.

**** Ты кажаш...* (с. 210)

Друкуецца па газ. «Літ. і мастацтва», 1977, 25 сак.

У рукапісе пад тэкстам: Жнівень, 1976 г.

*Чакаў я адказу* (с. 211)

Друкуецца па рукапісе.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1976 г.

*Змяніўся толькі воблік ваш* (с. 212)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, дзе датуецца 1976 годам.

У рукапісе, які таксама датуецца 1976 годам, даецца першапачатковая назва верша — «Маім сябрам...».

*** *Калі на ўзлессі, ля сасёнак...* (с. 213)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, дзе датуецца 1976 годам.

*Пляткар* (с. 214)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, дзе датуецца 1976 годам.

*Чараўнікі* (с. 215)

Упершыню — Зб. тв., 1977, т. 4, дзе датуецца 1976 годам.

*** *Мая Радзіма!..* (с. 217)

Друкуецца па зб. «І маладосць і сталасць», 1980.

Упершыню — Полымя, 1977, № 6.

У рукапісе пад тэкстам: 1976 г.

*** *Шчаслівы той...* (с. 218)

Друкуецца па рукапісе.

У рукапісе пад тэкстам: 1976 г.

*** *Браты, таварышы...* (с. 219)

Друкуецца па газ. «Літ. і мастацтва», 1977, 25 сак., дзе апублікаваны ўпершыню.

У рукапісе пад тэкстам: 1976 г.

*Расул* — Гамзатаў Расул Гамзатавіч (н. 1923), аварскі паэт. Народны паэт Дагестана. Лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэміі СССР. Герой Сацыялістычнай Працы.

*Кайсын* — Куліеў Кайсын Шуваевіч (1917—1985), балкарскі паэт. Народны паэт Кабардзіна-Балкарскай АССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

*Давід* — Кугульцінаў Давыд Мікітавіч (н. 1922), калмыцкі паэт. Народны паэт Калмыцкай АССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

*Мустай* — Карым Мустай (Карымаў Мустафа Сафіч, н. 1919), башкірскі паэт. Народны паэт Башкірскай АССР. Герой Сацыялістычнай Працы.

*Няхай бы, як у майскім ранку...* (с. 220)

Друкуецца па газ. «Літ. і мастацтва», 1977, 25 сак., дзе апублікаваны ўпершыню.

У рукапісе пад тэкстам: 1976 г.

*Жыццё ідзе...* (с. 221)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.

У рукапісе пад тэкстам: 7.IV.77 г.

*** *Мне дайце, дайце...* (с. 222)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.

Упершыню — Маладосць, 1977, № 11.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: 12.IV.77 г.

*Савецкі новы чалавек* (с. 223)

Друкуецца па часоп. «Вожык», 1977, № 10, дзе апублікаваны ўпершыню.

У машынапісе над тэкстам: 12.IV.77 г.

*На кожны дзень свае клапоты...* (с. 224)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.

Упершыню — Маладосць, 1977, № 11, дзе апублікаваны пад назвай «Наш новы дзень у шматгалоссі...».

У рукапісе, які мае загаловак «На кожны дзень свае клапоты...», над тэкстам: 13.IV.77.

*Чырвоныя кветкі* (с. 225)

Друкуецца па зб. «І маладосць і сталасць», 1980.

Упершыню — Полымя, 1977, № 6.

У рукапісе над тэкстам: 14.IV.77 г.

*А ты з'явілася якой?* (с. 226)

Друкуецца па часоп. «Маладосць», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.

У рукапісе над тэкстам: 20.IV.77 г.

*Усіх як ёсць перамаглі!* (с. 227)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.

У машынапісе над тэкстам 2—3.V.77 г.

*Ідуць у наступ рыбаловы...* (с. 229)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.

У рукапісе над тэкстам: 8.V.77 г.

*Ждановічы* (с. 230)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.

Упершыню — Полымя, 1977, № 11.

У рукапісе над тэкстам: 29.V.77 г.

*Будзённы Сямён Міхайлавіч* (1883—1973). Маршал Савецкага Саюза. Тройчы Герой Савецкага Саюза.

*Гай Гая Дзмітрыевіч (Бражышкянц Гайк Дзмітрыевіч* (1887—1937). Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Закаўказзі. Герой грамадзянскай вайны. Некаторы час быў камандзірам і ваенкомам 7-й Самарскай дывізіі, што размяшчалася ў Беларусі.

*Цімашэнка Сямён Канстанцінавіч* (1895—1970). Маршал Савецкага Саюза. Двойчы Герой Савецкага Саюза. У 1933—1935 гг. намеснік камандуючага войск БВА.

*Неба* (с. 232)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.

Упершыню — Маладосць, 1977, № 11.

У рукапісе і машынапісе над тэкстам: 31.V.77 г.

*Мы ўсе тады не кахалі...* (с. 234)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.

Упершыню — Маладосць, 1977, № 11.
У рукапісе пад тэкстам: 3.VI.77 г.

*Вясны мастацтва* (с. 236)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.
Упершыню — Маладосць, 1977, № 11.
У машынапісе пад тэкстам: 4.VI.77.

*Размова з касманаўтам* (с. 237)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.
У машынапісе пад тэкстам: 8.VI.77 г.

*Жыву за вас!* (с. 238)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.
У рукапісе, які мае загаловак «Ах, каб вы бачылі», пад тэкстам: 12.VI.77 г.
*Сыс* — дзявочае прозвішча маці паэта.

*Усё спявае* (с. 239)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.
Упершыню — Чырвоная змена, 1977, 29 кастр.
У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: 26.VI.77 г.
*Флейта* — (ням. Flöte ад праванс. flönt) духавы музычны інструмент, з якога гук здабываецца ўдзіманнем паветра непасрэдна ў канал трубкі.
*Фагот* — (італьян. fagotto, літар. звязка, вузел), духавы трысцінкавы музычны інструмент, з клапанавым механізмам.

*Ліпень* (с. 240)

Друкуецца па часоп. «Маладосць», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.
У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: 8.VII.77 г.

*Хто б мог падумаць...* (с. 241)

Друкуецца па часоп. «Маладосць», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.
У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: 19 ліпеня 1977 г.

*А не магу...* (с. 242)

Друкуецца па часоп. «Маладосць», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.
У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1977 г.

*Камень* (с. 243)

Друкуецца па часоп. «Маладосць», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.
У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1977 г.

*З такімі думамі іду...* (с. 244)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».
У рукапісе пад тэкстам: 10.IX.77 г.

*Масква* (с. 245)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1977, № 12, дзе апублікаваны ўпершыню.

У рукапісе, які мае загаловак «А я ў Маскве быць рад заўсёды...», пад тэкстам: 10.IX.77 г.

*А я нічога не хаваю...* (с. 246)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.

Упершыню — Полымя, 1978, № 1, дзе апублікаваны ў пізцы «Па ждановіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

У рукапісе пад тэкстам: 11.IX.77 г.

*Угору-ўніз...* (с. 247)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.

Упершыню — Полымя, 1978, № 1, дзе апублікаваны ў пізцы «Па ждановіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

У рукапісе пад назвай «Уверх — уніз» пад тэкстам: 11.IX. 77 г.

*У санаторыі «Крыніца»* (с. 248)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню ў нізцы «Па ждановіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

У рукапісе пад тэкстам: 16.IX.77 г.

*Мы самі некалі спявалі* (с. 250)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню ў нізцы «Па ждановіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

У рукапісе пад тэкстам: 18.IX.77 г.

*Ленінскі праспект у Мінску* (с. 251)

Друкуецца па газ. «Звязда», 1977, 27 кастр., дзе апублікаваны ўпершыню.

У рукапісе пад тэкстам: Кастрычнік, 1977.

*Глядзіць з праспекта на мяне Дзяржынскі* — паэт мае на ўвазе помнік Ф. Э. Дзяржынскаму ў скверыку на скрыжаванні вуліцы Камсамольскай з Ленінскім праспектам.

*Крыху далей — і Колас на віду* — маецца на ўвазе помнік Я. Коласу на плошчы, што носіць імя паэта.

*Далёка розумам пайшлі...* (с. 255)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.

Датуецца годам першай публікацыі.

*Калі саджуся за паперу* (с. 256)

Друкуецца па часоп. «Маладосць», 1977, № 11, дзе апублікаваны ўпершыню.

Датуецца годам першай публікацыі.

*Мы працу ведалі з дзяцінства* (с. 258)

Друкуецца па зб. «І маладосць і сталасць», 1980.

Упершыню — Полымя, 1978, № 1, дзе апублікаваны пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Яно — прытулак мой жаданы* (с. 259)

Друкуецца па зб. «Што сэрца прасiлавала», 1979.

Упершыню — Полымя, 1978, № 1, дзе апублікаваны ў нізцы «Па жданавіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Відаць, жыцця такі закон...* (с. 260)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Улічваючы дату здачы часопіса ў друк, а таксама дацiроўку вершаў дадзенай рубрыкі, рукапісы якіх захаваліся, датуецца 1977 годам.

*Вось я сапраўдная!..* (с. 261)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Вучыся гора перажыць...* (с. 262)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Граніт* (с. 263)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Ленінград* (с. 264)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*На Марсавым полі* (с. 266)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Марсава поле* — плошча ў Ленінградзе, названая ў гонар рымскага міфалагічнага бога вайны Марса. У XVIII—XIX стст. месца ваенных парадаў. У 1917 годзе па Марсавым полі выступаў У. І. Ленін. Месца пахавання герояў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У 1957 годзе на Марсавым полі запалены Вечны агонь.

*Народны хор* (с. 267)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*«Волга-маці»* — маецца на ўвазе папулярная ў канцы XIX— пачатку XX стст. руская народная песня «Из-за острова на стрежень». Словы паэта Д. Н. Садоўнікава.

*«Бацька-Нёман»* — беларуская песня на словы А. Астрэйкі. Муз. Н. Ф. Сакалоўскага.

*«Рэвэ та стогнэ»* — украінская народная песня на словы верша Т. Р. Шаўчэнкі «Запавіт».

*«Суліко»* — грузінская народная песня.

*Ну што ж, бывай, перажытое!..* (с. 268)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*** *Спяшаўся я ўранні...* (с. 269)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Ты не кажы ліслівых слоў...* (с. 270)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*** *Убранне кожнае птушыне...* (с. 271)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Ці гэта помніцца каму?* (с. 272)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Я песню прыгадаў старую* (с. 273)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад рубрыкай «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Не ўсё відочна, што працуе...* (с. 274)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны

ўпершыню ў нізцы «Па ждановіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

Датуецца 1974 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Паўночны вецер* (с. 275)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню ў нізцы «Па ждановіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Роздум на ўсходзе сонца* (с. 276)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню ў нізцы «Па ждановіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*Шукаем сябра мы свайго* (с. 277)

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1978, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню ў нізцы «Па ждановіцкіх сцяжынах» рубрыкі «Новыя вершы».

Датуецца 1977 годам (гл. каментарый да верша «Відаць, жыцця такі закон...»).

*** *Даўно мінулыя, сівому...* (с. 278)

Друкуецца па машынапісе.

У машынапісе пад тэкстам: Люты, 1978 г.

*** *А зоры ззяюць, як і ззялі...* (с. 279)

Друкуецца па зб. «Што сэрца праспявала», 1979.

